Вэйо Мэры

# Маршал Фінляндыі
# Карл Густаў Манэргейм

Veijo Meri

# Suomen marshalkka C. G. Mannerheim

WSOY – KIRJAPAINOYKSIKKÖ
Juva, 1990

Вэйо Мэры

# Маршал Фінляндыі Карл Густаў Манэргейм

КОЛАС

ІП КОЛАС
Мінск, 2004

УДК 929
ББК 63.3 (4 Фін) 8
М 97

*Кніга выдадзена пры садзеянні*
*Літаратурнага Таварыства Фінляндыі*

*Пераклад Якуба Лапаткі*

Мэры Вэйо.
М 97 **Маршал Фінляндыі Карл Густаў Манэргейм** /Пер. з фінскай Я. Лапаткі.— Мн.: ІП Колас, 2004.— 264 с.
ISBN 985-90050-1-Х

Біяграфічная кніга «Маршал Фінляндыі Карл Густаў Манэргейм» цікава распавядае пра лёс аднаго з найбольш вядомых дзеячаў на арэне еўрапейскай палітыкі першай паловы XX стагоддзя. Аўтар паведамляе шмат малавядомых дэталяў з жыцця фінскага маршала і паказвае, як сталася так, што былы генерал расейскай імператарскай арміі, які да 50-гадовага ўзросту ладам не ведаў фінскай мовы, стаў галоўнакамандуючым фінскага войска, дамогся незалежнасці Фінляндыі ад Расейскай імперыі і быў урэшце абраны прэзідэнтам Фінскай Рэспублікі.

Адрасуецца шырокаму колу чытачоў.

**ББК 63.3 (4 Фін) 8**

**ISBN 985-90050-1-Х**

©Vejo Meri, 1990
©Пераклад. Я. Лапатка, 2004
©Макет. ІП Колас, 2004

# І. ПАХОДЖАННЕ І ЮНАЦТВА

## Род Манэргеймаў

Род Манэргеймаў, хутчэй за ўсё, трапіў у Швецыю праз Нямеччыну з Галандыі. Родапачынальнік, купец Генрык Маргейн у 1645 годзе пасяліўся ў Гэўле. Ён быў чалавек дзейны і актыўны, а таму пачаў займацца горнымі промысламі, стаў чальцом гарадской рады і камандзірам адной з ротаў бюргерскай гвардыі. Праз восем гадоў ён перабіраецца ў Стакгольм, дзе займае пасаду бухгалтара ў першым шведскім банку.

Малодшы сын Генрыка Маргейна Аўгустын стаў аканомам маёнтка графа Аксэшэрны ў Эстоніі. Калі пачалася рэдукцыя, гэта значыць працэс вяртання кароне маёнткаў, земляў, вёсак, паветаў і староставаў, аддадзеных на водкуп або ў асабістае карыстанне арыстакратыі, дзяржава задзейнічала камісараў нешляхецкага паходжання, якія былі дастаткова жорсткія і непадкупныя і маглі справіцца з такой задачай. Аўгустын Маргейн стаў чальцом выканаўчага камітэта па рэдукцыі. Шмат якія камісары на гэтым узбагаціліся, выкупляючы або арандуючы маёмасць у збяднелых графаў і баронаў. Калі эстонскія маёнткі Аксэшэрнаў, самага знатнага рода Швецыі, таксама закрануў працэс рэдукцыі, Аўгустын Маргейн узяў іх у арэнду. У 1693 годзе яму надалі дваранскае званне. Тады ж ён перабраўся ў Швецыю і ўзяў там у арэнду два маёнткі. Са свайго ранейшага галандскага прозвішча ён зрабіў новае, болей доўгае і гучнае. Гарлавыя гукі ў прозвішчы «Манэргейм» надаюць яму належную грунтоўнасць і нават змрочнасць, асабліва калі параўнаць яго з провішчамі Кронстэдт або Эрэнсвярд.

Усе чацвёра сыноў Аўгустына сталі афіцэрамі артылерыі. Адна з дачок, Ганна, выйшла замуж за палкоўніка, які ў дваранстве набыў прозвішча Эрэнсвярд. Сын гэтай сямейнай пары стаў славутым будаўніком Свеабарга, марской крэпасці Хельсінкаў, выдатным чарцёжнікам, мастаком і военачальнікам. Пахаваны ён у той жа крэпасці Свеабарг, або на сучасны лад − Суоменлінна.

Жонку Аўгустына Манэргейма таксама звалі Ганна. І яе браты таксама заслужылі дваранства і атрымалі прозвішча Кронстэдт. А далей выйшла так, што крэпасць, пабудаваная Эрэнсвярдам, здалася рускаму военачальніку Кронстэдту. Паваротныя пункты гісторыі Фінляндыі таксама звязаныя з гэтым родам. Прадзед Манэргейма адыграў значную ролю падчас далучэння Фінляндыі да Расеі, а праз сто восем гадоў вызваліцелем Фінляндыі стаў ягоны праўнук, адзіны фінскі маршал. І заснавальнік рода Манэргеймаў таксама адыграў сваю значную ролю ў паваротны час шведскай гісторыі. Тут можна прасачыць нейкую заканамернасць жыццёвага рытму роду Манэргеймаў, які найбольш значна праяўляў сябе ў бурныя часы гісторыі, а не ў ціхамірным жыцці.

Прадзед маршала, Карл Эрык, першы з усяго роду перабраўся ў Фінляндыю. Яму было ўсяго 23 гады, і малады афіцэр пераскочыў з лейтэнантаў адразу ў секунд-маёры пяхотнага палка ў Турку. Гэта сведчыць, што чалавек ён быў нябедны, бо афіцэрскія чыны ў той час купляліся, іх маглі набыць нават для дзяцей.

Старэйшы брат Карла Эрыка стаў у Швецыі ўплывовым чалавекам, кіраўніком апазіцыі. Ён быў юрыстам і так смела выступаў супраць пашырэння каралеўскіх уладных паўнамоцтваў, што пасля 1809 года яго зрабілі дзяржаўным упаўнаважаным па юрыдычных пытаннях.

Брат, які жыў у Фінляндыі, прытрымліваўся падобных поглядаў. Ён займаў такое важнае месца ў саюзе «Аньяла», што разам са сваім непасрэдным начальнікам, камандзірам пяхотнага палка палкоўнікам Ёганам Генрыкам Хэстэску, быў абвінавачаны ў здрадзе радзіме і асуджаны на смяротнае пакаранне. Хэстэску страціў галаву, а Манэргейма памілавалі, бо ён падаў аб гэтым прашэнне. Пасля такога прашэння спадзявацца на паспяховую вайсковую кар'еру было проста смешна, і ён пайшоў у адстаўку, намерваючыся паступіць на службу ў якую-небудзь замежную армію.

Але тут у яго ўзнік значна лепшы ў эканамічных адносінах варыянт – магчымасць уступіць у шлюб з дачкой губернатара Турку Эрнста Густава фон Вілебрандта. На грошы, атрыманыя ў спадчыну ад маці, ён у 1795 годзе купіў маёнтак Лоўхісаары, а наступным годам ажаніўся. З 1805 года ён стаў старшынёй Эканамічнага таварыства Фінляндыі, сябрам Музычнага Таварыства Турку і плённа працаваў у сваім маёнтку. А калі ў 1808–1809 гадах рускія заваявалі Фінляндыю, Манэргейм стаў старшынём дэлегацыі, якую запрасілі да імператара ў Пецярбург, каб абмеркаваць будучыню Фінляндыі, хоць вайна яшчэ і не скончылася. Апошнім днём лістапада 1808 года Манэргейм звярнуўся з прамовай па-французску да рускага імператара. Ён сказаў, што дэлегацыя прадстаўляе свабодны, але законапаслухмяны народ, верны свайму валадару. Дэлегацыя папрасіла аб скліканні сейма. Яго сабралі ў Порваа. Манэргейм займаў там віднае становішча. Пасля таго ён стаў губернатарам, працаваў у Банку Фінляндыі, а на пачатку 1820 года стаў намеснікам старшыні сенацкага эканамічнага дэпартамента, што прыкладна адпавядае сучаснай пасадзе прэм'ер-міністра. Ён быў сапраўдным «таемным дарадцам». У 1825 годзе імператар узвёў яго ў графскае званне.

Карл Эрык Манэргейм быў строгім і патрабавальным чыноўнікам, за што многія яго не любілі. Ён быў спакойны, дзелавы і стрыманы чалавек, пазбаўлены фантазіяў і легкадумнасці, але дрэнны прамоўца. Калі генерал-губернатарам Вялікага княства Фінляндскага стаў Закрэўскі, чыноўнік-бюракрат, які не меў уяўлення аб заходнім правапарадку і заходніх прынцыпах кіравання, а таму часта ішоў у абыход сената, фіны абвінавацілі Манэргейма ў патуранні, баязлівасці і запабяганні перад ім. Пакрыўджаны Манэргейм падаў у адстаўку і паглыбіўся ў прыватнае жыццё.

Пасля таго ў краіне на працягу трыццаці год доўжыўся перыяд чыноўнага самаўладдзя, калі невялікая купка арыстакратаў кіравала краінай на свой лад, не забываючыся найперш пра свае ўласныя інтарэсы. Да 1855 года ў дзяржаўных справах сената рэй вёў Ларс Габрыэль фон Гартман па мянушцы «Яго Жахлівасць», які быў – як і Карл Эрык Манэргейм – намеснікам старшыні эканамічнага дэпартамента. Ён ажаніўся з дачкой Манэргейма, а пасля яе смерці пабраўся шлюбам з яе сястрой. Такім чынам ён быў двойчы зяць Карлу Эрыку Манэргейму. Адзін з сыноў Карла Эрыка – Карл Густаў – стаў дзедам будучага маршала. Унука назвалі ў гонар дзеда, які дасягнуў пасады старшыні надворнага суда ў Выбаргу. Ягоныя браты займалі розныя не абцяжараныя абавязкамі пасады ў Банку Фінляндыі. Яны не надта імкнуліся як да славы і гонару, так і да працягу роду. Адзін з іх з'ехаў у Польшчу,

дзе «ажаніўся на маёнтку». Ніякіх сувязяў з радзімай ён не падтрымліваў, і яго залічылі ў нябожчыкі. Сямейства Манэргеймаў стала аб'ектам варожых і зайздрослівых адносінаў і сацыяльнага ціску з боку вышэйшага саслоўя Фінляндыі, таму што гэта быў род, які атрымаў дваранства падчас секвестравання маёнткаў старых арыстакратычных родаў, болей таго, Манэргеймы ўдала скарысталі кан'юнктуру адносінаў з Расеяй. У Карла Густава такія адносіны выклікалі ў сваю чаргу варожасць да ўсіх шведскіх арыстакратаў Фінляндыі. Браты не вытрымалі сацыяльнага ціску. Яны пакінулі ўсялякія спробы зрабіць кар'еру і аддалі сябе на літасць арыстакратычнага грамадства. Напэўна, таму самы здольны з іх начапіў на сябе каўпак блазна, каб зрабіцца паслугачом усяго вышэйшага свету, ягоным агульным гофмайстрам. Менавіта Аўгустын стаў заканадаўцам жаночай моды, інтэр'ера і цырыманійных шэсцяў. Яго пасылалі ў Італію ды Нямеччыну купляць мэблю, дываны, свяцільнікі, габелены ды іншае абсталяванне дзеля палаца імператара і рэзідэнцыі генерал-губернатара ў Хельсінках. Пазней ён стаў няблага маляваць алоўкамі і пісаць акварэлі. На ягоных акварэлях лунаюць лёгкія, як матылькі, кавалеры і апранутыя па апошняй модзе паненкі. За свае манеры і паводзіны Аўгустын атрымаў мянушку «паненка Аўгустына».

Схільнасць да мастацтва перадавался ў родзе Манэргеймаў з пакалення ў пакаленне. У бацькі маршала мастацкія здольнасці спачатку трымалі верх над усім. Але прафесійным мастаком стала толькі ягоная сястра Ева. У часы Аўгустына двараніну не пасавала быць мастаком – надта ўжо нізкім быў тады сацыяльны статус гэтай прафесіі.

Дзед Манэргейма Карл Густаў быў поўнай супрацьлегласцю свайму брату Аўгустыну – такім скаваным і строгім, нягнуткім і халодным, якім толькі можа быць чалавек. Яго характарызуе тое, што ён сабраў вялізную калекцыю цвёрдакрылых. У ягонай калекцыі былі наколатыя на шпількі каля сотні тысячаў насякомых, з іх 20000 жукоў. Ён быў першы сярод Манэргеймаў, хто нарадзіўся ў Фінляндыі. Павольна, але ўпэўнена, ён падымаўся па службовай лесвіцы, пакуль у 36 год не стаў губернатарам Ваасы. Наступным годам яго перавялі на тую ж пасаду ў Выбарг, а калі праз пяць гадоў стварылі Выбаргскі надворны суд, ён стаў яго прэзідэнтам. Карл Густаў уступіў у Фінскае літаратурнае таварыства і ў 1850 годзе прапанаваў заснаваць пасаду прафесара фінскай мовы ў Хельсінкскім універсітэце. Апроч таго, ён прапанаваў весці справы і судавытворчасць на фінскай мове. У той час гэта была такая смелая ідэя, што яе нельга расцэньваць, як тактычны ход. Магчыма, гэта было сімптомам пазнейшай палітыкі Расеі адносна фінскай мовы. Падтрымліваючы імкненне да фінізацыі і фінскасці, можна было паслабіць сувязі Фінляндыі са Швецыяй і становішча шведскамоўнага вышэйшага класа ў краіне наогул.



Карл Густаў напісаў шмат кніжак і даследаванняў пра жукоў. Ён пісаў па-французску і на лаціне. Ён быў сябрам многіх замежных навукова-прыродазнаўчых таварыстваў.

У жонкі Карлу Густаву меціл самую прыгожую жанчыну Фінляндыі на пачатку стагоддзя – будучую Аўрору Карамзіну. Аднак халодная натура Манэргейма не паказала ніякіх прыкметаў адтайвання, і Аўрора пакінула яго ледзянець далей.

Манэргейм ажаніўся з дачкой падпалкоўніка Карла Канстанціна фон Шанца. У супругаў было чацвёра дзяцей: адзін сын, Карл Роберт, бацька маршала, і тры дачкі. Адна з іх, Ганна, выйшла замуж за сусветна вядомага фінскага падарожніка і палярнага даследчыка Адольфа Эрыка Нордэншэльда. Мужам Соф'і стаў італьянскі дыпламат Франчэска Котта, а трэцяя сястра, Вільгельміна, засталася незамужняя.

Карлу Роберту было дзевяць гадоў, калі памёр ягоны бацька. Ранняя страта бацькі стала адной з прычынаў нетрадыцыйных паводзінаў Карла Роберта. Ён атрымаў у спадчыну маёнтак Лоўхісаары і паступіў у Хельсінкскі універсітэт, дзе стаў радыкалам і атэістам. Ён валодаў разнастайнымі мастацкімі здольнасцямі. На прэм'еры першай фінскай оперы «Паляванне караля Карла» кампазітара Пацыуса, ён спяваў партыю караля, бо галоўны выканаўца раптоўна захварэў. Тады яму было 17 гадоў. Ягоная вольная манера выканання прыцягнула ўвагу і выклікала скандал, чаго ён і дабіваўся. Спектакль «Тое ды гэта», пастаўлены ў 1858 годзе, прывёў да адстаўкі рэктара. Карла Роберта выключылі на паўгода з універсітэта. На прысуджэнні ступені магістра ягоны сябар, а пазней муж сястры Нордэншэльд выступіў з прамовай, у якой падкрэсліваў еднасць Скандынаўскіх краінаў. Гэта стварыла яму

шматлікія цяжкасці, з-за чаго будучы палярнік пераехаў у Швецыю і ўсе свае падарожжы і адкрыцці зрабіў пад шведскім сцягам. Разам з другім сваім таварышам, Карлам Гуга фон Бэкерам, Манэргейм заснаваў газэту «Васіліск». На мэце была свабодная дыскусійная арэна. Да гэтага сяброўскага кола належаў і другі значны палітык Фінляндыі – Леа Мэкелін.

Бацька маршала шмат часу праводзіў у Парыжы і ўсёй сваёй істотай засвойваў тагачасны буржуазны лібералізм і радыкалізм. Падчас працэсу Дрэйфуса ён быў на баку падсуднага, дый наогул не цярпеў антысемітызму. Усім сваім знаёмым антысемітам у Фінляндыі і ў Пецярбургу ён паслаў свой здымак, на якім чытаў так ненавісную юдафобам кнігу Э. Заля «Аўрора».

Ён перакладаў на шведскую мову з англійскай, французскай і нямецкай вершы Р. Бёрнса, Альфрэда дэ Мюссэ, Генрыха Гейне, чыя элегантная іронія была яму блізкая. Гэта было ўласціва і ягонаму сыну – маршалу Фінляндыі. Бацька маршала і сам пісаў вершы. У дадатак, ён быў добрым мімам, парадыстам і акторам. Ягоная п'еса «Жахлівыя наступствы рэўнасці» была парадыйным фарсам і мела вялікі поспех. Ягоны сын-маршал таксама з задавальненнем пісаў і да апошніх дзён забаўляў вузкае кола сваіх сяброў пародыямі на славутых людзей.

Карл Роберт быў сапраўдным гурманам. Акрамя злых жартаў, ён частаваў сваіх гасцей экзатычнымі стравамі, прыгатаванымі з добрым веданнем справы. Быў ён і добрым знаўцам віна. Гэтыя схільнасці і рысы цалкам уласцівыя і маршалу Манэргейму.

Гэты дваранін, які раскідваў грошы як толькі мог, ажаніўся з дачкой капіталіста з багатага роду прадпрымальнікаў. У XIX стагоддзі такія шлюбы сталі звычайнаю з'явай у Еўропе і Злучаных Штатах, дзе мільянеры аддавалі сваіх дачок за сыноў з арыстакратычных сямействаў Англіі. У такім шлюбе нарадзіўся і Чэрчыль.

Адзін госць на вяселлі заўважыў, што Гэлена фон Юлін стала графіняю Манэргейм, а Карл Роберт Манэргейм – багатым чалавекам.

Вяселле адбылося ў апошнія дні 1862 года ў Фіскары, маёнтку фон Юлінаў, побач з якім быў вялікі завод. Святкаванне доўжылася шмат дзён.

Бацькам Гэлены быў горны дарадца Ёган Якаб фон Юлін, а маткай – трэцяя жонка горнага дарадцы Шарлота фон Егершэльд, якая памерла ад родаў, калі Гэлене было два гады. У 1886 годзе пры падзеле спадчыны Гэлена атрымала ў сваю долю маёнтак і каменны дом у Турку. Такім чынам даходы Гэлены ад спадчыны складалі 5000 рублёў або 20000 марак у год. Усё гэта – як нерухомасць, так і грошы – законны супруг пусціў на вецер разам са сваёй маёмасцю.



У свой час сын, маршал Карл Густаў Манэргейм, паўторыць манёўр бацькі. Ён ажэніцца з багатаю маладой рускай дваранкай, чыя маёмасць ацэньвалася ў 800000 рублёў або 1700000 фінскіх марак. Жонка атрымала ў спадчыну два маёнткі, адзін з якіх прадалі. Замест яго купілі маёнтак з нядрэнным даходам у Латвіі. Бацька маршала праз васемнаццаць год пакінуў жонку і семярых дзяцей на волю лёсу без уласнасці і грошай. Яго сын-афіцэр пратрымаўся толькі дзевяць гадоў: на такі час хапіла цярпення ягонай жонкі. Яна прыхапіла з сабою абедзвюх дачок і ўцякла ад мужа як мага далей. Маёмасць была тады ўжо страчаная. Сын прасадзіў таксама і грошы, гуляючы ў азартныя гульні і няўдала рызыкуючы на біржы, але, напэўна, яшчэ большая сума пайшла на раскошнае жыццё ў сталіцы імперыі і аплату вялізных даўгоў, накопленых да жаніцьбы. Шыкоўнае жыццё патрабуе вялікіх выдаткаў. Карл Густаў Манэргейм быў сапраўдным сынам свайго бацькі. Як і бацька, у сорак гадоў ён абразуміўся і паправіў сваё сацыяльнае і эканамічнае становішча, пачаўшы ўсё з самага пачатку. Ён рабіў гэта двойчы.

Маці Манэргейма верыла ў жорсткае англійскае выхаванне, якое дае чалавеку загартоўку. Яна не была мяккай і ласкавай маці-шчабятухай і не выказвала надта вялікай цікавасці да псіхічнага стану сваіх дзяцей, іх духоўнага і эмацыйнага свету. Здаецца, болей за ўсіх ад гэтага пакутавала старэйшая сястра Соф'я, што і натуральна. Незабыўнае расчараванне і гора прычыніла Соф'і тое, што, нягледзячы на сваё абяцанне, маці загадала ўсыпіць старога сабаку, улюбёнца ўсёй сям'і. У дзяўчынкі сталася пасля гэтага жорсткая ліхаманка, якая цягнулася некалькі дзён. А калі дзяўчынцы ледзь не з-пад палкі загадалі аддаць яе старую паламаную ляльку дзяўчынцы-жабрачцы, яна болей ніколі не гуляла ў лялькі, хоць у той жа дзень замест страчанай старой лялькі ёй падаравалі

новую. Пра гэта Соф'я распавядала ўжо ў сталым узросце. Два гэтыя выпадкі пазбавілі яе веры ў людзей і адпрэчылі ад навакольнага свету і іншых, а магчыма, і ад самой сябе, бо ўсё гэта – адзіны ланцуг.

Карл Густаў, будучы маршал, быў самым дзікім дзіцём у сям'і, якое не прызнавала ніякай дысцыпліны і, тым болей, матчыных педагагічных прынцыпаў. Дарослым ён стаў іх строга прытрымлівацца. Халодныя абліванні ўранку, цвёрды паходны ложак, даўжэзны працоўны дзень у безаблічным кабінеце, педантычнае выкананне сваіх абавязкаў, нежаданне раскрыць душу нават перад самымі блізкімі людзьмі і неверагодная смеласць на полі бою – усё гэта рысы англійскага выхавання. Англійскае выхаванне ў тым вядомым выглядзе не надавала асаблівага значэння чалавечым пачуццям і эротыцы. Падкрэслівалася самадысцыпліна, стрыманасць, дзелавітасць і непадкупнае выкананне абавязкаў.

### Дзяцінства

Тыя, хто наведваў маёнтак Лоўхісаары, расказваюць, што жыццё там падпарадкоўвалася строгім правілам. Усе паводзілі сябе прыстойна і высакародна. За мовай сачылі вельмі пільна, стараючыся выбіраць словы і выразы. Жартаваць і прыдурвацца забаранялася. Густаў паўставаў супраць усяго гэтага. Ён быў адзіным цяжкім дзіцём. З ім здараліся прыпадкі шаленства, калі ён лемантаваў і вішчаў. Ён тэрарызаваў свайго старэйшага брата Карла, які быў узорным хлопчыкам і таму не мог адказваць брату адпаведным чынам. Дзеля міру ў сям'і Карл заўсёды саступаў.

Сям'я і родзічы былі вельмі занепакоеныя тым, што Густаў доўга не пачынаў гаварыць. Вядома, каб настояць на сваім, ён крычаў і шалеў. Як і ўсе дзеці, якія яшчэ не пачалі гаварыць, Густаў быў надзвычай рухавым і дзейным хлопчыкам. Родзічы лічылі яго хуліганам. Яму споўнілася тры гады, але гаварыць ён так і не пачаў. І толькі пасля нараджэння сястры Евы адбыўся цуд. «Густаў загаварыў», – з палёгкай паўтаралі ўсе.

Калі Густаву споўнілася дванаццаць гадоў, дзядзька Альберт заклікаў яго стрымаць сваю дрэнную натуру і падаваць добры прыклад свайму малодшаму брату Ёгану.

Малога Густава называлі ласкава «Тутці» або «Цютця» – словамі накшталт дзіцячага лапатання. А магчыма, што гэтыя словы прыйшлі з фінскай мовы, бо на мясцовай гаворцы першае азначала лялька, а другое – маленькая дзяўчынка. А ўсё наваколле там размаўляла па-фінску. На той жа мове гаварыла і малодшая прыслуга. Не выключана, што гэтыя словы і падхапіў маленькі хлопчык. Неяк у трыццатыя гады Манэргейм сказаў паненцы Кёнёнен, якая працавала ў канторы Чырвонага Крыжа і, апроч гэтага, аказвала пазаслужбовыя паслугі – напрыклад, ад рукі падпісвала карткі, каб рассаджваць гасцей за сталом (але почырк у яе быў жахлівы, і тут яна пацярпела поўнае фіяска), – што такой маленькай, як ён, дзяўчынцы («цютця») вельмі цяжка падтрымліваць парадак у доме. У Манэргейме шмат чаго было ад жанчыны, чуллівай паненкі, непрадказальнай і капрызлівай прынцэсы, якая нават праз сем пярынаў адчувае пакінутую на ложку гарошыну.

Густаў заўсёды трапляў у розныя недарэчныя і небяспечныя гісторыі як у дзяцінстве, так і пазней, дасягнуўшы сталага ўзросту. Ён кідаў выклік не толькі людзям, але і фізічным законам прыроды. Ён быў бяздумна адважны. Аднойчы ён неяк залез на хлеў і ўзяўся скакаць з адной бэлькі на другую, але спатыкнуўся і зляцеў уніз, моцна ўдарыўшыся аб дошкі падлогі. Соф'я і Ёган вынеслі яго на двор, і тут у хлопчыка пайшла кроў горлам. Усе думалі, што ён сканае. Спешна паслалі па якую-небудзь бабку. Але тут высветлілася, што хлопец аб'еўся чарніцамі, і яго званітавала. Але цяжкое страсенне мазгоў ён усё-такі атрымаў, пасля чаго яму давялося папаляжаць у ложку.

Па настаўленнях Густава сёстры пашылі ветразь для старога чоўна. За гэта Густаў ўзяў іх пакатацца. На той выпадак, калі ўсе апынуцца ў вадзе, ён паклаў у човен дошку і загадаў дзяўчатам зашпіліць чаравікі так, каб іх было лёгка скінуць у вадзе. А аднойчы ён завёз іх на другі бок затокі, дзе на старажытнай сцяне была выява Флемінга, якога называлі Нячысцікам. Казалі, што яго забілі чароўнай стралой на Чортавай дарозе ў Лоўхісаары. Вядома ж, тая карціна магнітам прыцягвала да сябе дзяцей, бо яны жылі ў адным з дамоў таго самага Флемінга. І ніхто не хацеў верыць, што чорта няма, раз ёсць ягоная выява.

Гаспадыня той сядзібы, старая дзева, піла каву на верандзе, калі да берага падплыла шумная кампанія. Яна пачаставала іх

кавай і павяла паказаць сядзібу. Калі старая паненка прыйшла з імі да берага і пабачыла на чым прыехалі госці, яна жахнулася. Вецер мацнеў, і Густаў хацеў хутчэй адправіцца дадому, але гаспадыня не дазволіла. Яна загадала даросламу рыбаку адвезці іх на той бераг на вялікім баркасе.

Гэта вельмі абразіла дзяцей. Спачатку іх прынялі як дарослых і сапраўдных дваран – і раптам абыходзяцца, як з неразумнымі дзецьмі.

У тыя часы спорт яшчэ не быў шырока распаўсюджаны. Мала хто ўмеў плаваць. Маці Густава была зацятай плыўчыхай. Яна вадзіла дзяцей купацца і клапацілася, каб яны шмат часу праводзілі на вольным паветры і шмат рухаліся. Спалі яны на цвёрдых сенніках, мыліся халоднай вадой. Такое спартанскае выхаванне загартоўвала дзіцячую волю і адвагу.

Сын двараніна павінен быў умець ездзіць вершкі, паляваць і, паколькі сям'я жыла на ўзбярэжжы, хадзіць пад ветразямі. У Густава было і сваё ўласнае захапленне: ён збіраў паштовыя маркі і штампы.

Малодшыя браты Ёган і Аўгуст вельмі любілі яго і шчыра захапляліся, калі Густаву ўдавалася ўтварыць якое-небудзь штукарства.

Як і ўсе дваранскія дзеці, Густаў навучаўся дома пад наглядам швейцарскай гувэрнанткі да сямі гадоў. Потым яго паслалі вучыцца ў другім падрыхтоўчым класе ліцэя Бёёка ў Хельсінках. У гэтым самым ліцэі ўжо навучаўся ягоны старэйшы брат Карл. Бацька меў жытло ў Хельсінках, і дзеці жылі ў яго.

У школе Густаў паказаў поўную няздольнасць зжыцца са школьнымі ўмовамі. За гэта яго выключылі са школы на год. Тры дні запар ён разам двума таварышамі, якіх угаварыў далучыцца да акцыі, біў камянямі вокны . Такое было афіцыйнае абвінавачванне. Сам жа Густаў казаў, што ўсяго толькі адзін раз шпурнуў у вакно камень, дый тое на трэці дзень пасля моцнай падбухторкі з боку таварышаў. Маці лічыла, што з усіх траіх Густаў вінаваты найменей. Але нягледзячы на тое, пакаранне было жорсткім.

Погляд дырэктара ліцэя цалкам не супадаў з думкай графіні Манэргейм. Ён узяў пад увагу і ранейшыя паводзіны хлопчыка. Яго лічылі хуліганам і задзіракам. У класе Густаў ставіў сябе за



генерала і імкнуўся кіраваць і камандаваць іншымі хлопчыкамі, як рабіў гэта звычайна дома. І калі гэта было праўдай, дык слаба верыцца, што сярод тройцы, якая біла вокны, ён быў самым ціхім і бездапаможным, а не завадатарам усёй справы. А дырэктар меркаваў менавіта так. Тыя дзесяткі пакаранняў і спагнанняў, атрыманыя ім у кадэцкім корпусе, якія вялі да карцэра ці да забароны звальнення ў горад і ўрэшце прывялі да выключэння Манэргейма з корпуса, наводзяць на думку, што маці моцна памылялася адносна невінаватасці свайго сына.

Аднак графіня і не прасіла літасці, а завезла сына ў Лоўхісаары. Яна палічыла за лепшае забраць сына з непрыязнага асяроддзя, таму што абураны несправядлівасцю хлопчык мог стаць яшчэ болей непакорлівым і агрэсіўным.

Усю вясну 1880 года Густаў правёў у Лоўхісаары або ў фальварку Сялвік, непадалёк ад Таммісаары. Ён паводзіў сябе амаль бездакорна, што вельмі здзіўляла родзічаў і выклікала пачуццё палёгкі: значыць, хлопчык не меў ад прыроды заганнага, а таму непапраўнага характару.

Наступным ходам у гэтай гульні стала адпраўка Манэргейма да родзічаў ў горад Хаміна. Яго аддалі ў тамтэйшую школу для падрыхтоўкі да паступлення ў кадэцкі корпус, а гэта было нялёгка. У гэтай рэальнай вучэльні Густаў правучыўся два гады, бо аднаго года было мала. Жыць яго ўладкавалі ў сям'ю Прасторавых, вядомую сваімі строгімі правіламі. Жонка была фінскай кабетай, а галава сям'і – адстаўны рускі капітан. Муж ніколі не прамаўляў ні слова, жонка ж малацілa бесперапынна. У жніўні 1944 года за абедам у Стаўцы, Манэргейм расказваў пра тую пару свайго жыцця. У сям'ю Прасторавых адсылалі на пастой самых недысцыплінаваных і непакорлівых навучэнцаў, што, аднак, ніякім чынам не ўплывала на іхнія паводзіны. Гаспадыня клапацілася пра тое, каб яе падапечныя кожны дзень клаліся спаць а дзевятай гадзіне ўвечары, аднак аб адзінаццатай хлопчыкі ўжо гойсалі па горадзе. Калі капітан памёр, хлопчыкі адкрыта радаваліся, што на хатурах была смачная ежа.

Мінулай восенню сям'я Манэргеймаў развалілася канчаткова, што азначала ганьбу ў вачах арыстакратычных колаў Фінляндыі і страту сацыяльнага статусу. Бацька Манэргейма давёў справы да

поўнага банкруцтва і ўцёк у Парыж з дачкой генерала Нордэнстама, фрэйлінай імператрыцы. Члены сям'і казалі ўсім, што граф вынайшаў нешта важнае ў галіне кансервавання прадуктаў і паехаў у Францыю, каб там гэта прадаць.

Бацька патраціў усю сваю і жончыну маёмасць, прадаўшы адзін за адным дамы, сядзібы і маёнткі, і пакінуў 800000 марак доўгу, у асноўным за картачныя гульні. Ён нічога нікому не стаў тлумачыць, а кінуў усё ў заблытаным стане і ўцёк у Парыж. На жончыны лісты ён не адказваў, і пра яго не было ніякіх звестак.

Сям'я і родзічы, якія засталіся дома, спрабавалі ўратаваць што толькі можна. Лоўхісаары прадалі незамужняй сястры графа Вільгельміне, якая пазычыла грошы на пакупку ў Аўроры Карамзіной. Рухомую маёмасць, у тым ліку мастацкую калекцыю графа, пусцілі з малатка. Маёмасць з хельсінкскага дома пацiху прадалі за бесцань. Такім чынам удалося заплаціць 260000 марак неадкладнага доўгу.

Маці забрала з сабою чатырох дзяцей і паехала ў Сялвік. Старэйшы сын Карл па-ранейшаму вучыўся ў Хельсінках. Старэйшая з усіх дзяцей, Соф'я, жыла ў Стакгольме ў цёткі Ганны, а Густава адаслалі паступаць у танны кадэцкі корпус у Хаміне.

Маці збіралася адкрыць у Таммісаары школу і выкладаць там разам з дачкой Соф'яй. Аднак з таго плана нічога не выйшла. Тады яна пачала пісаць артыкулы для шведскіх газэтаў і рабіць для іх пераклады з французскай мовы. Яна была ў прыгнечаным стане, пастаянна адчувала нейкія страхі. Яна баялася ваўкоў і кожную ноч прыводзіла ў спальню старога вартавога сабаку.

Казалі, што Гэлена Манэргейм была хворая фізічна і душэўна. 23 студзеня 1881 года яна нечакана памерла ад сардэчнага прыпадку. У арыстакратычных колах і ў колах буйной буржуазіі таго часу банкруцтва, падобны да фарсу любоўны трохкутнік на французскі манер, уцёкі ад жонкі з другой жанчынай – усё гэта азначала сацыяльную смерць пакінутай жонкі, яе ізаляцыю і поўны байкот. Гэта яна і мела на ўвазе, калі пісала сястры мужа ў Стакгольм, што чалавека можна давесці да смерці маўчаннем.

За два дні да пахавання ў доме з'явіўся ўцёклы муж. Карл і Густаў кінуліся бацьку на шыю, іхняму прыкладу паследавалі і астатнія дзеці. Увесь першы вечар бацька праплакаў разам з сынамі. На пахаванні труну неслі бацька, Карл і Густаў. Яму было тады 13 гадоў. У такім узросце смерць яшчэ не ўспрымаецца як нешта рэальнае і непазбежнае. Праз два месяцы Густаў прыехаў з Хаміны ў Хельсінкі. Да Порваа ён дабіраўся на конях, а потым да Хельсінкаў – на цягніку. У лісце да сястры Соф'і ён апісвае пачатак свайго падарожжа:

«З маім таварышам па жытлу мы а палове пятай выехалі з Хаміны на конях з п'яным фурманам, пачалі спяваць, і гэта доўжылася ўсю ноч, потым памянялі коней, я ўзяў лейцы, і мы панесліся далей. Зноў памянялі коней. Вазніца нам трапіўся жвавы, сані аднойчы перакуліліся, як мы даганялі дзяўчат з жаночай школы, і так, не спыняючыся, даехалі да Ловіісы. Падмацаваліся і паехалі далей, але гэты вазніца ехаў ужо толькі ціхім крокам. Зноў памянялі коней і паімчаліся наперад. Новыя коні несліся штодух, і мы зноўку перакуліліся, а калі дабраліся да Порваа, дык выглядалі як апошнія валацугі».

Гэты ліст малюе яскравую карціну падарожжа ў той час. Перад намі паўстаюць постаці двух маладых хлопчыкаў, якія не дасягнулі нават юнацкай сталасці. Яны бесклапотна радуюцца такой прыгодзе радасцю маладых бестурботных гадоў.

Сястра Соф'я пазней расказвала, што яны з Густавам моцна пакрыўдзілі фон Юліненаў тым, што першымі з дзяцей пачалі наведваць бацьку, калі той вярнуўся ў Фінляндыю. На аснове таварыскасці, якая пазней перарасла ў сяброўства, паміж бацькам і імі ўзніклі даверлівыя адносіны. Стаўшы дарослым, Густаў пісаў яму як таварышу, а не як бацьку. Нібыта падміргваючы, ён пісаў бацьку пра мужчынскія справы, распавядаў розныя саркастычныя гісторыі пра афіцэраў, іхнія п'янкі і гарэзаванні, намякаючы нават на прыгоды з жанчынамі. Бацьку так пісаць было няможна ні тады, ні пасля. Проста ён ужо страціў для сына сваё бацькоўскае становішча і аўтарытэт. Пазней Густаў знайшоў мацнейшы аўтарытэт у асобе цара, у дзяржаве, у законе і ў строга саслоўным грамадстве. І яго надзіва доўгачасовая і трывалая залежнасць ад самадзяржаўнай дынастыі Раманавых выразна паказвае, чый аўтарытэт умацоўваўся за кошт страчанага бацькоўскага аўтарытэту.

Да таго, як збанкрутаваць, бацька спрабаваў сябе на ніве прадпрымальніцтва. Разам з Альбертам фон Юліненам ён стварыў шмат

малых прадпрыемстваў, але галоўная дзейнасць развівалася ў галіне дрэваапрацоўкі. Усё гэта ён страціў у 1880 годзе.

Бацька ажаніўся з каханай жанчынай і вярнуўся ў Фінляндыю. У 1887 годзе ён заснаваў таварыства, якое пасрэднічала ў самых разнастайных здзелках, але потым засяродзілася на продажы канторскага абсталявання і мэблі. У 1909 годзе гэта было ўжо саліднае прадпрыемства пад назвай «Сістэма», якое імпартавала ў Фінляндыю друкарскія машынкі і арыфмометры.

Бацька карыстаўся рэкламай на амерыканскі манер. Ён з'ездзіў у Амерыку нібыта дзеля таго, каб заснаваць там прадпрыемства, якое прынясе хуткі эканамічны поспех. На самой жа справе, ён ездзіў туды, каб сарваць добры куш. Пры гэтым ён верыў, што ўдасца выйграць, гуляючы ў тамтэйшыя латарэі. Ён усё яшчэ заставаўся азартным гульцом, гатовым на злом галавы кінуцца ў небяспечную гульню. Кажуць, што праз гэта ён напачатку і разарыўся.

І ўсё ж потым бацька змог навесці парадак у справах і нават забагацець. У новай яго сям'і нарадзілася дачка Магерыт, з мужам, сынам і свёкарам якой Манэргейм ахвотна супрацоўнічаў у 1918 годзе і пазней. Мужа зводнай сястры звалі Грыпенберг. Графу не ўдалося дасягнуць якога–небудзь значнага сацыяльнага і палітычнага становішча, але ён да таго і не надта імкнуўся. Як прадстаўнік свайго дваранскага роду ён удзельнічаў у рабоце сейма і быў узведзены ў званне камер-юнкера.

## Кадэцкі корпус

Вучоба ў нармальных кадэцкіх корпусах у Расеі доўжылася дзевяць гадоў. Дзяцей аддавалі туды ў дзесяцігадовым узросце. Ва ўсёй імперыі было толькі дзве падобныя навучальныя ўстановы, дзе навучанне ішло сем гадоў: Пажскі корпус у Пецярбургу і кадэцкі корпус у фінскім горадзе Хаміна, або, як тады яго называлі, Фрыдрыксхамне. Туды залічвалі дзяцей, якія дасягнулі дванаццацігадовага ўзросту. Яны павінны былі валодаць ведамі ў аб'ёме двух класаў гімназіі. Уступныя іспыты ў кадэцкі корпус у Хаміне сталі нашмат болей жорсткімі, бо выявілася, што навучэнцам цяжка за сем гадоў набыць тыя веды і навыкі, якія патрабаваліся ў Расеі. Прычына ляжыць на паверхні: кадэты павінны былі



дасканала вывучыць рускую мову раней, чым пачаць паўнацэнную вучобу і вывучэнне спецыфічных ваенных прадметаў. Такім чынам, уступныя экзамены ў кадэцкі корпус былі такімі жорсткімі, што здаць іх мог толькі той, хто меў адукацыю не мней чатырох класаў гімназіі. У выніку кадэтамі станавіліся на два гады пазней, чым гэта было вызначана правіламі. Манэргейм стаў кадэтам, калі яму споўнілася 15 гадоў. Гэтыя дадатковыя два гады стваралі навучэнцам перашкоду – гэта закранула і Манэргейма, – калі яны хацелі пасярод вучобы ў кадэцкім корпусе перавесціся ў Пажскі корпус. У адносінах да перарасткаў-фінаў рабілі выключэнні з правілаў, якія абмяжоўвалі ўзрост.

У кадэцкім корпусе Манэргейм вучыўся на казённы кошт. Жыць ён павінен быў у казарме. Паветра ў памяшканні было задушлівае, харчаванне кепскае і таннае: хлеб, бульба ды селядзец. Падымалі кадэтаў у 5.45. Манэргейм пакутаваў ад пастаяннага жыцця ў натоўпе, гэта мучыла яго і пазней. Малады кадэт з захапленнем і радасцю пісаў пра пахаванне свайго камандзіра, гвардыі паручніка Бэрга. Паколькі гэтае пахаванне было ваенным, дык кадэтам упершыню далі па кубачку кавы і абаранку – на хаўтурах. Бэрг застрэліўся.

Манэргейм учыняў смелыя, а часам і небяспечныя выхадкі. Аднойчы ў прысутнасці карпуснога лекара ён пачаў яго перакрыўляць, завёўшы малітоўным тонам: «Та-а-ак, ну, усё ясна, гэта пачатак цяжкай хваробы, але ж я, вядома, магу прыняць лыжачку касторкі, а праз дзве гадзінкі – ірвотны парашочак, а потым гарачы кампрэсік на жывоцік, потым звычайнай міктуркі і прапаласкаць горла, не пашкодзіць і памыць ногі халоднай вадой, памазаць каленкі ёдам і абавязкова інжырная прымочка, а там, глядзіш, пасяджу у казарме суботу ды нядзелю, а да панядзелка і папраўлюся». Тады яму было 18 гадоў.

Лекар злаваўся і тупаў нагой.

У адпачынак Манэргейм ездзіў у Лоўхісаары. Ён з задавальненнем пакідаў сцены корпуса. Спачатку ён пачуваў сябе там самотна, вакол былі чужыя і незнаёмыя людзі, а горад здаваўся проста кратовай дзюркай. З цягам часу ён асвойтаўся і пазнаёміўся з таварышамі. Некаторыя лічылі яго занадта ганарыстым і халодным. Але ж трэба ўзяць пад увагу, што на пачатку вучобы ён

толькі ўступаў у перыяд палавой спеласці. Гэтым і тлумачыцца тое, што хлопец увесь час стараўся вызначыцца і парушаў дысцыпліну. Ён не хацеў падпарадкоўвацца дробязным фармальнасцям жорсткай дысцыпліны і паводзіў сябе, нібы малое дзіцё. Ён быў яшчэ дзіцём, але ўжо і юнаком. Падчас адпачынку ў Лоўхісаары ён наведваў родзічаў і знаёмых, удзельнічаў у агульных забавах, танчыў, ездзіў вершкі і плаваў на яхце. У той жа час ён спазнаў пакуты першага захаплення дзяўчатамі.

У 1883 годзе Манэргейм быў найлепшым курсантам у сваім класе і меў агульны бал 9,5 з дванаццаці магчымых. З дванаццацібальнай сістэмы адзнакаў практычна ўжываліся толькі пяць верхніх. Увесну 1884 года ягоны бал склаў 9,4.

З паводзінамі было значна горш. Прозвішча Манэргейма ўвесь час згадваецца ў кандуіце, але парушэнні былі самыя звычайныя. Выдаў пісьмовае заданне прыяцеля за сваё. Вінаваты ў падмане. Размаўляў на ўроках, шумеў на ўроку танцаў, ленаваўся, быў няўважлівы, выскачыў з акна класа, пачуўшы сігнал агульнага збору, учыніў лямант у шпіталі, ужываў грубыя выразы ў класе, за што атрымаў двое сутак карцэра. Прапусціў урок танцаў, нібыта з-за нарыву на назе, але з’явіўся на ўрок гімнастыкі цалкам здаровы. Разам з прыяцелем пабіў малодшага кадэта. Ён часта бываў у карцэры. Каб неяк прабавіць час ён карыстаўся старым сродкам, які прыдумалі ў адным з кадэцкіх корпусаў у Швецыі: рабіў з хлеба маленькія шарыкі, раскідваў іх па падлозе і стараўся ўсе знайсці, што было нялёгка ў цёмным памяшканні.

Сваякі былі ў жаху. Бабуля пісала да матчынай сястры ў Стакгольм, што хлопчыка чакае змрочная будучыня. У яго няма пачуцця гонару і не хапае розуму, каб паклапаціцца аб сваім развіцці, закончыць кадэцкі корпус і такім чынам пачаць самастойнае жыццё, як гэта і належыць небагатым хлопчыкам.

Больш за ўсё сям’ю палохала, што Густаў не ўмеў належным чынам весці грашовыя справы. Сваякі баяліся, што Густаў пойдзе па слядах свайго бацькі. Увесну 1884 года выявілася, што Густаў патраціў усе грошы на ласункі і яшчэ хто ведае на што, а цяпер сядзіць без сродкаў з доўгам 163 маркі. Спачатку ён звярнуўся да бацькі, але той адказаў, што дапамагчы нічым не можа, і параіў папрасіць дапамогі ў матчынага брата, дзядзькі Альберта. Густаў



папрасіў пазычыць 170 марак і абяцаў аддаць з першага заробку. Ён сказаў, што ад сораму ледзь адважыўся напісаць такі ліст і прасіў дзядзьку нікому не казаць пра іхнія грашовыя справы.

Альберт доўга ўшчуваў, папракаў, даваў мудрыя і нудныя парады, але грошы прыслаў. Ён заклікаў Густава калегаваць з беднымі кадэтамі і пазбягаць багатых, бо тыя прабаўляюць час у непатрэбных і шкодных забавах. Аднак трэцюю і найбольш небяспечную групу складаюць тыя, што, не атрымліваючы з дому нічога, легкадумна пазычаюць грошы ў сяброў і трацяць іх на пустыя і марныя ўцехі. Грошы збіраюцца цяжкаю працай. Калі ж няма магчымасці скарыстаць вынік працы продкаў − трэба працаваць самому. І толькі тады, калі ашчадна карыстаючыся грашыма, збярэш суму, якая перавышае твае першасныя патрэбы, − толькі тады можаш траціць грошы як хочаш.

Дзядзька Альберт абяцаў эканамічную дапамогу, аднак выстаўляў свае ўмовы. Ён будзе прысылаць грошы, калі Густаў не зможа атрымаць іх ад бацькі, калі Густаў ніколі не будзе лезці ў пазыкі, а тыя грошы, што атрымае ад дзядзькі, скарыстае на добрыя мэты.

Густаў адпісаў, што не ўпэўнены ў сваёй здольнасці і магчымасці выканаць усе пастаўленыя дзядзькам умовы, асабліва ўмову ніколі не пазычаць грошай. Ён, вядома, мог бы адважыцца паабяцаць, што паспрабуе не браць пазыкаў. Але ж, паколькі ён не цалкам упэўнены, дык і не можа абяцаць таго цвёрда.

Такім чынам ён паказаў, што ў яго ёсць і пачуццё гонару, і сумленне, пра што пісаў яму Альберт, напамінаючы пра стараннасць і прыстойнасць, незалежна ад становішча ў свеце.

Рэдка хто з навічкоў, пачынаючы вайсковы шлях, задумваўся пра вакансіі ў службе ды іншыя фактары, якія маюць уплыў на кар’еру. Густаў пра гэта задумаўся і прыйшоў да высновы, што магчымыя ваенныя страты будуць не такія ўжо і вялікія, каб перад выпускніком кадэцкага корпуса ў Хаміне адкрыўся прамы шлях да хуткага росту ў службе. Ён пачаў думаць пра паступленне ў рускую вайсковую вучэльню. Многія выхадцы з Фінляндыі пайшлі такім шляхам і мелі вялікія поспехі. Але тут былі дзве перашкоды. У яго не было выдатнай адзнакі па паводзінах. Другой перашкодай было безграшоўе. У Хаміне ён вучыўся на казённы кошт, а ў Пецярбургу за вучобу трэба было плаціць.

Бацькавы сваякі, фон Шанцы, падтрымалі ідэю паступлення ў Пажскі корпус. Радзіна пусціла ў ход свае сувязі ў Пецярбургу, і Густаў паспяшаўся паведаміць дзядзьку Альберту, што месца ў Пажскім корпусе яму забяспечанае. Навучанне ў корпусе каштавала 500 марак за год. Густаў сказаў, што намерваецца ўзяць пазыку ў банку, каб не прасіць грошай у фон Юлінаў. Атрымаўшы афіцэрскі чын, ён будзе паступаць у акадэмію Генеральнага штаба. Пасля заканчэння акадэміі ён атрымае месца ў Генштабе і добрае жалаванне, якога хопіць, каб вярнуць пазыку.

У Пажскі корпус прымалі толькі дзяцей дваранаў, чые продкі на працягу трох пакаленняў вызначыліся ў дзяржаўнай службе. Практычна гэта азначала, што паводле расейскай Табелі аб рангах яны павінны належаць прынамсі да трэцяга класа. Гэта ў сваю чаргу азначала, што бацькі кандыдата павінны мець чын генерал-лейтэнанта, або па цывільных адпаведніках – таемнага дарадцы. Манэргеймаў бацька меў званне камер-юнкера, што адпавядала чыну падпалкоўніка. Бацька ў лісце з Парыжа ў Пецярбург пісаў, што хоць сам ён не мае высокага чына, але ягоныя продкі мелі высокія званні і заслугі ў дзяржаўнай службе. У Пецярбургу прызналі, што сям'я і род Манэргейма цалкам адпавядае нормам і правілам, і гэтае пытанне ніколі больш не ўздымалася.

Дзядзька Альберт высветліў практычны стан рэчаў. Найперш ён звярнуў увагу на памер жалавання і выдаткі на навучанне – карацей, на грашовы бок справы. Гвардзейскі афіцэр не можа пражыць на сваё жалаванне. У дадатак да 500 марак гадавых, трэба мець што-небудзь яшчэ. Альберт ды іншыя члены сямейства фон Юлінаў запрацівіліся паступленню ў Пажскі корпус. Яны не верылі, хто ў хлопца дастаткова характару дзеля такой справы. Ён не вытрымае напружання, ён схільны да пустых забаваў, дый апроч таго, яму пагражае абрусенне. А калі Манэргеймы – мужчыны і жанчыны – плануюць жыццё Густава ў гэтым кірунку, дык хай самі і плоцяць за навучанне і жыццё ў сталіцы. На думку фон Юлінаў, Густаву варта заставацца ў кадэцкім корпусе ў Хаміне. Адсюль ён у любым выпадку зможа трапіць у войска Вялікага княства Фінляндскага.

Перашкоды на шляху Манэргейма з Хаміны ў Пецярбург ставіліся тут, а не ў расейскай сталіцы. Дырэктар кадэцкага корпуса не



жадаў даваць яму рэкамендацыю ў Пажскі корпус. У пасведчанні за кастрычнік 1884 года Манэргейм меў агульны бал 9,3. З чацвёртага месца ў класе ён перайшоў на трэцяе. Ён меў вялікія здольнасці і шмат працаваў. Нават паводзіны ацэньваліся на «добра». Дырэктар корпуса паабяцаў даць яму рэкамендацыю ў Пецярбургскі пажскі корпус. Аднак Густаў павінен быў атрымаць афіцыйны выклік ад статс-сакратара Фінляндыі ў Пецярбургу. Густаў папрасіў свайго добрага знаёмага нагадаць пра гэта самому статс-сакратару. Ён з нецярпеннем чакаў, калі прыйдзе выклік. І ўжо праз тыдзень пасля ліста з запрашэннем быў гатовы абтрэсці пыл Хаміны са сваіх ног.

Дырэктар кадэцкага корпуса не паставіў Густаву вышэйшай адзнакі па паводзінах. Адзнакі «добра» было недастаткова. Трэба было, каб стаяла «выдатна». Дырэктар не саступіў і рэкамендацыі не даў. У выніку Густаў застаўся ў Хаміне, але прыгразіў, што пойдзе ў маракі.

Увесну 1886 года стала канчаткова зразумела, што Густаву давядзецца застацца ў кадэцкім корпусе, а потым пайсці служыць у адну з фінскіх вайсковых частак. Гэта былі Фінскае гвардзейскае падраздзяленне ў Хельсінках, драгунскі полк у Лапеенранце і стралковыя батальёны – па адным у кожнай губерні Вялікага княства Фінляндскага. А Манэргейму тым часам споўнілася 19 год. Гэта было зашмат для паступлення ў Пажскі корпус.

Густаў не затрымаўся з рэакцыяй. Ці то свядома, ці то не, але ён зрабіў парушэнне, за якое яго выключылі з кадэцкага корпуса. Ён сам выправіў становішча. Калі яму не далі ажыццявіць варыянт з Пецярбургам, дык варыянт з Фінляндыяй ён адрынуў сам. Ён паводзіў сябе як чалавек у глыбокай роспачы. А ён жа так стараўся! Дзякуючы сваёй упартай працы, ён стаў адным з першых вучняў у класе. Але выкладчыкі лічылі яго непапраўным. У кандуіце ўвесь час з'яўляюцца запісы аб спагнаннях. Ён засмяяўся ў адказ на заўвагу выкладчыка. З наступленнем ночы ён разам з двума прыяцелямі ўцёк з казармы і паехаў у прадмесці Выбарга. Нешта мармытаў на ўроку. Дапамог прыяцелю выканаць пісьмовае заданне. У вузкіх межах дробязнай карпусной дысцыпліны існаваць ён болей не мог.

24 красавіка 1886 года Густаў без дазволу пакінуў казарму, не

дачакаўшыся вячэры, узяў коней і паехаў за горад. Ягоны прыяцель Віднес зрабіў ляльку і паклаў яе ў ложак, каб адсутнасць Густава не кідалася ў вочы, але дзяжурны, капітан Хедлунд, заўважыў і склаў рапарт аб самавольнай адлучцы Манэргейма. Манэргейма зараз жа выключылі з корпуса, і тым самым днём ён мусіў пакінуць Хаміну. Кадэт Віднес за саўдзельніцтва ў парушэнні атрымаў двое сутак карцэра. У дадатак яго пазбавілі звальнення на Велікодныя святы.

Нашмат пазней, калі Манэргейм быў камандзірам 2-й гвардзейскай кавалерыйскай брыгады, яго запрасілі на штогоднае свята Літоўскага гвардзейскага палка, якім камандаваў Хедлунд – да таго часу ён таксама даслужыўся да генерала. Прамаўляючы тост у гонар Манэргейма, Хедлунд сказаў, што Манэргейм праславіў Фінляндыю, дасягнуўшы такога высокага чыну ў рускай арміі. Манэргейм сказаў тост у адказ. Ён падзякаваў Хедлунда за тое, што ён такім рашучым чынам паспрыяў ягонаму выключэнню з кадэцкага корпуса, а тым самым і ягонай бліскучай ваеннай кар'еры.

Тады ўжо можна было жартаўліва ўспомніць мінулае і пазабавіць гасцей.

Куды Манэргейм уцёк з казармы і што рабіў у самаволцы – невядома. Адны казалі, што ён быў у свайго знаёмага і так напіўся, што вярнуцца ў казарму ноччу не змог. У маладосці Манэргейм не цярпеў гарэлкі. Ягоны страўнік быў тады занадта далікатны. Другія сцвярджалі, што ён правёў ноч з жанчынай. Пакаранне было занадта жорсткім. Манэргейму было тады 19 год, і да выпуску з кадэцкага корпуса заставалася ўсяго нічога.

Паколькі невядома, што рабіў Манэргейм падчас сваёй самавольнай адлучкі і дзе правёў ноч, можна лёгка ўявіць, што ён займаўся чым-небудзь ганебным і вартым асуджэння. Раптоўнае яго выключэнне з корпуса і хуткая высылка з Хаміны якраз і сведчаць на карысць такой думкі.

З корпуса яго выключылі па загадзе новага дырэктра, генерала Карла Энкеля. У яго было два сыны, Карл і Оскар. Калі аднойчы хлопчыкі гулялі на двары ў снежкі, кадэт Манэргейм падышоў і загаварыў з імі. Ён спытаўся, хто іхні бацька. Пачуўшы, чые гэта былі дырэктаравы сыны, ён загадаў перадаць «прывітанне дзядку ад кадэта Манэргейма». Гэта была дзёрзкая і неразумная выхадка.



Выключэнне з корпуса было для яго моцным ударам. Манэргейм параўноваў гэта з дзвюма іншымі няўдачамі, якія проста нельга было забыць: адстаўку з паста галоўнакамандуючага напрыканцы мая 1918-га і правал на прэзідэнцкіх выбарах у 1919 годзе.

Жыццё дало яму магчымасць узяць рэванш нават тры разы. У канцы 1918 года яго выбралі рэгентам Фінляндыі. Разгром Нямеччыны ў Першай сусветнай вайне паказаў памылковасць палітычнага курсу Свінхувуда і Паасківі і пацвердзіў слушнасць планаў і кірунку дзейнасці Манэргейма. Улетку 1944 года той жа парламент абраў яго прэзідэнтам. Трэці рэванш быў болей сціплы, але болей значны ў асабітым плане. Той самы генерал Карл Энкель пасля грамадзянскай вайны абвясціў яго ганаровым кадэтам корпуса.

Да сыноў генерала Энкеля ён двойчы звяртаўся ў крытычныя моманты сваёй дзейнасці. Карл Энкель падчас ягонага рэгентцва ў 1918 годзе стаў міністрам замежных справаў, гэтаксама як і пасля Другой сусветнай вайны, калі Манэргейм зноў стаў на чале дзяржавы, але гэты раз ужо ў якасці прэзідэнта. Брата Карла Энкеля, Оскара, ён запрасіў з Турцыі ў фінскую армію і яго ж пасылаў у Маскву на перамовы аб перамір'і ў канцы лета 1944 года. Калі прэм'ер-міністра Хакцэліна ў Маскве разбіў паляруш, кіраўніком дэлегацыі Манэргейм прызначыў міністра замежных справаў Карла Энкеля. У тую дэлегацыю уваходзіў і маёр Георг Энкель. Такім чынам у Маскву паехала шмат Энкеляў. Калі Манэргейму прапанавалі ўключыць у склад дэлегацыі яшчэ і генерала Карла Энкеля, ён адказаў, што Энкеляў болей не трэба. Можа, у тым жаданні Манэргейма трымаць пры сабе абодвух братоў Энкеляў, сыноў чалавека, які парушыў ягоную ваенную кар'еру ў Фінляндыі, хавалася непераможная прага з упэўнасцю давесці, што ён змог такі ўзяць рэванш. Можа, ён расцягваў задавальненне. А можа, хацеў такім чынам папрасіць прабачэнне ў старога генерала за прыніжэнне, якое Энкель-бацька, мусіць, перажываў, калі выкінуты ім з кадэцкага корпуса маладзён стаў легендарным палкаводцам і кіраўніком дзяржавы. А можа, Манэргейм, чалавек тонкі і далікатны, дэманструючы сваю прыхільнасць да сыноў генерала, хацеў паказаць таму, што злосці на яго не трымае. У ста-

сунках з людзьмі Манэргейм быў вельмі разанастайны, умеючы наладзіць іх на самых розных узроўнях.

Дзядзька Альберт раіў Густаву паступіць ва ўніверсітэт і пайсці па цывільнай службе. Манэргейм паспрабаваў паступіць у рускую гімназію ў Хельсінках, але не змог наладзіць сувязі з чалавекам, які мог бы гэта арганізаваць. Той увесь час быў то ў саўне, то на крутым падпітку, асабліва калі патрабавалася сустрэцца і абмеркаваць справу. Гэтай справай па чарзе займаліся брат і хросны, потым сам Густаў, але беспаспяхова.

Тады Манэргейм пачаў стукацца ў рускія вайсковыя вучэльні. Ён аддаваў перавагу марской кар'еры. Сваякі з матчынага боку, якія мелі сувязі пры імператарскім двары і выхады на высокапастаўленых афіцэраў, пачалі хадайнічаць за Густава.

Альтэрнатывай марской вучэльні была Мікалаеўская кавалерыйская вучэльня. Манэргейм схіляўся да першага варыянту, бо ён быў выгаднейшы ў эканамічнымі плане.

У чэрвені 1886 года Манэргейм разам з дзядзькам Юннэ фон Юлінам адплылі да Пецярбурга. Дзядзька валодаў у Турку верфямі, на якіх размяшчаліся заказы рускага ваеннага флоту. Яны наведалі канцылярыю вайсковай марской вучэльні, а потым накіраваліся да статс-сакратара Фінляндыі ў Пецярбургу, барона Бруна, які меў права рэзерваваць некалькі месцаў у такіх вучэльнях. Барон успомніў, што некалі раней ужо браняваў месца для Манэргейма ў Пажскім корпусе. Успомніў ён і пра тое, што малады чалавек не адпавядаў нормам, бо не меў выдатнай адзнакі па паводзінах. Для вайсковай марской вучэльні таксама патрабавалася пасведчанне з кадэцкага корпуса, а там была дрэнная адзнака па паводзінах, і гэтую перашкоду абысці было ніяк нельга.

Юннэ фон Юлін правёў некалькі начэй у роздуме пра лёс свайго пляменніка і вырашыў, што лепш за ўсё хлопцу стаць інжынерам. Ён быў дзелавіты і разумны, меў схільнасць да матэматыкі. Дзядзька Юннэ напісаў ліст да Эдварда Бэргенгейма, які быў дырэктарам завода керамічных вырабаў у Харкаве. Ён прасіў вызначыць, ці падыходзіць Густаў да працы ў гэтай галіне, і абудзіць у хлопца цікавасць да гэтай прафесіі. У хуткім часе на інжынераў чакаўся вялікі попыт, бо прамысловасць Расеі імкліва развівалася.



Густава гэтая ідэя не запаліла. Ён хацеў паступаць у афіцэрскую вучэльню, здаўшы ўніверсітэцкія іспыты ў Расеі. Але тут узнікла новая перашкода: ён не ведаў лацінскай і грэцкай моваў. У кадэцкім корпусе вывучалі толькі новыя мовы і рэальныя прадметы. У гэтых адносінах корпус быў сучаснай навучальнай установай.

Быў і другі шлях трапіць у вучэльню − паступіць добраахвотнікам у рускую армію і праслужыць два гады простым салдатам. Добраахвотнікі падзяляліся на дзве катэгорыі. Да першай адносіліся тыя, што закончылі якую-небудзь вышэйшую тэхнічную навучальную ўстанову або правучыліся чатыры гады ва ўніверсітэце. Да другой − тыя, што прайшлі паглыблены курс расейскай гісторыі, геаграфіі і літаратуры. Але ў любым выпадку патрабавалася дасканала валодаць рускай мовай, чым Манэргейм не вызначаўся.

У глыбіні душы Манэргейм ужо выбраў для сябе Мікалаеўскую кавалерыйскую вучэльню. Навучанне там доўжылася два гады, і выпускнікі атрымоўвалі добрыя месцы ў рускай арміі. За курс навучання плата была 1600 рублёў. Потым выпускнікі атрымлівалі 225 рублёў на абмундзіраванне. А адслужыўшы два гады ў арміі, яму давялося б заплаціць 1200 рублёў, ўсяго на 175 рублёў менш. Нязначная розніца. Манэргейм вырашыў паступаць у Мікалаеўскую кавалерыйскую вучэльню праз год, увосень 1887 года.

Каб мець магчымасць пазаймацца і вывучыць рускую мову, ён паехаў да Бэргенгейма і спыніўся ў вайсковым лагеры непадалёк ад Харкава. Бэргенгейм сам скончыў кадэцкі корпус у Хаміне і захаваў пра яго нядобры ўспамін, а таму вельмі добра разумеў Густава. Манэргеймавы паводзіны яго ўразілі. Тое, што ён назіраў, цалкам разыходзілася з тым, што яму расказвалі пра Густава. Насуперак усім меркаванням малады чалавек уважліва і ветла ставіўся да ўсіх, меў добрую галаву і жвавы характар. Вядома, Бэргенгейм меў пэўныя падазрэнні наконт легкадумнасці хлопца, але тлумачыў усё ўплывам колішняга кадэцкага асяроддзя. Ён памятаў, што кадэты ў Хаміне толькі гулялі ў карты, учынялі бойкі і паводзілі сябе распусна. Бэргенгейм з задавальненнем адзначыў стараннасць, працаздольнасць і нястомнасць у занятках.

У настаўнікі маладому Манэргейму ён выбраў капітана Сухіна.

Калі той выязджаў па службе на вучэнні, то заўсёды браў Манэргейма з сабой. Руская мова ў Манэргейма была – горш няма куды. Бэргенгейм не верыў, што Густаў зможа трапіць у другую катэгорыю добраахвотнікаў. А калі і зможа, дык усё роўна яму давядзецца правучыцца два гады ў юнкерскай вучэльні. Такім чынам, каб атрымаць афіцэрскі чын і месца ў якім-небудзь кавалерыйскім палку, спатрэбіцца не меней за тры гады. Бэргенгейм і Манэргейм разам ламалі галовы над усімі магчымымі варыянтамі. Адным такім варыянтам быў Хельсінкскі універсітэт.

Правёўшы з капітанам Сухіным два тыдні ў Чугуеўскіх вайсковых лагерах, Манэргейм пісаў дзядзьку Альберту, што руская армія страціла ў ягоных вачах свой бляск. Служба была да адурэння аднастайная, а плата мізэрная. Малодшыя афіцэры гвардзейскай кавалерыі таксама не маглі пражыць на сваё жалаванне. Генеральны штаб, куды Манэргейм марыў трапіць – але так ніколі нават не паспрабаваў, – ператвараў палкоўнікаў у звычайных лёкаяў. Падпаручнік атрымліваў 500-600 рублёў за год, ротмістр пасля 15-20 гадоў службы – 600-700 рублёў. Палкоўнік, г. зн. камандзір палка, атрымліваў ужо 4000 рублёў, але ў яго было шмат прадстаўніцкіх выдаткаў. Камандзір корпуса атрымліваў 7000 рублёў, але такіх паноў было толькі 19 ва ўсёй арміі.

Манэргейм скарыўся і вырашыў, што лепш за ўсё будзе паехаць у Хельсінкі, скончыць універсітэт і пайсці на цывільную службу. Ён намерваўся паехаць з братам Карлам у вёску Руовэсі і падвучыць фінскую мову, каб здаць універсітэцкія іспыты.

Пазней Манэргейм пісаў, што нягледзячы на ўсе адмоўныя ўражанні і сумны досвед, ён па-ранейшаму імкнуўся стаць афіцэрам. Аднак ажыццявіць гэты план было не так проста, таму што ў яго не было грошай. Так, карнэт драгунскага палка ў Чугуеве атрымліваў 200 рублёў за год. Частка грошай ішла на афіцэрскія вечарыны, прадстаўніцкія выдаткі, на афіцэрскую касу. На тыя ж 200 рублёў патрабавалася купіць вопратку, каня і ўтрымліваць іх у належным выглядзе.

Жалаванне ў рускай арміі было маленькае. Таму на афіцэрскіх пасадах былі ў асноўным прадстаўнікі памеснага дваранства, якія мелі добрыя даходы са сваіх маёнткаў. Так неўпрыкмет і напрамую абразліва маленькае жалаванне адсейвала з афіцэрскага корпуса прадстаўнікоў ніжэйшых класаў і тым самым замінала дэмакратызацыі арміі. Царскае самадзяржаўе атрымлівала адданы афіцэрскі корпус, бо іхнія інтарэсы цалкам супадалі.



Па дарозе дадому Манэргейм пазычыў грошай аднаму малодшаму афіцэру, які ехаў у Пецярбург. Той па прычыне поўнага безграшоўя мусіў бы застацца на нейкім паўстанку. У Пецярбургу Манэргейму давялося чакаць пяць дзён, пакуль той афіцэр аддаў яму грошы. Так на развітанне Манэргейм атрымаў яшчэ адно сведчанне таго, як мала плацілі рускім афіцэрам.

У Хельсінках ён падаў заяву ў той самы ліцэй, адкуль яго некалькі гадоў таму выключылі з падрыхтоўчага класа. Гэтым разам яго прынялі ў выпускны клас. Жанчыны сямейства лічылі Хельсінкі небяспечным, грахоўным і распусным месцам, а таму баяліся, што Густаў кінецца ў розныя спакусы. Аднак ён старанна займаўся. Самым цяжкім прадметам для яго была фінская мова. У кадэцкім корпусе фінскай мове не давалі належнай увагі, хоць афіцэры мусілі потым служыць і мець справу з фінскімі рэкрутамі. Гэта была звычайная карціна для вышэйшых класаў. Манэргейм знайшоў сабе прыватнага настаўніка і плаціў яму тры маркі за ўрок. Ягоны таварыш Альбэр дэ Шапэль даваў яму ўрокі бясплатна. Манэргейм падараваў яму сваю дзіцячую калекцыю штэмпеляў. Апроч таго, Манэргейм узяў 18 прыватных урокаў па трыганаметрыі і фізіцы, таксама па тры маркі за ўрок. Усяго 54 маркі, а ў тыя часы гэта былі вялікія грошы.

У канцы восені Манэргейм захварэў на тыф. Наступным годам хвароба паўтарылася. Сястра Соф'я даглядала яго і ўгаварыла паехаць дзеля ўмацавання здароўя да дзядзькі Альберта ў Фіскар. Ён быў у такім дрэнным стане, што хадзіць мог толькі з кіёчкам. На шчацэ ўтварыўся нарыў, давялося зрабіць аперацыю. Пасля рэцыдыву хваробы ўвосень, адной палачкі для хадзьбы стала недастаткова, і Густаву дапамагаў хадзіць ягоны стрыечны брат Ліндсей. Толькі напярэдадні Калядаў ён больш ці менш ачуняў. Хвароба забрала ў Густава шмат сілы і часу, якія былі так патрэбныя для вучобы.

Манэргейм баяўся, што праваліцца па фінскай мове, у той час, як шведскую ён здаў на выдатна. Але ўсё скончылася шчасліва – Густаў удала здаў усе іспыты. Пасведчанне з гімназіі было выдат-

ным. Дзядзька Альберт быў вельмі задаволены і чакаў, што пляменнік пачне вучыцца ва ўніверсітэце. Але Манэргейм зазначыў, што цяпер у яго ўзнікла магчымасць трапіць у рускую вайсковую вучэльню, бо выпускныя паперы былі ўсе добрыя. На кадэцкі корпус у Хаміне і на выгнанне адтуль можна было забыцца, ён болей не залежаў ад карпуснога пасведчання і адзнакаў. Яшчэ перад іспытамі Манэргейм пачаў ажыўляць свае сувязі са сваякамі і знаёмымі. Муж ягонай хроснай маці, генерал-маёр барон Гёста Амінаў камандаваў палком у рускай арміі. Манэргейм звярнуўся да яго па падтрымку і быў прыхільна прыняты ў гэтым сямействе. Праўда, у сям'і Амінавых склалася дрэннае думка пра бацьку Густава, але яны вельмі спачувальна ставілася да маці і хацелі дапамагчы сыну Гэлены. Сястра спадарыні Амінавай, баранэса Скалон, была замужам за стацкім саветнікам Міхаілам Пятровічам Скалонам дэ Каліны. Баранэса Скалон таксама была хроснаю Манэргейма, а ў тыя часы хросныя бацькі ставіліся да сваіх абавязкаў вельмі сур'ёзна і лічыліся блізкімі сваякамі.

Манэргейма запрасілі ў госці ў маёнтак Скалонаў у Курскай губерні. Баранэса прыкладала ўсе намаганні, каб хроснік трапіў у Мікалаеўскую кавалерыйскую вучэльню. Напярэдадні Купалля Манэргейм з'явіўся ў маёнтку Скалонаў. Яму толькі што споўнілася 20 гадоў. Маёнтак называўся Лук'янаўка. Тэлеграма, у якой Манэргейм паведамляў пра свой прыезд, прыйшла ўсяго за дзве гадзіны да самога прыезду, а таму ніхто на станцыі яго не сустракаў. Ён быў вымушаны восем гадзінаў трэсціся ў сялянскіх калёсах, каб адолець адлегласць у 70 кіламетраў. У дадатак да ўсяго яшчэ й ліў дождж.

У Лук'янаўцы было шматлюдна. Гаспадар, стацкі саветнік і губернскі маршалак, быў у ад'ездзе. У маёнтку заставаліся дачка барона ад першага шлюбу, прыгожая дзевятнаццацігадовая дзяўчына, спадарыня Скалон са сваімі дзецьмі ад папярэдняга шлюбу, чатырнаццаці і дзесяці гадоў, старая гувэрнантка, пятнаццацігадовы хлопчык, выхаванец гаспадара, малады юрыст з Харкава і яшчэ двое дзяцей ад другога шлюбу барона. Манэргейм увесь дзень размаўляў з імі па-руску, прычым тэма гаворкі і ўзровень мовы мяняліся ў залежнасці ад інтарэсаў і адукацыі суразмоўцаў. Калі стамляўся адзін, Густаў тут жа пераходзіў да другога. Апроч таго,



у маёнтку мелася выдатная рускамоўная бібліятэка. Манэргейм спяшаўся. Яму абавязкова трэба было добра вывучыць гэтую мову, і замест двух тыдняў ён правёў там цэлы месяц. Толькі пасля гэтага ён адправіўся ў знаёмыя мясціны – у Харкаў.

Дзядзька Альберт адмоўна паставіўся да ягонай затрымкі ў Лук'янаўцы. Ён разлічваў, што Густаў затрымаецца там толькі на пару дзён і адразу паспяшаецца ў Харкаў, дзе ў вайсковых лагерах усур'ёз зоймецца вывучэннем рускай мовы і ваеннай тэрміналогіі, каб потым паступіць у вучэльню, уладкаваць у якую яго штомоц старалася мноства ягоных арыстакратычных родзічаў. Магчыма, што дзядзька Альберт пачаў у пэўнай ступені адчуваць комплекс непаўнавартасці. Ён лічыў, што затрымка Манэргейма звязаная з атмасферай раскошы і сібарыцтва, што панавалі ў маёнтку, баяўся, што гэта дрэнна паўплывае на юнака, схіліць яго да лянотнага расліннага існавання і той не ўстоіць перад спакусамі салодкага жыцця.

Манэргейм з захапленнем пісаў пра сваю хросную маці, чароўную жанчыну, баранэсу Скалон. Ён пісаў, што баранэса вельмі клапацілася пра яго і прымушала есці так многа, што ён прыбавіў у вазе 15 фунтаў. Манэргейм сведчыў, што баранэса Скалон была мудрая, адукаваная і добрасардэчная жанчына – карацей, сапраўдная еўрапейская арыстакратка. Але на думку фон Юлінаў, рускасць была зусім не тым, што еўрапейскасць. Гэта выявілася самым забаўным чынам, калі Манэргейм ажаніўся з Анастасіяй. Уся радзіна ўздыхнула з палёгкай, калі на свае вочы ўбачыла і пераканалася, што маладая жанчына аказалася еўрапейскай дамай, а не рускай «матушкой-барыней».

Толькі брату Карлу Манэргейм пазней расказаў, што Бэргенгейм прыняў яго ў Харкаве даволі халодна. Бэргенгейм, як і дзядзька Альберт, быў бюргерам, які старанна працаваў і таксама падазраваў арыстакратаў у дэградацыі і амаральнасці. Бэргенгеймы яшчэ даволі доўга папікалі Манэргейма яго затрымкай у Лук'янаўцы. Манэргейм насмеліўся расказаць брату, што ў той час яму важней за ўсё на свеце была падтрымка, а ў Скалона меліся добрыя сувязі ў вярхах. Менавіта таму Густаў вырашыў дачакацца ў Лук'янаўцы гаспадара і прадэманстраваць яму свае фізічныя і разумовыя вартасці.

Скалоны і найдалей падтрымлівалі Манэргейма. Калі праз дваццаць гадоў Манэргейм служыў у Польшчы, адзін з сямейства Скалонаў быў там генерал-губернатарам і не даваў ходу рапартам жандараў, у якіх яны паведамлялі пра ягоную недабранадзейнасць.

Хутчэй за ўсё, Манэргейм меў на ўвазе менавіта Скалона, калі аднойчы за абедам у Стаўцы расказаў анекдатычны выпадак з генерал-губернатарам. Гэта была, напэўна, найлепшая са шматлікіх гісторыяў, якія Манэргейм любіў распавядаць за сталом. Пасля добрай п’янкі, якая цягнулася цэлы тыдзень, за сталом у генерал-губернатара застаўся толькі адзін субяседнік – падпаручнік з раскватараванага непадалёк палка, які нейкім чынам трапіў у вясёлую кампанію. Астатнія не вытрымалі такога напружання. У прыпадку любові да ўсяго свету генерал-губернатар прапанаваў падпаручніку перайсці на «ты», падараваў яму каня і запрасіў заходзіць, калі неяк надарыцца быць у Варшаве. Вярнуўшыся ў гарнізон, падпаручнік фанабэрыста ўсім распавядаў, што піў на брудэршафт з самім генерал-губернатарам. Праз некалькі тыдняў ён па справах быў у Варшаве і вырашыў наведаць «брата». У прыёмнай зале генерал-губернатара было шмат розных важных чыноў, як ваенных, так і цывільных. Падпаручнік чакаў сваёй чаргі і ў адпаведнасці з чынам яго пусцілі апошнім. Генерал-губернатар не памятаў яго. Ён забыўся нават на тое, што калісьці сустракаўся з гэтым афіцэрам. «Чым магу служыць, падпаручнік?» – спытаў ён. «Проста зайшоў з табой павітацца. Ці ты не памятаеш, што мы перайшлі на «ты», без чыноў?» Генерал-губернатар на хвілінку задумаўся, потым націснуў кнопку званка і загадаў прынесці бутэльку шампанскага і два келіхі. Падняўшы свой келіх, генерал прапанаваў падпаручніку выпіць на «вы». «Паколькі на «ты» мы ўжо былі, то прапаную выпіць на «вы».

Генерал Туомпа, які запісаў гэты выпадак, здзіўляўся, што ў Манэргейма такая добрая памяць, і ён запомніў імя генерал-губернатара. Сам Туомпа абазначыў тое імя праз «ікс».

Скалон быў вытанчаны кавалер, дамскі залётнік і свецкі чалавек. Жандарскі генерал напісаў на яго данос імператару. Імператар выклікаў Скалона ў Пецярбург, але таму ўдалося рассеяць усе падазрэнні. Вярнуўшыся ў Варшаву генерал-губернатар наладзіў вечарыну, куды ў якасці ганаровага госця запрасіў жандарскага генерала. Званы вечар лёгка перайшоў у тыднёвую п’янку, і гэта можна зразумець, бо святкавалі з важнай нагоды. Манэргейм ведаў гэта з уласнага досведу. Але субяседнікі за сталом у Стаўцы гэтага не ведалі, як не ведалі ні генерал-губернатара, ні адносінаў паміж ім і Манэргеймам.



Манэргейму напраўду варта было затрымацца ў Лук’янаўцы, дзе яго сустрэлі, як прынца, каб набыць пэўны досвед. Там ён піў, еў і ездзіў верхам. Пасля раскошы, якая панавала ў Лук’янаўцы, умовы ў Чугуеўскім лагеры падаліся яму яшчэ больш прымітыўнымі, чым раней. Як і першы раз, ён пасяліўся ў капітана Сухіна. Ягоная гаспадарка аказалася запушчанай да немагчымасці. Сухін прыцягнуў у лагер сваю сям’ю. Спадарыня Сухіна, дваццацітрохгадовая маладая жанчына, прагна паглынала старыя сентыментальныя раманы – на нейкую асэнсаваную і карысную дзейнасць яна была няздольная. Яна заняла адзіны вялікі пакой у доме і патрабавала ад мужа і Манэргейма, каб яны апраналіся так, нібыта збіраліся на баль у горадзе. Малому было паўтары гады, ён крычаў і ўдзень, і ўначы, што вельмі раздражняла Манэргейма. Старая буркатлівая нянька мела дзіўную здольнасць вечна трапляцца пад ногі і лаяцца з усімі без дай прычыны.

Неяк Манэргейм і Сухін праехалі верхам 40 кіламетраў у страшэнную спёку, каб павіншаваць маладога барона Бэргенгейма з нараджэннем дзіцяці. Манэргейм падгадаў прыезд якраз да абеду і з’ядаў усё, што падавалі. Ці было гэта выпадковасцю? Увечары ён з Бэргенгеймамі пайшоў у тэатр, а ўранні, добра выспаўшыся за ноч, зноў падаўся ў лагер.

Яшчэ адно падарожжа – ужо разам з Бэргенгеймам – ён зрабіў у горад Славянаўск, дзе Бэргенгейм будаваў чыгунку і арганізаваў сваяку бясплатны чыгуначны білет. Яны ездзілі на цягніках і на конях, чаруючыся на шматлікімі кляштарамі.

Сталуючыся ў Сухіна Манэргейм за два тыдні схуднеў на шэсць фунтаў, а яму даводзілася старанна сачыць за вагой і станам здароўя. Двойчы перанесены тыф – гэта не жарты. Па стане здароўя Манэргейму трэба было набіраць вагу, а не худнець.

# II. ПЕЦЯРБУРГСКІЯ ГАДЫ

## Гвардзейскі афіцэр

Граф Амінаў зрабіў свае захады, каб дапамагчы Манэргейму. Сувязі ў яго былі немалыя, і начальнік Мікалаеўскай кавалерыйскай вучэльні, барон фон Білдэрлінг, быў яго сябрам. Як можна зразумець з прозвішча, фон Білдэрлінг паходзіў з прыбалтыйскіх немцаў. Родам з Курляндыі, ён меў сваякоў і знаёмых у Фінляндыі, напрыклад, Армфельтаў. У канцы ліпеня 1887 года Амінаў паведаміў Манэргейму, што начальнік вучэльні паабяцаў зарэзерваваць яму месца.

Аднак трапіць у вучэльню можна было толькі пасля здачы іспытаў, якія Манэргейм паспяхова прайшоў у жніўні таго ж года. 16 верасня 1887 года Манэргейм прынёс прысягу на сцягу вучэльні. З гэтага дня ён пачаў службу ў рускай арміі, якая доўжылася трыццаць гадоў, бо падчас прысягі яму было ўсяго дваццаць, а калі яго звольнілі са службы – дзеля агульнай карысці, а лепей сказаць з-за ягонай нягнуткасці, – яму споўнілася 50 гадоў.

У манежы курсантаў навучалі старадаўнім прыёмам верхавой язды. Манэргейм іх лёгка засвоіў і першы на курсе атрымаў шпоры. Старэйшыя кадэты як хацелі муштравалі і ганялі малодшых. Напэўна, гэтая «дзядоўшчына» пасля аддзялення Фінляндыі ад Расеі пранікла ў фінску армію з рускай, а не з фінскіх егерскіх падраздзяленняў, якія прайшлі навучанне ў Нямеччыне. Сярод егераў такой з'явы не было.

Цяжкія фізічныя практыкаванні – язда верхам, гімнастыка ды скачкі з перашкодамі – займалі не менш за чатыры гадзіны на дзень. Кармілі добра, але Манэргейму, які меў рост 193-194 см і яшчэ рос, порцыі былі ўсё ж замалыя.

Пасля першай атэстацыі Манэргейм займаў чацвёртае месца па паспяховасці і атрымаў вышэйшы бал па паводзінах, што дало яму права не наведваць заняткі па серадах.



Па механіцы яму давялося браць прыватныя ўрокі, бо ў гэтай галіне ён адставаў ад сваіх сунавучэнцаў.

Паколькі Манэргейм першы атрымаў шпоры, то павінен быў пачаставаць паўэскадрона піражнымі. На гэта пайшло 15 рублёў. Яшчэ пяць рублёў давялося – як і кожнаму кадэту – унесці на ўпрыгожванне манежа. Гэтыя траты цалкам спустошылі Манэргеймаў кашалёк, і ён мусіў зноў прасіць грошай у дзядзькі Альберта. Такія звышбюджэтныя траты падрывалі эканамічнае становішча Манэргейма на працягу ўсёй вучобы.

На калядныя канікулы Манэргейм паехаў у сваё найболып улюбёнае месца – маёнтак Фіскар. Туды ж прыехалі і браты Карл з Ёганам, а малодшы, Аўгуст, быў у Стакгольме, дзе хадзіў у школу. Сястра Соф'я заўважыла, што брат стаў сапраўдным веліканам, схуднеў і ў сваім доўгім шынялі выглядаў зусім як рускі.

Наступным летам Манэргейм зноў захварэў на тыф. Занепакоенае сямейства паслала брата Карла паглядзець наколькі сур'ёзна захварэў Густаў. Карл прывёз яго на папраўку ў маёнтак, але новы прыступ хваробы зноў уклаў Манэргейма у ложак на тры тыдні. Бывалі дні, калі тэмпература сягала вышэй за сорак градусаў.

Доўгая хвароба адбілася на выніках іспытаў зімовага сэместра, і Манэргейм не здолеў стаць вахмістрам курса. А потым на адпачынку ён упершыню ўпаў з каня, прычым пашкодзіў плячо так, што давялося паказацца лекару.

Вясенні сэместр закончыўся 31 мая, і вучэльня перамясцілася ў Чырвонае Сяло займацца тапаграфіяй і стральбой. За вычэрчванне картаў Манэргейм атрымаў найвышэйшую адзнаку. Гэта ўменне вельмі прыдалося яму падчас падарожжа па Азіі. Апроч таго, кадэты павінны былі будаваць умацаванні. Самым нудным заняткам Манэргейм лічыў практыкаванні ў стральбе. Астатні час аддаваўся на баявыя вучэнні. Падчас візіту ў лагер нямецкага кайзера Вільгельма II былі наладжаныя паказальныя выступленні і раскошны парад. Пасля гэтага кадэты атрымалі два дні адпачынку. Манэргейм з трыма таварышамі наведаў у гэты час лагер фінскай гвардыі ў Лапеенранце. Там ён сустрэўся з некаторымі таварышамі па кадэцкім корпусе ў Хаміне. Мясцовыя паненкі паказваліся ў горадзе, але сам горад нечакана падаўся яму пустым і ціхім. Таварышы хацелі наведаць яшчэ Іматру, але часу на тое не хапіла.

На другім годзе навучання фон Білдэрлінг прымусіў кадэтаў гарцаваць на плацу да самага наступлення зімы і раз на тыдзень праязджацца па Пецярбургу. Цяпер асноўная ўвага надавалася палявым заняткам па-за манежам. Гэтыя перамены Манэргейм перанёс даволі цяжка: ён захварэў і зноў мусіў паехаць на папраўку ў Фінляндыю. Калі ж праз некалькі тыдняў ён вярнуўся ў вучэльню, то даведаўся, што з дзесятага месца па паспяховаці перабраўся на чацвёртае.

У вучэльні не было жорсткай прускай дысцыпліны. Калі навучэнец адмаўляўся ісці ў каравул з-за вялікага холаду, камандзір і не назначаў яго ў той нарад.

У Манэргейма ў Пецярбургу было шмат сваякоў і знаёмых, да якіх ён хадзіў у госці падхарчавацца. Там ён сустракаўся з важнымі персонамі з акружэння статс-сакратара Фінляндыі. Сваякі прасілі іх дапамачы Манэргейму не толькі парадамі. Асабістыя сувязі мелі вялікае значэнне ў царскай арміі, часам нават большае, чым выдатныя адзнакі. Гэта Манэргейм добра засвоіў.

Увесну 1889 года Манэргейм першы раз зведаў даброты рускага посту і жахнуўся. Харчавацца можна было толькі рыбай і грыбамі. Адзін юнкер з Фінляндыі атрымаў пасылку з харчамі і падзяліўся імі з Манэргеймам.

Пабачыць велікодныя святы Манэргейму ў той год не давялося, бо ён з’ехаў на гэты час у Фінляндыю. Ён заслужыў срэбны цямляк на шаблю і лычкі вахмістра на пагоны. За гэты час ён так зжыўся з арміяй і ўсяляк падкрэсліваў сваю прыналежнасць да вайскоўцаў, што бацька і брат Карл нават адчулі сябе абражанымі − гэтак пагардліва малады кадэт ставіўся да цывільных. Прынамсі, такое ўражанне склалася ў сястры Соф’і.

Акрамя 150 рублёў за форму і экіпіроўку, Манэргейм мусіў заплаціць 400 рублёў за першы год навучання. На другім годзе навучання плаціць за экіпіроўку не даводзілася, а патрачаныя на яе грошы вярталі пры выпуску з вучэльні, каб маладыя афіцэры маглі зладзіць сабе форму. Юнкеры форму куплялі сабе самі − яна каштавала 200 рублёў. На першым годзе Манэргейм папрасіў у дзядзькі Альберта 900 рублёў, а на другім − ужо 700. Паводле рэкамендацыі начальніка вучэльні і па хадайніцтве статс-сакратара Фінляндыі Манэргейм атрымаў грашовую дапамогу з імператарскай касы. Форма і рыштунак падчас манёўраў вельмі зношваліся. На іх утрыманне і рамонт таксама патрабаваліся грошы. Кадэтам даводзілася самім плаціць конюхам і іншай абслузе, якая даглядала коней. На гэтыя патрэбы Манэргейм папрасіў у дзядзькі Альберта яшчэ 35 рублёў і 15 рублёў на паездку ў Фінляндыю.



Пасля заканчэння вучэльні настаў час выбіраць полк. Гвардыя была выгоднейшая з усіх бакоў, бо належала да прывілеяваных войскаў. Пры пераходзе з гвардыі ў лінейную армію гвардзейскі афіцэр аўтаматычна падвышаўся ў чыне. У гвардыю залічвалі на падставе адзнакаў, атрыманых у вучэльні, але перад тым кандыдыт павінен быў атрымаць згоду ўсіх афіцэраў гвардзейскага палка. А Манэргейму патрабавалася яшчэ і згода ягонага апекуна, дзядзькі Альберта.

Той не быў у захапленні ад паступлення Манэргейма ў гвардыю. На ягоную думку, лепей было б выбраць які-небудзь болей танны полк у звычайных войсках. Потым, праслужыўшы тры гады, можна падавацца у акадэмію Генеральнага штаба, што Густаву і належала зрабіць. Альберт выдатна ведаў, што жалавання афіцэра ў звычайных войсках не хапала на пражыццё і ўсе выдаткі, звязаныя са службай. Апроч таго, ён напомніў Манэргейму, што абяцаў дапамагчы толькі падчас навучання ў кавалерыйскай вучэльні, а далей Густаў павінен прабівацца сам. У дадатак Альберт патлумачыў, што дапамагаў бы з задавальненнем і далей, але ў яго шасцёра дзяцей, на вучобу якіх даводзіцца траціць шмат грошай.

Манэргейм паставіў перад сабой мэту дасягнуць высокага становішча. Ад маладога чалавека без грошай чакаць такога, здаецца, было нельга. Ці наадварот − гэта і павінна было стаць мэтай такога афіцэра. Як ён сам змог пераканацца, зрабіць кар’еру ў Расеі можна толькі пры дапамозе сувязяў. Стараннасць, прыстойнасць і ашчаднасць не мелі ніякага значэння. Ты сам павінен паставіць перад сабой мэту дасягнуць высокага становішча. Неадходна было выбраць полк, у якім мелася магчымасць наладзіць важныя асабістыя адносіны. Такім чынам ён хацеў давесці, што ягонае імкненне трапіць у гвардзейскі полк грунтуецца на рэальных разліках, а не славалюбстве і марнатраўстве. Намечаны ім шлях быў адзіна разумным і практычным. У іншым выпадку − поўнае, да нябачнасці, растварэнне ў шэрых армейскіх масах вялізнага войска Расеі.

Пецярбург быў сапраўдным касмапалітычным горадам. У вучэльні разам з Манэргеймам навучаліся прыбалтыйскія немцы, рознаплямённыя каўказцы, выхадцы з Фінляндыі... У Пецярбургу размаўлялі на многіх заходнееўрапейскіх мовах, там панавала сапраўдная вавілонская моўная сумесь. Шмат хто размаўляў на ламанай рускай мове, а таму шведскаму акцэнту Манэргейма ніхто не здзіўляўся − яго проста не заўважалі. Манэргейм жыў у Расеі не ў чыста рускім асяроддзі. У 1910-я гады ён служыў у Польшчы, а перад тым два гады правёў у падарожжы па Кітаі, дзе вакол яго гучалі шматлікія мовы Цэнтральнай Азіі. Яму ўдалося прабіцца ў вышэйшы клас грамадства і ўтрымацца там − ён сапраўды не мог знікнуць у бязмежным людскім моры вялікай імперыі.

Ён імкнуўся і трапіў у гвардыю, адтуль − на прыдворную службу, на якой правёў 17 год. Тады па службовых справах яму давялося паездзіць па Заходняй Еўропе. Ён ажаніўся з рускай жанчынай, але дома яны размаўлялі па-французску. Жонка таксама належала да касмапалітычнага вышэйшага класу.

Гвардыя выглядала ў вачах Манэргейма настолькі прывабна, што ён пакінуў думку аб паступленні ў акадэмію, праз якую хацеў трапіць у Генеральны штаб. Ён прыйшоў да высновы, што дзеля таго ён не мае ні высокіх заступнікаў, ні дастатковых сродкаў. Прыступкай мог стаць добры полк. Слухачоў з акадэміі выганялі ўсяго за некалькі тыдняў да выпуску толькі за тое, што каму-небудзь з выкладчыкаў раптам прыйшлася недаспадобы ягоная форма лінейных войскаў. Гвардзейская ж форма паўсюдна ў Расеі была добрай рэкамендацыяй. Нават у Генштабе гвардзейскаму афіцэру прысвойвалі болей высокі чын, чым афіцэру з лінейнага палка. Новы чын у Генеральным штабе прысвойваўся праз кожныя тры гады. Манэргейм пісаў дзядзьку Альберту, што калі ён пойдзе на тры гады ў звычайны полк, дык адстане ад гвардзейскіх афіцэраў і усё жыццё будзе плесціся за імі, адстаючы ў чыне.

Манэргейм намеціў сабе найболей выгодны шлях для кар’еры. Спачатку гвардыя, потым акадэмія, потым Генеральны штаб. Самае большае праз дзевяць гадоў ён стане падпалкоўнікам, калі нават не адбудзецца ніякай вайны, што звычайна адкрывае шырокія магчымасці для росту па службе. З усіх гвардзейскіх палкоў, на думку Манэргейма, найлепшым быў полк кавалергардаў. Там



можна было хутка зрабіць кар’еру. Гэта быў адзіны гвардзейскі полк, які меў доступ да царскіх пакояў. Шэфам палка была імператрыца, якая ўсіх афіцэраў ведала на імя. Яны ўваходзілі ў вышэйшы свет Пецярбурга, і іх таксама там добра ведалі. Манэргейм пісаў Альберту, што цяпер якраз у палку не хапае высакарослых афіцэраў. У ганаровую варту пры імператарскім двары бралі людзей толькі з гэтага палка, а таму гэта мусілі быць высокія, прадстаўнічыя мужчыны. Манэргейм цалкам сур’езна пісаў аб тым, што яго будуць часта пасылаць на прыдворныя мерапрыемствы і такім чынам ён набудзе шырокую вядомасць. Але і ў палку было шмат святаў. Наладжваліся святкаванні ў гонар імператарскай сям’і. Усё гэта патрабавала па 200 рублёў у месяц, 2400 рублёў у год. Тры першыя месяцы афіцэры ўвогуле не атрымлівалі грошай. Потым ім пачыналі плаціць жалаванне 40-50 рублёў у месяц. З гэтай сумы выплачваліся ўзносы ў афіцэрскую інвалідную і пенсійную касы, у касу пахавальнай дапамогі, пасля чаго на руках заставалася ўсяго 19 рублёў, а часам нават і два. Можа, Манэргейм смяяўся са свайго дзядзькі, адчуваючы ад гэтага асалоду?

Статс-сакратар, які быў практычна паслом Фінляндыі ў Расеі, выдаў Манэргейму 350 рублёў дзяржаўнае дапамогі. Поўнага спадзеву на тое, што новы статс-сакратар Казімір Эрнрут будзе дапамагаць яму грашыма і далей, не было. Манэргейм запэўніваў дзядзьку, што ягоная кар’ера − гэта чыста камерцыйная справа: калі хочаш даходу − укладай грошы.

Ён дакладна пралічыў кожны гвардзейскі полк. Гарадзенскія гусары стаялі ў Варшаве. З усімі выдаткамі на свята і рыштунак выходзіла 4000-5000 рублёў. Шмат, але меней, чым у лейб-гвардыі гусарскім палку ў Царскім Сяле, дзе афіцэрскія выдаткі складалі болей за 6000 рублёў у год без уліку формы і рыштунку.

Полк гвардзейскіх драгунаў быў нядрэнным месцам, з добрым афіцэрскім складам і выдаткамі ўсяго 75 рублёў у месяц плюс 2500 рублёў штогод на форму і рыштунак. Заганай было тое, што полк размяшчаўся ў пустэльнай мясцовасці, за сорак кіламетраў ад Ноўгарада. Шанцы на падвышэнне там былі малыя. Свецкае жыццё абмяжоўвалася кампліментамі некалькім афіцэрскім жонкам.

На рыштунак кавалергарды трацілі 3500 рублёў, але на заканчэнне вучэльні ён атрымае назад 400 рублёў, патрачаных на абмундзіраванне. Апроч таго, патрабавалася яшчэ каля 1000 рублёў, каб набыць каня.

Манэргейм спадзяваўся атрымаць даволі вялікую пазыку дзеля пакрыцця выдаткаў на службу ў кавалергардах на працягу трох гадоў. У якасці гарантыі ён намерваўся застрахавацца на вялікую суму.

Дзядзька Альберт падлічыў, што стархоўка і працэнты абыйдуцца ў 2000 марак штогод. Луіза Ягершэльд паабяцала 2500 марак на рыштунак і абмундзіраванне. Альберт згадзіўся даць грошы толькі пад вэксаль.

Манэргейм-бацька прыехаў у Пецярбург. Ён быў поўны аптымізму адносна сваёй камерцыйнай дзейнасці. Калі ўсё пойдзе добра, ён зможа заплаціць працэнты і пагасіць пазыку.

Альберт уважліва прагледзеў усе ўмовы і пралічыў магчымасці, пасля чаго напісаў пляменніку, што найлепш было б узяць такую пазыку, каб атрымоўвалася па 200 у месяц. Ён гатовы арганізаваць такую пазыку, калі Густаў паабяцае, што праз тры гады паступіць у акадэмію Генштаба і пасля паступлення пазыку верне.

Паводле запавету, бабуля разлічвала пакінуць кожнаму дзіцяці Гэлены Манэргейм па 5000 марак. Пэўную частку грошай дзеці маглі скарыстаць ужо цяпер. Дамовіліся на тым, што Густаў патраціць 20000 марак за першыя тры гады службы. Пасля паступлення ў акадэмію ён аддасць траім сёстрам па 5000 марак кожнай.

Манэргейм не атрымаў вакансіі у кавалергардах. Месцам службы яму прызначылі Аляксандраўскі драгунскі полк, які размяшчаўся ў Польшчы. У маі 1889 года Манэргейм быў выпушчаны з Мікалаеўскай кавалерыйскай вучэльні у чыне карнета і прыбыў у горад Каліш, дзе стаяў ягоны полк, непадалёк ад мяжы з Нямеччынай.

Служба аказалася лёгкай і займала ўся тры гадзіны на дзень. У рускай арміі, гэтаксама як у фінскіх вайсковых фармаваннях, навучаннем салдат і падтрыманнем парадку ў кашарах займаліся унтэр-афіцэры. Афіцэры трымаліся ад гэткай працы ўбаку. Новыя рэкруты, за якіх адказваў Манэргейм, прыбылі ў полк толькі ў студзені. Манэргейм купіў у Палтаўскай губерні добрую кабылу



чатырох гадоў, але ў хуткім часе сабраўся яе прадаць. Ён патлумачыў дзядзьку, што, займаючыся перапродажам коней, афіцэр можа зарабіць сёе-тое у дадатак да сваіх звычайных даходаў.

Горад аказаўся лепшы, чым з апаскай меркаваў Манэргейм. Гэта быў тыповы заходнееўрапейскі горад з каменнымі дамамі і брукаванымі вуліцамі.

Мала які малады афіцэр адважыцца крытыкаваць сваё вайсковае атачэнне. А Манэргейм пачаў крытыкаваць ужо з першых крокаў, нібыта быў не маладым карнетам, а старым генералам. Апісваючы свой полк, ён не знайшоў ніводнага добрага слова. Афіцэры сварыліся між сабой і адзін на аднаго даносілі. Камандзір палка − поўны нуль, і падначаленыя з ім зусім не лічацца. Калегаваць няма з кім. Афіцэрскія жонкі − нізкага паходжання, з дрэннай рэпутацыяй. Перад ад'ездам з Пецярбурга Манэргейм чуў пэўныя намёкі, і калі яны спраўдзяцца, дык неўзабаве яго адкамандзіруюць у Пецярбург. Таму ён мог спакойна ставіцца да ўсіх недахопаў і прыкрых умоваў гэтага правінцыйнага палка.

На Каляды Манэргейм з'ездзіў дадому. Ён з'явіўся ў адзенні Каляднага дзеда і з поўгадзіны танчыў канкан перад бацькам і братам Карлам, пакуль яны яго не прызналі, бо спачатку былі падумалі, што гэта выдурваецца Соф'я. Усе 28 дзён свайго адпачынку ён скарыстаў узімку. А пасля Калядаў вярнуўся ў Каліш і пачаў навучаць рэкрутаў, якіх было сорак чалавек.

Улетку адбыліся вялікія вайсковыя вучэнні. Манэргейм пазнаёміўся з тэлеграфнай працай, падрыўной справай, навучыўся сігналізацыі ліхтаром у цёмны час. Іхні полк разам з трыма іншымі коннымі палкамі праводзіў аперацыі ва ўмовах, блізкіх да баявых, на левым беразе Віслы. Гэта былі палкі першай лініі абароны і ў выпадку вайны павінны былі першыя прыняць удар праціўніка. Вучэнні доўжыліся 20 дзён. Пасля заканчэння Манэргейма прызначылі афіцэрам сувязі ў Валынь на імператарскія манёўры. Гэта было шматбаковае і эфектыўнае ваеннае навучанне і практыка. У Калішы Манэргейм спачатку жыў ва ўбогім гасцінічным пакойчыку. Яму не ўдалося знайсці мэбляванай кватэры. Жыллё было без мэблі, а яе трэба яшчэ набыць. Грошы знікалі, як вада з рэшата. Паколькі ў горадзе не было манежа, даводзілася займацца верхавой яздой на вуліцы. Манэргейму давялося купіць кароткі

кажушок і цёплыя нагавіцы. Апроч таго, прыйшлося ўнесці грошы ў афіцэрскі клуб, бібліятэку, на аплату музыкам, наладзіць вечарыну для афіцэраў эскадрона і пачастунак салдатам.

Урэшце яму ўдалося зняць у аднаго польскага адваката маленькую мэбляваную кватэру з двума вокнамі і невялікім пакоем на гарышчы для свайго дзеншчыка за 38 рублёў у месяц. Гэта была такая самая цана, як у Пецярбургу. У афіцэрскі клуб Манэргейм хадзіў харчавацца і чытаць газэты. Дзеншчыку і конюху ён плаціў 5 рублёў у месяц. Абед каштаваў адзін рубель, сняданак і вячэра – 75 капеек, пятнічны абед з музыкай – 2 рублі 50 капеек. На фураж ішло 8 рублёў у месяц. Такім чынам штомесячныя траты складалі 126 рублёў, а жалаванне, якое пачалі плаціць толькі з кастрычніка, было 35-40 рублёў.

Калі нехта з афіцэраў сыходзіў з палка, грошы збіралі па падпісным лісце, і Манэргейму даводзілася ўносіць 10 рублёў, што складала амаль поўны заробак за дзесяць дзён. Калі ж у адстаўку сышоў камандзір дывізіі, афіцэрам давялося скласціся на развітальны падарунак па 30-35 рублёў. Практычна на гэтыя траты ішло ўсё месячнае жалаванне.

На пачатку 1891 года Манэргейм атрымаў перавод у Пецярбург, у кавалергарды. Ён прасіў сямейства Скалонаў скарыстаць свае добрыя адносіны з імператрыцай Марыяй Фёдараўнай, якая была шэфам кавалергардаў. Летам ён пісаў сваёй хроснай, Альфідзе Скалон, што афіцэры-кавалергарды правялі патаемнае галасаванне і вырашылі прыняць яго ў свой полк. Цяпер баранэса павінна была пагутарыць з ваенным міністрам або з імператрыцай і дабіцца ў іх вакансіі для Манэргейма. Яна мела размову з імператрыцай, і справа зладзілася.

Пасля восеньскіх манёўраў 1890 года Манэргейм сам паехаў у Пецярбург, каб неяк паскорыць падзеі. Там ён жыў у кватэры Ялмара Ліндэра, які пэўны час быў мужам ягонай сястры Соф'і. Ліндэр быў тады ў ад'ездзе. Манэргейм адаслаў паперы ў ваеннае міністэрства і чакаў рашэння. За гэты час ён з'ездзіў у Фінляндыю, дзе правёў тры тыдні. Нарэшце рашэнне з ваеннага міністэрства прыйшло. І Манэргейм на два тыдні паехаў у Каліш забраць свае рэчы і наладзіць развітальную вечарыну афіцэрам палка. Тады ж ён прадаў і свайго каня.



У Пецярбургу Манэргейм напачатку жыў на кватэры таго ж Ялмара Ліндэра. А потым перасяліўся да саслужыўца Дзямідава. Напрыканцы года Манэргейм атрымаў казённую кватэру. Там было тры жылыя пакоі, пярэдні пакой, пакойчык для абслугі, унізе было памяшканне для конюха і стайня для васьмі коней і калясак. Усё гэта каштавала 16 рублёў у месяц. Кватэра была непадалёк ад кашараў. Конь Манэргейма быў малаваты для кавалергардаў, дый масць у яго была не тая – у тым палку былі гнядыя коні. Ягоная венгерская кабыла ростам 174 сантыметры, купленая ў Брэслаў, каштавала 430 рублёў. У Пецярбургу за такую ж давялося б заплаціць не менш за тысячу. Калі Манэргейм прывёз яе па чыгунцы ў Пецярбург, сам генерал агледзеў яе і адобрыў. Манэргейм прадаў яе за 860 рублёў сыну звергнутага караля Сербіі, а сам купіў у свайго таварыша, кавалергарда Арапава, англійскага каня за 900 рублёў. Генерал Арапаў, добры коннік, раней купіў яго за 1800 рублёў для свайго сына, але конь аказаўся такі свавольны і наравісты, што малодшы Арапаў не змог яго ўтаймаваць і прадаў Манэргейму.

Пасля вяртання з лагера Манэргейм думаў паехаць у Нямеччыну і купіць там двух коней – аднаго сабе, а другога на продаж. Паколькі коні ў Пецярбургу каштавалі ўдвая даражэй, то ўласны конь яму абышоўся б толькі ў суму, патрачаную на дарогу. Такімі здзелкамі з коньмі Манэргейм займаўся на працягу многіх гадоў. Пазней, калі Манэргейм стаў служыць ва Упраўленні прыдворных стайняў, у яго склаліся вельмі спрыяльныя ўмовы дзеля такіх справаў, бо давялося ездзіць па ўсёй Еўропе і купляць коней за дзяржаўны кошт, прычым уласных коней ён перавозіў разам з дзяржаўнымі.

Праз год службы Манэргейма ў кавалергардах іх камандзірам стаў генерал Артур фон Груневальд, тыповы немец. Калі яго паставілі на пасаду обер-шталмайстра, ён перавёў ва Упраўленне прыдворных стайняў і Манэргейма, якога цаніў і любіў.

Ад кавалергардаў патрабавалася ўпэўненасць, спрыт і зграбнасць у рухах, таму што гэта быў прадстаўнічы, «паркетны» полк. Менавіта там Манэргейм і набыў свае элегантныя манеры і паходку.

Граф Ігнацьеў, які пазней стаў генералам Чырвонай Арміі, слу-

жыў у тым жа эскадроне і быў падначаленым Манэргейма. У сваіх мемуарах ён апісвае Манэргейма як тыповага салдата-наёмніка, які лічыў сваю службу прафесіяй, а не прыемным марнаваннем часу. На думку Ігнацьева стаўленне Манэргейма да сваёй службы было стаўленнем прафесіянала. Усё тое, што выходзіла за межы службы, яго не цікавіла і не вабіла. Ён не цікавіўся палітыкай, абыякава ставіўся да нацыянальных і дзяржаўных ідэалаў. Ніколі і не перад кім не выказваў сваіх пачуццяў і думак, не дзяліўся клопатамі асабістага жыцця і свецкімі ўражаннямі, добрасумленна і старанна да аднастайнасці, з узорнай грунтоўнасцю выконваў свае абавязкі. Манэргейм мог шмат піць і не хмялець. Яго лічылі добранамерным, але абмежаваным служакам. Да цывільных і вайскоўцаў з налётам цывільнасці ён ставіўся з пагардай – рыса, якую ўжо даўно з трывогай адзначалі бацька і сястра Соф'я. Аднак сваю пагарду і грэблівасць ён выяўляў у такіх вытанчаных і элегантных формах, што гэта бралося за жарт. Ігнацьеву ж ён увесь час даваў зразумець, што той здольны адно – больш-менш добра сядзець на кані ды рабіць гімнастычныя практыкаванні.

Ва ўсіх краінах гвардзейцаў лічылі за людзей павярхоўных, гэткіх пыхлівых свецкіх ільвоў, якія нават уяўлення не маюць пра сваю прафесію. Таму Манэргейм з ягоным пачуццём абавязку і добрасумленнасцю звяртаў на сябе ўвагу.

Пазней, у Стаўцы Манэргейма ў Міккелях, генерал Нэнанен, які быў царскім артылерыстам, вельмі здзіўляўся гэтым якасцям Манэргейма, адзінага стараннага афіцэра-кавалергарда з усіх, што ён ведаў. Гэта было адзначана і падчас яго службы ў кавалергардах, калі яму часова даверылі палкавую касу і абозную гаспадарку.

Генерал Нэнанен даволі натуральна тлумачыў і тое, чаму Манэргейм усім, нават самым блізкім людзям, казаў «вы» і ніколі не піў на брудэршафт. У царскай арміі ўжывалі зварот на «вы». Нэнанен і сам, стаўшы афіцэрам рускай арміі ў 17 год, звяртаўся на «ты» толькі да трох-чатырох сваіх калегаў. Але да салдатаў звярталіся на «ты».

У час каранацыі імператара Мікалая II ў Маскве ў 1896 годзе Манэргейм і барон фон Кнорынг ішлі на чале каранацыйнай працэсіі перад імператарам, бо аказаліся самымі статнымі гвардзейскімі



афіцэрамі. Увесь полк кавалергардаў правёў тады ў Маскве цэлы месяц.

Кавалергардаў часта называлі «пахавальнымі майстрамі», таму што ім часта даводзілася ўдзельнічаць у пахаваннях вялікіх князёў і генералаў. А па вечарах яны заляцаліся да свецкіх дам на танцах або сядзелі ў оперы ды тэатрах. Вышэйшы свет прысылаў ім запрашэнні на дамашнія святы і баляванні. У Манэргейма быў расклад усіх вечароў на два тыдні наперад. Манэргейм сам казаў, што быў заўзятым танцорам і не любіў бегаць па тэатрах. Таму яго зусім не засмуціла, што ў сувязі са смерцю Аляксандра III усе забавы былі забароненыя. Праўда, Манэргейм тады ўжо два гады быў жанаты.

У свецкім коле ні ў якім выпадку нельга было паказваць, што табе нудна, – гэта было асноўнае правіла добрага тону. І Манэргейм ніколі не парушаў яго, паколькі гэтага патрабавалі пачуццё абавязку і добрапрыстойнасці.

Славуты палярны даследчык А.Е. Нордэншэльд быў сябрам дзяцінства Манэргейма-бацькі і мужам яго сястры. Такім чынам, ён даводзіўся Густаву Манэргейму сваяком, і водбліскі дзядзькавай славы ляглі і на Густава. Дзядзька часта прыязджаў у Пецярбург. Аднойчы Нордэншэльд пайшоў у манеж палюбавацца на мастацтва гвардзейскіх коннікаў, адным з якіх быў Манэргейм. Сярод гледачоў была і жонка Манэргейма, якую славуты падарожнік палічыў вельмі прыгожай. Ён пазнаёміў Манэргейма з сямействам Нобеляў і іншымі сваімі сябрамі, потым паехалі ў калясцы пакатацца па ўзбярэжжы Нявы. У той час гэта было месца, дзе збіраўся ўвесь пецярбургскі вышэйшы свет, падобна таму, як парыжскі – у Булонскім лесе.

Манэргейм жыў звычайным жыццём гвардзейскага афіцэра, якому ўдалося з дапамогай сацыяльна і эканамічна выгоднага шлюбу і сувязяў заняць прыстойнае месца сярод вышэйшага класа. Ён дабрасумленна выконваў свае абавязкі і наладжваў сувязі з патрэбнымі людзьмі.

Сваю славутую выпраўку і здольнасць падняць паўнюткую чарку, не выліўшы ні кроплі, і выпіць яе, не міргнуўшы вокам, Манэргейм набыў менавіта падчас службы ў кавалергардах. Там на гэта звярталі асаблівую ўвагу. І гэта было агульнапрынятым пра-

віламі паводзінаў у вышэйшым свеце, а не асабістай рысай характару Манэргейма.

У 1897 годзе Манэргейма перавялі ва Упраўленне прыдворных стайняў. Гэтая служба вымагала паездак па ўсёй Еўропе дзеля куплі коней. Манэргейм адказваў за пошукі, дагляд і навучанне коней. Яму належала ведаць замежныя конезаводы, пароды коней, шляхі іх паляпшэння і радаводы. Ён быў гандляром коньмі, конюхам, утаймавальнікам коней, настаўнікам верхавой язды, удзельнічаў у скачках з перашкодамі і спаборніцтвах па тэрэнкуру. Таму і не дзіва, што ён так шмат піша пра сваіх коней, падрабязна апісвае іхнія характары і стаці, ганарыцца іхнімі поспехапі і смуткуе па іх. Пра сваіх дзеншчыкоў ён не піша амаль нічога. Увогуле ад ацэнак блізкіх яму людзей Манэргейм устрымліваўся і нічога пра іх не пісаў ці абмяжоўваўся агульнымі ўсхваленнямі. Чужым жа людзям ён даваў сакавітыя характарыстыкі, не прамінаючы распавесці прыдатны да выпадку анекдот.

Бацька быў невысокай думкі пра здольнасці, навыкі і веды свайго сына ў галіне гандлю коньмі. Сын для яго быў бліскучым коннікам, але невялікім знаўцам коней. У Пецярбургу, калі ім даводзілася ездзіць разам, сын заўсёды выбіраў вазніцу, у якога былі нікуды не вартыя коні. Брата Ёгана лічылі лепшым знаўцам коней, і Густаву было далёка да яго – такая думка панавала ў сямействе.

Пасля вяселля Манэргейм паехаў у Нямеччыну з жонкай купляць коней. Падарожжа маладых працягвалася цэлы месяц. Перад ад'ездам Манэргейм прадаў свайго каня і закупіў для сябе ў Нямеччыне некалькі коней. Гэта адбылося ў 1893 годзе, калі ў яго былі грошы і ён мог дазволіць сабе такія пакупкі. Наступным годам Манэргейм з жонкай паехалі ў Францыю на славуты курорт атлантычнага ўзбярэжжа – Біярыц. Адтуль ён адправіўся ў Аўстра-Венгрыю, каб азнаёміцца з тамтэйшымі конезаводамі. Разам з ім паехаў і брат Ёган.

У 1898 годзе Манэргейм закупіў на рускіх конезаводах пяць кабыл для сваёй жонкі. Чацвёра з іх былі жаробныя. Ён мерыўся заснаваць свой уласны конезавод у жончыным маёнтку. Усяго ён закупіў сем кабыл, думаў набыць яшчэ дзве і ўзяў з царскіх канюшняў племяннога жарабка. Здаецца ўсё абяцала поспех, жончыны грошы давалі такую магчымасць. Але тут жонка ўцякла і, паездзіўшы па свеце цэлы год, вярнулася ў Пецярбург толькі дзеля таго, каб забраць абедзвюх дачок і канчаткова з'ехаць у Францыю. Манэргейм застаўся без грошай, без маёнтка ў Латвіі, без крэдытаў на закупку коней. Светлая мара пра ўласны конезавод рассеялася, як дым у паднябессі.



Брат Ёган валодаў найбуйнейшым у Фінляндыі конезаводам, якім сам і кіраваў. Браты часта рабілі сумесныя здзелкі і давалі адзін аднаму заказы.

Яшчэ раней Манэргейм набыў добрую фотаапаратуру, каб рабіць здымкі коней, якіх збіраўся прадаць. Паколькі ён быў дзяржаўным гандляром коньмі, то атрымліваў 500 рублёў на абсталяванне, білеты ў першы клас, добрыя нумары ў гатэлях і шэсць залатых рублёў падзённых. На гэтым этапе ў яго і пачаліся непрыемнасці з верхавой яздой.

Увесну 1898 года Манэргейм зламаў нагу. Ягоны конь упаў і прыціснуў яго. Толькі напрыканцы 1899 года ён змог зноў паехаць у доўгае падарожжа. Ён наведаў Берлін, Брусэль, Парыж, дзе правёў два дні ў сваёй сястры Евы і яе мужа. Потым ягоны шлях ляжаў у Гановер. Ён сустракаўся з конезаводчыкамі, аглядаў коней, рабіў шматлікія закупкі: дзве чацвёркі для ўдовай імператрыцы, чатыры чорныя ардэнцы, чатыры шэрыя першароны і некалькі англійскіх коней для верхавой язды. У Берліне, калі ён аглядаў кайзераўскія стайні, конь моцна ўдарыў яго азадкам, і два месяцы Манэргейм праляжаў у шпіталі, дзе яму зрабілі аперацыю на калене. За гэты час ён прачытаў так шмат, як ніколі ў жыцці. Калі пазней, 15 сакавіка 1943 года, ён паслізнуўся на вуліцы ў Міккелях і зламаў левае запясце, ён сказаў, што гэта быў чатырнаццаты пераломам у ягоным жыцці.

А пасля здарэння на стайнях немцы не ўзялі з яго грошай за лячэнне. Расейскі імператар у адказ зрабіў падарунак: узнагародзіў галоўнага лекара шпіталя расейскім ордэнам. У таго ўжо быў адзін даволі высокі расейскі ордэн, а значыць, па статусе ён павінен быў атрымаць болей высокую ўзнагароду. Гэты раз яму ўручылі ордэн Уладзіміра з брыльянтамі, які каштаваў 10000 рублёў. Такім чынам рускі цар Мікалай патраціўся на лячэнне Манэргеймава калена болей, чым нямецкі кайзер Вільгельм.

Спачатку нага была такая слабая, што Манэргейм не мог ступіць кроку, калі хто-небудзь ззаду яе не падштурхоўваў.

Нямецкі лекар сшыў рэпку ў калене срэбнаю ніткай. Калі цар пра гэта даведаўся, то сказаў, што гэта служыць доказам нямецкай сквапнасці – трэба было сшываць залатой.

Манэргейм пастараўся высветліць, што стала з канём. Яго вярнулі са стайняў кайзера прадаўцу, а той прадаў яго далей. Конь трапіў да аднаго князя. Калі каня запрэглі ў каляску, ён павёў сябе гэтак сама, як з Манэргеймам: панёс, разбіў ушчэнт каляску, але ўдару капытом князь, на шчасце, пазбег.

Пакуль Манэргейм вылечыўся, настала зіма. У студзені снег яшчэ не выпаў і было так цёпла, што вокны не зачынялі. Купленыя Манэргеймам коні ўжо былі ў Пецярбургу, обер-шталмайстар Груневальд ухваліў пакупку і застаўся задаволены. Масаж назе рабілі двойчы на дзень, сярод медыцынскіх сёстраў была адна шведка на імя Адэль. Манэргейм лічыў, што сваёй шведскай мовай ён заваяваў сэрца сястрычкі. Апроч хворага калена, цяпер яго засмучала толькі адна акалічнасць: ён не мог трапіць на святкаванне стогадовага юбілею палка. Свята доўжылася чатыры дні. Праўда, Манэргейм атрымаў кампенсацыю ад нямецкага кайзера: той прыслаў Манэргейму запрашэнне на абед. Кветкі кайзер яму прысылаў раней.

За абедам кайзер паспешліва паглынаў стравы і ўвесь час гаварыў. У гасцей жа стаялі некранутыя поўныя талеркі, бо кайзер мог звярнуцца да іх у любы момант, а адказваць царскай асобе з поўным ротам – гэта верх непрыстойнасці.

У Пецярбургу калена разбалелася, і Манэргейму зрабілі рэнтгенаўскі здымак, пасля чаго ён на шэсць тыдняў паехаў на эстонскую выспу Саарэмаа – рабіць масаж і ўмацоўваць сілы. Жонка Ната паехаць туды адмовілася. Адмовіўся і брат Ёган, хоць Манэргейм запрашаў яго да сябе ў кампанію.

У 1901 годзе Манэргейм разам з бацькам з'явіліся ў Лондане і сустрэліся з ягонай сястрою Соф'яй, якая вучылася на медыцынскую сястру. Густаў купляў коней, а бацька рабіў свае камерцыйныя справы. Пасля пераводу ва Упраўленне прыдворных стайняў Манэргейм атрымаў две службовыя кватэры – адну у Пецярбургу, другую – ў Царскім Сяле.



У верасні 1901 года Манэргейма наведала жонка брата Ёгана Палаэмона, якая яму вельмі падабалася. Барон Густаў на ўласнай запражцы сустрэў госцю на вакзале, адкуль яны паімчаліся на Марсава поле паглядзець на арабскіх коней і венгерскую чацвёрку, толькі потым ужо ён завёз яе на сваю раскошную кватэру непадалёк ад царскіх стайняў. Побач знаходзіўся карэтны музэй, дзе зберагаўся і экіпаж, на якім ехаў Аляксандр II у дзень смяротнага замаху. У гонар сваёй госці Манэргейм даў пышны абед на кватэры ў Царскім Сяле. За абедам прыслужваў важнецкага выгляду лёкай з доўгаю сівой барадой і шасцю медалямі.

Яшчэ да жаніцьбы Манэргейм удзельнічаў у спаборніцтвах па конным спорце. На пачатку 1892 года ў адным спаборніцтве ён заваяваў адразу два першыя прызы, адзін другі і адзін трэці. Трэцім прызам быў срэбны паходны кацялок коштам 200 рублёў. Адзін прыз быў грашовы – 700 рублёў. Імператрыца, якая ўручала прызы, загаварыла з Манэргеймам па-шведску – да замужжа яна была дацкай прынцэсай.

Наступным годам Манэргейм удзельнічаў у скачках з перашкодамі. Спаборніцтва працягвалася шэсць нядзельных дзён запар. Ён выступаў на трох конях, аднаго з якіх купіў у пераможцы леташніх спаборніцтваў. Жонка Ната баялася гэтых спаборніцтваў і спрабавала адгаварыць яго: ён быў занадта высокі і лёгка скідваўся з каня. Але ён працягваў удзельнічаць у спаборніцтвах і нават пачаў гуляць у пола, калі гэтая гульня з'явілася ў Пецярбургу. Першы матч па пола ў гонар адкрыцця пляцоўкі адбыўся ў 1895 годзе, і Манэргейм быў у камандзе пераможцаў.

У 1903 годзе стала вакантным месца камандзіра ўзорнага эскадрона ў Мікалаеўскай кавалерыйскай вучэльні. У гэтай вучэльні афіцэры набывалі добрыя навыкі верхавой язды. Да таго часу Манэргейм стаў выдатным кавалерыстам і настаўнікам верхавой язды. Начальнікам вучэльні быў генерал Брусілаў, будучы легендарны герой Першай сусветнай вайны.

Не стаўшы чакаць верасня, каб прыступіць да выканання сваіх абавязкаў, Манэргейм пачаў камандаваць эскадронам ужо на пачатку чэрвеня, а таму лічылася, што пакуль ён не камандзір, а выконваючы абавязкі. Раней ён думаў паехаць на пару месяцаў у курляндскі маёнтак жонкі падлячыць нервы, але цяпер у яго за-

стаўся толькі адзін месяц адпачынку, і ён паехаў у Фінляндыю. Дзесяць дзён гэтага адпачынку ён займаўся справамі акцыянернага таварыства Нокіа.

1903 год быў для Манэргейма цяжкі. Шлюб канчаткова разваліўся. Дэспатычнае кіраванне генерал-губернатара Фінляндыі Бобрыкава вымусіла брата Карла выехаць у Швецыю. Такі ж лёс мог напаткаць і брата Ёгана. У Манэргейма былі ўсе прычыны непакоіцца за сваю кар'еру.

Служба ў эскадроне стала для Манэргейма сапраўднай пакутай. Ён быў так загружаны, што ўсе іншыя месцы здаваліся яму прыгожымі і прахалоднымі. Ён пісаў, што жыве як у тропіках, дзе, выходзячы на вуліцу, трапляеш у спёку шматкроць большую, чым дома, а вяртаючыся дадому, вяртаешся ў ласкавы халадок. Зранку эскадрон займаўся выездкай, увечары – гімнастыкай і заняткамі ў класах. Вечар у чацвер быў вольны. Вольнымі былі таксама суботнія вечары і ўсе нядзелі. У гэты час Манэргейм хадзіў у горад займацца сваімі камерцыйнымі справамі.

Улетку 1903 года адбыліся вялікія манёўры пад Псковам. Бліжэй да восені лагер перавялі пад Вільню. І там аднойчы скачкі па перасечанай мясцовасці скончыліся для Манэргейма плачэўна: ягоны конь спатыкнуўся, і Манэргейм паляцеў на зямлю. Ён ледзь не зламаў сабе шыю, але яго ногі ўдала падагнуліся, і ён толькі разбіў сабе спіну і вывіхнуў шыю, але нічога не зламаў.

## Шлюб

Хросная маці Манэргейма, чароўная баранэса Альфіда Скалон, якая дзякуючы сваім сувязям уладкавала Манэргейма ў юнкерскую вучэльню, а потым у кавалергарды, знайшла яму ў жонкі багатую дзяўчыну. Гэта была Анастасія Арапава, маладая сірата, якая разам з сястрой жыла ў свайго дзядзькі. А сын дзядзькі, як і Манэргейм, быў афіцэрам кавалергардаў. Манэргейм часта заходзіў да яго, і, вядома ж, яго запрашалі да стала. Баранэса наведала дзядзькаву жонку, і дзве хітрамудрыя жанчыны вырашылі пажаніць маладых людзей. Паклікалі Анастасію, і тая, выслухаўшы шлюбны план цётак, адразу дала згоду: «Хто ж не хацеў бы выйсці замуж за такога станістага мужчыну, як Манэргейм, ды яшчэ такога прачутага». Згода Манэргейма разумелася сама па сабе.



Існуе і другая версія адносна прычыны шлюбу, якая ніякім чынам не абвяргае першую, а толькі служыць яе працягам і паказвае, як Манэргейм даведаўся пра гэтую шлюбную змову. Магчыма, гэтыя тры высакародныя дамы не хацелі, каб іхні план быў занадта прамы і меў камерцыйнае адценне. Таму яны вырашылі надаць падзеям драматычны характар гэткага любоўнага нерата.

Аўтар гэтай версіі – жанчына, якая сцвярджала, што яна Манэргеймава стрыечная сястра, і належала да тых жа колаў, што Манэргейм, – расказвае простую і праўдападобную гісторыю, якая менавіта тым і заслугоўвае даверу. Гэта гісторыя пра тое, як Манэргейм з'язджаў з кватэры свайго таварыша-афіцэра Дзямідава на вуліцы Захар'еўскай, 25. Князь Качубей, якому належала кватэра, вярнуўшыся з паездкі, запатрабаваў, каб кватэру вызвалілі. Вось тады Манэргейм і пераехаў да другога свайго прыяцеля – П'ера Арапава, стрыечнага брата будучай баранэсы Манэргейм. Анастасія была дзяўчына рослая, з добрай, хоць і крыху каржакаватай фігурай. Яна не была надта прыгожая – яе псавалі вірлаватыя вочы. Яе сястра Соф'я была прыгажэйшая. Сёстры, бацька якіх таксама быў генерал, засталіся сіратамі. Анастасія закахалася ў Манэргейма з таго самага дня, калі ён пасяліўся ў гэтым доме. Манэргейм жа ўсяляк імкнуўся пазбегнуць сустрэчы з ёю. Ён нават перастаў прыходзіць да абеду, цэлымі днямі прападаючы ў казармах і харчуючыся ў афіцэрскай сталоўцы. Спадарыня Арапава адразу зразумела душэўны стан дзяўчыны – каханне нівк не схаваеш. Зусім як у апавяданнях Чэхава ды іншых тагачасных пісьменнікаў, Анастасія, выпадкова сустрэўшыся з Манэргеймам у адным з пакоеў, не стрымалася і кінулася яму на шыю. Тут жа – як гэта і было загадзя дамоўлена з Анастасіяй – з'явілася цётка Арапава. Манэргейм стараўся вызваліцца з абдымкаў. Уражаная цётка толькі развяла рукамі і радасным голасам сказала, што гэта смелы ўчынак, але нічога не зробіш – калі ўжо яны кахаюць адно аднаго, дык хаваць каханне не варта, як не варта й саромецца свайго пачуцця. Ім застаецца толькі пажаніцца. Манэргейм адказаў, што не можа зрабіць гэтага без бацькоўскага дазволу і не мае поўнай упэўненасці, што такі дазвол атрымае. Тады пані Арапава параіла яму хутчэй гэтага дазволу папрасіць, а пакуль яе сям'я будзе з радасцю прыймаць яго і лічыць за жаніха

Анастасіі, каб маладым не давялося перажываць прыкрых непрыемнасцяў. І пані Арапава тут жа арганізавала Манэргейму запрашэнне на званую вечарыну, куды была запрошаная і Анастасія.

Тым вечарам у палацы графіні Клейнміхель давалі прадстаўленне, Анастасія выступала з танцамі. Такім чынам яна магла паказаць сябе з найлепшага боку, і Манэргейм павінен быў убачыць яе ў самым прывабным выглядзе.

Адносіны паміж маладымі вырашылі пакуль захоўваць у таямніцы. Былі пэўныя падставы, каб спачатку абмеркаваць публічнае абвяшчэнне і зрабіць яго ў патрэбны час і ў патрэбным месцы. Але што атрымалася? У разгар свята Анастасія павярнулася да дачок Клейнміхеля і, паказваючы на Манэргейма, які стаяў побач, сказала, што гэта яе жаніх, але пакуль гэта тайна і ніхто іншы не павінен яе ведаць. Тым жа вечарам таямніца стала вядомая ў свецкіх колах, дзе ўсе адно з адным былі знаёмыя. Зрэшты, па словах расказчыцы, ніхто ў гэтую навіну не паверыў, бо Манэргейм у той вечар не ўдзяляў Анастасіі ніякай увагі, як рабіў гэта і заўсёды пазней.

Пра заручыны, такім чынам, стала вядома спачатку неафіцыйна, а потым іх абвесцілі ў манежы, дзе Манэргейм удзельнічаў у спаборніцтвах і ўзяў першы прыз. Месца і час былі выбраныя вельмі ўдала. Гэтым разам Манэргейм выступаў у ролі зоркі.

Пазней, калі Анастасія сустрэлася з расказчыцай, то распавяла ёй, што Манэргейм быў стрыманы і халодны. Па горадзе хадзілі чуткі, што графіня Бэтсі Шувалава была закаханая ў Манэргейма, і ў гэтым выпадку ён не быў ні халодным, ні стрыманым. Графіня была нашмат старэйшая за Манэргейма, але той на працягу двух дзесяткаў гадоў падтрымліваў сувязі з ёю і ездзіў у Пецярбург, Уладзівасток ды іншыя гарады толькі дзеля спаткання з ёю. Анастасія раўнавала яго і да іншых жанчын. Каб хоць нейкім чынам абудзіць у грудзях мужа такія ж гарачыя пачуцці, яна ўзялася так актыўна і мэтанакіравана зачароўваць і вабіць да сябе мужчын, што за ёю устанавілася рэпутацыя легкадумнай жанчыны.

Таямнічая расказчыца сцвярджала, што яна пляменніца князя Канстанціна Беласельскага-Белазерскага, што пабудаваў пляцоўку для коннага пола, на якую прыходзіў пагуляць і Манэргейм. Яны з князем былі добрыя знаёмыя.



Расказчыца – тады ўжо старая паня-эмігрантка – казала, нібыта Манэргейм распавядаў ёй, што з жонкай ён не правёў ладам і мядовага месяцу, дый наогул не перажыў ніводнага шчаслівага дня. Ён не быў закаханы ў сваю жонку і ніколі яе не любіў.

Яна абмалёўвае баранэсу Манэргейм, як жанчыну нахабную, непрыемную і амаральную. Вядома, расказчыца моцна згушчае фарбы.

Манэргейм пісаў сваёй цётцы ў Швецыю, што Анастасія светлавалосая, сярэдняга росту, крыху паўнаватая, але бадзёрая і вясёлая жанчына. Амаль тое ж пісала пра яе і сястра Соф'я. Каб суцешыць сваякоў, яна паведаміла, што Анастасііна бабуля была замужам за статс-сакратаром Фінляндыі Армфельтам і, такім чынам, мела сувязі з Фінляндыяй.

Арапавы запатрабавалі, каб Манэргейм перайшоў у праваслаўе, але той адмовіўся. Але калі яго жонка ў 1936 годзе памерла, ён замовіў набажэнства за супакой яе душы ў праваслаўным храме ў Хельсінках і ўкленчыў, як таго патрабаваў праваслаўны абрад.

Вяселле адсвяткавалі 2 мая 1892 года ў Пецярбургу. На вяселле прыехалі бацька і брат Карл. Вянчанне паводле праваслаўнага абраду адбылося ў палкавой царкве, а паводле лютэранскага – у доме Звягінцавых, у доме нявесцінай цёткі. Там жа быў наладжаны і развітальны абед для нешматлікіх сваякоў. Вечарам а восьмай гадзіне маладыя адбылі ў Маскву, каб правесці мядовы месяц у маёнтку Успенскае, размешчаным на беразе рэчкі за 14 кіламетраў ад Масквы. Маладыя выглядалі шчаслівымі і задаволенымі.

Калі ўвосень маладая пара прыехала ў Стакгольм, сваякі ўздыхнулі з палёгкай. Руская жонка аказалася жанчынай даволі адукаванай, а галоўнае – еўрапейскай. У сямейства склалася думка, што Анастасія вельмі багатая. Яе маёмасць ацэньвалася ў 800000 рублёў. Пазней стала вядома, што яна мае 14000 рублёў гадавога даходу. У яе было два маёнткі. Адзін пад Масквой, а другі – у наваколлі Варонежа.

Манэргейм прадаў падмаскоўны маёнтак і набыў другі – у Курляндыі. Суседзі былі прыбалтыйскія немцы-арыстакраты і не жадалі мецца з рускімі ніякіх стасункаў. Болей пра іх не вядома нічога.

Маладыя пасяліліся ў Пецярбургу на Мільённай вуліцы. Манэргейм перавёз з падмаскоўнага маёнтку Успенскае мэблю і коней. У хуткім часе ён атрымаў недарагую казённую кватэру для прадстаўніцтва.

Дома Манэргеймы размаўлялі па-французску, Анастасія выдатна валодала і англійскаю мовай, і яе ўжывалі, калі госць дрэнна разумеў французскую або рускую. Па-французску Манэргейм пазней перапісваўся са сваімі дочкамі і з жонкай. У Пецярбургу саслоўная прыналежнасць вызначалася тым, наколькі лёгка людзі пераходзілі з адной мовы на другую і наколькі натуральна мовы змешваліся ў гаворцы, бо адны выразы добра гучаць на адной мове, другія – на другой.

Дачка Анастасія нарадзілася ў 1893 годзе, Соф'я – у 1895. Хлопчык нарадзіўся мёртвы. Магчыма, каб сын нарадзіўся жывы, лёс сям'і Манэргеймаў склаўся б інačай.

Калі бацька і брат Карл першы раз прыехалі ва Успенскае, над маёнткам узнялі шведскі сцяг, а слуг апранулі ў адзенне шведскіх колераў. У Расеі Манэргейма лічылі за шведа. Гэта было, вядома ж, болей прэстыжна, чым лічыцца фінам. Фінскія сяляне і рабочыя былі звычайным відовішчам на вуліцах Пецярбурга. Пра дурнаватых чухонцаў, якія не разумелі чалавечай мовы, здаўна расказвалі показкі.

Праз тры месяцы пасля вяселля Манэргеймы наведалі Стакгольм, а адтуль заехалі ў Фінляндыю, дзе на кароткі час зазірнулі ў Лоўхісаары. Да іншых сваякоў яны не паехалі. Бабуля па маці, якая жыла ў Лоўхісаары, была настроеная крытычна і нават злосна.

Густаў прыехаў з вялікай раскошай, як і належыць важнаму вяльможы: на адмыслова нанятым параходзе, на якім маладыя і адбылі наступным днём. Бабуля адзначыла, што бацька Густава з задавальненнем глядзіць на сваю непрыгожую нявестку. На думку старой, маладую жанчыну трэба было б пазалаціць, каб хоць як-небудзь назваць прыгожай.

На Каляды Манэргейм зноў наведаў Лоўхісаары. Ён прыехаў адзін, жонка засталася ў Пецярбургу. Густаў зноў пажартаваў на свой звычайны лад: напісаў, што прыехаць не зможа, а потым заявіўся, пераапрануўшыся Дзедам Марозам. Хутчэй за ўсё ён



хацеў давесці сямейству, што ён – па-ранейшаму іхні мілы хлопчык.

Адразу пасля вяселля Манэргейм расплаціўся з усімі сваімі даўгамі – за жончыны грошы, вядома. Ён планаваў купіць вялікі маёнтак у Фінляндыі. Яму прапанавалі некалькі маёнткаў на выбар, але ён хацеў набыць Лоўхісаары. Аднак цётка наадрэз адмовілася не толькі прадаць, але і аддаць яму памесце ў арэнду. Густаў разам з братам Ёганам многія гады думалі над размяшчэннем грошай у Расеі, ва Украіне ці на Каўказе. Планавалі нават пабудаваць цукровы завод на Далёкім Усходзе.

Але тут біржавы крах, які адбыўся ад неспрыяльных эканамічных умоваў, нагадаў Манэргейму пра марнасць чалавечага існавання.

Ён страціў столькі грошай, што пра новыя інвестыцыі нельга было і думаць. Давялося нават адмовіцца ад перабудовы варонежскага маёнтка і прадаць некалькі выдатных коней, на якіх ён заваёўваў прызы.

На шчасце, ён паспеў зрабіць пэўныя ўклады ў Фінляндыі – накупіў акцыяў таварыства Нокія і ў 1903 годзе быў абраны ў склад яго праўлення.

Праз чатыры гады пасля вяселля Манэргейм-бацька заўважыў, што сумеснае жыццё маладой пары робіцца ўсё больш невыносным, у доме пануе гнятучая атмасфера, і віной таму быў зусім не муж. Гадоў праз дваццаць сам Манэргейм расказваў, што ягоная жонка была няздольная да якой-небудзь сістэматычнай працы і, апроч таго, была непапраўнай гультайкай. Яна заўсёды рабіла ўсё насуперак парадам і пажаданням мужа. Манэргейм таксама не ўяўляў сабой узору мужа і сем'яніна. Ён быў дробязна-педантычны і гняўлівы, лёгка крыўдзіўся і, здаецца, не кахаў сваю жонку ніколі, магчыма, толькі ў самыя першыя часы свайго сямейнага жыцця.

У 1901 годзе Анастасія знікла. Яна ўцякла, не паведаміўшы куды і навошта. Аказваецца, яна перасекла на караблі Індыйскі акіян і апынулася на Далёкім Усходзе, дзе стала сястрой міласэрнасці. Праз таварыства Чырвонага Крыжа Манэргейм высветліў, што яна працуе ў Хабараўску. Гэта быў першы кантакт Манэргейма з Чырвоным крыжам. З Хабараўска яна перабралася ў Чыту,

дзе ўвесь год працавала ў вайсковым шпіталі. Гэтак жа, як і сястра Манэргейма Соф'я, яна выбрала сабе адзіна магчымую прафесію, якой маглі займацца высакародныя дамы.

Урэшце яна вярнулася і нараспавядала ўсемагчымых жахаў пра свае прыгоды. Па дарозе назад яе сані перакуліліся, і яна вылецела наперад галавой у сумёт, зламала нагу і праляжала бог ведае колькі на пятнаццціградусным марозе, пакуль яе не знайшлі. Шыну на паламаную нагу яна наклала сабе сама. А далей яе адправілі ў таварным цягніку, які сышоў з рэек, загарэўся і кіламетры паўтары малаціў па шпалах, пакуль нейкі адважны герой не спыніў паравоз. Нерухомая і бездапаможная Наста думала, што настаў яе апошні час, але яе зноў выратавалі. Цяжка даць веры падобным байкам, бо іх расказвае ледзь не кожны, хто пасля вяртання дадому пакутуе ад згрызотаў сумлення за тое, што, кінуўшы ўсё, рынуўся шукаць прыгодаў і шчасця. Але нага была, відаць, сапраўды паламаная, бо ад пералому застаўся след. На Манэргейма гэтыя аповеды зрабілі моцнае ўражанне. І пазней ён казаў, што ў яго мужная і смелая жонка.

Пражыўшы год у Пецярбургу, Анастасія забрала дзяцей і пакінула свайго мужа назаўжды. Яна пасялілася ў Кане, адтуль пераехала ў Парыж, дзе і пражыла да скону яшчэ трыццаць гадоў. Там жа ўладкавалася і малодшая дачка Соф'я. Старэйшая − Анастасія − стала англійскай манашкай і цалкам адышла ад свету. Соф'я вяла неахайнае жыццё ў сырым сутарэнні, бавіла час у мясцовых кабаках з сябрамі-эмігрантамі. Яна трымала катоў і сабак, якія размнажаліся з такой хуткасцю, што сама гаспадыня гублялася сярод іх. Даглядаць за сабой у яе не даходзілі рукі. Калі ў 1939 годзе пачалася Другая сусветная вайна, усе парыжане кінуліся здабываць сабе супрацьгазавыя маскі. Соф'я адмовілася ад такіх пошукаў, матывуючы гэта тым, што для сабак супрацьгазавых масак няма. Калі немцы падышлі да Парыжа, жыхары сталі пакідаць горад. Соф'я спачатку таксама рушыла ў дарогу, але потым вярнулася, палічыўшы шлях занадта цяжкім. Калі маці была хоць крыху падобная да дачкі, то даводзіцца верыць таму, што расказваў Манэргейм. Нашмат пазней Соф'я казала аднаму свайму сябру, што вельмі ўражаная тым, як у Фінляндыі маглі зрабіць нацыянальнага героя з такога непапраўнага бабніка, якім быў яе



бацька. Напэўна, гэтае заяўленне − проста паўтор той думкі, якую выказала пра бацьку падчас разводу яе маці.

Манэргейм быў шчаслівы, калі ў другой палове трыццатых гадоў яму ўдалося звязацца з жонкай незадоўга да яе смерці. Ён пасылаў жонцы грошы, і паміж імі ўсталявалася даволі цёплая і добразычлівая перапіска.

1 красавіка Манэргеймава сястра Ева прыслала яму ліст, апісаўшы ў ім жыццё, якое вяла ў Кане Анастасія, і яе настрой. Пра вяртанне да мужа не магло быць гаворкі. Тым жа годам Манэргейм адправіўся на японскую вайну, пасля яе, адразу − у двухгадовае падарожжа па Азіі, вярнуўшыся з якога трапіў у Польшчу, потым чатыры гады праваяваў на франтах Першай сусветнай вайны, а пасля стаў рэгентам фінскай дзяржавы. Вось тады ён і запрасіў да сябе дачку Соф'ю. Яна спрабавала адыгрываць ролю гаспадыні як на афіцыйных мерапрыемствах, так і ў іншых выпадках, на кароткі час нават стала папулярнай фігурай у прэсе. Але так і не звыклася са сваім новым становішчам. Ды яна й не магла выконваць тыя задачы, якія ўскладаў на яе строгі і педантычны бацька. Яна неўпрыкмет з'ехала за мяжу разам з бацькам, калі той пакінуў краіну, склаўшы з сябе абавязкі рэгента. У дзяцінстве дочкі не вельмі часта бачылі свайго бацьку, а пасля і таго меней. Яны ўспаміналі, як бацька заходзіў у дзіцячы пакой: на парозе ўзнікаў вялізны чалавек, і Соф'я баялася, што ён не пралезе праз дзверы. Калі аднойчы разам з бацькам да іх зайшоў двухмятровы вялікі князь Мікалай, то Соф'я схавалася пад ложак. Манэргейм паставіў у дзіцячым пакоі трапецыю, арэлі і два паходныя ложкі, бо хацеў загартаваць дачок так, як гартавалі ў дзяцінстве яго самога. Соф'я казала, што яны баяліся бацькі. На яе думку, яго баяліся і ўсе іншыя жывыя істоты за выключэннем коней і сабак. Здаецца, што ў Соф'і было нейкае д'ябальскае пачуццё гумару, атрыманае ў спадчыну ад Манэргеймаў.

Увесну 1919 года Манэргейм дабіўся афіцыйнага разводу ў Фінляндыі. Ён спяшаўся. Суд у горадзе Торніа рабіў гэта хутка, дый аддаленасць мястэчка ад цэнтра гарантавала непрыкметнасць справы. Перад прэзідэнцкімі выбарамі Манэргейм хацеў пазбавіцца ад такога небяспечнага цяжару, як руская жонка. Жаночая палова насельніцтва краіны заўсёды з вялікім імпэтам абмяркоўва-

ла жонку будучага прэзідэнта і пісала пра яе так многа, быццам прэзідэнта трэба было выбіраць у залежнасці ад таго, якая ў яго жонка. Манэргейм не хацеў падобных дыскусіяў і спыніў іх яшчэ да іх пачатку.

### Японская вайна

Свае 37 гадоў Манэргейм сустрэў камандзірам эскадрона. Ён не паспрабаваў нават паступіць у ваенную акадэмію і трапіць у Генеральны штаб, каб такім чынам дасягнуць высокіх вайсковых чыноў. Ён быў салдатам, які збіраў свае лаўры ў манежы і на паркеце свецкіх салонаў. Праўда, ён атрымаў выдатную адукацыю, як наезнік і трэнер, да яго часта звярталіся па параду пры гандлі коньмі, хоць сам ён, здаецца, не надта верыў у свой талент вялікага конскага знаўцы.

У той час у Манэргейма пачалася паласа няўдачаў і няшчасцяў: камерцыя ішла няўдала, гэтак сама, як спробы наладзіць даходную дзейнасць маёнткаў, шлюб разваліўся. Для конных спаборніцтваў ён быў ужо занадта стары, рэчаіснасць паставіла кропку на ягоным прыватным жыцці ды іншых інтарэсах.

Па шматлікіх прычынах апошнія два-тры гады былі для яго невыносна цяжкімі. Патрабавалася рашуча змяніць лад жыцця, вызваліцца ад старога мінулага і ўбачыць новыя мэты і задачы. Манэргейм сам прызнаваўся, што часам ён бываў ў такім дрэнным настроі, што проста прымушаў сябе жыць далей.

Ён пісаў, што адной з прычынаў ад’езду на вайну былі вялізныя даўгі. Калі б ён і далей жыў у Пецярбургу, даўгі толькі раслі б. Афіцэрскага жалавання ні на што не хапала.

Адбываючы на фронт, ён ехаў пачаць новае жыццё або загінуць. А новае жыццё для яго азначала ачышчэнне вайной і простае, без усялякіх складанасцяў жыццё салдата.

Але тут на шляху Манэргейма раптам узнікла мноства перашкодаў. Гэта можа здацца дзіўным, калі ўлічыць, што ён адбываў на вайну. Лагічней было б думаць, што чалавека стараюцца выпіхнуць туды як мага хутчэй. Галоўнаю перашкодай сталі разладжаныя грашовыя справы. Сямейства ведала, што ў Густава вялікія картачныя даўгі. У Расеі з прычыны, што ён ішоў на вайну, яму нават не давалі страхоўку. Але затое далі ў другім месцы. Ён



атрымаў ажно дзве страхоўкі: адну на 20000 марак, а другую – на 100000 шведскіх крон. Пад гарантыю гэтых страховак Манэргейм здолеў узяць вялікую пазыку, дзякуючы якой расплаціўся з самымі вялікімі і найбольш тэрміновымі даўгамі. Цяпер можна было ехаць. У выпадку ягонай смерці страхоўку атрымаў бы брат Ёган.

Выпраўляючыся на фронт, ён за тысячу рублёў купіў двух выдатных коней. І як выдатны конскі гандляр, тут жа прадаў аднаго за 600 рублёў, а другога, на мянушку Талісман, пакінуў сабе. На ім Манэргейм і ваяваў, пакуль каня прама пад ім не забілі.

Дзеля зімовых ваенных дзеянняў Манэргейм экіпіраваўся найлепшым чынам, закупіўшы ўсё патрэбнае ў стакгольмскіх крамах.

Ад’езд, напэўна, не адбыўся б ніколі, калі б яго былы камандзір эскадрона, барон Г. Хойнінген, літаральна закасаўшы рукавы, сам не спакаваў ягоныя рэчы. Апроч трох чамаданаў, у яго было яшчэ на 90 кілаграмаў рэчаў, а розным людзям трэба было перадаць яшчэ 160 кілаграмаў.

Манэргейм самавольна ажыццявіў удасканаленні ў сваім шынялі, а менавіта перарабіў каўнер, кішэні і рукавы. Гэтак сама насуперак усім правілам і статутам ён зрабіў пазней і з фінскай вайсковай формай: напрыклад, спароў у парадным мундзіры гузікі на нагрудных кішэнях, каб яны не перашкаджалі прышпільваць узнагароды. У час Другой сусветнай вайны ён насіў плашч са светлай тканіны, што таксама не было прадугледжана статутам. Па ўсім відаць, што ў яго была схільнасць да стварэння новых мадэляў адзення, як у дзедавага брата, Аўгуста Манэргейма.

Экіпіруючыся на вайну, Манэргейм купіў скураную партупею для шаблі. Калі ж ён стаў прымацоўваць яе да пояса, металёвая дэталь зламалася. Манэргейм пайшоў у краму Скосарава, дзе зрабіў гэтую пакупку, і ў старанна выбраных словах і выразах выказаў гаспадару сваю думку наконт узроўню паслугаў у краме.

Падарожжа на Далёкі Усход цягнулася доўга. У дарозе Манэргейм шмат чытаў. Ён старанна вывучаў японскія вайсковыя статуты, але ,на здзіў, нічога карыснага для сябе там не знайшоў. Наадварот, там было шмат недахопаў. Сваю ролю ў гэтым адыграў і дрэнны пераклад на рускую мову.

Коні мусілі прыбыць у Харбін пазней, і Манэргейм застаўся іх чакаць. Паколькі меўся ворльны час, ён з’ездзіў на два дні ва

Уладзівасток. Непадалёк ад Уладзівастока размяшчаўся шпіталь, якім кіравала Бэтсі Шувалава – блізкая Манэргейму жанчына, сувязі з якой ён падтрымліваў доўгі час. Яна вызвалілася ад працы і прыехала на двое сутак ва Уладзівасток, каб пабыць у гатэлі разам з Манэргеймам. Гэтыя дзве ночы былі першыя, што ён правёў у гатэлі за месяц падарожжа. У цягніку ён падхапіў вошай і цела проста палала. Зёлкаў, каб пакончыць з гэтай бядой, ён здабыў у нейкім шпіталі, магчыма, нават у тым, дзе працавала Бэтсі Шувалава.

На фронце Манэргейм меў чын падпалкоўніка. На думку аднаго нямецкага ваеннага назіральніка, Манэргейм быў на дзіва малады для такога высокага чыну.

Гвардзейскі ротмістр, якім і быў Манэргейм, пераходзячы ў лінейныя войскі аўтаматычна атрымліваў наступны, болей высокі, чын. У дадзеным выпадку гэта быў чын падпалкоўніка. Немец спачатку здзіўляўся таму, што ў Манэргейма быў вельмі вялікі конь, але потым успомніў, што ў лейб-гвардыі імператара ўсе коні былі вялікія. Манэргейм запэўніваў немца, што не варта верыць тым дрэнным чуткам і плёткам пра рускіх, якія распаўсюджваюць прыбалты.

Едучы на фронт, Манэргейм пачаў пісаць дзённік. Гэта быў ягоны першы опус. Пазней ён напісаў яшчэ тры кнігі для чытачоў. Гэта былі дзве часткі «Вершкі па Азіі», «Успаміны» і справаздача Генеральнаму штабу рускай арміі аб ваенных назіраннях і высновах.

У пачатку свайго ваеннага дзённіка Манэргейм піша пра спадзевы й чаканні, якія ён ускладае на свой твор. Ён паведамляе, што заўсёды з вялікім задавальненнем чытаў мемуары, і лічыць вельмі важным, каб аўтар у іх выказваў свае думкі і ўражанні. Чыстага апісання падзеяў недастаткова. Вялікае значэнне маюць розныя гісторыі, байкі і плёткі. Ён расказвае таксама пра тыя роспач і безнадзейнасць, якія панавалі ў ягонай душы. Акалічнасці самага далікатнага чыну давялі яго да такой прыгечанасці, што яму ўжо не хапала мужнасці пачаць новае жыццё. І толькі ад’езд на вайну стаў пачаткам новага этапа ў яго біяграфіі. Без якога-небудзь вонкавага штуршка ён быў не здольны зрабіць нічога. І такім штуршком стала вайна.



Баявое хрышчэнне Манэргейм атрымаў, калі яны разам з казакамі падыходзілі да абнесенай гліняным мурам кітайскай вёскі. Наблізіўшыся на адлегласць 100–200 метраў, атрад спыніўся. Раптам вакол засвісцелі кулі. Гук нагадваў свіст нагайкі. Усяго праз імгненне паветра ўжо скрозь звінела ад страляніны і пошчаку куляў. Конь Манэргейма, 11-гадовы Аргус, узвіўся на дыбкі, і Манэргейм насілу стрымаў яго ад галопу, уратаваўшыся такім чынам ад ганьбы ўцёкаў з поля бою. З поўным самавалоданнем ён то прышпорваючы каня, то едучы спакойнай хадой, дабраўся да бліжэйшага пагорка. Усё гэта доўжылася некалькі хвілінаў. Манэргейм пісаў, што ў гэтыя хвіліны ім валодалі вельмі непрыемныя пачуцці.

Увечары баявыя таварышы сабраліся, каб выпіць па чарцы каньяку ў гонар Манэргейма і павіншаваць яго з баявым хрышчэннем. Гэта быў стары звычай яшчэ з каўказскай вайны. Манэргейм выпіў на брудэршафт з усімі прысутнымі афіцэрамі – цяпер яны сталі братамі па зброі. Афіцэру, асабліва гвардзейскаму, было вельмі важна зберагчы твар. А ў Азіі гэта было проста абавязкова. Наступныя чатыры гады Манэргейм пераважна меў справу толькі з азіятамі. Такім чынам яму ўдвая спатрэбіліся такія ягоныя якасці, як непахісная ўпэўненасць у сабе і цвёрдыя паводзіны ў любых абставінах. Дзякуючы ім ён выдатна справіўся з падарожжам па Азіі.

На фронце Манэргейм апынуўся на самым краі правага фланга, а па сутнасці нават за яго межамі, у зоне так званага вольнага палявання. Яму далі групу конных кітайскіх хунхузаў. Японцы пэўны час ужо выкарыстоўвалі такія групы, а цяпер гэта пачалі рабіць і рускія. Ужо тады Манэргейма апанавала прага дзейнасці, жаданне пайсці далей углыб мацерыка. Ужо тады ён падумваў пра выведчую ваенную экспедыцыю ў тым кірунку, а, вярнуўшыся ў Пецярбург, пачаў энергічна і мэтанакіравана ажыццяўляць гэтую ідэю. Яшчэ на Далёкім Усходзе ён выклаў свае ідэі начальству, і яны дайшлі да Генеральнага штаба, дзе да іх паставіліся прыхільна. Паколькі ініцыятыва належала Манэргейму, ён сам і вызначыў шмат якія мэты і задачы экспедыцыі.

Манэргейму абрыдлі афіцэры, якія прыязджалі з тылу пакрасавацца на фронце, надакучыла тактыка чакання без ніякай ініцыя-

тывы, адсутнасць парадку, што часта прыводзіла да беспадстаўнай панікі, устылі шалёныя п’янкі, брудныя кватэры і шматлікія паразіты. Ён хацеў вырвацца з усяго гэтага, з’ехаць як мага далей і ад Пецярбурга, і ад сваіх успамінаў. Кітай, бяскрайныя горы і пустэльні Цэнтральнай Азіі – гэта была магчымасць самага далёкага падарожжа. Там ён апынаўся па-за межамі Расеі. Але ж гэта сведчыла больш пра жаданне пахаваць мінулае, а не пачаць новае жыццё.

Калі ён вярнуўся з тэатра ваенных дзеянняў у Пецярбург, імперыя нагадвала бурлівы кацёл, царская ўлада пахіснулася. Беспарадкі панавалі паўсюдна. Ні тады, ні пазней, у 1917 годзе, Манэргейм быў няздольны – дый не жадаў – ні зразумець, ні ўспрыняць рэвалюцыю. Ён хацеў адкаснуцца ад усяго гэтага.

І вось на два гады ён знікае ў Азіі, а калі вяртаецца – усё ўжо супакоілася і зноў ідзе па старых рэйках. Дзякуючы сваім заслугам, ён атрымаў полк. Зрэшты, пра гэтае назначэнне ён ужо ведаў загадзя. Полк стаяў непадалёк ад Варшавы. З усходняй мяжы імперыі Манэргейма перавялі на самую заходнюю яе мяжу. Далей ад цэнтра, далей ад Пецярбурга – ён нібыта знарок пазбягаў сталіцы. Вайна закінула яго з Польшчы ў Румынію, потым на берагі Чорнага мора ў Адэсу. Адтуль ён трапляе на паўночны захад імперыі, у Фінляндыю. Пасля ад’езду на японскую вайну Манэргейм ужо ніколі не жыў ў Пецярбургу падоўгу. Ён хацеў пакончыць з успамінамі, якія звязвалі яго з гэтым горадам. 17 гадоў, самых лепшых у фізічных і духоўных адносінах, ён пражыў там, у самым сэрцы імперыі. А потым жа – толькі на яе межах або нават па-за імі. Моцнае прыцягнэнне сталіцы змянілася поўным яе непрыняццем, жаданнем адштурхнуцца і ахаваць сябе ад яе смяротнага ўплыву. Ад’езд на японскую вайну стаў другім паваротным пунктам ягонага жыцця. Першым было паступленне ў рускую вайсковую вучэльню. А трэцім стаў пачатак новага жыцця і новай кар’еры ў незалежнай Фінляндыі.

Па дарозе на фронт, у Чыце, Манэргейм упершыню ўбачыў кітайцаў. Асабліва вялікае ўражанне на яго зрабілі двое – такія ж рослыя, як і ён, але з магутнай, добра развітай мускулатурай. Сам Манэргейм быў высокі і сухарлявы. Кітайцы хадзілі вельмі прыгожай, пругкай хадою. Манэргейм валодаў такой паходкай і сцвярджаў, што навучыцца ёй можна за пару дзён. Калі ён разгледзеў кітайцаў бліжэй, то звярнуў увагу на пэўную жаночасць іхніх твараў.



Манэргейм адвострываў сваю назіральнасць на афіцэрах, з якімі даводзілася сустракацца. На гэты час ён стаў добрым знаўцам людзей. Генерал Мішчанка, напрыклад, валодаў зайздроснай здольнасцю ўважліва сачыць за настроем суразмоўцы і падзяляць ягоныя пачуцці, пра што не вялася б гаворка. Манэргейм сцвярджаў, што такім талентам валодала большасць рускіх генералаў. А генерал Сцяпанаў загадаў абабіць сцены ў сваім пакоі тканінай на кітайскі манер і засцяліў спальню і спальнік-кан цыноўкамі, а сам насіў блакітны аўстрыйскі шынель і ўвесь час учыняў спектаклі – аднойчы ён зняў акуляры з маладога ротмістра і пачаў круціць за падбароддзе ягоную галаву туды-сюды, нібыта дзеля таго, каб скласці пра маладога афіцэра нейкае правільнае ўяўленне. Манэргейма гэтая сцэна нікольні не здзівіла – ён ведаў, што генерал Сцяпанаў быў гомасексуалістам.

Чыта была тым горадам, куды ўцёклая жонка Манэргейма прыехала з Харбіна. Мяркуючы па ўсім, гэтае месца моцна ўразіла Манэргейма. Рослыя і статныя, як і ён, толькі болей магутныя і элегантныя, мужчыны маглі выклікаць у яго пачуццё рэўнасці і нават нейкай прыніжанасці. Але і ў другім горадзе, дзе працавала ягоная жонка, Манэргейм згледзеў на тварах кітайцаў пэўныя жаночыя рысы і супакоіўся.

Манэргейм сачыў не толькі за людзьмі, але і за коньмі. Аднойчы, калі яны пераходзілі раку Ляо, ягоны конь Талісман паслізнуўся на крутым гліняным беразе і зляцеў уніз. Ён разгубіўся і не мог падняцца, лежачы дагары капытамі, пакуль салдаты не перакулілі яго на бок. Толькі тады конь супакоіўся і здолеў устаць на ногі. Яшчэ адзін конь, Бурда, вельмі баяўся кананады і нерваваўся. Талісман паводзіў сябе болей спакойна.

Аднойчы Манэргейм захварэў. З-за высокай тэмпературы ён амаль не мог рухацца. Нягледзячы на гэта, ён вершкі прабіўся праз увесь Мукдэн, поўны ахопленымі панікай салдатамі, да санітарнага цягніка, які стаяў на поўнач ад горада, на станцыі Кушытан. Толькі праз чатыры дні цяжкага падарожжа ён дабраўся да перасоўнага фінскага шпіталя ў Гуншунліне, дзе яго распранулі,

памылі і ўклалі ў ложак. Тэмпература была 40,1. Праз тры дні яна панізілася. Разам з хуткай дапамогай гэтага шпіталя ён дабраўся да Харбіна, дзе прафесар Фальцын, яго аднакласнік па ліцэю Бёека, двойчы прачысціў яму вуха. З тае пары ён страціў слых на левае вуха да канца жыцця. У яго было двухбаковае запаленне вушэй і запаленне прастаты, такім чынам лячыцца давялося доўга. Былы кадэт з Хаміны, капітан Хуга Бакмансон, які паступіў у кадэцкі корпус, калі Манэргейма там ужо не было, таксама змог выбрацца з вогненнага пекла Мукдэна і скіраваўся на поўнач. Яго становішча было вельмі цяжкае. Амаль дзесяць дзён запар ён нічога не еў. Ён ніяк не мог прымусіць сябе з'есці смярдзючую кансерваваную марскую капусту. Праўда, ў паходнай біклажцы ў яго быў каньяк, а ў кішэнях знайшлося некалькі кавалачкаў цукру. Інтэндант фінскага шпіталя Сіткоў запрасіў яго да сябе адпачыць. Якраз у той дзень быў накрыты святочны стол, і бедачына так прагна накінуўся на піражныя ды іншыя прысмакі, што страціў прытомнасць. Ачуняў ён толькі назаўтра ў шпітальным пакоі, дзе ляжаў яшчэ адзін хворы, які чытаў хельсінкскую шведскамоўную газэту «Хувудстадбладэт». Гэта быў Манэргейм. Манэргейм сказаў, што чытае ў газэце артыкул пра сябе, напісаны Бакмансонам.

Яны сустракаліся на полі бою. Бакмансон прыйшоў у жах ад той адвагі, якую дэманстраваў Манэргейм. Ён неадрыўна сачыў за праціўнікам у бінокль, не звяртаючы ўвагу на часты агонь з таго боку. На патрабаванне Бакмансона пайсці у сховішча Манэргейм адказаў, што ніякай небяспекі няма. Адзін з прыяцеляў Манэргейма сказаў тады Бакмансону, што Манэргейм, здаецца, шукае сабе пагібелі. Манэргейм пайшоў у бяспечнае месца толькі тады, калі яму загадаў камандзір батальёна, палкоўнік Леш. Там у лагчыне і зрабілі групавы здымак, які потым згубіўся падчас уцёкаў з Мукдэна. Магчыма, гэты здымак і цяпер ляжыць у японскім вайсковым архіве.

У газэтным артыкуле Бакмансон расказвае, як Манэргейма, калі той упершыню трапіў на перадавую, затрымалі як японскага шпіёна. Прычынай таму сталася ягонае стыльнае адзенне, купленае ў Стакгольме, асабліва гамашы з жоўтай скуры. «На самой справе ўсё было не зусім так», − сказаў Манэргейм аўтару артыкула. Затое дома бацька пацяшаўся з гэтай гісторыі, усім расказваючы, як



ягонага даўгалыгага сына, такога раскошнага прадстаўніка еўракаўказкай расы, узялі за японца.

Манэргейм правёў ужо ў шпіталі некалькі дзён, калі пайшлі чуткі, што генерал Ліневіч, прызначаны камандуючым замест Курапаткіна, будзе інспектаваць шпіталі, каб выявіць сімулянтаў і вярнуць іх на фронт. Запаленне прастаты ў Манэргейма ішло на папраўку, і ён не хацеў, каб пра ягонае захворванне ведалі. Але сіла ў яго была яшчэ вельмі слабая, і рухаўся ён з дапамогаю мыліцаў. Адна шпітальная сястрычка сфатаграфавала іх з Бакмансонам, і гэты здымак быў апублікаваны ў Фінляндыі ў красавіцкім нумары газэты «Монадсрэвюн» за 1905 год.

Вярнуўшыся ў сваю частку, Манэргейм даведаўся, што яго прадставілі да звання палкоўніка. Ён па-ранейшаму служыў на самым краі правага фланга. На пачатку мая пасля пераходу ўброд рэчкі Манэргейм моцна прастудзіўся. Тэмпература дасягала 39,5 градусаў. Але ён штодзённа сядаў на каня і нёс службу, пакуль не зваліўся зусім, і яго давялося пакласці на паходныя насілкі.

Свой 38-гадовы юбілей Манэргейм сустрэў на маршы, нягледзячы на высокую тэмпературу. Язда вершкі прычыняла яму вялікія пакуты. Наступнай ноччу Манэргейм з двума эскадронамі прыбыў ва ўжо знаёмае яму мястэчка Кослантун. Ноч ён правёў у сядзячай ванне. Удзень стаяла страшэнная спёка. Усё здавалася поўным вар'яцтвам. Генерал Сцяпанаў, які пры любым выпадку цалаваў салдатаў, дзейнічаў усім на нервы. А той раз ён прызначыў выхад брыгады на самы спякотны час, бо напярэдадні напіўся на эскадроннай вечарыне. Рэч у тым, што нейкі казачы афіцэр сказаў, быццам пачаліся мірныя перамовы.

Манэргеймаў конь Талісман быў вельмі хуткі. Ягоны бацька выйграваў дэрбі. Талісман вызначаўся гарачым норавам, прыгожай рыссю і элегантным алюрам. Ён быў не надта пражорлівы і лёгка паддаваўся навучанню. За зіму Манэргейм навучыў яго ўсяму, што патрабавалася баявому каню. Адзіным яго недахопам была зласлівасць у дачыненні да іншых коней. Два другія Манэргеймавы кані былі пужлівыя і палохаліся стрэлаў. А Талісман быў пад агнём спакойны, як і гаспадар. Аднойчы падчас абстрэлу каня напаткала смяротная куля. Манэргейм не зразумеў наколькі сур'ёзная была рана, бо конь працягваў бегчы і ўпаў толькі ў бяспеч-

ным месцы. Гэта адбылося вясной. Манэргейм моцна смуткаваў па сваім кані.

На гэтай вайне, як і пазней, Манэргейм замаўляў побытавыя тавары ў Фінляндыі і Швецыі. У яго зберагаліся пэўныя сумы, бо траціць грошы тут не было дзе. У нейкім адным са штабоў прадстаўленне Манэргейма да чына палкоўніка замянілі на ордэн Уладзіміра, і гэта вельмі яго ўзнервавала.

У жніўні пад камандай Манэргейма апынуліся тры сотні хунхузаў. Гэтыя рабаўнікі з вялікай дарогі атрымоўвалі па 45 рублёў жалавання ў месяц, але коней, адзенне і харчы мусілі здабываць самі. Яны і здабывалі − без грашовых затратаў, рабуючы ў вольны час. Патроны і вінтоўкі ім давалі рускія. Яны ездзілі на сухіх, жвавых мангольскіх жарабцах. Хунхузы былі маладыя дужыя і спрытныя хлопцы. На конях яны гэтак жа лёгка спраўляліся з карабінамі, як і з нагайкамі. Рускія драгуны ў параўнанні з імі выглядалі проста няўклюдна.

У першы рэйд Манэргейм узяў сем рускіх афіцэраў-добраахвотнікаў, а тыя ўзялі з сабою дзеля аховы пяць рускіх драгунаў. Праз два дні з трох соцень хунхузаў засталося ўсяго толькі сто сорак. Астатнія зніклі немаведама куды. Манэргейм узяў палову хунхузаў, што засталіся, і зрабіў рэйд на 160 кіламетраў, каб зайсці ў тыл японцам. Ён дайшоў да самай Манголіі. Краявіды ўражвалі прыгажосцю. У паходзе яны харчаваліся кашай і кансервамі, купаліся ў рэчках. Манэргейм змог уявіць усе прыемныя бакі свайго будучага падарожжа па Азіі. Рэйд працягваўся восем дзён. За гэты час атрад Манэргейма прайшоў 400 кіламетраў, і Манэргейм начарціў дакладныя карты свайго маршрута. Яны пілі малако і кумыс, чаго ў мангольскіх вандроўных пастухоў было ў дастатку. Манэргейм купіў сабе карову, але нягледзячы на ўсе высілкі, яна давала малака не больш за бутэльку. Падчас падарожжа па Азіі Манэргейма напаткала тая ж праблема. Каб карова даілася, трэба было побач ставіць цяляці або класці цялячую скуру.

Манэргейм кіпеў з-за таго, што прысваенне палкоўніцкага чыну затрымлівалася. Каб ён трапіў на фронт у першыя дні вайны, дык цяпер ужо быў палкоўнікам і камандзірам палка. Ён падлічыў, што, калі чын палкоўніка яму прысвояць у жніўні, а тэрмін службы палічаць з лютага, дык полк ён атрымае не раней, як праз год.



Дома яго таксама чакалі страшэнна заблытаныя праблемы: трэба было дзяліць даходы і маёмасць паміж супругамі. Гэтыя праблемы ён мусіў абавязкова вырашыць, і гэта атручвала ўсё ягонае жыццё.

Старэйшы брат Карл, нягледзячы на графскі тытул, моцна звязаў сябе з буржуазіяй. Тытул перайшоў да старэйшага сына. Карл далучыўся да так званай групы «Кагал» − групы пасіўнага супраціву русіфікацыі. Ён працягваў цвёрдую канстытуцыйную лінію свайго бацькі. Сам таго не падазраючы, Густаў належаў да супрацьлеглага лагеру. Ён трымаўся лініі кампрамісаў. Ён не прызнаваў рэзкіх заклікаў да барацьбы. Уласна кажучы, ён ішоў далей за партыю старафінаў, далей, чым, напрыклад, Паасіківі, паколькі лічыў, што Фінляндыя сваімі значнымі і нават вялікімі паслугамі Расеі заваюе ў яе давер і верне страчаныя правы ды ільготы. Пра тое, каб паднесці такія ідэі фінам, не было чаго і думаць. Іхні дух быў настроены на барацьбу з царскім самадзяржаўем, на ваенную падрыхтоўку і ваенныя дзеянні.

Рускія выслалі брата Карла з Фінляндыі, і той з’ехаў у Швецыю. Ягонаю жонкай была вядомая спявачка і славутая прыгажуня Айна Эрнрут. Падчас паўстання ў Свеабаргу яна прадстаўляла «Кагал» на перамовах паміж рускімі матросамі і фінскімі чырвонагвардзейцамі. Магчыма, мужчыны проста пабаяліся пайсці самі, а таму паслалі замест сябе жанчыну, думаючы, што ёй паўстанцы не прычыняць нічога благога. Манэргейм ніколі не пісаў і ніяк не выказваўся пра гэтую жанчыну. Што да Карла, дык ягоная камерцыя ў Швецыі пайшла нядобра, і ён памёр ва ўзросце пяцідзесяці гадоў ад раку.

Падпольная газэта пасіўнага супраціву «Фрыя Орд» («Вольнае слова»), якую кантрабандай дастаўлялі ў Фінляндыю, апублікавала чорны спіс фінаў, якія, нягледзячы на прыгнёт рускага самадзяржаўя, працягвалі яму служыць верай і праўдай. Было ў гэтым спісе і прозвішча Манэргейма. У той час гэта азначала грамадскую смерць.

На гэтым адрэзку жыцця Манэргейм з лёгкай пагардай, нібы гарэзлівы школьнік, гаварыў пра фінскую мову і яе носьбітаў. Магчыма, гэта было нешта накшталт вучнёўскага гумару тых часоў. Летам 1905 года ён пісаў сястры Соф’і, якая думала ехаць у

фінскую правінцыю Хяме, каб вывучаць фінскую мову, што гэта мова чудзі. Чудзь – гэта гістарычная мянушка, якую рускія ўжывалі адносна фінскіх плямёнаў. Манэргейм шкадаваў, што сястра едзе не ў Швецыю, а да гэтых чухонцаў.

І пасля вяртання з японскай вайны ён ставіўся да ўсяго гэтага па-ранейшаму. Ён пісаў пра свой намер падацца ў паліцыю, бо на службе ў жандармерыі можна лёгка даслужыцца да высокіх пасадаў. Ён адчуваў сябе пакрыўджаным і лічыў, што яго не ацанілі па заслугах, проста адсунуўшы ўбок. Ён стаў агрэсіўны. Казалі, што ён пабіў адну высокапастаўленую асобу – намякалі нават на аднаго з вялікіх князёў – за тое, што той публічна пляткарыў пра Манэргеймаву жонку, кажучы, што тая ходзіць па мужчынах. Апроч таго, хадзілі чуткі пра любоўныя сувязі паміж Манэргеймам і адной вялікай князёўнай. Казалі і пра тое, што яго паставілі перад выбарам: або ён адпраўляецца ў падарожжа па Азіі, або вылятае з арміі. Не дзіва, што ў такім настроі ўсе фіны для яго станавіліся чухонцамі, а іхняя мова – бог ведае якім закінутым азіяцкім дыялектам.

12 лістапада 1905 года ён пісаў сястры, што пачаў ужо раскайвацца ў сваім намеры зрабіць падарожжа праз Манголію. Значыць, яшчэ тады Манэргейм планаваў падарожжа па Азіі, хоць і думаў, што яно будзе карацейшае і пачнецца з усходу. Але ва ўсякім выпадку робіцца ясным, што ён хацеў апынуцца як мага далей ад сваіх жыццёвых клопатаў і праблемаў. Хаос у войску, затрымкі з павышэннем у чыне – усё гэта вельмі раздражняла і злавала яго.

Гэтым жа днём ён паехаў у Харбін, каб дабіцца чатырохмесячнага адпачынку па стане здароўя. Адпачынак патрабаваўся, каб неяк абдумаць сваё жыццёвае становішча і вырашыць, што рабіць далей. Ён планаваў атрымаць ад падарожжа па Манголіі не толькі цікавыя практычныя вынікі, але і матэрыяльную карысць. Але, з другога боку, ізаляванасць ад палітычнага жыцця Расеі магла яму дацца ў знакі. Краіна кіпела. Цар выдаў маніфест і згадзіўся на канстытуцыю. Манэргейм зацікавіўся гэтымі важнымі момантамі жыцця. Пераўтварэнні ў кіраванні дзяржавай адкрывалі новыя магчымасці і пасады ў кіраўніцтве. У некаторых колах Фінляндыі нават пагаворвалі аб назначэнні Манэргейма на вышэйшую дзяржаўную пасаду, якой у той час была пасада статс-сакратара Фінляндыі пры імператарскім двары.



Падарожжа ў цягніку з Далёкага Усходу да Пецярбурга доўжылася цэлы месяц. Калі ж у лістападзе Манэргейм прыбыў на месца, то даведаўся, што ягонае прозвішча ўключанае ў спіс новапрызначаных палкавых камандзіраў.

На пачатку 1906 года Манэргейм атрымаў аўдыенцыю ў імператара і чын палкоўніка. Па ягонай просьбе выслугу яму палічылі з лютага 1905 года. Манэргейм паехаў у Фінляндыю лячыць рэўматызм. Ён узяў удзел у апошнім пасяджэнні станавага прадстаўніцтва, як прадстаўнік свайго роду. Гэтую магчымасць даў яму бацька. Шляхецкі стан таксама даў згоду на парламенцкую рэформу, паводле якой у краіне усеагульным народным галасаваннем абіраўся парламент. Але сам Манэргейм быў настроены крытычна. Ён лічыў, што народ яшчэ не гатовы да рэформаў, а новы парламент ніякім чынам не ўкладаецца нават у рамкі канстытуцыйнай царскай улады. Усе гэтыя перамены народзяць толькі новыя цяжкасці і прывядуць да пагаршэння стасункаў паміж Фінляндыяй і Расеяй. Манэргейм не прымаў такое развіццё падзеяў і надоўга захаваў адмоўнае стаўленне да парламента. Ён лічыў дэпутатаў некампетэнтнымі і ў надзейнасць такога парламента не верыў. А да ўсеагульных выбараў у той час ён увогуле ставіўся з насмешкай.

# III. ПАДАРОЖЖА ПА АЗІІ

## Даследчая экспедыцыя ў Кітай

На пачатку сакавіка Манэргейм атрымаў ад Генштаба Расеі заданне адправіцца ў даследчую экспедыцыю па Цэнтральнай Азіі. Заданне аказалася нашмат шырэйшае, чым ён думаў, – яго выкананне было разлічанае аж два гады.

Экспедыцыя мела на мэце высветліць, як уплывае палітыка абнаўлення і рэформаў у Кітаі на памежныя расейскія землі. Манэргейму ставілася задача нанесці на карту дарогі, па якім пойдзе экспедыцыя, ацаніць іх ваенна-практычнае значэнне, скласці статыстыку шчыльнасці насельніцтва, прыродных багаццяў і вытворчых магутнасцяў. Апроч таго, яму трэба было высветліць настрой малых народаў, якія менш як паўстагоддзя таму ўзнялі паўстанне супраць цэнтральных і мясцовых уладаў Кітая, а таму Манэргейму ставілася задача вызначыць, у якой ступені гэтыя народы гатовыя да супрацоўніцтва з рускай арміяй у выпадку ўзнікнення крызіснай сітуацыі.

Мэты ваеннай разведкі і шпіянажу маскаваліся пад навуковыя даследаванні. Прыналежнасць Манэргейма да рускай арміі меркавалася цалкам захаваць у тайне. Пад выглядам шведскага падданага ён уключаўся ў французскую навуковую экспедыцыю. Францыя і Расея былі ў той час саюзнікамі і багата супрацоўнічалі ў ваеннай сферы, аднак тая экспедыцыя не мела ніякіх адносінаў да ваеннага ведамства, а таму кіраўніцтву эспедыцыі зусім не спадабалася ідэя ўключэння ў яе склад рускага афіцэра дзеля ваеннага шпіянажу. Манэргейма там прынялі вельмі непрыязна, што ён адразу адчуў на ўласнай скуры.

Манэргейм вырашаў сам, якому аспекту даследаванняў – геаграфічнаму ці этнаграфічнаму – надаваць большую ўвагу. Але безумоўна, што ўсе геаграфічныя даследаванні праводзіліся з чыста ваеннымі мэтамі.

Манэргейм загадзя склаў маршрут падарожжа, які быў ухвале-



ны і зацверджаны імператарам. З самага пачатку гэты маршрут ніякім чынам не супадаў са шляхамі французскай экспедыцыі.

Спачатку Манэргейма планавалі забяспечыць фрацузскім пашпартам, але французскае Міністэрства замежных справаў не дало згоды, і ён адправіўся ў падарожжа пад выглядам шведскага навукоўца. Пошта з Фінлядыі прыходзіла да Манэргейма праз Швецыю, дзе яе перакладалі ў новы, шведскі, канверт і ставілі штампы шведскай пошты. Гэтыя камбінацыі праводзіліся з мэтай увесці ў зман кітайскія ўлады.

Сувязным стаў Манэргеймаў бацька. Як і кожны сапраўдны шпіён, Манэргейм дасылаў прамежкавыя рапарты ў Генеральны штаб, устаўляючы іх у доўгія лісты да свайго бацькі. Той у сваю чаргу выдзяляў з тэксту важныя для Генштаба звесткі і адсылаў іх начальніку Генштаба, які выступаў пад псеўданімам Федзя. Гэта было імя высокапастаўленага афіцэра Генштаба, прозвішча Паліцын нідзе не згадвася.

Манэргейм набыў два фотаапараты і навучыўся карыстацца імі. Ён купіў таксама шмат рэчаў для падарункаў і хабару, бо іх у Азіі трэба было раздаваць усім і кожнаму. Ён набраў з сабою нажоў, сонечных акуляраў, компасаў, іголак, парфумы, карамельных цукерак, якія звычайна браў і для сябе, дзе толькі мог, каляровых алоўкаў, паперы і канвертаў. У падборы падарункаў яму дапамагаў фінскі даследчык Азіі і выдатны знаўца кітайскай, японскай ды мангольскай моваў Г.Й. Рамстэд. Кіраўніка французскай экспедыцыі Пэліёта ён папрасіў купіць у Парыжы гадзіннікаў, люстэркаў, музычных куфэркаў, каляровых паштовак з жаночымі выявамі і нават парнаграфічных картак. На гэта была патрачана тысяча франкаў.

Падарожжа Манэргейма фінансавалася расейскім Генеральным штабам, статс-сакратарыятам Фінляндыі, Фіна-вугорскім таварыставам, сябрам якога быў Манэргейм, ды іншымі арганізацыямі. Ад названага таварыства Манэргейм атрымліваў стыпендыю. А яшчэ пяць тысяч марак яму дала сястра Соф'я. Жалаванне выплачвалася на працягу ўсяго падарожжа.

Багаж Манэргейма складаў 490 кілаграмаў. У Ташкенце, адкуль пачынаўся шлях экспедыцыі, Манэргейм набыў пуд пораху, сем бярданак і 2000 патронаў для іх. Да яго дайшлі чуткі, што цар

распусціў Дзяржаўную думу, і гэта прымусіла яго паспяшацца з ад'ездам. Ён нібыта прадчуваў беспарадкі, сведкам якіх быў падчас японскай вайны і адразу пасля яе. З ліхаманкавай паспешлівасцю ён закончыў падрыхтоўку і рушыў у дарогу.

Манэргейм пачаў падарожжа ў адпаведнасці з указаннямі Пэліёта і далучыўся да французскай экспедыцыі ў Ташкенце. Пэліёт сустрэў яго раззлавана, бо Манэргейм не прывёз абяцанай дапамогі ў 10000 франкаў. А калі Манэргейм яшчэ і падпарадкаваў сабе двух з пяці казакоў, якія па ягоным хадайніцтве прыехалі суправаджаць экспедыцыю, Пэліёт зусім прыйшоў у шаленства. Праз два тыдні знаёмства з гэтым сусветна славутым французскім падарожнікам Манэргейм напісаў бацьку, што гэта дробязны, сквапны і ўпарты чалавек з цяжкім характарам, які ўмешваецца ва ўсе справы, дзе трэба і дзе не трэба. Калі Манэргейм даведаўся, што французская экспедыцыя адпраўляецца на Лабнор, ён заўважыў, што рабіць яму там няма чаго.

Пэліёт прыгразіў Манэргейму, што, калі кітайцы пацікавяцца ягонай асобай, ён ім раскажа, што Манэргейм не швед, а рускі афіцэр. І апроч таго, ён сказаў, што хутчэй за ўсё забароніць яму праводзіць даследаванні па маршруце праз перавал Муртаз, дый наогул любыя выведчыя работы паблізу расейскай мяжы, бо гэта можа нашкодзіць усёй экспедыцыі. А ўвогуле было б лепей, каб Манэргейм, не ўваходзячы непасрэдна ў склад французскай экспедыцыі, проста ішоў следам за ёй. Манэргейм зразумеў, што дапамогі і падтрымкі ад французаў наўрад ці дачакаешся, а таму паспрабаваў іх задобрыць, перадаўшы сваіх двух казакоў у распараджэнне Пэліёта, і нават выдзеліў сродкі на іх утрыманне. Апроч таго, вялікую частку сваіх тавараў ён уключыў у французскі абоз. Але ўсё гэта не дало ніякіх вынікаў.

Поль Пэліёт легкадумна распавёў праўду экспедыцыйнаму лекару, маёру Луі Ваяну, а, магчыма, яшчэ і фатографу Шарлю Нуэту. Кітайцы пранюхалі пра гэта даволі хутка, і пекінскія газэты ўперабой паведамлялі, што чужаземец, які фатаграфуе масты, перавалы і горныя праходы, – гэта рускі падданы. Не выключана, што гэтыя звесткі пранікл у прэсу праз кітайскага перакладчыка, які чуў размовы французаў. Манэргейму ўдалося прабыць шведам толькі да Кашгара.



У Кашгары рускі консул паказаў Манэргейму сакрэтныя рапарты аб узрослай актыўнасці японцаў у правінцыі Сіньцзян. Таму ён адхіліўся ад першапачаткова запланаванага маршруту і не пайшоў на паўднёвы ўсход, а рушыў праз Яркенд і Хатан уздоўж заходняй ускраіны пустэльні Такла-Макан. Аднак нідзе на сваім шляху ён не сустрэў японцаў, як не пабачыў і слядоў іхняй дзейнасці. Такія адхіленні ад запланаванага маршруту яму давялося рабіць не адзін раз. Англічане, якія пільна сачылі з Індыі за падзеямі ў гэтых месцах, так і не даведаліся нічога пра сапраўдную задачу Манэргейма. Ды ён і сам прыкладаў усе намаганні, каб зберагчы гэтую таямніцу. Нават казакі не ведалі, што ён афіцэр рускай арміі. Безумоўна, гэта і прывяло да выпадкаў непаслушэнства і парушэнняў дысцыпліны. Манэргейм з-за гэтага мусіў адаслаць аднаго з казакоў назад у гарнізон. Замест яго прыслалі другога казака, які неўзабаве паказаў сябе нечакана добрым салдатам.

У Самаркандзе Манэргейм накіраваўся ў штаб размешчанай там казацкай дывізіі, а адтуль яго правялі ў казармы Уральскага казацкага палка, якія месціліся за пяць кіламетраў ад цэнтра горада. Па загадзе імператара яму далі патрэбную колькасць казакоў, прычым сорак чалавек выклікаліся добраахвотнікамі. Потым камандзір палка выбраў з іх самых лепшых. Правяраючы рыштунак і коней, якія аказаліся маленькімі і круглымі ад перакорму, Манэргейм спытаў у выраных казакаў, ці разумеюць яны, што гаворка ідзе аб падарожжы ў два гады. Казакі дружна адказалі, што хай сабе і ўсе чатыры.

Манэргейм пачаў падарожжа не зусім так, як апісвае гэта ў сваіх мемуарах, – ён выехаў разам з французамі, а не з двума казакамі і адным перакладчыкам. Так ён падарожнічаў тры сотні кіламетраў, перш чым пайсці сваім шляхам.

Доўгае падарожжа заўсёды пачынаецца з першага кроку. Манэргейм выбраў шлях уздоўж арашальнага канала, каб коні змаглі крыху прасвяжацца каля вады ў палючую спёку. Раптам адзін з коней паспрабаваў ускочыць на стромкі бераг, але сарваўся і паляцеў у ваду разам з коннікам. З усіх рэчаў сухім застаўся толькі фотаапарат, шмат вады налілося пад шкло компаса і гадзінніка, у запасы паперы. Праўда, міліметровая папера для вычэрчвання картаў і схемаў знаходзілася ў абозе і ацалела. Галоўнае было –

высушыць нататнік. Толькі цяпер Манэргейм заўважыў, што страціў стрэмя, якое адвязалася ад сядла і ўпала ў канал. Адзін казак на прозвішча Рахім'янаў палез у ваду і ўзяўся шукаць згубленае стрэмя, асцярожна ступаючы нагой па дне канала, – ба стрэмя ж было незаменнаю часткай падарожнага рыштунку. Нарэшце яму ўдалося яго знайсці. Такім чынам Манэргейм атрымаў наглядны ўрок пераацэнкі каштоўнасцяў: стрэмя было для яго важнейшае за ўсе тыя дарагія цацкі, якія яму так хацелася, але, на вялікі жаль, не ўдалося ўзяць з сабою. Сістэма каштоўнасцяў змянялася на вачах.

Больш як на год Манэргейм затрымаўся ва Усходнім Туркестане, які ўваходзіў у склад Кітайскай правінцыі Сіньцзян і быў населены мусульманскімі цюркскамоўнымі народамі. Манэргейм абдумваў, як рускім можна было б дзейнічаць ў гэтым раёне найлепшым чынам. Моцнае кавалерыйскае злучэнне з артылерыяй і кулямётамі было б здольнае лёгка авалодаць горадам Кашгарам і адрэзаць групоўку кітайскіх войскаў, што знаходзілася ў Сіньцзяне, ад цэнтральнай паўднёвай групоўкі за Вялікім кітайскім мурам. Тады гэтая вайсковая групоўка не ўяўляла б сабой ніякай небяспекі, асабліва, калі размесціць гарнізоны ў некалькіх стратэгічна важных пунктах і такім чынам пазбегнуць небяспекі контрдзеянняў. Болей тут рабіць было нечага, бо асноўныя бітвы павінны разгарнуцца на ўзбярэжжы Ціхага акіяна.

На працягу трох тыдняў Манэргейм падарожнічаў па Вялікім ядвабным шляху. У Яркендзе, які Манэргейм назваў прыгожым горадам, ён мусіў затрымацца на пяць тыдняў з-за свайго рэўматызму. У сваім падарожным дзённіку Манэргейм неахвотна піша пра свае хваробы.

Праз сем месяцаў аднаго казака на прозвішча Янусаў давялося адправіць дамоў. Рахім'янаў быў болей моцны і цягавіты, можа, таму, што быў больш ленаваты і патрабавальны і не такі паслужлівы, як Янусаў. Замест яго прыслалі казака на прозвішча Луканін, які аказаўся чалавекам дужым, спрытным і здольным – ён хутка навучыўся гаварыць па-кітайску, чаго Манэргейм дасягнуць так і не здолеў, нягледзячы на свае неаднаразовыя і настойлівыя спробы.

На самых цяжкіх адрэзках шляху Манэргейм ехаў верхам на кані, якога звалі Піліп. Гэта быў выдатны жарабец, але з адной маленькаю хібай: ідучы па горных дарогах, ён звычайна ступаў па самым беразе прорвы, чым прыводзіў у жах свайго седака. Два другія кані здохлі ад сапу, і таму Манэргейм цалкам залежаў цяпер ад Піліпа. Часам ён прыпісваў каню свае пачуцці і думкі, бо лічыў, што разумее яго не горай, чым чалавека. На адным з самых цяжкіх горных пераходаў Піліп ашалеў – нібыта, ад выгляду конскіх шкілетаў і чарапоў (коні гінулі тут ад непадсільнага цяжару ці па якой іншай, трагічнай прычыне). І супакоіўся толькі тады, калі ўрэшце звыкся з жудасным выглядам белых костак. Але конь наўрад ці разумеў, што тыя косці і рэшткі адносяцца да коней, а не якой іншай жывой істоты. Манэргейм увогуле часта піша пра коней і сабак, як пра людзей – гэта было звычайнай з'явай у тагачаснай літаратуры. Але ж Манэргейм мастацкай літаратуры не чытаў, а значыць, гэта было проста гумарам і звычайным для вялікага аматара коней імкненнем атаясаміць сябе з сваім улюбёнцам.



Піліп добра трываў усе цяжкасці падарожжа, хоць шмат разоў падаў у расколіны і бяздонні. Часам яго не кармілі па двое сутак, дый ён наогул еў усё, што траплялася. Кітайцы выстаўлялі на прыдарожжы корм для коней. А ўжо наколькі гэты корм быў ядомы, каню даводзілася вызначаць самому па смаку і паху.

Пасля прыезду ў Пекін Манэргейм прадаў Піліпа Карнілаву, які пазней стаў генералам, а тады быў прызначаны ваенным аташэ ў Кітаі. Два гады таму Карнілаў адпраўляў экпедыцыю Манэргейма ў падарожжа з Ташкента, а цяпер праз выпадковае супадзенне меў магчымасць павіншаваць яго са шчаслівым вяртаннем у цывілізацыю. Пазней Манэргейму давялося сустрэцца з Карнілавым яшчэ. У сусветную гісторыю Карнілаў трапіў у 1917 годзе, калі першым з белых генералаў паспрабаваў – хоць і няўдала – звергнуць урад Керэнскага і рушыў свае войскі на Пецярбург. У тыя часы Манэргейм належаў да групы генералаў, якія не прынялі рэвалюцыю і выступалі супраць яе.

Падчас падарожжа па Азіі Манэргейм быў не зусім адрэзаны ад астатняга свету. З рускіх факторыяў і консульстваў ён адсылаў лісты і нават вялікія пасылкі. Ён адсылаў, напрыклад, галовы ўпаляваных ім горных казлоў і набытыя прадметы народнага побыту,

якія мелі этнаграфічную і гістарычную каштоўнасць, а таксама справаздачныя дакументы. Тут жа ён атрымліваў і адрасаваную яму пошту.

У падарожжы ён прасякнуўся цалкам імперыялістычнымі, кіплінгаўскімі поглядамі на правы і абавязкі белага чалавека, які ўзваліў на свае плечы цяжар цывілізацыйнай місіі. Кыргізы ды сарты – нацыянальныя меншасці Расеі і Кітая – увесь час скардзіліся на кіраўніцтва і спосабы дзеяння белых людзей. А тым часам будаваліся чыгункі, рамантаваліся дарогі, паспяхова развівалася бавоўнаводства, на зямлі ўсталёўваліся бяспека і спакой. На думку Манэргейма, характэрнымі для мусульманаў Туркестана рысамі былі адсутнасць логікі, здзяцінелнасць і няздольнасць бачыць шырокія перспектывы развіцця. Манэргейм быў абсалютна няздольным зразумець і ўбачыць, што развіццё імперыялізму і, асабліва, яго распаўсюджанне на слабаразвітыя краіны, магло ўспрыймацца там як прыгнёт і пазбаўленне тамтэйшых людзей маёмасці і правоў.

## Уражанні і назіранні

У падарожным дзённіку Манэргейм апісваў пачуцці, уражанні і назіранні, якія сам перажыў, адчуў ці ўбачыў на свае вочы. Нечакана датэрміновае заканчэнне натамляльна аднастайнай дарогі было адным з самых моцных такіх уражанняў. Ён апісвае прыезд у Кашгар 30 жніўня 1906 года так: «Пячэ сонца. Усё часцей і ўсё больш нецярпліва распытваем сустрэчных сартаў, колькі засталося да Кашгара, які здаецца такім блізкім і такім недасягальным. Адзін кажа – «адна вярста», другі – восем вёрст. Насельніцтва становіцца ўсё болей шматлікае, пыл – болей шчыльны, рух на дарозе – болей ажыўлены, а горада ўсё не відаць. Сонца пячэ, галава цяжэйшая, чым звычайна, і я адчуваю неадольнае жаданне выцягнуцца пад дрэвам і кінуць гэтае падарожжа. Марна я стараюся асвяжыцца сакавітымі персікамі. У роце перасохла, язык прыліп да гартані. Здаецца, у мяне лёгкі сонечны ўдар. Нарэшце мы ў горадзе і праязджаем паўз крапасны мур. Я ў роспачы думаю, што рускае консульства – у іншым кітайскім гарадку вёрст за 12 адсюль, але тут перад намі раптам узнікаюць некалькі чыстых, пакрытых зялёнаю бляхай дамоў, што сведчыць аб прысутнасці еўрапейцаў. І праўда – гэта мясцовая кантора Руска-Кітайскага банка, а крыху далей – будынак рускага консульства з садам. На час майго знаходжання ў Кашгары мне даюць прасторны дом на беразе ракі. Я рассцілаю свой плашч на каменнай падлозе, кладу пад галаву ягдташ і з асалодай выцягваюся на ўвесь рост».



У гэтым урыўку Манэргейм расказвае пра ўсё, нічога не забываючы і не прапускаючы дэталяў. А гэта ўласціва толькі добраму пісьменніку, чалавеку, які здольны адлюстраваць праўду, перамогшы свае ўласныя схільнасці і здагадкі.

На здзіў вялікі паэтычны эфект можа быць выкліканы проста падманам пачуццяў і адчуванняў. Так, аднойчы падчас падарожжа па каменнай пустэльні Манэргейм звярнуў увагу на тое, што жарства такога зялёнага колеру, нібыта ўвесь схіл гары пакрыты зялёнай травой. Наступным днём ён убачыў пагоркі такога ж зялёнага колеру. Самае дзіўнае было тое, што разгледзеўшы ўважліва жарству на схіле, ён не знайшоў там ніякай зеляніны.

Самым геніялным у Манэргеймавых апісаннях з'яўляецца яго абвостранае ўспрыняцце агульнай карціны, уменне давесці сваё ўспрыманне да самай мяжы і нават перайсці яе.

Манэргейм уважліва вывучаў чужыя звычаі і чужы лад мыслення. З прачытанага яму стала ясна, чаму, ацэньваючы адлегласці і даўжыню падарожжа, кітайцы называюць розныя лічбы ў залежнасці ад цяжкасці дарогі – ідзе яна ўверх ці ўніз, лягчэйшая для праезду або цяжэйшая. Іначай кажучы, яны ператвараюць намаганні, якія патрабуюцца на адоленне такога шляху, у адпаведную даўжыню, дадаючы яе да рэальнай адлегласці.

Вока падманвае і няправільна ацэньвае адлегласць. Аднойчы сонечным красавіцкім раннем Манэргейм з лагера ў Бурзе разглядаў Аг'язскія горы на поўдні. У сваім беласнежным убранні яны здаваліся зусім блізкімі, і цяжка ўяўлялася, што шлях да іх падножжа можа доўжыцца не менш за паўтара дня.

Нешматслоўна і выразна Манэргейм мог распавесці пра тое, што бачыў, не забываючы пры гэтым даць убачанаму сваю ацэнку, выкласці свае думкі. Праўда, часта яны былі занадта суб'ектыўныя, і іх можна лёгка абвергнуць. Так, ён апісвае вясельны картэж кыргізаў, сустрэты падарожнікамі ў бяскрайнім стэпе: «Валасы нявесты заплецены ў косы, што звісаюць на твар. Яна выглядае

суровай і самаўпэўненай, выраз твару непрыемны... Коні проста прадзіраюцца праз высокую траву...» Гэта мастацкая літаратура высокага ўзроўню. Вобраз нявесты здзіўляе сваёй адмоўнасцю. Паводле заўседнага клішэ, нявеста павінна быць прыгожая. Манэргейм мімаходзь абвяргае гэтую ўстойлівую думку і малюе жывы, праўдзівы вобраз, чым, безумоўна, выдае і свае пачуцці, пачуцці чалавека, зняслаўленага і прыніжанага разводам.

З сапраўды кіплінгаўскай сілаю Манэргейм апісвае Кітай за Вялікім мурам, які ён перасякае 29 лістапада 1907 года, праехаўшы праз уражвальна магутную браму Коўль. Звонку на браме можна прачытаць выбіты на камені тэкст: «Ді-ішун-ган» – першая грозная брама. Гэтая брама аначасова з'яўляецца і магутным умацаваннем. І Манэргейм спыняецца на ноч у заезным двары ля яе падножжа.

«Аднастайныя працяглыя гукі вячэрняй трубы даносяцца з кітайскага гарнізона крэпасці і з крышталёвым празрыстым звонам нясуцца ў зорнае зімняе неба. Потым чуецца некалькі гарматных стрэлаў, якія заклікаюць прыстойных людзей пасяпшацца дадому, і тады я выразна чую, як Кітайская імперыя з грукатам зачыняе ўсе пяць сваіх магутных, закутых у жалеза брамаў, і вось мы ўжо ўсе сядзім за моцнымі запорамі, пад замком».

### Кітайскі Новы год

Урэшце, свет застаецца аднолькавым у любым месцы. Перад валадарнымі асобамі Цэнтральнай Азіі Манэргейм мусіў паводзіць сябе яшчэ болей ветліва і стрымана, чым пры царскім двары. Калі ён сустрэўся з 95-гадовай кіргізкай княгіняй, якая, абапіраючыся на двух служкаў, нарэшце прыйшла да юрты, дзе Манэргейм у адпаведнасці з этыкетам чакаў яе візіту, гаворка сталася пустым абменам ветлівымі фразамі. У адказ на гэта патрабавалася толькі ветліва кланяцца лёгкім паклонам.

У 1908 годзе Манэргейм спыніўся ў вялікім горадзе Ланьчжоў. На працягу цэлага месяца ён не рабіў у свой дзённік ніякіх запісаў – да такой ступені яму абрыдла штодзённая пісаніна.

У горадзе былі еўрапейскія місіянеры, біскуп і навуковая бібліятэка. Там Манэргейм захварэў і прапакутаваў цэлы тыдзень. Яму невыносна балелі ногі, спіна і галава. На такую самую хваробу



захварэлі і чацвёра ягоных людзей. Манэргейма даглядаў місіянер Прэдзі. У яго быў яшчэ адзін пацыент-місіянер Купітэрс, які з-за хваробы мусіў застацца ў горадзе, а калі паправіўся, то ўразіў і лекара, і Манэргейма сваёй заявай аб тым, што ён памёр у Ланьчжоў, а тое, што жыве цяпер – гэта проста цуд. «Ніякія мае спробы выбіць шаленства з гэтай каталіцкай галавы, якая паверыла ў цуды, не ўдаліся», – пісаў Манэргейм. А навокал кітайцы бесперапыннымі карнаваламі з ранку да ночы адзначалі Новы год. Грукаталі бубны, бразгалі металёвыя талеркі, гучалі выбухі петардаў. Гвалт і грукат, які зваліся кітайскаю музыкай, доўжыліся два тыдні. Па горадзе сюды-туды шпацыравалі самадзейныя аркестры. Звычайна ў іх склад уваходзіла васьмёра бубначоў і столькі ж талерачнікаў. Час ад часу музыкі высока падскоквалі. Манэргейму «пашанцавала» – адзін такі аркестр збіраўся ў яго пад акном, а яно было папяровае. Перш чым рушыць у абход па горадзе, аркестр як шалёны граў некалькі гадзінаў на месцы збору. Увесь горад амаль бесперапынна быў на нагах, многія ездзілі на маленькіх запрэжаных коньмі павозках, у якіх сядзела не менш як па дзве размаляваныя кабеты. Гэтай парой усе жанчыны штодзень выходзілі на вуліцу – гэта быў адзіны перыяд у годзе, калі ім дазвалялася пакідаць дом, дзе ўвесь астатні час яны сядзелі, як у вязніцы. Гандляры насілі вялізныя падносы і гучнымі крыкамі прапаноўвалі свой тавар: замарожаную садавіну ды цукеркі. Пад грукат бубнаў і звон талерак аркестры сноўдалі сярод шматлікага натоўпу. Перад кожным аркестрам ішлі 2–3 чалавекі ў мужчынскай і жаночай вопратцы, якія прыкідваліся зданямі і нячысцікамі, і даволі такі аднастайнымі сваімі штукарствамі вельмі весялілі натоўп гледачоў. У адным месцы народ пацяшаўся з трох хлопцаў, замаскаваных пад параход. У другім – рухалася стракатае карнавальнае шэсце. Недзе ўдалечыні над чалавечымі галовамі плыў вялізарны дракон, якога неслі і якім кіравалі чалавек дзесяць. У другой палове дня па горадзе святочным маршам прайшоў гарнізон. Штыхі старых стрэльбаў былі ўпрыгожаныя вялікімі жоўтымі выцінанымі з паперы кветкамі.

Чым бліжэй падыходзілі будзёныя дні, тым болей у горадзе было шуму, музыкі ды петардавых выбухаў. Здавалася, што мірных кітайцаў апанавалі нячысцікі шуму, грукату і музыкі.

Так апісвае Манэргейм кітайскі Новы год. Ён засведчыў, што класавая розніца ў Кітаі кідаецца ў вочы не так выразна, як у Еўропе. Здавалася, што ўсе людзі створаныя тут на адзін капыл. Аднолькавае адзенне, аднолькавыя манеры, аднолькавы абавязак удзельнічаць у святах і аплочваць іх. Апроч таго, Манэргейм адзначыў, што кітайцы – як знатныя, так і нізкародныя – валодаюць выразным пачуццём формы і парадку. Аднак ён пагардліва назваў гэта мастацкай дэкарацыяй і штукарствам. Трэба памятаць, што з-за хваробы Манэргейм быў тады ў дрэнным гуморы.

### Панурыя горы

Манэргейм з задавальненнем – калі б толькі была такая магчымасць – узяў бы пэндзаль і living рознымі колерамі размаляваў аднастайна шэры горны краявід Цэнтральнай Азіі. Таму яго вельмі ўзрадавала, калі пасля шматдзённага коннага пераходу праз горы ён нарэшце ўбачыў зялёную траву. Пачуццё гумару ў яго стала вастрэйшым, бо ўспрымаць тутэйшую рэчаіснасць без ніякага гумару было б цяжкавата.

Аднойчы Манэргейм вылаяў сваіх людзей за тое, што яны без дазволу ўсталі занадта позна. На другі дзень кухар прачнуўся а палове першай ночы і падняў усіх, бо яму здалося, што настаў час світання і пад'ёму. Манэргейма разбудзілі а палове чацвёртай. Ён вырашыў неяк узнагародзіць сваіх людзей і падараваў ім гадзіннікі. Але ніводзін з чатырох ключоў да гадзіннікаў не падышоў. Заводзіць іх не было чым. Адзін гадзіннік Манэргейму ўдалося такі накруціць, але і ён не пайшоў. Манэргейм мусіў прызнаць, што, калі ўсе 15 гадзіннікаў будуць у такім стане, дык дарыць іх каму-небудзь не варта.

У складзе экспедыцыі ў Манэргейма быў юнак, які збіраўся прайсці з падарожнікамі даволі доўгі шлях, але раптам успомніў, што праз некалькі дзён яму трэба жаніцца. Выходзіла, што, калі ён пойдзе з Манэргеймам далей, дык спозніцца на ўласнае вяселле. Хлопцу было васемнаццаць год, а ягонай нявесце – трынаццаць. Манэргейм зазначыў, што прычына вельмі сур'ёзная і пярэчыць супраць яе нельга. Дзядзька, які суправаджаў юнака, цэлы дзень перад ад'ездам аказваў Манэргейму розныя знакі азіяцкай прыязнасці. Але слухаць на працягу цэлага дня, як цяжка дзядзьку будзе перажыць разлуку з падарожнікамі, – было нялёгкім абавязкам.



Манэргейм вучыў кітайскую мову. Апроч перакладчыка, ён наняў сабе і асобнага настаўніка кітайскай мовы, а паколькі ў таго настаўніка быў слуга, дык Манэргейм аплочваў і ўтрыманне слугі. Каб лепей навучыцца мове, Манэргейм забараніў перакладчыку гаварыць па-руску.

Кожны дзень прыносіў новы каштоўны вопыт. Шматлікія плямёны здзіўлялі падарожнікаў на кожным кроку. Так, Манэргейм марна спрабаваў купіць коней у гордых і маўклівых афганцаў. Трэба сказаць, што коні ў іх былі выдатныя. А калі адзін афганец усё ж разгаварыўся, дык увесь час усхваляў самастойнасць і ваяўнічасць свайго народа.

У Манэргейма была выдатная здольнасць паўсюль выдатна ўладкоўвацца і паўсюль пачуваць сябе, як дома, незалежна да таго, была гэта Варшава, ці стаўка ў Міккелях, ці глінабітная кітайская хаціна з дымагрэйным канам-ложкам. У ёй было спакойна і цёпла. З нейкім неверагодным спакоем ён вельмі натуральна прыстасоўваўся да начлегаў у хлявах без дахаў.

На пачатку 1907 года Манэргейм спазнаў цяжкасці і прыгнёт недружалюбных гор. Падарожнікам не хапала вады, бо па дарозе не траплялася нават снегу, які можна было б растапіць. Асабліва ад недахопу вады пакутавалі коні. Манэргейм адзначае, што коні вытрымлівалі без вады толькі паўтара дні. Аднойчы, калі Манэргейм вычэрчваў карты, цемра застала яго ў гарах і ён мусіў шукаць начлег. На стромым горным схіле стаялі дзве кіргізскія юрты. Манэргейм зазірнуў у адну. Там былі тры жанчыны, трое дзяцей і дзевяць мужчын. Немаўля ў люльцы бесперапынна плакала, вакол ціскалася 30–40 авечак. Манэргейм зайшоў у другую юрту, дзе яго сустрэла сярдзітая старая і пачала нешта злосна мармытаць. Паваліў снег. Манэргейм уклаўся спаць сярод авечак. Ён пачаставаў бы гаспадароў мясам, але ў яго нічога не было. Ён бачыў, як агаладалыя жыхары юрты грызлі голыя косці, на якіх не было ніводнае жылкі, не тое што мяса. Манэргейм зайшоў у сябе хлеба і цукру і аддаў гэта жыхарам юрты, якія вельмі ўзрадваліся такому дарунку. У гэтай юрце было дванаццаць дарослых, чацвёра дзяцей і сорак авечак. У такой цеснаце нельга было на-

ват выцягнуць ногі. Навокал пішчалі дзеці, бляялі авечкі, але Манэргейм праспаў да пятай гадзіны раніцы, бо напярэдадні адзінаццаць з паловай гадзінаў правёў у сядле.

Снег усё яшчэ сыпаў, было халодна і цёмна. Манэргейм патраціў яшчэ паўгадзіны, пакуль дабраўся да месца, дзе ўчора спыніў сваю картаграфічную працу.

У падарожных дзённіках Манэргейм апісвае ўсё, што адбывалася з ім, так выразна і жыва, што стварае ў чытача своеасаблівы настрой і вострае пачуццё рэальнасці таго жыцця, якое ён бачыў тады вакол.

2 сакавіка 1907 года ў кітайскім горадзе Аксу Манэргейму ўдалося правесці ноч у добраўпарадкаваным доме і паспаць у пакоі, дзе было двое вокнаў і печ. Ён сядзеў на сапраўдным зэдліку за сапраўдным сталом. Ноччу яму сніліся сны адзін за другі лепшы. Перад ягонымі вачыма адзін за адным праходзілі цудоўныя краявіды і ажывалі старыя добрыя часы. Усе гэтыя відовішчы праходзілі на фоне чароўнай музыкі. Прачнуўшыся, Манэргейм са здзіўленнем пачуў, што музыка не спыняецца. Таямніца хутка раскрылася. У адной нішы стаяў музычны гадзіннік, і гаспадар, жадаючы дагадзіць госцю, завёў яго на пэўны час, каб ён сыграў кароткую мелодыю. Манэргейм пісаў, што гэта занесла яго ў чароўны свет казачнай фантазіі. Ён не верыў у сны і ніколі не пісаў пра іх. Але чалавек − слабая істота, а таму простая сталёвая спружына і музыка, якая ліецца з музыкальнага куфэрка, уплываюць на ягоныя пачуцці і даюць магчымасць паспытаць усе радасці штучна створанага рая.

Расказваюць пра два прадказанні, якія збыліся цалкам. Абодва яны адносяцца да канца 1917 года. Пра першае Манэргейм піша ў сваіх успамінах сам. Перад яго ад’ездам у Фінляндыю прафесійная гадалка ў Адэсе прадказала яму бліскучую будучыню. Апошнім днём старога года ў кватэры сястры ў Хельсінках другая гадалка раскінула карты і на стол ляглі адны чырвоныя буйныя карты ды тузы. Імклівы ўзлёт Манэргейма ў 1918 годзе, ператварэнне з нікому невядомага вайскоўца ў яркую зорку на палітычным небасхіле Еўропы, ператварэнне з драбязы накшталт двойкі ці тройкі ў палітычнага туза патрабавалі такога прадказання, нейкага містычнага закліку, злавеснага знаку. Пазней самыя адданыя прыхільнікі



Манэргейма пачнуць казаць пра лёс ці Боскае наканаванне. Сам жа Манэргейм і кола ягоных бліжэйшых паплечнікаў задавальняліся размовамі аб магічных сілах і тэорыі верагоднасці.

Каб перамаляваць чарнавікі картаў начыста, Манэргейм мусіў зрабіць прыпынак на шэсць дзён. Ён баяўся, што начэрчаныя алоўкам карты сапсуюцца і стануць ні да чаго непрыдатнымі. З глыбокім задавальненнем ён адзначае, што на карту нанесена больш за тры сотні кіламетраў ягонага маршруту. Ён з вялікай асалодай з’ядае супы, звараныя кухарам Ізмаілам. Добры настрой і стан душы Манэргейма можна патлумачыць тым, што ён выканаў свой абавязак і пастаўленую задачу. Сама праца служыла яму ўзнагародай. На ягоных картах белых плямаў не засталося. Часам, каб усё закартаграфаваць і каб ягоныя карты былі як мага паўнейшымі, ён мог збочыць з асноўнай дарогі і праехаць вялікую адлегласць. Гэтак сама старанна ён апісваў масты праз рэкі, пазначаў глыбіню рэк, тэрміны паводак і разводдзяў. Ён адзначаў, ці расце непадалёк ад мастоў лес і колькі яго, каб з яго можна было пабудаваць новы мост, калі стары спаляць кітайцы.

Ён даследаваў дарогі да вёсак і гарадоў, схілы гор, з якіх да тых вёсак і гарадоў можна падысці без людскіх стратаў. Ён лічыў дамы ў населеных пунктах, колькасць скаціны, коней, пасяўныя плошчы і будучыя ўраджаі.

Кітайцы ад самага пачатку ведалі, кім напраўду быў Манэргейм. У кожным мястэчку і горадзе, дзе былі гарнізоны, вышэйшыя афіцэры і чыноўнікі паказвалі яму, якія спрытныя і цямкія кітайскія салдаты. Адзін афіцэр нават прымусіў сваіх шматлікіх жонак паказаць сваё стралковае майстэрства. Кітайцы − добрыя стралкі, і гэта было адзінае, чым яны вызначаліся ў ваеннай справе, а таму цалкам зразумела іхняе жаданне паказаць, на што яны здольныя, і пахваліцца сваім уменнем.

Самым маленькім вайсковым падраздзяленнем былі пікеты, або заставы, з двух чалавек, якіх Манэргейм шмат пабачыў на дарогах. У асобную карціну складваецца апісанне такой сустрэчы 22 лістапада 1907 года непадалёк ад горада Аньцзы. Гэта быў даволі выразны аповед:

«Снег перастаў, але моцны ўсходні вецер шалёна кідаў нам у твары жмені снегу, снег забіваўся пад футры і ў валёнкі. Пра-

ваднік, якому мандарын загадаў суправаджаць нас, не з'явіўся ў назначаны час, і мы рушылі ў дарогу, арыентуючыся на тэлеграфныя слупы ўздоўж дарогі. Дарогу зусім завеяла снегам. Толькі чыста выпадкова нам удалося праехаць па ёй. Мы ехалі па рытвінах, абмінаючы сумёты і перабіраючыся ад аднаго меней заснежанага месца да другога. На адлегласці 200 сажняў злева да нас віднеўся невялікі гай, крыху падалей – другі. А ўвогле перад намі была раўніна, парослая грубым невысокім кустарнікам. Завіруха схавала далёкія горы, што высіліся на поўдні. За сямнаццаць з паловаю вёрст ад горада мы ўбачылі невялікую рачулку, якая, апісаўшы шырокую дугу, падыходзіла да самай дарогі. Прыкладна за вярсту далей стаяла глінабітная хацінка. Мы ўвайшлі туды пагрэцца. У хатцы было два ўваходы – адзін з дзвярыма з трох дошак са шчылінамі на тры пальцы, а на другім праёме ўвогуле нічога не было. Дзеля лепшага абмену паветра ў столі пакінута даволі вялікая дзірка. У гэтым прадзіманым наскрозь памяшканні, прыдатным толькі пад летняе жытло і нічым не абароненым ад зімовых замецяў, цяпер жылі два салдаты, якіх паслалі сюды пасвіць дванаццаць казённых кабыліц. Два кітайскія мінакі распалілі з галінак маленькае вогнішча. Адзін салдат, напэўна, цяжка хворы, стогнучы ляжаў на глінянай ляжанцы. Кітайцы ішлі пешшу з Хунаня ў Аньцзы папрасіць якой-небудзь працы ў аднавяскоўца, які стаў у горадзе вялікім начальнікам. Усю сваю паклажу яны неслі на каромысле, зробленым з расколатай уздоўж бамбукавай палкі. Да яго былі прывязаныя два саламяныя брылі і два парасоны. Адзін кітаец меў на дзіва прыгожыя, нібы высечаныя з каменя, рукі».

Вось такую добрую прозу мог пісаць Манэргейм. Ён пастаянна згадвае рукі, уважліва разглядае іх. У тыя часы вопратка звычайна пакрывала чалавека амаль цалкам, пакідаючы даступнымі воку толькі твары ды рукі, калі іх не хавалі пад пальчаткамі. У тварах кітайцаў Манэргейм тады разбіраўся яшчэ не надта добра.

Праз пяць дзён Манэргейм забіраецца ў самае сэрца ночы, у пустэльню без ніякіх падзеяў. Снежнае покрыва таўшчынёй 30 сантыметраў засцілала зямлю.

«Прыблізна за сем з паловаю вёрст ад пачатку раўніны мы прайшлі паўз руіны невялічкай адрыны, а праз адзінаццаць вёрст



дабраліся да глінянай хаткі. Напэўна, яе з самага пачатку прызначалі дзеля свайго роду часовага прыстанку. Там жывуць два старыя, амаль знясіленыя, кітайскія салдаты, якія, падобна ўсім астатнім, нічога не ведаюць ні пра свае абавязкі, ні ў чым заключаецца іхняя служба».

І тут узнікае пытанне: а дзе жанчыны? Манэргейм правёў у падарожжы два гады. У той час ён быў мужчына ў самым росквіце і меў славу зацятага бабздыра. Але ніякіх звестак пра тое, што сярод удзельнікаў экспедыцыі былі жанчыны – еўрапейскай ці азіяцкай расы, – няма. Толькі ў самым канцы падарожжа, калі Манэргейм дабраўся да самага сэрца Кітая, да горада вялікай культуры, дзе ўбачыў модна апранутых жанчын з элегантнымі манерамі, якія ці то былі пад пільным прыглядам, ці то прапанаваліся на продаж, – толькі тады ён пачаў звяртаць увагу на мясцовых жанчын і выявіў іхнюю эратычную прывабнасць. Ён пачаў шмат пісаць пра жанчын у ліпені 1908 года.

Увечары падарожнікі спыніліся на адпачынак у вёсцы Мэйтцюр. У сувязі з гэтым Манэргейм пісаў:

«Мяне атакавала адна старая, якая надзвычай адкрыта і навязліва прапанавала мне наведаць нейкую дзяўчыну гадоў дваццаці. Па словах гэтай бабулі, дзяўчына ўяўляла сабой нешта незвычайнае. На маю думку, жанчыны ў гэтых краях не такія брыдкія, як у іншых месцах. Яны высокія, зграбныя, з добрай паходкай, маюць просты нос, авальны твар і прыгожыя вочы». Тут Манэргейм выказвае свае патрабаванні да жаночай прыгажосці. Высокую культуру і манеры ён ставіць на першае месца. Яшчэ болей захапляўся Манэргейм на пачатку падарожжа, калі ўпершыню пабачыў далонцаў. Іхнія рукі і ногі мелі надзвычай правільную форму, пальцы на руках былі доўгія і тонкія, а на нагах другі палец – даўжэйшы за вялікі. Паводле канонаў японскага мастацтва і часоў Адраджэння, у прыгожых жанчын другі палец на назе заўсёды павінен быць даўжэйшы за вялікі, а астатнія – такія ж гнуткія, тонкія і спрытныя, як на руках – мусяць мець аднолькавую даўжыню з першым пальцам. Толькі тады пальцы ног маглі лічыцца прыгожымі. Тут зноў мы знаходзім пацверджанне таму, што Манэргейм заўсёды і ў першую чаргу звяртае ўвагу на рукі чалавека.

У горадзе Аксу праходзіў кітайскі карнавал. Маладая прыго-

жая дзяўчына з народнасці сартаў, адной з нацыянальных меншасцяў Кітая, прадавала на вуліцы з каляскі розныя дробязі з дрэва і паперы. Манэргейм наблізіўся, каб сфатаграфаваць гэтую прадстаўніцу гожай паловы чалавецтва, і тут выявілася, што гэта мужчына, апрануты ў жаночае адзенне. Ён так зжыўся з гэтаю роляй, што нават закрываў твар чадрой, а калі Манэргейм папрасіў дазволу зрабіць здымак, толькі мацней прыціснуў веерам чадру да свайго твару. Такі вось прыгажун-трансвестыт. Уся гэтая шматзначнасць, містэрыя забароненага і схаваныя за ёй элегантнасць, какецтва і гумар часткова зберагалі ілюзіі, хоць і перайначвалі іх на іншы лад. А Манэргейм умеў зберагаць ілюзіі і цаніў іх.

### Цудоўны тыдзень

На пачатку мая 1907 года Манэргейм гасціў у калмыцкага князька Насумбатава, чалавека багатага і магутнага. У яго было дзве сотні жаўнераў, коннікаў і 1500 коней. Некалькі гадзінаў Манэргейм ездзіў, разглядаў і вывучаў табуны коней. Там было 400–500 выдатных кабыліц, ад якіх не адмовіўся б ніводзін конезавод. Насумбатаў падарыў Манэргейму вялікага каня з адзінай невялічкай заганай – у яго былі занадта мясістыя ногі. У адказ Манэргейм падарыў бярданку з патронамі, палічыўшы, што гэта будзе раўназначным падарункам. Насумбатаў заўважыў, што Манэргейм не надта радуецца падарунку, і прапанаваў яму другога каня, якога хацеў прынесці ў ахвяру багам.

Ад Насумбатава Манэргейм пераехаў на бераг ракі Аг'яз і паставіў там свой лагер. На беразе стаяў вялізны камень з рысамі чалавечага твару, і Манэргейм вырашыў яго сфатаграфаваць. Але каменны твар асвятляўся ў патрэбнай ступені толькі ўранні і ўдзень паміж першай і другой гадзінамі. Нацэліўшы камеру, Манэргейм цярпліва чакаў гэтых кароткіх імгненняў, каб зрабіць здымак. У Кітаі ён зрабіў ужо сотні здымкаў і стаў амаль прафесійным фатографам і псіхолагам, бо здымаць у гэтых краях было няпроста. Людзі лічылі, што здымак пазбаўляе іх уласнага «Я» і тым самым паграджае выкраданнем чалавечай душы, а таму патрабавалася немалое майстэрства ці нахабства, каб угаварыць іх зняцца.

Вакол уздымаліся магутныя горы, парослыя густымі лясамі. Да



падарожнікаў далучыўся мясцовы паляўнічы, стары Нумган. Яны ехалі ўздоўж ракі, і калмык зваліўся ў ваду разам з канём. Манэргейм здзівіўся таму, што стары не пайшоў уброд некалькіх астатніх метраў, а ўпарта стараўся сесці верхам на каня, хоць вада некалькі разоў накрывала яго з галавой. І дзед не супакоіўся, пакуль такі не залез у сядло.

Як і рэкі ў Фінляндыі, гэты паток віраваў у вузкім скалістым рэчышчы. Манэргейм слухаў яго пошум, лежачы ў сваім намёце начною парой.

Пасля шматгадзіннага падарожжа група дабралася да месца, дзе рака падзялялася на два рукавы. Там на густой сакавітай траве яны паставілі лагер.

Наступным днём кухар-калмык сказаў, што бачыў на гары 50 горных казлоў. Манэргейм зірнуў туды, але паспеў згледзець толькі сямнаццаць. Але пакуль яны сядлалі коней, намерваючыся пусціцца па слядах статка, пачалася звычайная для горнай мясцовасці завіруха, калі вецер, здаецца, дзьме з усіх бакоў адразу.

Кухар, з саракакілаграмовай торбай за плячыма, пачаў гатаваць суп. У торбе ён трымаў запас сухароў і ніколі з ёю не разлучаўся, каб зберагчы каштоўны груз, – сухары складалі важную частку харчавання, бо прыпасы імкліва канчаліся, зусім як на караблі пасярод акіяна.

Нарэшце Манэргейм выправіўся на паляванне і палез угору па стромым схіле, але двойчы прааперыраванае калена не вытрымала такога напружання. Адвячоркам яно моцна разбалелася, а да вечара ўжо абое каленяў распухлі ад кровазліцця. Манэргейм наклаў павязкі з воўны і за ноч яго стан крыху палепшаў, а каля чавертай гадзіны ўранні ён ужо быў на нагах і зноўку палез на гару. Але і гэты раз ён мусіў вярнуцца. А вось Нумган не скарыўся і разам з новым казаком Луканіным на працягу трынаццаці гадзінаў шукаў горных казлоў. Для такой упартасці былі ўсе падставы – быў закрануты паляўнічы гонар калмыка.

Нумган прапанаваў перанесці лагер на 16 кіламетраў далей, дзе горныя схілы былі болей спадзістыя, так што наверх можна было заехаць на кані. Новы лагер паставілі на беразе невялікага прытоку рэчкі Оні-су.

Наступным днём, 22 мая 1907 года, Манэргейм вырашыў лю-

бою цаной упаляваць свайго першага горнага казла. На схілах абапал рэчкі пасвіліся невялічкія статкі па 4–5 жывёлінаў. Як толькі Манэргейм дабраўся да перавалу, дзе пасвіўся такі статак, нечакана наляцеў буран, вецер данёс да жывёл чалавечыя пахі і ўвесь гурт імгненна знік.

Нарэшце ў адным распадку яны знайшлі чатырох горных казлоў. Пакуль Манэргейм, задыхаўшыся, выбіраў ахвяру і цэліўся, важак пачуў небяспеку. Але Манэргейм паспеў стрэліць і, мяркуючы па крывавых слядах, падраніў жывёлу. Гэта адбывалася на вышыні 4100 метраў.

Нумган параіў спусціцца ў глыбокую расколіну і адтуль падняцца на супрацьлеглы бок. Там, на вяршыні гары, пасвілася шаснаццаць сернаў. У адной былі такія вялізныя рогі, якіх Манэргейм не бачыў ніколі ў жыцці. Гэта было цудоўнае відовішча. Адлегласць да іх была з палову кіламетра, але Манэргейм стрэліў. Статак з вялікай годнасцю пайшоў прэч, часам спыняючыся і паглядаючы на стралка. На вяршыні гары яны спыніліся, утварыўшы на фоне неба непараўнальную карціну, а потым зніклі з поля зроку паляўнічых. Два раней незаўважаныя статкі ўзбіраліся па другім схіле, а на адной вяршыні стаяў невялічкі гурт сернаў, якія аглядалі даліну ўнізе. Незлічоныя кроплі з горных ручаінак зіхцелі на сонцы шматкаляровай непаўторнай мазаікай. Манэргейм пісаў, што гэта было райскае месца.

Дождж вымусіў падарожнікаў спусціцца ў лагер. Адтуль яны заўважылі 16 арлоў-падлажэраў, якія кружылі якраз прыкладна там, дзе Манэргейм падстрэліў казла. Падняўшыся зноў па схіле, яны знайшлі цудоўны экземпляр дзесяцігадовага самца – за кіламетр ад таго месца, дзе яго напаткала куля.

Па дарозе назад Манэргейм разам з канём саслізнуў уніз па схіле. Ён ляцеў потырч галавой у глыбокую расколіну. Коннік быў надта цяжкі і конь не мог спыніцца, нягледзячы на тое, што зрабіў дзве адчайныя спробы. Манэргейм падумаў, што настаў ягоны канец. Аднак яму ўдалося ўчапіцца за галіну вялікага дрэва, што расло на схіле. Галіна зламалася, але ён ўстояў на месцы. Конь без седака таксама выбраўся наверх.

Наступным днём, 23 мая 1907 года, Манэргейм адправіўся на паляванне без Нумгана. Ён цвёрда вырашыў здабыць горнага казла. Напярэдадні ўвечары Нумган пайшоў паляваць на казлоў і да гэтай пары не вярнуўся. Напэўна, ён недзе заначаваў у гарах. Але амаль цэлы дзень Манэргейм са сваімі людзьмі лавіў коней, бо напярэдадні загадаў пусціць іх папасвіцца, не спутаўшы ног. Да другой гадзіны ўдалося злавіць восем коней з дванаццаці. І тут зноў наляцеў моцны буран. Тэмпература ўпала на 15 градусаў, і дождж ператварыўся ў снег. Лавіць чацвёра астатніх коней не было сэнсу. Праз 25 гадзін вярнуўся з палявання Нумган. Яму не ўдалося ўпаляваць горнага казла, замест яго ён падстрэліў серну. Манэргейм да таго часу таксама здабыў адну серну, якая была трошкі большая, чым у Нумгана. Гонар старога паляўнічага быў моцна закрануты. А Манэргейм быў вельмі задаволены.

Яны вырашылі зрабіць апошнюю спробу назаўтра, 24 мая 1907 года. Але завіруха ўсё не сціхала, і Манэргейм загадаў пакінуць гэтае месца. Снегу было шмат, шалеў паўночны вецер. На паўдарозе да ранейшага лагера падарожнікі ўбачылі за рэчкай на горным схіле статак казлоў. Караван пайшоў далей да месца былой стаянкі, а Манэргейм з Нумганам кінуліся за статкам. Аднак, калі яны перабраліся праз бурлівую раку, жывёлы адбегліся так далёка, што гнацца за імі не было ўжо ніякага сэнсу. І ўсё ж, калі паляўнічыя дабраліся да лагера, Нумган не вытрымаў і папрасіў дазволу паехаць на пошукі збеглага статку. Манэргейм дазволіў, але як толькі калмык паехаў, вырашыў пашукаць шчасця сам, бо нават думка пра тое, што Нумгану пашанцуе аднаму, была яму невыцерпная. Ён ехаў па рэчышчы рэчкі Хаптхаун. Мясціны былі незнаёмыя, бо раней тут яны не былі. Пасля некалькіх гадзін язды Манэргейм і яго праваднік нарэшце ўбачылі невялікі статак горных казлоў на ніжнім схіле гары. Паляўнічыя схавалі коней, і Манэргейм пачаў паўзком падкрадацца да жывёлаў. Калі ж ён дабраўся да месца, адкуль было зручна сачыць за наваколлем, то са здзіўленнем убачыў, што ніякага статку на месцы няма. Ён лічыў, што жывёлы мусяць быць ніжэй за яго, але хутка ўбачыў, што яны стаяць метраў на дзвесце вышэй і сочаць за ягонымі недарэчнымі рухамі і марнымі намаганнямі. Ён накіраваў на іх стрэльбу, але жывёлы мігам кінуліся ўверх па скалах. Праз пэўны час яны спыніліся паглядзець уніз. Тады Манэргейм стрэліў і з вялікаю радасцю ўбачыў, што адна жывёліна запаволіла бег і аб-

рынулася ўніз. Гэта быў дзесяцігадовы казёл. Адна куля прабіла яму грудзі і лёгкія, а другая трапіла ў галаву. Так Манэргейм сам, без дапамогі Нумгана ўпаляваў свайго першага горнага казла.

На другі дзень, калі яны зняліся са стаянкі, Манэргейм падстрэліў яшчэ аднаго вялікага самца. Жывёла перакулілася ў паветры і з разбегу ўпала ў расколіну. Калі Манэргейм распавёў пра гэта Нумгану, той проста не паверыў. Манэргейм загадаў яму праверыць. На дне не было нічога. Трэба было пабачыць выраз твару старога паляўнічага. Тады Манэргейм вырашыў сам спусціцца ў расколіну. Схіл быў вельмі стромкі і хутка Манэргейм апынуўся на маленькім выступе, адкуль не мог ні падняцца ўверх, ні спусціцца ўніз. Нават павярнуцца на ім было вельмі цяжка і небяспечна. Не відаць было і слядоў, якія ён пакінуў падчас спуску. Ён пачаў клікаць на дапамогу. І толькі праз паўгадзіны пачуўся крык ў адказ. Ён далятаў аднекуль з-за гары злева. Манэргейм зрабіў два сігнальныя стрэлы, але толькі праз цэлую вечнасць наверсе паказалася барадатая пыса Нумгана. Стары спусціўся да Манэргейма і зноў палез наверх, а Манэргейм ступаў за ім след у след.

Нумган быў горац, а Манэргейм жыхар раўніны. І цяпер ён змог ацаніць спрыт горцаў і іх здольнасць цярпець холад, голад і смагу. Яны бясстрашна ездзілі на сваіх коніках па стромкіх схілах. А Манэргеймаў праваднік звычайна прывязваў да сваіх ног конскія падковы і гойсаў па скалах, нібы сапраўдны горны казёл.

Уратаваўшы Манэргейма, Нумган спусціўся ў расколіну з другога боку і знайшоў там застрэленага казла. Куля трапіла жывёле ў сэрца. Потым знайшоўся і падранак. Паляўнічыя ў знак сваёй перамогі ўзялі з сабою толькі галовы упаляваных жывёлаў, бо цягнуць і тушы магчымасці не было.

Караван ужо знік з вачэй, калі Манэргейм і Нумган пад'ехалі да месца былой стаянкі. Манэргейм са шкадобай падумаў, што ніколі болей не ўбачыць гэтага месца. Сакавітая зялёная трава, бурлівая, пеністая рэчка ды велічныя горы навокал – сапраўды райскія мясціны. А праз два дні Манэргейм назаўсёды развітаўся і з рэчкай Аг'яз, і з горнымі краявідамі, і з густымі яловымі лясамі. Ён правёў тут, магчыма, самы шчаслівы тыдзень у сваім жыцці.

Пазней яму давялося пабачыць і іншыя горныя рэкі, і іншыя горы. У канцы Першай сусветнай вайны ён трапіў у Лясістыя Карпаты, перад Другой сусветнай вайной штогод паляваў у Аўстрыі, у Ціролі, дзе арандаваў 24000 гектараў зямлі, а апошнія гады свайго жыцця правёў у альпійскіх цяснінах Швейцарыі. Для сусветна вядомага чалавека, палітыка і дзяржаўнага дзеяча такая цясніна была месцам, дзе можна было знайсці спакой. Дый уся Швейцарыя была такім месцам у Еўропе, ахопленай сусветнымі войнамі.



### Прыгожы народ

Апошнімі днямі Манэргейму давялося пазнаёміцца з невялікім племем цюркскага пажоджання шэра-уйгураў. У гэтага народа быў просты лад мыслення і разумныя звычаі. Целы памерлых супляменнікаў яны праз некалькі дзён адносілі ў горы на харч драпежнікам. З целамі не рабілі нічога, нябожчыкам толькі закрывалі вочы. Праз тры дні наведваліся ў горы паглядзець, што зрабілі з целам падлажэры. Калі цела заставалася некранутае – гэта быў дрэнны чалавек. Тады запрашалі ламу, і манах чытаў малітвы, каб залагодзіць бога і прыроду.

Манэргейм цікавіўся ўсім, і палавым жыццём гэтага племя ў тым ліку. У гэтай галіне ён заўважыў тое, чаго не было апісана нідзе ў навуковай літаратуры. Манэргейма апанавала навуковае натхненне, і ён падрабязна апісаў шлюбныя звычаі гэтага народа. Мужчынскія здольнасці і сіла жаніха правяраліся не перад вяселлем, а пасля яго. Нявеста не абавязкова мусіла быць дзяўчынай, што не спазнала мужчыны. Жанчыны маглі выходзіць замуж, маючы дашлюбных дзяцей. Розныя любоўныя гісторыі не лічыліся нечым незвычайным. Калі жонка пападалася на шашнях, муж задаваў ёй лупцоўку – на тым справа і канчалася. Аднак, калі жанчына не магла мець дзяцей, муж меў права ўзяць сабе другую жонку (а па нейкай прычыне жанчыны ў гэтым племі часта былі бяздзетныя). Звычайна жонка была гадоў на восем старэйшая за мужа.

Шэра-уйгуры карысталіся кітайскімі палачкамі, а потым старанна вылізвалі посуд. Пасля вячэры на працягу поўгадзіны ўзносіліся малітвы.

Пасля святочнай пачосткі, якой племя сустрэла Манэргейма,

дзве маладыя жанчыны пачалі співаць. Яны моцна абняліся і, гледзячы адана адной у вочы, завялі доўгую прыгожую песню, кожны куплет якой заканчваўся сумнай працяглаю нотай. Потым адна спявачка, аберуч прымаючы ад другой чашу падагрэтай гарэлкі, пачала з ветлівымі паклонамі абносіць кожнага прысутнага. Манэргейм захапляўся тым, як годна сябе паводзілі і як гожа рухаліся жанчыны, нягледзячы на вялікія апранахі з футры і кітайскія боцікі. Рухі і жэсты ў мужчын таксама выглядалі элегантна.

Кожную раніцу жанчыны абыходзілі авечыя статкі. Яны падымалі з зямлі ягнятак, напявалі ім ласкавыя песенькі і нават цалавалі.

Шэра-уйгуры былі гаваркія, жартаўлівыя і працавітыя. Яны ніколі не сварыліся і не лаяліся між сабой, і ніколі не паказвалі свайго незадавальнення. Пасля вячэры яны доўга гаманілі і смяяліся. Спаць клаліся позна і спалі на лямцавым подсціле, накрываючыся футравымі коўдрамі.

Манэргейм зрабіў антрапалагічныя вымярэнні і запісаў, што шэра-уйгуры былі па большасці сярэдняга росту і добрага целаскладу, з рукамі і нагамі прыгожай формы. Манэргейм не заўважыў занадта тоўстых людзей, але занадта схуднелыя трапляліся. Яны мелі прыгожыя простыя насы. Лысых і пляшывых не было зусім, хоць бароды раслі рэдзенькія, а на целе зусім не было валасянога покрыва. Ніхто ніколі не пляваўся. У цуды і дзівосы ўйгуры верылі не надта, а таму, што бачылі ў сне, зусім не надавалі ніякага значэння. Тут можна заўважыць, што Манэргейм вылучае свае крытэрыі ідэальнай чалавечай прыгажосці, асноўным з якіх былі форма рук і ног ды гожасць жэстаў і рухаў.

Манэргейм высветліў і тое, што жанчыны родзяць, стоячы на каленях, і ім дапамагаюць другія жанчыны, а мужчыны пры гэтым зусім не прысутнічаюць. Послед закопваюць у зямлю. Немаўлятку мыюць кожны дзень, а першыя сем дзён яшчэ і робяць яму масаж алеем. Жанчына гэты час праводзіць у ложку. Дзіцёнка спавіваюць, не ўжываючы дошку, як гэта робяць у некаторых плямёнах.

Уйгуры вельмі здольны і кемлівы народ, яны разумеюць усё з паўслова, а таму часта перабіваюць суразмоўцу, каб выказаць сваю думку.



Хатняя жывёла ў іх таксама прыгожая і добра дагледжаная, прычым авечкі даволі вялікія, а коні наадварот – маленькія. Сабакі там таксама вялікія і прыгожыя з доўгай цёмна-карычневай поўсцю.

Манэргейм неахвотна і з жалем рушыў далей. Мужчыны сабраліся, каб развітацца з госцем. Адзін трымаў каня, другі – стрэмя, трэці падсадзіў Манэргейма ў сядло, а чацвёрты стаяў ззаду, страхуючы, каб конь не падаўся назад і сядок не зваліўся з сядла. Кідалася ў вочы поўная адсутнасць жанчын. Аднак калі Манэргейм праязджаў паўз авечыя атары, то заўважыў, што ўсе жанчыны працуюць там. Манэргейм спыніў каня і крыкнуў: «Чуава суйя!», – што значыць: «Дзякуй, бывайце!»

Жанчыны адказалі ветлівымі выгукамі і, здавалася, былі вельмі задаволеныя такой увагаю госця.

### Рапарт Манэргейма

Пасля заканчэння падарожжа, перш чым вярнуцца на захад, Манэргейм напісаў у Пекіне рапарт аб экспедыцы і па дарозе дадому на восем дзён заехаў у Японію. У Амерыцы ён ніколі не быў, дый – як ён сам прызнаваўся – нішто яго туды і не вабіла, бо ён быў чалавек старой еўрапейскай культуры. А ў Азіі ён напаткаў культуру яшчэ болей старажытную.

Генеральны штаб апублікаваў Манэргеймаў рапарт невялікім накладам у шэрагу кніг пра Азію. Як ужо адзначалася, свой рапарт Манэргейм пісаў у Пекіне, адразу пасля таго, як туды прыехаў. Гэтая праца заняла шэсць тыдняў. У рапарце было 150 старонак, а кніга атрымалася на 192.

Паводле заведзенага у Генштабе правіла, Манэргейм, распрацоўваючы вайсковыя аперацыі ў раёне даследавання, выступаў у ролі галоўнакамандуючага. Галоўны ўдар рускія мусілі нанесці на захадзе па сталіцы правінцыі Сянган. Галоўным было адрэзаць правінцыю ад цэнтральнага Кітая, а далей наступаць не было сэнсу.

Да сталіцы правінцыі Ганьсу, горада Ланьчжоў, рускія войскі змогуць дайсці за палову года, а адтуль занадта вялікая адлегласць да Пекіна. Усё вырашыцца ў Маньчжурыі, а таму ў астатніх месцах весці баявыя дзеянні не варта. Манэргейм сцвярджаў, што чыгунка, якую Кітай пачаў весці да Сіньцзяна, у бліжэйшы час

завершаная не будзе. І сапраўды − яе закончылі з дапамогай кітайскай арміі ажно ў 1963 годзе. А тады рэфармаванне кітайскай арміі толькі пачыналася, і ў памежных раёнах ніякіх вынікаў гэтай рэформы яшчэ не назіралася.

З Пекіна Манэргейм зрабіў адмысловую паездку да далай-ламы, які тады жыў у кітайскім палоне. Кітайцы ўсяляк стараліся перашкодзіць гэтай сустрэчы, а калі яе ўсё ж удалося арганізаваць, Манэргейму каштавала вялікіх намаганняў пазбавіцца ад кітайскага суправаджэння.

Далай-лама адразу спытаў, ці прывёз Манэргейм для яго якія-небудзь пасланні. Напэўна ён чакаў нечага ад рускага імператара ці ўрада, але ў Манэргейма нічога не было, нават простага падарунка, і таму ён мусіў падараваць духоўнаму правадыру Цэнтральнай Азіі свой пісталет. У мемуарах Манэргейм з задавальненнем адзначае, што далай-ламе ўдалося вярнуцца ў Тыбет і, карыстаючыся аслабленнем вялікіх дзяржаваў, стварыць незалежную краіну. Паколькі Манэргейм зрабіў тое самае для Фінляндыі, ён ўспрымаў далай-ламу як блізкага па духу чалавека і нават у пэўнай ступені атаясамліваў сябе з ім.

У Пецярбургу падчас асабістай аўдыенцыі Манэргейм зрабіў імператару справаздачу пра вынікі свайго падарожжа. Аўдыенцыя замест вызначаных 15-20 хвілін доўжылася гадзіну і дваццаць хвілін. Манэргейм так старанна падрыхтаваўся да важнага даклада, што імператар помніў яго і праз год, згадаўшы ў размове са шведскім даследчыкам Цэнтральнай Азіі Свенам Гедынам і параіўшы славутаму падарожніку звязацца з Манэргеймам.

# IV. ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА

## У Польшчы

Паслухаўшы даклад аб падарожжы па Азіі, імператар на развітанне спытаў у Манэргейма, што ён думае рабіць далей. Манэргейм адказаў, што спадзяецца атрымаць пад камандаванне полк, бо з-за доўгай адсутнасці адстаў ад сваіх таварышаў па службе. Цар заўважыў, што пакамандаваць палком ён яшчэ паспее, а вось зрабіць такое надзвычай цікавае падарожжа ўдаецца не кожнаму.

Калі з нейкай прычыны назначэнне ў полк затрымалася, Манэргейм узяў вялікі адпачынак і на пачатку 1909 года паехаў у Швецыю. Там ён і атрымаў паведамленне, што прызначаны камандзірам 13-га Уладзімірскага ўланскага палка, які стаяў у Навамінску, за сорак кіламетраў ад Варшавы.

Праз два гады Манэргейм атрымаў лепшы полк − лейб-гвардыі ўланскі полк, размешчаны ў Варшаве. Манэргейм быў вельмі задаволены − цяпер ён нарэшце абагнаў па службе сваіх аднагодкаў, ад якіх дагэтуль заўжды адставаў.

У гэты час Манэргейм сцісла апісаў свае погляды на жыццё, прычым карыстаючыся дзеля гэтага нейкай дзіўнаю мовай гульца ў газардоўныя гульні − магчыма, таму што, азіраючыся назад, ён успрымаў і японскую вайну, і сваё падарожжа ў Азію, як нейкую газардоўную гульню, у якой стаўкаю было ягонае жыццё. Ён пісаў брату, што верыць у чаргаванне нешчаслівых перыядаў і шчаслівых, калі ўдаецца ўсё, за што ні ўзяўся б. У нешчаслівыя перыяды трэба быць надзвычай асцярожным, а ў шчаслівыя − дзейнічаць смела і рашуча. Сам ён не заўсёды прытрымліваўся гэтага правіла, і яму не вельмі шанцавала. Змена палка была для яго вялікаю радасцю, бо дазваляла пачаць ўсё спачатку.

Атрымаўшы такое прызначэнне, Манэргейм павінен быў ехаць у Пецярбург на прадстаўленне імператару. Камандзір гвардзейскага палка меў чын генерал-маёра, а таму Манэргейма павысілі. Праз два гады ён стаў камандзірам быгады, і абмяркоўвалася пы-

танне пра яго перавод на пасаду камандзіра кірасірскай брыгады ў Пецярбург. Перабірацца ў Пецярбург ён не хацеў, а таму адмовіўся ад прапановы і застаўся ў Варшаве чакаць, пакуль там вызваліцца пасада камандзіра кавалерыйскай брыгады. Ён добра прыжыўся ў Варшаве, быў прыняты ў вышэйшым свеце і набыў уласны дом. Шостага студзеня 1914 года ён атрымаў прызначэнне на пасаду камандзіра кавалерыйскай брыгады, у якую ўваходзілі ягоны былы ўланскі і Гродзенскі гусарскі палкі.

Улетку 1914 года Манэргейм лячыўся ад рэўматызму ў нямецкім горадзе Вісбадэне і вярнуўся на службу толькі 22 ліпеня 1914 года. Брыгада была на палявых вучэннях, падчас якіх конь панёс і скінуў Манэргейма. Ён спрывіліў нагу якраз у той дзень, калі пачалася вайна. Зрэшты, Манэргейм быў даўно ўпэўнены, што вайна вось-вось пачнецца, і яшчэ загадзя загадаў скласці свой паходны чамадан.

Ён завязаў добрыя адносіны з многімі арыстакратычнымі сямействамі Польшчы і ўваходзіў у склад ганаровага клуба паляўнічых. Самыя блізкія адносіны ў яго былі з сямействам Любамірскіх, асабліва з жонкай. У час вайны і пасля яе Манэргейм вёў з княгіняй вялікую перапіску. Манэргейм захаваў усе яе лісты і вельмі цаніў іх, нават чытаў сваім самым блізкім сябрам. Гэтыя лісты сведчаць пра высокі ўзровень іхніх адносінаў.

Перапіска пачылася гэты раз з ініцыятывы княгіні Марыі. Яе муж быў старшынём гарадской рады і па-ранейшаму займаў высокую пасаду ў гарадской адміністрацыі нават пасля таго, як немцы занялі горад. Княгіня стаяла на раздарожжы – ці то па абавязку жонкі яна мусіць застацца з мужам, ці то пасля прыходу жахлівай нямецкай арміі мае права пакінуць усё і паехаць прэч. Яна выбрала апошняе і з'ехала спачатку ў Расею, а потым у Скандынавію і Заходнюю Еўропу. У адным лісце княгіня робіць даволі дзіўны намёк. Яна піша, што болей за ўсё ёй хацелася б застацца ў сваім польскім маёнтку і быць пахаванай пад яго руінамі, але ў яе ёсць маленькае дзіця, сінявокая Даратэя. Марыя прасіла любага барона не смяяцца з яе, як гэта ён робіць заўсёды. У канцы княгіня прасіла як мага хутчэй знішчыць гэты ліст, бо ён занадта асабісты і заслугоўвае пякельнага полымя.

Па гэтым лісце можна ўявіць, што паміж імі былі патаемныя блізкія адносіны, а згадка пра сінявокую дачку, як адзіную жывую істоту, якая ўтрымлівае княгіню ў гэтым жыцці, наводзіць на думку, што гэтыя адносіны мелі свае наступствы.



Пад жахлівымі ўражаннямі вайны Марыя Любамірская пытае ў Манэргейма, ці зможа ён калі-небудзь зноў, як у старыя добрыя часы, адчуць асалоду ад гукаў вальса пасля добрага абеду.

У сваім лісце Манэргейм адказвае, што самыя добрыя рэчы на свеце прыходзяць да людзей запозана, прычым адны спазняюцца на доўгі час, а другія – усяго на якую гадзіну.

«Чаканне доўжыцца доўга, а шчаслівыя імгненні такія кароткія», – піша ў адказ Марыя.

У лютым 1915 года Манэргейм і княгіня Марыя Любамірская сустрэліся ў Варшаве. Пасля таго княгіня пісала Манэргейму, што ён зрабіў уражанне чалавека закутага ў сталёвы панцыр, праз які не бачна нічога асабістага, нічога жывога. Жанчына шкадуе, што яе шчырасць пайшла ёй толькі на шкоду. Яна просіць Манэргейма з гэтага часу пісаць ёй толькі кароткія лісты, некалькі радкоў з навінамі, і не болей таго, як гэта прынята паміж сябрамі. Гэта будзе значна лепей, чым доўгія лісты, якія надаюць Манэргейму выгляд закаханага чалавека. «Я ўпотай кідаю позірк на вас і ціха іду прэч», – напісала Марыя ў красавіку 1915 года і разам з гэтым лістом прыслала Манэргейму некалькі пер'яў цецерука, забітага філінам.

За апошнія сто год такое пяро – сімвал баязлівасці – паслалі толькі аднаму афіцэру, які ўцёк з поля бою. Такое пасланне азначала, што афіцэры не жадаюць бачыць яго ў сваіх шэрагах і патрабуюць ягонай адстаўкі.

Манэргейм адказаў Марыі, што ён прымацуе гэтае пер'е да свайго ваеннага галаўнога ўбору і паабяцаў далучыцца да світы княгіні, у якой бы краіне яна ні была. Пагарджаючы грамадскаю думкай, Манэргейм абяцаў адкрыць усім сваю ганьбу і выклікаў княгіню на новы двубой, дзе і калі толькі яна пажадае.

«Мне больш да душы самотныя, надзейна агароджаныя сады, куды могуць трапіць толькі нямногія абраныя», – пісаў Манэргейм у маі 1915 года. У ліпені таго ж года княгіня прыслала яму свой здымак.

У кастрычніку княгіня, уцёкшы разам з дзіцём у Расею, пры-

гадвае тую сустрэчу ў Варшаве, якая пакінула ў яе моцныя ўражанні ды ўспаміны. Манэргейм быў тады нібы простая лінія, а яна – нібы хвалістая, і гэтыя лініі ніколі не перасякуцца. Княгіня патрабавала, каб Манэргейм знішчыў гэты ліст. З усяго гэтага складаецца ўражанне, што княгіня прайшла больш за палову шляху насустрач Манэргейму, але той застаўся стрыманы і непрыступны.

Атрымаўшы развітальны ліст ад Манэргейма, княгіня вельмі абурылася. Яна намервалася ці то вярнуцца праз Скандынавію ў Польшчу, ці то падацца ў Англію. Такім чынам далейшая перапіска станавілася немагчымай.

«Не шкадуйце, што на імгненне прыўзнялі свой панцыр і прагаварыліся, што мой ад'езд прычыняе вам боль, бо мне соладка чуць гэтыя словы», – пісала жанчына.

Гэтыя лісты – лісты закаханых людзей. Манэргейм у іх фліртуе, не стрымліваючы сябе, аднак, калі яны сустрэліся, ён скамянеў і адступіўся. Ён хацеў кахаць здалёк. Можа, Манэргейм баяўся публічнага ці асабістага скандалу, а можа, ён проста не кахаў княгіню? Жанчына вярнула Манэргейму ўсе ягоныя лісты, а ён зберагаў ёйныя, як каштоўны скарб. Яму было лягчэй зрабіць гэта, бо ён быў нежанаты.

## На фронце

29 ліпеня 1914 года Манэргейм сядзеў за абедам у клубе паляўнічых. Туды яму і прынеслі ліст з загадам быць у штабе брыгады а дванаццатай гадзіне ночы. У штаб прыйшла тэлеграма, у якой абвяшчалася ўсеагульная мабілізацыя. Манэргейм павінен быў ускрыць канверт з сургучовымі пячаткамі, які захоўваўся ў брыгадным сейфе. У тым канверце былі падрабязныя інструкцыі. Брыгада павінна была выступіць праз шэсць гадзін. Да выступлення брыгада была гатовая праз чатыры гадзіны. Яшчэ не ведаючы змест ліста, падначаленыя Манэргейма пачалі дзейнічаць. Гэта ўказвае на тое, што адносіны паміж Манэргеймам і ягонымі падначаленымі не былі жорстка фармальнымі, а давалі ім пэўную свабоду дзеяння і нават ініцыятывы, дазваляючы рызыкаваць, адгадваць невыказаныя пажаданні і прымаць неабходныя рашэнні ў кожнай канкрэтнай сітуацыі. Праз шэсць гадзін войскі былі на



чыгуначнай станцыі. Манэргейм стаяў на вуліцы і вітаў войскі, штот праходзілі міма, жадаючы ім шчаслівай дарогі і ўдачы. Потым, так ні на хвіліну і не прылёгшы за ўсю ноч, выехаў на машыне сустракаць сваю брыгаду ўжо на месцы прызначэння.

На цягніках брыгада даехала да Любліна, а потым вершкі зрабіла марш да горада Красніка, які знаходзіўся на адлегласці трыццаці кіламетраў ад аўстрыйскай мяжы. Перад брыгадай стаяла задача абараняць чыгунку Варшава – Люблін – Холм, уздоўж якой канцэтравалася 4-я руская армія. Расейская мяжа, як і чыгунка, праходзіла на поўнач ад ракі Сан, што цякла на паўднёвы ўсход. У аўстрыйцаў там была створаная паласа абароны мастоў на 50 кіламетраў па фронце і 10-15 кіламетраў у глыбіню. Брыгада Манэргейма і 13-я кавалерыйская дывізія стварылі кавалерыйскую групоўку пад камандаваннем генерала Туманава. Задачай групоўкі была абарона паласы шырынёй 60 кіламетраў.

Аўстра-Венгрыя абвясціла вайну на шэсць дзён пазней за Нямеччыну, г.зн. 6 жніўня 1914 года. Праз адзінаццаць дзён аўстрыйцы пайшлі ў наступ са сваёй умацаванай паласы. Манэргейм у Красніку атрымаў пісьмовы загад генерала Туманава заняць пазіцыі на паўднёвай ускраіне горада і ўтрымаць горад любой цаной. Загад быў напісаны на адваротным баку разведрапарта, дзе паведамлялася, што на горад будуць кінутыя адна аўстрыйская пяхотная брыгада і шмат кавалерыстаў, падтрымліваць якіх будуць тры артылерыйскія батарэі.

Манэргейм зрабіў рэкагнасцыроўку пазіцыяў на паўднёвай ускраіне горада, але займаць іх цяпер ужо не было часу. Напэўна Манэргейм баяўся, што аўстрыйцы пачнуць атаку менавіта ў гэты час. Палкам загадалі выступіць хуткім маршам на поўдзень і заняць абарону ў пешых парадках там, дзе іх заспее агонь праціўніка. Не паспеў сціхнуць грукат капытоў, як з пагоркаў на паўднёвай ускраіне пачуліся рэдкія стрэлы. Вораг падышоў зусім блізка, і брыгада мусіла прыняць бой, расцягнуўшы фронт на сем кіламетраў. Шасцігарматная лёгкая батарэя рускіх адразу страціла чатыры гарматы ад агню аўстрыйскай артылерыі. Дзве ацалелыя гарматы давялося адвесці, каб і іх не напаткаў такі самы лёс. Манэргейм упэўніўся, што ніводная з вялікіх еўрапейскіх дзяржаваў не скарыстала досвед руска-японскай вайны. Руская артылерыя

вяла агонь з адкрытых, нічым не абароненых пазіцыяў. Манэргейм непакоіўся за флангі. На левы фланг ён даслаў яшчэ дзве сотні памежнай варты, а 13-му уланскаму палку, які месціўся на правым флангу, загадаў пашырыць паласу абароны, абысці праціўніка з тылу і ўдарыць яму ў спіну. Вечарам на змену брыгадзе Манэргейма падышоў пяхотны полк. Убачыўшы такую вялікую колькасць войскаў, праціўнік пачаў беспарадкавае адступленне, у выніку чаго ў палон трапіла некалькі соцень аўстрыйскіх салдат з двух розных палкоў. Дапытаўшы палонных, высветлілі, што, апроч гэтых двух палкоў, у аўстрыйцаў было яшчэ тры артбатарэі і кавалерыйская дывізія, якая зусім не брала ўдзел у гэтым баі. Такія няўзгодненыя дзеянні былі ўласцівыя і рускім, што, у прыватнасці, прывяло да пагібельных наступстваў на самым пачатку Таненбергскай бітвы ва Усходняй Прусіі, дзе тады загінулі дзве рускія арміі.

Такой была першая бітва Манэргейма, бітва лёгкая і кароткая, падчас якой ён прыстасоўваўся і адпрацоўваў тактыку. Манэргейм дзейнічаў рашуча і смела, імкнучыся ахапіць варожыя флангі і, па ўласцівай яму асцярожнасці, абараніць свае – тактыка кавалерыі, вядомая яшчэ з Трыццацігадовай вайны. Манэргейма ўзнагародзілі Георгіеўскай шабляй.

Манэргейм трапіў у падобнае становішча і пазней – на поўдзень ад чыгункі Люблін – Івангорад. Чыгункі былі важнымі аб'ектамі, бо па іх ажыццяўляліся перагрупоўка і перавозка войскаў. Аўстрыйцы наблізіліся на 30 кіламетраў да чыгункі і пагражалі перарэзаць яе. Рубяжом абароны рускіх быў прыток Віслы – рэчка Ходэль, на поўдзень ад якой знаходзілася вёска Опаль. Меркавалася, што менавіта тут праціўнік будзе фарсаваць раку. Манэргейм са сваімі войскамі перайшоў на паўднёвы бераг і паспрабаваў абысці варожую дывізію з фланга, заняўшы адначасова тры вёскі. Праціўнік, у сваю чаргу, таксама паспрабаваў абысці войскі Манэргейма з фланга і падпаліў усе вёскі. Манэргейм мусіў адысці назад, на паўночны бераг ракі. Упершыню за гэтую вайну ён убачыў, як вынішчаецца ўсё на полі бою і як пакутуе ад гэтага мірнае насельніцтва.

13-ая кавалерыйская дывізія, накіраваная Манэргеймавай брыгадзе на дапамогу, таксама не здолела перашкодзіць пераправе



аўстрыйцаў цераз раку. Яны пабудавалі каля пераправаў на паўночным беразе чатыры ўмацаваныя пункты.

29 жніўня 1914 года Манэргейм атрымаў загад захапіць пераправы, дзеля чаго ягоную брыгаду дадаткова ўмацавалі казацкім палком.

Праціўнік упарта супраціўляўся і пашырыў плацдармы каля пераправаў. Але Манэргейм такі знайшоў слабое месца ў варожай абароне – ён ударыў па адкрытым флангу аўстрыйцаў за рэчкай, пераправіўшы туды атрад ротмістра Насовіча. Атака ўдалася, і аўстрыйцаў адкінулі за раку.

Наступным раннем прыйшло падмацаванне: 91-ы полк 23-й пяхотнай дывізіі пад камандаваннем яшчэ аднаго выхадца з Фінляндыі – Эрнста Лёфстрома, былога Манэргеймавага «дзядзькі» іката ў кадэцкім корпусе. Задачай Лёфстрома была абарона пераправаў цераз раку, задачай Манэргейма – развіццё наступу. Для кавалерыстаў гэта была правільная задача, бо коннікі лепей прыдатныя для наступу, а пяхота – для абароны.

Паколькі дакладнага загаду наконт далейшых дзеянняў Манэргейм не меў, дык рукі ў яго былі развязаныя. Ён паведаміў Лёфстрому, што збіраецца абысці аўстрыйцаў злева і ўдарыць ім у спіну – па толькі што ўжо выкарыстаным рацэпце. Манэргейм піша ў сваіх мемуарах, што ведаў пра малы ваенны досвед Лёфстромава палка і не спадзяваўся, што той зможа ўтрымаць пераправы, калі аўстрыйцы паспрабуюць фарсаваць раку.

Манэргейм пераправіўся цераз раку справа і не знайшоў там ніводнага варожага салдата. У той жа час ад пераправаў пачулася моцная артылерыйская і вінтовачная страляніна. Шэсць аўстрыйскіх палкоў перайшлі ў наступ і адкінулі полк Лёфстрома на поўнач.

Праз непраходныя лясы і балоты Манэргейм вывеў свае войскі да вёскі Опаль. Да трэцяй гадзіны ўсе ягоныя палкі былі сканцэнтраваныя на захадзе ад гэтай вёскі, якая стаяла на скрыжаванні дарог. Манэргейм перарэзаў тыя дарогі, што вялі на поўдзень. Пяхотныя ланцугі аўстрыйцаў пачалі рухацца на поўнач. Тады Манэргейм адкрыў артылерыйскі агонь і пачаў біць па іх і па вёсцы, што аказалася для праціўніка поўнаю нечаканасцю. Пасля таго, як выявілася, што вораг зайшоў ім у тыл, сярод аўстрыйцаў

пачалася паніка і яны сталі адступаць у адзіна магчымым вольным кірунку – на паўднёвы ўсход.

Манэргейм успамінае, што 91-му палку пад камандай Лёфстрома была тады пастаўленая ўдзячная задача – захапіць умацаванні перад пераправамі. І полк бліскуча яе выканаў, узяўшы пры гэтым тысячу палонных. Калі прыгадаць падзеі ў Фінляндыі ўвесну 1918 года, няпростыя адносіны паміж Манэргеймам і Лёфстромам і тую акалічнасць, што і праз 15 год Манэргейм з горыччу казаў пра самазадаволенасць Лёфстрома, які прыпісаў сабе ўсю славу за вызваленне Выбаргу, робіцца зразумелым, што, і кажучы пра бой у Опале, Манэргейм выразна намякае і хоча давесці, што славу за свой першы бой Лёфстром атрымаў толькі дзякуючы адважнай і дакладнай аперацыі па акружэнню праціўніка, якую правёў Манэргейм.

Наступным днём рускія збілі аўстрыйскі самалёт. Падаючы, лётчык выкінуў з самалёта рапарт, які потым адшукалі на полі. З гэтага рапарта вынікала, што наступ на Опаль праводзіўся амаль цэлым армейскім корпусам на чале з генералам Куммерам. Супраць яго стаялі 24 эскадроны Манэргейма з 12 гарматамі, якім не хапала снарадаў. Як ім удалося перамагчы ў гэтым баі? Манэргейм у сваіх мемуарах піша, што часта на вайне ўсё вырашае псіхалагічны фактар. Калі праціўнік лічыць і пачувае сябе слабейшым – ён сапраўды слабейшы, нягледзячы на перавагу ў сіле. Гаворачы пра суадносіны сілаў паміж ім і аўстрыйцамі, Манэргейм ніводным словам не згадвае 91-га пяхотнага палка пад камандваннем Эрнста Лёфстрома. А гэты полк таксама браў удзел у баі, прыняў на сябе галоўны ўдар і панёс самыя вялікія страты. Полк біўся без перадыху і звязаў галоўныя сілы праціўніка так, што той не мог прасачыць, што адбывалася ў іншых месцах, асабліва на флангах.

Вельмі трагічны і прыкры выпадак звязаны са смерцю ў верасні 1914 года выдатнага конніка і ўлюбёнца вышэйшага свету Варшавы маладога ротмістра Бібікава.

У той дзень яго эскадрон атакаваў варожыя траншэі пешым строем, але атака была адбітая. У паўторную атаку эскадрон не падняўся. Манэргейм прымчаў на поле бою і спытаў у Бібікава, у чым справа. Той адказаў, што пасля першай атакі ў эскадроне засталося ўсяго 14 чалавек, бо сустрэчны агонь праціўніка павыкошваў шмат людзей. Манэргейм спытаў: можа, Бібікаў баіцца зноў пайсці ў атаку? Тады малады ротмістр на чале рэшты свайго эскадрона кінуўся наперад і тут жа загінуў ад варожай кулі.



У тую ноч Манэргейм не змог заснуць. Раніцай ён расказаў усім пра гэты выпадак і дадаў, што гэта ўвесь час точыць ягонае сумленне. Ён прадставіў Бібікава да ордэна Святога Георгія чацвёртай ступені. На пахаванні ён па праваслаўнаму звычаю пацалаваў нябожчыка ў лоб і сказаў, што лепей бы ён сам цяпер ляжаў у труне на месцы маладога афіцэра. Прадстаўнік англійскай ваеннай місіі Нокс пісаў у сваім дзённіку, што Манэргейма папракалі ў жорсткасці і ў тым, што ён не шкадуе людзей. Як сведчыць блізкая Манэргеймава сяброўка Марыя Любамірская, тое самае пра яго казалі і ў вышэйшым свеце Варшавы. І нават больш за тое – што ён пасылае людзей на верную смерць. Вядома, на ўвазе не меліся шараговыя салдаты. Іхні лёс зусім не хваляваў гэтых паноў. Але тут гаворка ішла пра Бібікава, чалавека, які належаў да іхняга кола і, апроч таго, быў у гэтым коле супернікам Манэргейму. Ці паўплывала гэта якім-небудзь чынам на Манэргеймавы паводзіны ў тым трагічным выпадку? Свет лічыў, што Манэргейм наўмысна загубіў ротмістра Яўгена Іванавіча Бібікава. Дый Манэргейм сам адчуваў сваю віну. Можа, старое суперніцтва падсвядома вылілася ў яго беспадстаўныя патрабаванні і пагардлівыя словы? Яны абодва былі добра прынятыя ў вышэйшых колах. Але Бібікаў быў маладзейшы і, відавочна, болей вясёлы, адкрыты і шчыры – карацей, валодаў тымі рысамі, якіх не было ў Манэргейма. На здымку перад намі паўстае прыгожы, статны і дужы юнак з чорнымі валасамі і прывабнымі вачыма. А значыць, суперніцтва паміж маладзейшым і старэйшым было непазбежнае.

Чуткі пра вялікія страты ў войсках Манэргейма даляцелі і да Хельсінкаў. 15 верасня 1914 года прафесар Аспелін-Хаапкюля пачуў, што камандзір «Жоўтай гвардыі» барон Манэргейм, прыехаўшы наведаць бацьку, нібыта сказаў, што рабіць яму больш няма чаго, бо ягоны полк не існуе, а кавалергарды цалкам вынішчаныя ў баях ва Усходняй Прусіі. Хутчэй за ўсё, у гэтых плётках не было ніводнага слова праўды. На пачатку вайны гэта звычайная з’ява.

Зімою 1914–1915 гадоў руская армія планавала нанесці ўдар у Карпатах і завалодаць імі. Лічылася, што гэта вымусіла б Румынію ўступіць у вайну на баку саюзнікаў. Брыгаду Манэргейма перакінулі ў Галіцыю, каб яна таксама ўзяла ўдзел у наступе. Брыгаду ўключылі ў склад 8-й арміі, якой камандаваў генерал Брусілаў. Ён быў некалі начальнікам вучэльні, дзе Манэргейм камандаваў узорным эскадронам.

Брусілаў выехаў на кані сустракаць брыгаду, і яна маршам прайшла перад ім. Потым у штабе Брусілаў спытаў у Манэргейма, ці будуць у таго якія-небудзь пажаданні. Манэргейм адказаў, што хацеў бы працягваць камандаваць сваёй брыгадай, калі яе пераформуюць у дывізію. Яны абмеркавалі гэтую справу, і Брусілаў сказаў, што пытанне будзе вырашанае.

Аднойчы ўвечары, калі Манэргейм вячэраў са сваім штабам, яму прынеслі ад Брусілава тэлеграму. Той прапаноўваў Манэргейму прыняць камандаванне 12-й кавалерыйскай дывізіяй замест параненага генерала Каледзіна. Вячэра яшчэ не скончылася, як прынеслі яшчэ адну тэлеграму такога ж зместу. Манэргейм паспяшаўся да Брусілава, каб падзякаваць за давер і спытаць парады. 12-ю дывізію Манэргейм зусім не ведаў, а напярэдадні яны з Брусілавым абмяркоўвалі для Манэргейма лепшы варыянт, калі яму даводзілася б мець справу са знаёмымі палкамі. Брусілаў урачыста абвясціў, што 12-я дывізія – гэта элітнае падраздзяленне і адмовіцца ад такой прапановы проста нельга. Манэргейм адразу згадзіўся. У гэты час дывізія вяла баі за 140 кіламетраў ад месца, дзе знаходзіўся штаб. Да камандзірскага вагона ўжо даставілі паравоз, і Манэргейм, ні з кім не развітаўшыся, ад'ехаў да новага месца службы. Ён толькі і паспеў перадаць прывітанні афіцэрам брыгады і загадаць, каб яму прыслалі каня і асабістыя рэчы. У склад 12-й дывізіі ўваходзілі Ахтырскі гусарскі полк, Белгародскі ўланскі полк, Старадубскі драгунскі полк, Арэнбургскі казацкі полк і артылерыйскі дывізіён.

Дывізія наступала. Патанаючы па калена ў снезе, яна з баямі рухалася наперад. Такім чынам Манэргейм усё аддаляўся ад свайго каня і рэчаў, хоць іх выслалі наўздагон. Восем дзён ён мусіў ездзіць на армейскім кані, у дадатак да ўсяго скончыўся тытунь, і гэта азмрочвала ягонае жыццё.



Ранейшага камандзіра, генерала Каледзіна, у дывізіі проста абагаўлялі, таму Манэргейм не адважыўся на персанальныя змены ў штабе. Не дзіва, што спачатку да Манэргейма ў дывізіі паставіліся вельмі насцярожана. Падчас абеду са сваім новым штабам Манэргейм зрабіў уражанне чалавека высокага, статнага і вельмі халоднага, але які заслугоўвае асаблівай увагі. Пазней высветлілася, што ён вельмі рэдка казаў «не» і рэдка не згаджаўся з чужою думкай. А калі быў не згодзен, дык выказваў гэта не словамі, а даваў зразумець зусім інакш – адкідаў галаву і са спакойнай іроніяй уважліва разглядаў нешта за плячыма ў суразмоўцы. Калі хацеў, ён мог і рэзка перапыніць размову. Нейкім невядомым чынам ён скіроўваў гутарку ў патрэбнае яму рэчышча ад пачатку да канца, і размаўляць з ім можна было толькі пра тое, чаго сам ён хацеў. Манэргейм гаварыў па-руску з жахлівым шведскім акцэнтам, часам нават не мог як след выказаць сваю думку на гэтай мове.

Такім чынам, першае ўражанне было непрыхільнае. Пра гэта пазней расказваў ягоны ад'ютант дэ Віт.

Дэ Віт расказваў пра тэмперамент Манэргейма, пра ягоную гарачнасць і пра тое, якім чынам Манэргейм звычайна стараўся загладзіць учыненую ім каму-небудзь крыўду. Аднойчы Манэргейм загадаў дэ Віту паехаць на скрыжаванне дарог і чакаць там дадатковых указанняў. Дэ Віт прастаяў на скрыжаванні каля гадзіны. Потым прыскакаў казак і перадаў загад вярнуцца назад у штаб дывізіі. Увесь штаб быў у зборы, а вакол панавала поўная сумятня, бо аўстрыйцы вялі артылерыйскі агонь па штабе. Як толькі дэ Віт паказаўся на парозе, Манэргейм пачаў гнеўна папракаць яго, вінавацячы тым, што ён, маўляў, парушыў ягоны загад. Начальнік штаба паспрабаваў умяшацца, але Манэргейм не даў яму сказаць ні слова. Тады дэ Віт моўчкі выйшаў і паскакаў назад, на тое самае скрыжаванне. Хутка ён атрымаў загад правесці рэкагнасцыроўку мясцовасці. Калі ўвечары ён вярнуўся ў дывізію, Манэргейм чакаў яго ў двары штаба. Ён ветліва папрасіў прабачэння за свае паводзіны. Пазней, аказваецца, высветлілася, што казака з загадам дэ Віту вярнуцца са скрыжавання паслаў начальнік штаба, але Манэргейм не захацеў яго выслухаць. Гэта моцна сапсавала Манэргейму настрой.

На думку дэ Віта Манэргейм быў добрым псіхолагам і ўмеў улічваць пачуцці суразмоўцы. Дурная смерць Бібікава, прычынай якой стала рэзкае і крыўднае выказванне Манэргейма, далася яму ў знакі на ўсё жыццё.

У час ваенных дзеянняў над войскамі Манэргейма лунаў нейкі злы лёс – страты былі вельмі вялікія. Так, падчас грамадзянскай вайны ў Фінляндыі шведская брыгада і спехам навучаныя егерамі апалчэнцы ў першым наступе на Тамперэ страцілі каля паловы свайго асабовага складу. Пасля гэтых баёў у шведскай брыгадзе доўга разбіраліся, хто і ў чым вінаваты. Гэтыя разборы доўжыліся і ў Швецыі і прывялі да таго, што палкоўнік Ялмарсон пусціў сабе кулю ў лоб, хоць ягонай віны ў стратах не было. Казалі, што Манэргейм быў не супраць, каб шведы, якія загінулі ў баях за незалежнасць Фінляндыі, сваёй крывёй звязалі дзве гэтыя краіны, а такая сувязь была мацнейшая за ўсе саюзныя дамовы. Паслаць у бой шведскую брыгаду было палітычным рашэннем Манэргейма.

У крывавым жніўні 1941 года загінула 9000 фінскіх салдат. Як гэта ні парадаксальна, але асцярожнасць Манэргейма, які не хацеў праліваць шмат салдацкай крыві, вяла да вялікіх стратаў. Крывавымі былі і апошнія дні Зімовай вайны ў 1940 годзе. Генерал Хейнрыкс пісаў, што за дзень фінская армія панесла большыя страты, чым белая армія за ўсю грамадзянскую вайну. Гэткія ж вялікія страты былі і падчас конртнаступу ў 1944 годзе. І тут Манэргейм ставіў на першае месца палітычныя фактары. На перамовы з рускімі трэба ісці, калі ўласная абарона будзе моцная. Слабых рускія ніколі не будуць слухаць, а моцных будуць слухаць і паважаць. Такой думкі трымаўся Манэргейм у дачыненні да рускіх.

Улетку 1916 года Брусілаў пачаў вялікае наступленне па ўзору заходніх саюзнікаў, якіх можна лічыць за ягоных настаўнікаў. Пасля магутнай артылерыйскай падрыхтоўкі войскі атакавалі аўстрыйскія ўмацаванні, на якія аўстрыйцы не пашкадавалі ні бетону, ні калючага дроту. Дывізія Манэргейма ўвесь час рухалася ўздоўж фронту, каб зрабіць прарыў варожай абароны і праз гэтую брэш зайсці непрыяцелю ў тыл. Але зрабіць гэта не ўдалося.

У Луцку Манэргейм дзейнічаў разам са стралковай дывізіяй генерала Дзянікіна, які пазней змагаўся супраць бальшавікоў. Дывізія Манэргейма стаяла крыху наперадзе і справа да войскаў Дзянікіна. Перад лініяй рускага фронту было некалькі нікім не занятых вышыняў. Паколькі Дзянікін не паслаў туды сваіх падраздзяленняў, тыя вышыні заняў Манэргейм. Але тут на дапамогу сваім слабейшым саюзнікам-аўстрыйцам падышлі нямецкія часткі і атакавалі пазіцыі Манэргейма. Становішча стала пагражальным. Манэргейм патэлефанаваў Дзянікіну і папрасіў яго ўзяць вышыні пад абарону – каб пазіцыі на іх не дасталіся немцам. Але Дзянікін адмовіўся, патлумачыўшы, што цяпер ягоныя войскі перагрупоўваюцца для атакі, а пагоркі ён зойме тады, калі гэта спатрэбіцца, пакуль жа такой патрэбы няма. Манэргейм сказаў, што адбіць вышыні ў немцаў будзе нялёгка. «Дзе вы бачыце немцаў! – закрычаў у трубку Дзянікін. – Ніякіх немцаў тут няма!» Манэргейм суха адказаў, што бачыць немцаў проста перад сабой.



У сваіх мемуарах Манэргейм піша, што рускія з-за сваёй самаўпэўненасці недаацэньвалі факты, якія не адпавядалі іх планам.

Уначы дывізію Манэргейма адвялі ў рэзерв, і немцы занялі тыя вышыні. Ранкам планавалася наступленне Дзянікіна. Манэргейм патэлефанаваў камандуючаму арміяй і сказаў, што поспех наступу пад вялікім сумневам. Ён прапанаваў адвесці ягоную дывізію ў другое месца, адкуль можна было б нанесці ўдар у двух кірунках. «Вы атрымалі мой загад, генерал?» – спытаў камандуючы. «Атрымаў», – адказаў Манэргейм. «Вось і выконвайце», – пачуўся строгі адказ, і трубку паклалі. Праз некалькі гадзін дывізію Манэргейма перакінулі ў той пункт, пра які ён казаў па тэлефоне, але дывізія на той час была ўжо ў іншым месцы, адкуль ёй давялося пераходзіць праз вялікае балота. Пераход доўжыўся да канца дня. Але і з новай пазіцыі адна казацкая сотня правяла добра спланаваную контратаку. А ў гэты час руская пяхота панічна адступала, кідаючы зброю. Увечары камандуючы патэлефанаваў Манэргейму і падзякаваў за тое, што гэтая контратака выратавала ад паражэння ўвесь корпус. Начная цемра перашкодзіла Манэргейму ўвесці ў бой большыя сілы і замацаваць перамогу. Аднак становішча выправілася і наступіў зацішак.

У лістападзе 1916 года дывізія Манэргейма зрабіла пераход даўжынёй у семсот кіламетраў на поўдзень, на румынскі фронт,

праз зруйнаваную краіну, па разбітых дарогах. Румынія ўступіла ў вайну супраць Нямеччыны, якая маланкавай аперацыяй ажыццявіла захоп большай часткі краіны. Расея мусіла кінуць на дапамогу цэлых 42 дывізіі, усе свае баяздольныя рэзервы, як пісаў Манэргейм. А ён заўсёды выкарыстоўваў рэзервы з вялікаю асцярожнасцю. Прапускной здольнасці чыгунак не хапала, таму Манэргеймавай дывізіі і давялося рабіць такі вялікі конны пераход. Манэргейм ганарыўся тым, што за ўвесь час пераходу ягоны войскі не страцілі ніводнага каня.

Манэргейм прадставіўся камандуючаму 2-й румынскай арміяй генералу Аварэску. Становішча на румынскім фронце тады крыху выправілася, і Аварэску прапанаваў дывізіі Манэргейма некалькі дзён адпачыць. Аднак ужо ў першую ноч ёй давялося ўступіць у бой. Немцы атакавалі чыгуначную станцыю Путна, якую абараняла румынская брыгада палкоўніка Стурдзы. Яе падпарадкавалі Манэргейму. Цяпер ён адказваў за паласу абароны шырынёй 60 кіламетраў. Яе перасякалі чатыры горныя рэчкі, уздоўж якіх немцы вялі наступленне, стараючыся прарвацца ў даліну Серэт у пойме аднайменнай ракі. За станцыю Путна разгарэліся жорсткія баі, і войскі Манэргейма неслі цяжкія страты. Сярод загінуўшых быў падпалкоўнік Багальдзі з Ахтырскага гусарскага палка. Манэргейм лічыў гэтую страту непапраўнай. Нямецкі націск быў такі моцны, што на дапамогу саюзнікам давялося кінуць дзве рускія, чатыры румынскія дывізіі і адну румынскую брыгаду.

2 студзеня 1917 года адбылося нешта неверагоднае. Руская дывізія, якая стаяла на левым флангу войскаў Манэргейма, знікла. Яна пакінула свае пазіцыі і некуды рушылала, нікога не папярэдзіўшы. Закрыць такую брэш не было магчымасці, і немцы скарысталі гэта. Праз некалькі тыдняў Манэргейм даведаўся, што дывізія знялася з месца па загадзе свайго камандзіра, які абвясціў, што страціў усякі давер да румынскай арміі і таму вырашыў перавесці дывізію ў бліжэйшы рускі корпус. Цікавую выснову з гэтай справы зрабіў Манэргейм. Генерал Крымаў самым грубым чынам парушыў правілы вядзення вайны. Ён нікому не паведаміў пра адыход сваёй дывізіі і тым самым прычыніў непапраўную шкоду. «І за такое злачынства шаноўны афіцэр Генеральнага штаба не панёс ніякага пакарання», − пісаў Манэргейм. Тут асабліва падкрэсліваліся словы «афіцэр Генеральнага штаба». Манэргейм заўсёды карыстаўся выпадкам, каб неяк падкусіць «няшчасных тэарэтыкаў».



З гэтым самым генералам Крымавым і генералам Урангелем Манэргейм летам і на пачатку восені 1917 года вёў перамовы аб звяржэнні Часовага ўрада.

Калі ў верасні немцы захапілі Рыгу, генерала Карнілава назначылі галоўнакамандуючым. Ён адразу запатрабаваў, каб у арміі навялі парадак і дысцыпліну. Гэта быў той самы Карнілаў, які ў Ташкенце праводзіў Манэргейма ў экспедыцыю па Азіі, а праз два гады ў Пекіне радаваўся ягонаму вяртанню ў чалавечую цывілізацыю. Прэм'ер-міністр Керэнскі заспрацівіўся гэтаму патрабаванню. Тады Карнілаў паслаў на Пецярбург дзве казацкія дывізіі, каб арыштаваць Керэнскага і звергнуць урад. Камандзірам адной з гэтых дывізіяў ён прызначыў Крымава. З пяра Манэргейма бруіцца атрута, калі ён піша пра гэта у сваіх мемуарах. Няцяжка заўважыць сумесь зайздрасці і горычы ў тым, што Манэргейм піша пра Крымава, «які меў гонар стаць камандуючым у той момант, калі быў гатовы выкінуць на стол апошні козыр. Керэнскі запрасіў яго ў Зімні палац, і Крымаў пайшоў туды адзін. Пасля бурнай размовы, змест якой, мабыць, так і застанецца тайнай, генерал паехаў з палаца дадому і там застрэліўся. Наступным днём галоўнакамандуючага арыштавалі ў Магілёўскай Стаўцы, пасля чаго і абвесцілі рэспубліку».

Ненадзейны аднойчы − ненадзейны заўсёды. Такім чалавекам быў генерал Крымаў.

Манэргейм верыў у наканаванне, у тое, што жыццё кожнага чалавека мае сваю асаблівую структуру і сваю асаблівую форму. Сіла і слабасць прысутнічаюць у роўнай ступені і праяўляюцца як у цэлым, так і ў прыватнасцях. Жыццё чалавека − гэта сам чалавек.

Пасля цэлага месяца баёў група Манэргейма была распушчаная для адпачынку і перафармавання. Ягоная 12-я дывізія атрымала загад перайсці з Трансільванскіх Альпаў у Бесарабію, дзе былі вялікія запасы сена, а значыць лёгка вырашаліся праблемы з фуражом. У канцы студзеня 1917 года дывізія размясцілася непадалёк ад сталіцы Бесарабіі горада Кішынёва.

Новы камандуючы 4-й арміяй наладзіў абед для афіцэраў. Ён пачаў лаяць румынскую армію, хоць румынскі афіцэр сувязі сядзеў побач з ім. Манэргейм, які заўсёды чула ставіўся да пытанняў гонару, запярэчыў і сказаў, што хоць румынскія часткі, якія былі пад ягонай камандай, і адрозніваліся па сваіх баявых якасцях ад рускіх, палкоўнік Стурдза паказаў такую мужнасць і тактычныя ўменні, што ён, Манэргейм, хацеў бы, каб і ягоныя падначаленыя мелі такія ж якасці. Потым ён расказаў пра свае асабістыя ўражанні ад румынскіх салдат. Аднойчы два нямецкія эскадроны адрэзалі Манэргейма і двух ягоных ардынарцаў ад штаба і шквальным агнём перакрылі ім шлях на вузкай горнай сцяжынцы паміж дзвюма стромымі скаламі. Уратаваннем магла быць толькі дарога праз перавал. І тут Манэргейма з ягонымі людзьмі выратаваў адзін кульгавы румынскі афіцэр. Ён з паловай спешанага эскадрона атакаваў немцаў, адцягнуўшы іхнюю ўвагу на сябе, і тым самым даў Манэргейму і ягоным афіцэрам магчымасць праскочыць пад самым носам у праціўніка. Манэргейм лічыў, што дзеянні гэтага афіцэра былі сапраўды гераічнымі і заслугоўвалі ўсялякай пахвалы.

# V. РУСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ

## Манэргейм і руская рэвалюцыя

Як ставіўся Манэргейм да сваіх падначаленых у час сваёй службы ў Расеі? Як ставіліся падначаленыя да яго?

Немцы ў сваіх данясеннях у 1918 годзе характарызавалі Манэргейма як адважнага, схільнага да авантураў і славалюбнага манархіста.

Манэргейм прынёс прысягу на вернасць рускаму імператару. Перад Першай сусветнай вайной ён адказваў за бяспеку цара падчас паляванняў у бяскрайных рускіх лясах. Яго залічылі ў царскі почат, і ён атрымаў права насіць на пагонах царскі вензель. Бываючы ў Пецярбургу, ён заўсёды карыстаўся сваім правам свецкага афіцэра і не праміна́ў асабіста прадставіцца імператару. Такім чынам, ён быў звязаны з царом падвойнаю повяззю − вайсковай прысягай і абавязкамі афіцэра світы.

Калі пасля буржуазнай рэвалюцыі часовы ўрад прысвоіў яму чын генерал-лейтэнанта, Манэргейм мусіў зняць з пагонаў царскія вензелі, бо, паводле старадаўняга правіла, у званні генерал-лейтэнанта ён насіць іх ужо не мог. Пазней гэта, безумоўна, уратавала яму жыццё, хоць блізкія да яго людзі казалі, што толькі дзеля сваёй бяспекі Манэргейм ніколі іх не зняў бы. А з такімі значакамі на плячах яго маглі б проста паставіць да сценкі і расстраляць.

Манэргейм быў строгі начальнік і не цярпеў ніякіх парушэнняў дысцыпліны. У гэтых адносінах ён быў непахісны. Гэта выявілася ў 1917 годзе і прывяло да звальнення са службы. Аднак ён не быў бяздумна жорсткім камандзірам і не прыніжаў чалавечай годнасці сваіх падначаленых. Ён быў проста сумленны і законапаслухмяны. Гэта ўратавала яго пасля рэвалюцыі на паўднёвым фронце і ў Адэсе. Аднак усё гэта не мела ніякага значэння ў час ягонага падарожжа з Адэсы ў Пецярбург і далей да Хельсінкаў і Ваасы. Тады ягонае жыццё ў некаторых выпадках вісела на валас-

ку. Ягоная высокая постаць, аўтарытэтны выгляд, смеласць і неверагодная вытрымка ўздзейнічалі нават на салдатаў, якія яго ніколі раней не ведалі. Ён быў арыстакратам і не хаваў гэтага, што даволі забаўна праявілася на вакзале ў Пецярбургу. Афіцэру было не да твару насіць свае рэчы, а таму Манэргейм пачаў шукаць насільшчыка. Вакзал быў поўны салдат, якія снoўдалі сюды-туды без ніякай справы, тым часам як некаторыя генералы самі цягнулі свае чамаданы. На думку Манэргейма, гэта было найніжэйшай ступенню самапрыніжэння, а таму ён наняў двух салдат, якія паднеслі яму чамаданы, прычым з задавальненнем.

Падчас падарожжа ў Пецярбург на адным паўстанку адбыўся смяротна небяспечны выпадак. Манэргейму для паездкі з Адэсы ў сталіцу ўдалося здабыць асабісты вагон. Гэта да таго раздражняла ваенных і цывільных, што аднойчы вагон абвясцілі сапсаваным і хацелі адчапіць ад цягніка. Манэргейм не згадзіўся. Тады ў вагон рынуўся натоўп салдат, ахопленых рэвалюцыйным запалам. Яны пагражалі расправай і хацелі выцягнуць Манэргейма з вагона. Афіцэраў тады расстрэльвалі паўсюдна без усялякіх цырымоніяў, проста на пэронах станцыяў. Манэргейм нават і не паспрабаваў абараняцца, уцячы ці ўступіць з салдатамі ў бойку. Ён загадаў маладому прапаршчыку з Фінляндыі, які добраахвотна служыў у рускай арміі і ехаў з ім разам, ачысціць вагон. Хлопец як шалёны выхапіў шаблю і, нічога не заўважаючы і не чуючы, на ўсю глотку закрычаў на ўзброены натоўп, які даўно адвык слухацца любых загадаў, патрабуючы зараз жа ачысціць вагон. Малады чалавек дзейнічаў у гэтай сітуацыі цалкам рэфлекторна. Тым часам цягнік якраз зрушыў з месца. І салдаты паспяшаліся выскачыць з вагона. Калі б Манэргейм пачаў з імі біцца ці паспрабаваў уцячы – смерць была б непазбежная.

Душой і целам Манэргейм быў царскі афіцэр. Калі ў 1915 годзе ён атрымаў Георгіеўскі крыж чацвёртай ступені, радасці не было канца. Ён паўтараў: «Божа, якая радасць!» Засмучала толькі тое, што бацькі ўжо не было ў жывых і ён не мог парадавацца такой добрай навіне. Манэргейм пісаў да сястры Соф'і, што пасля гэтага можна спакойна загінуць, бо інакш і на тым свеце яго засмучала б, што ён загінуў раней, чым атрымаў гэты ордэн. Цяпер жа ён быў георгіеўскім кавалерам. Да такой узнагароды яго



прадстаўлялі тройчы, але тройчы і адмаўлялі. Злыя языкі сцвярджалі, што ўзнагароду яму арганізавалі прыдворныя дамы.

Як адданы царскі ваяр Манэргейм спадзяваўся, што Фінляндыя пашле на фронт у Расею тысячы добраахвотнікаў, а таму вельмі ўзрадваўся, калі сустрэў аднаго. У ягоных войсках з'явіўся малады Марцін Франк. Манэргейм узяў юнака да сябе ў штаб, настаўляў і навучаў яго, раіў яму вывучаць рускую мову і бездакорна выконваць свае абавязкі.

Прыкладам у гэтым мог быць сам Манэргейм. Невядома ніводнага выпадку, каб падчас рэвалюцыйнага выбуху супраць яго вылучалі якія-небудзь абвінавачванні. Безумоўна, ён быў далёка ад рэвалюцыйных цэнтраў, на паўднёвым фронце і ў Румыніі. Важна і тое, што ён служыў у кавалерыі, войсках, куды меней за ўсё пранікла рэвалючыйная зараза. Кавалерысты лічылі сябе элітнымі войскамі і не праяўлялі цікаўнасці да шэрай пяхотнай масы.

Спачатку на фронце некаторыя афіцэры ставіліся да Манэргейма з падазронасцю. Сваім зухаватым выглядам і манерамі бліскучага гвардзейскага афіцэра ён выклікаў раздражненне. Ён сачыў за сваім фізічным станам, і ягоныя рухі былі заўжды зграбнымі і спрытнымі. На першы погляд ён падаўся фінскаму юнаку-добраахвотніку вельмі маладым, а калі той пачуў, што Манэргейму не трыццаць год, а ўсіх пяцьдзесят, то быў вельмі ўражаны.

Манеры гвардзейскага афіцэра, перабольшаная стыльнасць і франтаватасць не выклікалі ў падначаленых афіцэраў нічога, апроч прыкрасці, нават тады, калі яны бліжэй пазналі свайго камандзіра, бо ён умеў трымаць дыстанцыю і не дапускаў фамільярнасці ў адносінах з саслужыўцамі.

Метадычнасць, парадак і дысцыпліна – вось асноўныя рысы натуры Манэргейма. Ён быў старанны да педантычнасці. Калі Манэргейм праводзіў інспекцыі, ўсё павінна было знаходзіцца ў бездакорным парадку. Тапаграфічныя карты ён старанна вывучаў і запамінаў, нават калі маршрут пераходу ягоных частак быў кароткі і праходзіў па бяспечнай мясцовасці.

Да сваіх падначаленых ён ставіўся без паблажлівасці, размаўляў ветліва, незалежна ад чыноў, і калі нават рабіў вымовы, то не абражаў чалавека.

Пры вырашэнні сур'ёзных пытанняў ён быў заўсёды разважлі-

вы і спакойны, але мог нечакана распаліцца ад дробнай прыкрасці. Так, аднойчы, калі раптам перарвалася сувязь, ён разбіў палявы тэлефон.

Ялецкі, першы начальнік штаба, у якім знаходзіўся Манэргейм у час сусветнай вайны, расказваў, як той зазлаваў, калі ўбачыў на стале крышталёвую цукарніцу, якой раней у штабной маёмасці не было. Аказалася, што дзяншчык аднаго афіцэра ўзяў яе ў польскага ксяндза. Манэргейм загадаў салдату адправіцца пешшу да месца ранейшае дыслакацыі і вярнуцца з распіскай аб звароце пасудзіны. Ад болей суровага пакарання салдата ўратавала толькі тое, што цукарніцу ён узяў не для сябе.

Аднойчы польскі ксёндз адмовіўся прадаць салдатам сена, якое было складзенае ў сціртах на двары. Манэргейм спачатку не паверыў, што служка царквы можа быць такім непатрыятычным. Ён паслаў вахмістра разабрацца. Ксёндз зноў адмовіўся прадаць сена. У шаленстве Манэргейм загадаў начальніку сапёрнай каманды спачатку заплаціць за сена, а потым паставіць шыбеніцу і павесіць свяшчэнніка. Начальнік штаба Ялецкі і сапёр ледзь угаварылі яго адмяніць загад. Калі ж Манэргейм супакоіўся, то напісаў рапарт аб паводзінах свяшчэнніка з парадай прасачыць за паводзінамі ксяндза і адаслаў яго мясцовым уладам. Ялецкі ўспамінаў, што Манэргейм лічыў адсутнасць патрыятызму і нелаяльнасць да сваёй краіны самымі цяжкімі злачынствамі. Ён чакаў ад рускіх святога парыву і думаў што палякі таксама ўзгарацца імперскім патрыятызмам. Таго ж ён чакаў і ад фінаў. Ён не браў пад увагу і не разумеў, што ні палякі, ні фіны не лічылі Расею сваёй Радзімай, а рускую армію − сваёй арміяй. Шмат хто з іх быў настроены варожа як да Расеі, так і да яе арміі. Польскія ксяндзы былі яшчэ болей непахіснымі ў сваёй польскасці, чым простыя палякі. Польскі вышэйшы свет і арыстакратыя былі ў большай ці меншай ступені схільныя супрацоўнічаць з рускімі ўладамі.

Сімпатыі і антыпатыі Манэргейма былі вельмі глыбокімі. Адным ён мог дараваць шмат якія грахі, другім − ніякія і ніколі.

Брыгадны праваслаўны свяшчэннік сталаваўся разам са штабам. Ён з запалам выкладваў свае ваенныя планы і бясконца ўмешваўся ў чужыя размовы. Аднойчы штаб размясціўся ў невялікай хатцы. Ужо каторы дзень ішлі цяжкія баі. Усе падалі з ног ад



бяссоння і стомы. Святы айцец дабраўся разам з абозам, прыцягнуў свае пажыткі ў хаціну і пайшоў падшукаць сабе болей утульнага начлегу. Манэргейм у той час быў у выключна дрэнным гуморы. Два эскадроны не апраўдалі ягоных надзеяў. Ён нецярпліва хадзіў сюды-туды, адбіваючы такт па рыпучай падлозе. Раптам ён моцным выспяткам скінуў на падлогу два чамаданы, якія стаялі на зэдліку. Рэчы рассыпаліся па падлозе, і верны дзяншчык Карпацьеў пачаў складаць іх назад.

− Пакінь! Хай поп сам збірае свае пажыткі! − сярдзіта сказаў Манэргейм.

− Ваша правасхадзіцельства! Гэта ж нашыя рэчы, − адказаў Карпацьеў.

Манэргейм выскачыў на вуліцу, моцна ляснуўшы дзвярыма.

Пастаянная ветлівасць мела сваю цану. Накопленае раздражненне і напружанне − як і ў кожнага здаровага чалавека − патрабавалі выхаду, але ж ён не даў выспятка ўстыламу з-за сваёй бесцырымоннасці папу, а сарваў злосць на чамаданах.

Граф Раман Патоцкі ведаў Манэргейма да вайны па Варшаве. Манэргейм прыходзіў на прыёмы, якія наладжвалі бацькі графа кожны чацвер. Патоцкі расказваў, што Манэргейм быў прыняты ў вышэйшым свеце Варшавы і ўваходзіў у закрыты для рускіх клуб паляўнічых. Дзве адметныя рысы адрознівалі Манэргейма ад іншых рускіх афіцэраў: ён паліў цыгары і нават на вайне аддаваў загады, пачынаючы з ветлівай формулы накшталт: «Ці не зрабілі б вы мне паслугу...» − што было не прынята ў рускай арміі.

І на вайне Манэргейм імкнуўся весці звычны лад жыцця. Так, у чэрвені 1916 года ён прасіў сястру Соф'ю прыслаць яму сякія-такія рэчы, у спісе якіх фігуруюць добрыя цыгары, фірмовае мыла, парфума і г.д. Ён лічыў, што адзенне, рэчы і напоі павінны быць самай лепшай якасці. Адзенне ён звычайна купляў у Стакгольме, таму што спецыяльныя крамы там былі лепшыя, чым у Хельсінках.

Манэргейм сачыў за сваім здароўем і імкнуўся заўсёды быць свежым і бадзёрым. На новых месцах дыслакацыі, перш чым узяцца за працу, ён стараўся гадзіну-другую паспаць. Спаць ён мог калі і дзе заўгодна. Сон ягоны быў кароткі, але глыбокі, нават у нармальных умовах ён спаў не болей шасці гадзін у суткі. Кажуць,

што з-за гэтага ён ніколі і нічога ў сне не бачыў. А гэта чалавеку неабходна, бо такім чынам здымаецца ўнутранае напружанне. Пры кароткім сне гэтае напружанне можа вырвацца раптоўным выбухам злосці або нечым падобным.

Выпадак закінуў Манэргейма ў самы цэнтр урагану буржуазнай рэвалюцыі ў сакавіку 1917 года. Такія выпадкі становяцца зорнымі часамі для таленавітых журналістаў, як гэта адбылося праз некалькі месяцаў з Джонам Рыдам, якога нават ушанавалі пахаваннем у Крамлёўскай сцяне. У сваіх мемуарах Манэргейм ацаніў гэтую прыхамаць лёсу. У раздзеле, прысвечаным тым дням, значна больш падрабязнасцяў, чым у іншых.

Напрыканцы студзеня 1917 года Манэргейм паехаў у Фінляндыю на адпачынак. Дабраўшыся да Пецярбурга, ён вырашыў з'ездзіць у Царскае Сяло, каб прадставіцца імператару, бо як афіцэр світы меў такое права і заўсёды ім карыстаўся. Пасля вайны ён наведваў імператрыцу-маці, якая жыла ў Даніі, а ў Парыжы – тагачаснага старэйшыну рода Раманавых вялікага князя Мікалая.

У той дзень імператар прыняў толькі двух чалавек. Аўдыенцыю Манэргейму далі імгненна. Царская сям'я насуперак усім спадзяванням жыла ціхім паўсядзённым жыццём добрапрыстойных буржуа – адносна спакойна і замкнёна. Такая магчымасць у Царскім Сяле была. Манэргейм думаў, што цар, які заўсёды цікавіўся досведам і ведамі іншых, выслухае яго з цікаўнасцю, тым болей што гаворка ішла пра румынскі фронт, фронт непадобны да іншых, і асабліва цікава будзе, калі ніхто – як лічыў Манэргейм – пра тое цару не расказваў.

Манэргейм пачаў казаць пра Румынію, але цар слухаў абсалютна безуважна. Пасля аўдыенцыі Манэргейм пацікавіўся ў флігельад'ютанта, ці прымае царыца. Яна хварэла, аднак Манэргейм лічыў сваім абавязкам выказаць ёй сваю ўвагу і папрасіў паведаміць, што просіць аўдыенцыі. Царыца адказала, што чакае яго заўтра.

Такім чынам Манэргейм патраціў два дні на гэтыя фармальныя візіты. Ён быў ахоплены нейкім дзіўным натхненнем. Магчыма ён успомніў старую прымаўку: «як з вачэй – так і з памяці». Фармальна імператар быў галоўнакамандуючым і мог павышаць у чыне сваіх генералаў, ставіць перад імі новыя задачы і прызначаць на любую пасаду. Аднак у Манэргейма не было ніякіх просьбаў і прапановаў. Уласна кажучы, у яго не было да цара ніякай канкрэтнай справы. Магчыма, што ён спадзяваўся атрымаць новае важнае заданне. Магчыма, быў гатовы абараняць імператара, ратаваць яго, бо казаў пра гэта адразу пасля пачатку рэвалюцыі.



Імператрыца выглядала стомленай, валасы ў яе пасівелі. Звычайна яна паводзіла сябе стрымана і халодна, але гэтым разам была ажыўленай і цікаўнай. Цэсарэвіч, прыгожы дванаццацігадовы хлопчык хворы на гемафілію, з вялікай увагай слухаў захаплядьны аповед Манэргейма пра румынскі фронт. Манэргейм, безумоўна, падрыхтаваў яго загадзя. Калі з нейкай нагоды ён станоўча выказаўся пра румынскага палкоўніка Стурдзу, імператрыца перапыніла яго і спытала: «Ці не той гэта Стурдза, які, кажуць, перакінуўся да немцаў?»

Манэргейм адказаў, што ад'ехаў з фронту усяго толькі два тыдні таму і паверыць падобным чуткам не можа. Палкоўнік Стурдза проста не можа ўчыніць такое, за яго Манэргейм можа даць руку на адсячэнне.

Імператрыца на гэта нічога не адказала, спрачацца з падданым не стала і не паклікала нікога, каб высветліць гэтае пытанне. Яна дала Манэргейму адчувальную пстрычку, бо пра падзеі ў Румыніі ведала болей, чым ён, які распавядаў усё так, быццам перад ім быў чалавек абсалютна незнаёмы ні з краінай, ні з тым, што ў ёй адбываецца.

Толькі ў гатэлі Манэргейм даведаўся, што палкоўнік Стурдза перабег да ворага і скідваў з самалёта лістоўкі з заклікам да румынскіх войскаў пераходзіць на бок Нямеччыны.

Манэргейм ужо аднойчы праславіўся тым, што, распавядаючы пра сваё азіяцкае падарожжа, так зацікавіў цара, што той нават забыўся на час, і аўдыенцыя доўжылася ўтрая больш, чым было запланавана. Здаецца, і гэты раз ён хацеў дабіцца такога ж поспеху. Але падзеі на румынскім фронце былі тады не настолькі важныя і радасныя, каб палепшыць настрой у гаспадароў, якія, безумоўна, адчувалі, што іх час мінае, а наперадзе чакаюць яшчэ цяжэйшыя выпрабаванні. Мяркуючы па мемуарах, Манэргейму нават у галаву не прыходзіла, што час і месца ён выбраў няўдала, і ягоны аповед нікога не цікавіць. Імператрыца адной фразай перакрэсліла ўсю ягоную гісторыю. Але Манэргейм, здаецца, і гэта-

га не заўважыў. Ён быў фармалістам, а свет вакол тым часам імкліва мяняўся.

У Пецярбургу Манэргейм, аднак, звярнуў увагу на тое, што цара крытыкуюць у адкрытую. Народ стаміўся ад вайны, эканоміка знаходзілася ў хаатычным стане, транспартная сістэма развальвалася. Не хапала нават разменнай манеты. Ад лютых маразоў замерзлі паўтары тысячы паравозных катлоў, дзесяткі тысячаў вагонаў загрувашчвалі станцыі. У сталіцы не хапала хлеба і паліва. Некалі развал жыцця ў сталіцы справакаваў вялікую французскую рэвалюцыю. Тое самае адбылося ў Расеі. Прычыны, вядома, былі глыбейшыя, але менавіта адчай і паніка выгналі людзей на вуліцы і плошчы, каб знішчыць ні на што не здольную дзяржаву.

23 лютага Манэргейм ад'ехаў у Фінляндыю. У Хельсінках ён сустрэўся са сваёю сястрой Соф'яй і зводнай сястрой Маргэрыт. Ён прабыў у Фінляндыі два тыдні і выехаў на фронт 9 сакавіка. Наступным днём ён быў у Пецярбургу і пасяліўся ў гасцініцы «Еўрапейская». Вечарам у нядзелю 11 сакавіка ён глядзеў балет у оперным тэатры. Днём у цэнтры горада было неспакойна, чуліся стрэлы − салдаты па загадзе імператара спрабавалі навесці парадак. Народ хваляваўся і рабаваў харчовыя крамы. У Оперу Манэргейм трапіў па гадавым абанеменце аднаго свайго сябра. Выпадкова ягоным суседам аказаўся стары знаёмец, дзяржаўны натарыус Хольм, гэткі добрапрыстойны дзядок, які вёў вэксальныя справы афіцэраў. Манэргейм спытаў у Хольма, ці згодзіцца той перавесці на яго свой гадавы абанемент, калі памрэ раней, − бо ні сям'і, ні сваякоў у Хольма не было, і Манэргейм гэта ведаў. Хольм вельмі ветліва пагадзіўся. Камізм дамовы абвастраўся тым, што Манэргейм адпраўляўся на фронт, дзе смерць пільнавала яго на кожным кроку.

Калі позна ўвечары Манэргейм выйшаў з Імператарскай оперы, горад здаваўся пустым, ніякага транспарту не было − ні таксоўкі, ні рамізніка здабыць не ўдалося. Былы прыяцель Манэргейма па палку прапанаваў падвезці яго на машыне да гатэля. На Вялікай Марской і Неўскім праспекце хадзілі толькі ўзброеныя патрулі. У гасцінічнай рэстарацыі Манэргейм сустрэў свайго сябра, дырэктара кампаніі Нобель, Эмануэля Нобеля. Той прапанаваў схадзіць у клуб, што быў непадалёк ад гатэля і дзе звычайна збіраліся дэпутаты Думы. Там было пуста. Швейцар сказаў, што за цэлы дзень сюды ніхто не зазірнуў. Тады яны накіраваліся ў кантору кампаніі Нобеля і там даведаліся, што хваляванні ахапілі ўвесь цэнтр горада. Пачуўшы гэтую навіну, яны вырашылі лепш вярнуцца назад у гасцініцу. Сапраўдная рэвалюцыя пачалася назаўтра. Казалі, што шэсць палкоў − адзін з іх казацкі, які лічыўся абсалютна надзейным, − перайшлі на бок рэвалюцыянераў. Ужо зранку ў цэнтры горада разгарэліся сапраўдныя баі. Паўстанцы захапілі некалькі турмаў і вызвалілі вязняў. Некаторыя склады зброі разрабавалі і спалілі. Шукалі жандараў, паліцэйскіх і генералаў, якіх адводзілі на задворкі і расстрэльвалі. Ваеннага каменданта Пецярбурга павесілі.



Раніцай Манэргейм стаяў каля акна ў гатэлі і сачыў за тым, як на вуліцы бязладна бурліць натоўп. Перад гатэлем сноўдалі ўзброеныя салдаты і цывільныя. Нехта згледзеў Манэргейма ў генеральскай форме і паказаў на ягонае акно. Натоўп кінуўся ў гатэль. Пільны швейцар узбег наверх папярэдзіць Манэргейма і паказаў як выйсці з гасцініцы чорным ходам. Манэргейм паспеў сказаць ардынарцу, што сыходзіць і патэлефануе пазней. На Манэргейме было футра без знакаў адрознення, а шпоры ён зняў сам.

Ён пайшоў да канторы Нобеля той жа дарогай, якой ішоў увечары, − уздоўж Екацярыненскага канала. Служачы кампаніі Нобеля Карл Васільевіч Хагелін у сваім дзённіку расказвае, што Эмануэль Нобель адразу паслаў чалавека за цывільнай вопраткай для Манэргейма, у якую той зараз пераапрануўся. Манэргейм у сваіх мемуарах пра гэта не расказвае, як не ўспамінае і свае словы: «Калі толькі ўдасца трапіць на Выбаргскую, дык усё будзе добра». Туды, на другі бок Нявы, дзе знаходзіўся палац сям'і Нобеляў, ён накіраваўся ў кампаніі Эмануэля Нобеля і Эжэна Бо, карэспандэнта ад французскай нафтавай кампаніі. Калі тройца ў жаху спынілася каля палаючага паліцэйскага пастарунку, з натоўпу пачуліся шалёныя крыкі: «Там пераапрануты афіцэр!»

Як сведчыць Хагелін, яны пайшлі праз Марсава поле. На паўдарозе іх дагнаў адзін салдат і сказаў:

− Адзін з вас − афіцэр.

– Так, я афіцэр, – адказаў француз, дастаючы свой ваенны пашпарт. Ён ваяваў на Заходнім фронце і толькі нядаўна прыехаў на працу ў Расею. Салдат казырнуў і пайшоў назад.

На мосце праз Няву нейкі надта пільны грамадзянін схапіў Манэргейма за плячо і паклікаў ваенны патруль праверыць у затрыманых ім трох падазроных мінакоў дакументы. Паперы француза былі ў парадку. Нобель сказаў, што ягоныя дакументы дома, а Манэргейм патлумачыў, што толькі сёння ўранні прыехаў з Фінляндыі і ўсе ягоныя паперы ў чамадане на Фінляндскім вакзале. Начальнік патруля не захацеў цягнуцца на вакзал дзеля папераў аднаго чужаземца, і яны пайшлі далей. Нобелева жытло было побач з яго заводам, і Манэргейм не захацеў там застацца, бо рабочыя маглі даведацца, што ў доме хаваецца генерал, і ўчыніць беспарадкі. Ён дачакаўся вечара і перабраўся да фінскага лейтэнанта Сэліна, які жыў непадалёку. Той некалі запрашаў Манэргейма да сябе, калі не ўдасца знайсці гасцініцу. Эміль, зводны брат Эмануэля Нобеля, вывеў Манэргейма з завадскога раёна на цэнтральную вуліцу. Паўсюль гарэлі вогнішчы, вакол якіх грэліся людзі. Туды-сюды ездзілі машыны, напакаваныя ўзброенымі салдатамі і «вольнымі» жанчынамі. Неба над горадам барвела пажарамі, чуліся стрэлы.

У передпакоі Сэлінавай кватэры Манэргейм сутыкнуўся са сваім зяцем Мікаэлем Грыпенбергам, які толькі што прыехаў з Хельсінкаў. Хутка прыйшоў і гаспадар з адстаўным генералам Лодэ, які прыехаў з Фінляндыі крыху раней і таксама жыў і Сэліна.

У аўторак, 13 сакавіка, у кватэру з праверкай прыйшоў салдацкі патруль – ім паведамілі, што тут хаваецца генерал. Сэлін пацвердзіў, што у яго жыве адстаўны генерал. Салдаты пачалі абшукваць кватэру. Манэргейм у халаце сядзеў у пярэднім пакоі і размаўляў па тэлефоне. Ён спрабаваў звязацца са сваім ардынарцам, які заставаўся ў гатэлі. Салдаты згледзелі на ягоных ботах сляды ад шпораў. Манэргейм патлумачыў, што ён прыехаў з Фінлянды і вельмі рады, што ўдалося здабыць хоць якія боты ў такі мароз. З тым салдаты і пайшлі прэч.

Наступным днём Манэргейму ўсё ж удалося звязацца з ардынарцам. Той прыехаў за ім на аўтамабілі. У гатэль быў прызначаны камендант, які меў у сваім распараджэнні салдат для абароны пастаяльцаў. Камендант таксама меў права выпісваць пасведчанні, якія былі адначасова і прапускамі. Рэвалюцыя усталёўвала свае парадкі. Часовы ўрад быў створаны і пачынаў кіраваць.



Манэргеймаву ардынарцу ўдалося атрымаць для яго дазвол на выезд і месца ў спальным вагоне маскоўскага цягніка, які адыходзіў у той жа дзень вечарам.

Прыехаўшы ў Маскву, Манэргейм бачыў, як пачыналася там рэвалюцыя. Увесь горад хутка ахапілі дэманстрацыі пад чырвонымі сцягамі. Адну з першых такіх дэманстрацыяў Манэргейм сустрэў каля Брэсцкага вакзала. Ён сядзеў у санях і назіраў, як па той самай вуліцы, дзе 21 год назад праходзіла каранацыйная працэсія з ягоным удзелам, цяпер цягнуліся гурмы народу пад чырвонымі сцягамі. Толькі ішлі яны ў адваротным кірунку. Тым самым днём, 15 сакавіка, ён даведаўся ад адрачэнні імператара на карысць свайго брата Міхаіла. Гэта крыху абнадзеіла генерала. Але праз два дні стала вядома, што і Міхаіл адмовіўся ад кароны. Манэргейм паабедаў недзе за горадам, паехаў на вакзал і сеў у цягнік, які ішоў на поўдзень. Калі ён дабраўся да Кіева, рэвалюцыя пачалася ўжо і там. На шыі забітага царскага міністра Сталыпіна вісеў чырвоны гальштук. Манэргейм рухаўся наперад на грабяні рэвалюцыйнай хвалі.

Адмовіўшыся ад улады за сябе і свайго спадкаемцу-сына, імператар перадаў усю ўладу Часоваму ўраду і Устаноўчаму сходу, каб яны выпрацавалі новую канстытуцыю. Такім чынам, з пункту погляду прыхільнікаў цара, новы ўрад, створаны з дэпутатаў Думы, быў цалкам легітымны і паўнамоцны. Але Манэргейм быў не здольны на такія разважанні. Новыя ідэі зусім яго не цікавілі, ён іх не ведаў і не хацеў ведаць. Ён чапляўся за старое, за ўчарашні дзень і лічыў адзіным сваім абавязкам заставацца верным той клятве, якую даў некалі імператару. На ім быў «манэргеймаўскі панцыр», пра які пазней яму пісала графіня Любамірская. Гэтая мудрая жанчына тады мела на ўвазе Манэргеймава нежаданне кахаць і скарыцца перад каханнем. Затое яму давялося скарыцца перад рэвалюцыяй. Гэты досвед стаўся для яго цяжкаю траўмай, якая вымусіла яго з яшчэ большай варожасцю ставіцца да рэвалюцыі і народжанай ёю дзяржавы. З гэтай дзяржавай ён ніколі так і не прымірыўся.

Манэргейм спасцігаў рэвалюцыю з другога боку барыкадаў, ён быў яе смяротным ворагам і мог стаць яе першай ахвярай. Ён ніколі нават не спрабаваў яе зразумець або паправіць аб ёй сваё адмоўнае ўяўленне. У Фінляндыі ўсе, нават самыя добрапрыстойныя буржуа, выйшлі на вуліцы святкаваць рэвалюцыю, пачапіўшы чырвоныя банты. Манэргейм гэтага не пабачыў, бо, калі праз дзевяць месяцаў вярнуўся ў Фінляндыю, тыя буржуа ўжо даўно ўсе чырвоныя банты са сваіх грудзей пазрывалі.

29 сакавіка 1917 года Манэргейм прыбыў у свой штаб. Армія прысягнула Часоваму ўраду. У адным з лістоў Манэргейм пісаў, што гэта глыбока абурыла салдат і афіцэраў. Пецярбургскі гарнізон парушыў прысягу і прывёў да ўлады ўрад, які цяпер патрабаваў прысягі на вернасць сабе і ад іншых. На думку Манэргейма, гэта было памылкай і ўрад не меў права на такія патрабаванні. Сёння гэты ўрад сядзіць пры ўладзе, а заўтра рабочыя і салдаты звергнуць яго. Гэты ўрад быў кароткачасоваю з'явай і не меў права прывязваць да сябе людзей надоўга.

У сваіх мемуарах Манэргейм сцвярджае, што адразу пасля прыезду на фронт звязаўся з камандуючым рускімі войскамі ў Румыніі генералам Сахаравым і прапанаваў яму стаць на чале супраціўлення. Але той лічыў, што час яшчэ не настаў.

Прайшло некалькі тыдняў. У адным лісце Манэргейм пісаў, што яму непрыемна бачыць, што людзі сталі бяссільнымі цацкамі, якіх гойдае сюды-туды на хвалях лёсу. Ён пачынаў сумнявацца, што абяцанае народу запаветнае царства шчасця, свабоды і роўнасці калі-небудзь настане. Усё змянілася, і людзі ўжо зусім не тыя, што былі раней. Яму было цяжка цярпець бальшавікоў з іхнімі фіглярствамі. Дысцыпліна ў войсках падала, палітычныя дзеячы ўсё часцей умешваліся ў ваенныя справы.

У свой час адыход бацькі з дому прывёў да распаду сям'і і смерці маці, а дзяцей параскідала ў розныя бакі да беднага і няпэўнага існавання. Цяпер адбывалася тое самае. Можа, гэтая перажытая ў раннім дзяцінстве катастрофа і паўплывала на тое, што Манэргейм ад самага пачатку заняў адмоўную і агрэсіўную пазіцыю ў дачыненні да рэвалюцыі?

Манэргейм не прысягнуў Часоваму ўраду. Ён не паехаў на ўрачыстасці, арганізаваныя з гэтай нагоды, спаслаўшыся на вялікую колькасць паўсядзённых справаў, наадварот – ён прапанаваў неадкладна паўстаць супраць гэтага ўрада. Яму і ў галаву не прыйшло, што фіны будуць вітаць рэвалюцыю, як світанак новага дня і новай эры. Але фіны зрабілі менавіта гэтак.



Калі адна з Манэргеймавых дывізіяў адмовілася заняць пазіцыі ў траншэях, той загадаў артылерыі адкрыць агонь. Двух снарадаў хапіла, каб салдаты адправіліся ў траншэі. У маі 1917 года Манэргейму па выслузе з 1915 года прысвоілі званне генерал-лейтэнанта і прызначылі камандзірам Шостага кавалерыйскага корпуса, у які ўваходзла і былая ягоная 12-ая кавалерыйская дывізія. Паколькі ён пакідаў дывізію, то выдаў свой апошні загад, вельмі падобны да таго славутага загаду, які ён напісаў пасля заканчэння Зімовай вайны. Ён пералічваў у ім геаграфічныя назвы, прыродныя ўмовы і пройдзеныя разам дарогі: «У крывавых баях на раўнінах Галіцыі, на берагах Днястра і Прута, у бяскрайніх гарах Румыніі, сярод снягоў і пад пякучым сонцам палкі і батарэі сваёю крывёй і самаадданым гераізмам уплялі новыя лаўры ў вянок сваёй бессмяротнай славы».

Манэргейм, як і Напалеон, любіў устаўляць у загады гучныя назвы і прыродныя абсягі.

Манэргеймаў корпус не ўдзельнічаў у вялікім летнім наступленні. Войскі практычна адпачывалі, і Манэргейм атрымаў магчымасць аб'ехаць тылы сваіх войскаў і шырэй пазанёміцца з краінай. У Букавіне ён наведаў конезавод Радданца, у якім, аднак, ужо не было коней, пабываў у шырокай дэльце Дуная, славутай сваімі чаратамі і пеліканамі. Ён агледзеў шматлікія калоніі нямецкіх пасяленцаў у Расейскай імперыі, звярнуў увагу на прасторныя дамы, чыстыя вуліцы і каменныя платы. І яго парадавала, што нічога не перашкаджае мясцовай моладзі служыць у шэрагах расейскай арміі.

У ліпені 1917 года 12-ую дывізію, якая, як і яе былы камандзір, найболей зберaглася ад рэвалюцыйнай заразы, паслалі ў Адэсу навесці і падтрымаць парадак. Яна выканала заданне самым простым і надзейным спосабам – знішчыла вялікія вінныя склады. Сотні тысяч бутэлек з шампанскім былі разбітыя і віно цякло бурлівай ракой. Манэргейм таксама пабываў у Адэсе, а потым накіраваўся ў Бэндэры, мястэчка, у якім пасля няўдалага паходу

на Расею доўга жыў шведскі кароль Карл XII, а калі ён стаў невыносным, яго даўнішнія саюзнікі-туркі самі напалі на яго, каб прагнаць са сваёй тэрыторыі. Манэргейм даўно хацеў пабачыць гэтыя мясціны.

20 жніўня 1917 года перад яго вачыма адкрылася дзіўнае дзіва: маленькі румынскі гарадок без ніякіх прыкметаў вайны, у якім было толькі два шынялі – Манэргеймаў і ягонага ад'ютанта. Упершыню за тры гады ён правёў некалькі гадзінаў у свеце, які не ведаў вайны. Гэта была бязмежная радасць. У Манэргейма былі выключна развітая чуйнасць і ўменне ўсебакова адчуваць навакольную мясцовасць, успрымаючы яе ўсімі пачуццямі. Гэтаму майстэрству і дагэтуль няма назвы.

Манэргейм наведаў камандуючага арміяй генерала Лаўра Карнілава, які ў той час прамаўляў палымяную прамову да салдатаў аб неабходнасці трымаць дысцыпліну. У канцы ён пакланіўся салдатам і сказаў: «Усё цяпер залежыць ад вас, браткі. Уся ўлада ў вашых руках».

Афіцэрам у Расеі болей няма чаго рабіць – такую выснову зрабіў для сябе Манэргейм.

У Манэргеймавых войсках дысцыпліна яшчэ зберагалася. 4 чэрвеня, калі яму споўнілася 50 гадоў, корпус адзначыў гэта парадам і традыцыйным святам. У той жа час выспявала і запачаткоўлася змова. Аднойчы, калі Манэргейм абедаў са сваім штабам, яму прынеслі данясенне. Ён выйшаў з-за стала, не прыцягваючы нічыёй увагі, каб патаемна сустрэцца са сваімі аднадумцамі, генераламі Крымавым і Урангелем. На гэтай таемнай сустрэчы яны абмяркоўвалі магчымасць маршу на Пецярбург з мэтай аднаўлення парадку. Аднак давялося канстатаваць, што гэта немагчыма, бо ўвесь транспарт быў у руках рэвалюцыянераў. А без чыгункі, тэлеграфа і тэлефона ўсе спробы будуць марнымі.

Манэргейма ратавала яго ўпэўненасць у сабе. Адзін яго падначалены расказваў, што кожную раніцу Манэргейм з двума веставымі некуды ад'язджаў. Яны праязджалі праз вёскі і бівакі, дзе бадзяліся пехацінцы, якія ўжо забылі, што такое дысцыпліна. Манэргейм ехаў з застылым тварам, без ніякага выразу, і гэта дзейнічала. Салдаты адразу выструньваліся. І пачыналі бурчаць, толькі калі Манэргейм праязджаў міма. У адным эскадроне ўсё ж



з'явіліся прыкметы непадпарадкавання. Кожны эскадрон меў свайго святога абаронцу, і дзень гэтага святога традыцыйна адзначаўся як свята. Гэты раз на традыцыю махнулі рукой. Манэргейм спусціўся ў траншэі, сабраў людзей з эскадрона, адвёў іх у лес і там звярнуўся з прамовай: «Драгуны, сёння вашае свята. Я віншую вас, але тут адсутнічае адзін чалавек, ваш камандзір, які не аднойчы вадзіў вас у бой і быў вам родным бацькам. Ці вы забыліся, якія падарункі ён паднёс вам да эскадроннага свята? Вы зняважліва паставіліся да яго, і сёння, у гэты святочны дзень вам належала б паслаць яму тэлеграму і папрасіць прабачэння».

Справа была ў тым, што драгуны арыштавалі свайго камандзіра за тое, што ён сказаў манархічную прамову, і адаслалі яго ў Кішынёў, дзе яго трымалі пад арыштам.

Тэлеграму паслалі.

Фінам цяжка ўспрыняць і зразумець матывы дзеянняў Манэргейма ў дадзеным выпадку. Адносіны афіцэра да салдатаў нагадвалі адносіны бацькі да сына, пераходзілі на асабісты ўзровень з адпаведнымі пачуццямі. Гэтак сама, як цар быў бацька ўсім рускім (цар-бацюхна), афіцэр быў бацька ўсім сваім падначаленым. У славутым загадзе, выдадзеным падчас Зімовай вайны, Манэргейм назваў салдат сваімі дзецьмі. І дух Зімовай вайны, і Манэргеймаў узрост дазвалялі яму такі зварот – Манэргейм ужо належаў тады да пакалення дзядоў.

Калі прыехаў новы армейскі камісар, Манэргейм павітаўся з ім і некуды знік, даручыўшы свайму падначаленаму заняцца госцем. З грэблівай грымасай Манэргейм сказаў, што гэты генерал прадаў армію, перайшоўшы да бальшавікоў толькі дзеля сваёй выгады. Праз пэўны час Манэргейм адправіўся з камісарам у полк дзеля размовы з драгунамі, якія арыштавалі свайго камандзіра. Перад тым Манэргейм загадаў адвесці вінаватых у штаб палка і забараніў ім вяртацца ў эскадрон. Аднак армейскі камісар дазволіў ім вярнуцца і працягваць службу пасля адбыцця пакарання. Для Манэргейма гэта было ўжо занадта. Чаша цярпення перапоўнілася – ён адчуў, што пара падаваць у адстаўку.

Армейскі камісар з-за параненай нагі вымушаны быў амаль ляжаць у машыне. Манэргейм з'явіўся толькі тады, калі госць уладкаваўся для ад'езду. Развітанне было кароткае і халоднае.

Савет арміі паслаў на перамовы да Манэргейма сваіх прадстаўнікоў. Манэргейм загадзя загадаў вынесці з кабінета ўсе крэслы за выключэннем свайго, каб прадстаўнікам савета давялося размаўляць з ім стоячы.

Але Манэргейм не змог абараніць свайго афіцэра, камандзіра таго эскадрона. Ён адчуваў сябе бяссільным, непатрэбным і абражаным. Гэтае пачуццё выклікала і ўмацавала ў ім адпаведную рэакцыю – і ён прыняў выклік з пагардаю і нянавісцю. Але сталася так, што ў хуткім часе яго конь спатыкнуўся, і Манэргейм так моцна пашкодзіў калена, што мусіў праляжаць пару месяцаў у ложку. Дзеля лячэння ён атрымаў дазвол выехаць у Адэсу, а 25 верасня 1917 года са штаба арміі прыйшла тэлеграма: яго пераводзілі ў рэзерв Адэскай ваеннай акругі. Усё было ясна – ён не падыходзіў да новых умоваў.

Манэргейм быў пакрыўджаны і абражаны. Аднаму свайму падначаленаму, які паехаў на адпачынак у Маскву, ён пісаў, што яму прапанавалі на выбар – адмовіцца ад камандавання або аднавіць сваё добрае імя, што азначала заваяваць давер новай улады. А гэта Манэргейм якраз і лічыў самым нізкім падзеннем.

Калі на пачатку лістапада бальшавікі захапілі ўладу ў Пецярбургу, Манэргейм звярнуўся да сваіх знаёмых афіцэраў з заклікам неадкладна пачаць барацьбу супраць іх. Аднак усе былі нібыта паралізаваныя страхам.

Манэргейм прабыў у Адэсе да 3 снежня. Ён жыў ва ўтульным гатэлі «Лондан». З-за забастоўкі краўцоў ён не змог пашыць сабе цывільнага гарнітура, а паколькі шаўцы баставалі таксама, ён заставаўся і ў сваіх генеральскіх ботах са шпорамі. Удалося раздабыць толькі гальштук і капялюш. Купіць што-небудзь з гатовага адзення ці з чужога пляча – такое яму і ў галаву не магло прыйсці.

Манэргейм адкладваў ад'езд, чакаючы канца забастоўкі. Але ехаць давялося такі ў небяспечнай генеральскай форме: ён разлічваў трапіць у Фінляндыю 10 лістапада, а ў марным чаканні прайшло ўжо ажно тры тыдні. У Хельсінках ён спадзяваўся растварыцца ў цывільным натоўпе, але зрабіць гэта яму давялося яшчэ ў Пецярбургу.

Нага ў асноўным зажыла, хоць і не цалкам, і Манэргейм скарыстаў гэтую падставу, каб атрымаць дазвол на ад'езд у Пецярбург дзеля дальнейшага лячэння, якое можна было правесці толькі там. Ён атрымаў дазвол і для свайго дзеншчыка Карпацьева. На развітанне Манэргейм наведаў штаб корпуса. Ахтырскія гусары наладзілі яму развітальную вечарыну.



Вакол Манэргейма сабралося цеснае кола людзей, якія хацелі паехаць з ім разам. Гэтых людзей ён падбіраў сам з мэтай перасцярогі. З ім ехалі дзве сястры з англійскага Чырвонага Крыжа, тры румынскія лекары, Карпацьеў і малады Марцін Франк, фінскі добраахвотнік, якім Манэргейм апекаваўся.

Манэргейм раздабыў вагон са знакамі Чырвонага Крыжа. Падарожжа пачалося 3 снежня, а 11 яны ўжо былі ў Пецярбургу.

У Пецярбургу Манэргейм пасяліўся ў знаёмай яму гасцініцы «Еўрапейская». Ён атрымаў у фінскага статс-сакратара пасведчанне аб тым, што ён з'яўляецца грамадзянінам Фінляндыі, і занёс яго ў Генеральны штаб разам з рапартам аб адстаўцы. Ён прасіў выкрэсліць яго са спісаў расейскай арміі, бо Фінляндыя стала незалежнай дзяржавай і ў расейскім войску ён болей служыць не можа. Пашпарт ад фінскага статс-сакратара атрымаць ён не змог, бо дазвол на выезд выдавалі толькі бальшавікі. Адзіным дакументам, які ўдалося здабыць, было пасчведчанне аб тым, што ён фінскі грамадзянін і едзе ў Фінляндыю. А даведка ад адэскага каменданта дзеля паездкі ў Пецярбург было адзіным пасведчаннем асобы. Генштаб не меў магчымасці дапамагчы яму, а прасіць што-небудзь у бальшавікоў ён наадрэз адмаўляўся дый увогуле не хацеў мець з імі ніякай справы.

Калі на Фінляндскім вакзале ён паказаў сваё пасведчанне салдатам, тыя не змаглі яго прачытаць, бо аказаліся інгерманландцамі, фінамі з Пецярбургскай губерні. Манэргейм патлумачыў, што ён грамадзянін Фінляндыі і туды накіроўваецца. Ён гаварыў па-фінску, хоць ведаў па-фінску ўсяго некалькі словаў, дый тыя з дрэнным вымаўленнем. Становішча было – абсурдней няма куды. Манэргейму патрэбна было толькі крыху шанцавання – і яму пашанцавала гэты раз таксама, як і кожны раз падчас той рэвалюцыі. Манэргейм лічыў, што добраму салдату шанцуе заўсёды.

Манэргейм адправіўся ў дарогу з Хуга Бакмансонам, якога выпадкова сустрэў на вакзале. Каб дайсці да пашпартнага кантролю, ім давялося перасекчы ўсю залу, набітую рэвалюцыянерамі. Як

расказвае Бакмансон, яны ўвесь час размаўлялі па-руску, каб усе думалі, што ён рускі афіцэр, бо на ім была ваенная форма.

Манэргейм сеў у цягнік і паехаў да Хельсінкаў – наўпрост у гісторыю Фінляндыі і ўсяго свету. І калі ён выходзіў на пэроне вакзала ў Хельсінках, гэта была ўжо новая старонка гісторыі. Праз некалькі дзён ён зноў прыехаў у Пецярбург, каб высветліць палітычнае становішча ў Расейскай Імперыі. Гэта быў яго апошні візіт у Пецярбург. Болей ён там ніколі не быў.

# VI. ГРАМАДЗЯНСКАЯ ВАЙНА

## Патрэбны чалавек у патрэбны момант у патрэбным месцы

18 снежня ў Хельсінках стаяла шэрае дажджлівае надвор'е. Сюды, за дванаццаць дзён да абвяшчэння незалежнасці Фінляндыі, начным цягнікам з Пецярбурга прыехаў былы генерал-лейтэнант расейскай арміі Карл Густаў Эміль Манэргейм. Гэта быў статны мужчына ростам 194 сантыметры. Паўгода таму, 4 чэрвеня 1917 года, яму споўнілася 50 год. На ім быў цывільны гарнітур, які генералу ўдалося здабыць у Пецярбургу. Яго суправаджаў улан Карпацьеў, украінец з тэрыторыі Польшчы, які аднойчы на фронце выратаваў Манэргейму жыццё. Ён быў настолькі адданы свайму камандзіру, што, пераапрануўшыся ў цывільнае адзенне, паследаваў за ім у чужую краіну, абедзьве мовы якой былі яму абсалютна невядомыя. Гэтым самым цягнікам ехаў да Хельсінкаў і палкоўнік з Фінляндыі Марцін Ветцэр, стары Манэргеймаў знаёмы, з якім яны сустракаліся апошні раз у Лясістых Карпатах улетку 1917-га. Аднак кампанію Манэргейму ў гэтай паездцы склаў яшчэ адзін царскі афіцэр і мастак, Хуга Бекмансон, якога ён выпадкова сустрэў на Фінляндскім вакзале ў Пецярбургу. Падчас падарожжа Бекмансон распавёў Манэргейму, што фінскі сенат вырашыў стварыць гвардыю абароны, і ўвесь час здзіўляўся, як гэта магчыма, калі паўсюль кішэлі чырвоныя.

– Яна будзе створаная на захадзе, у Торніа, а потым паступова, пакрысе, мы адваюем усю краіну, – адказаў Манэргейм.

З вакзала генерал Манэргейм накіраваўся прама на кватэру да сваёй зводнай сястры Марыі Грыпенберг і яе мужа. Грыпенбергі цёпла прынялі госця, хоць і сутыкнуліся з ім у дзвярах, бо ад'язджалі ў Стакгольм. Генерал быў у добрым настроі, што зразумець і растлумачыць ніяк нмагчыма, бо пачынаючы з сакавіка ягонае жыццё ўвесь час было ў небяспецы.

У Хельсінках жыла і старэйшая сястра генерала Соф'я. З усіх

шматлікіх дзяцей гэтай сям'і трое памерлі, а двое жылі ў Швецыі. Соф'я была галоўнай медыцынскай сястрой у Хірургічным шпіталю і неаспрэчным кіраўніком аб'яднання медыцынскіх сёстраў Фінляндыі. Прыезд брата яе вельмі ўзрадваў.

Соф'я была бацькавай улюбёнай дачкой – гэтак сама, як генерал быў ягоным улюбёным сынам. Астатнія дзеці не забыліся і не даравалі бацьку той ганьбы і тых бедаў, якія ён прычыніў сям'і, пакінуўшы яе. Соф'я адчувала сябе прадстаўніком бацькі, які памёр тры гады таму, і ад яго імя таксама вітала брата, які правёў трыццаць гадоў у чужых краях, пабачыў раскошу і беднасць, перажыў шмат прыгодаў у двух частках свету, а цяпер страціў усё: жонку, дзяцей, службу, пенсію, маладосць і нават здароўе. Вось ужо болей за дзесяць гадоў ён так цяжка пакутаваў ад рэўматызму, што часам губляў працаздольнасць. І ўсё ж, на думку сястры, Густаў, як яго называлі ў сямейным коле, быў тым адзіным чалавекам, якому Фінляндыя магла даверыць сваю бяспеку. У вачах сястры ён ужо быў уратавальнікам Фінляндыі.

Соф'я звязала брата з магістрам Эрыкам Мандэлінам, які ўваходзіў у групу егераў-актывістаў. Актывісты хацелі са зброяй у руках вызваліць Фінляндыю ад расейскага ярма, і ім удалося стварыць у нямецкай арміі фінскі егерскі батальён. Гэты батальён знаходзіўся цяпер у Латвіі, і вялікая колькасць людзей прайшла там падрыхтоўку афіцэраў і унтэр-афіцэраў. Такая падрыхтоўка вялася ўжо некалькі гадоў. Батальён меў на мэце вызваленне Фінляндыі. Хоць у батальёне ўсе лічылі, што здольныя зрабіць гэта, але адной толькі яго сілы было недастаткова. Напраўду мэтай было ўцягнуць у выкананне гэтай задачы Нямеччыну. Але ж гэта была нязбыўная надзея. У планах Нямеччыны нейкі адзін батальён не меў ніякага значэння – падчас вайны яна страціла ўжо больш за тысячу батальёнаў. Па яго асабістым сцверджанні, Манэргейм нічога не ведаў пра існаванне гэтага батальёна. Але праўдзівей было б сказаць: ён чуў пра яго ўжо болей за год таму, але да пары не хацеў ведаць.

Мандэлін расказаў аб прыездзе Манэргейма ў Фінляндыю свайму таварышу, магістру Турэ Сведліну. Гэтая вестка хутка абляцела ўсю групу егераў-актывістаў. Адзін з іх, даследчык фіна-вугорскіх моваў Кай Донэр, пазней пісаў, што ўжо тады егеры-акты-



вісты пачалі казаць пра Манэргейма, як пра жаданага і доўгачаканага вярхоўнага галоўнакамандуючага фінскай арміяй.

Апошнім днём старога года вядомы камерсант Якаб фон Юлін, стрыечны брат Манэргейма з матчынага боку, сутыкнуўся на Сенацкай плошчы з Карлам Энкелем, чыноўнікам Міністэрства замежных справаў маладой фінскай дзяржавы. Ён сказаў Энкелю, што ім трэба неадкладна знайсці месца для Манэргейма, якому пасля вяртання з Расеі патрабуецца праца. Яшчэ ў дзіцячым і юнацкім узросце Манэргейм прычыніў сям'і фон Юлінаў столькі турботаў і грашовых выдаткаў, што непакой і клопаты аб ім, здаецца, назаўсёды ўвайшлі ў кроў гэтай сям'і.

Паміж Калядамі і Новым годам Манэргейм, чалавек смелы, зноў вярнуўся ў Пецярбург, гэты пякельны кацёл. Ён хацеў на свае вочы пабачыць, як там складваецца становішча і як развіваюцца падзеі. Ён сустрэўся з графіняй Бэтсі Шувалавай, разумнай і прыгожай жанчынай, якая была значна старэйшая за яго і таксама належала да вышэйшага свету. Гадоў дзесяць назад арыстакратычны Пецярбург гаварыў пра магчымасць грамадзянскага або царкоўнага шлюбу паміж імі – графіня ў той час стала ўдавой, а Манэргеймава жонка ўцякла ад мужа і дзяцей на Далёкі Усход, а потым, ненадоўга вярнуўшыся і прыхапіўшы дзяцей, падалася ў Парыж.

У Пецярбургу Манэргейм сустрэўся таксама з кіраўніком французскай ваеннай місіі генералам Нісэлем. Той лічыў, што становішча ў Фінляндыі цяжкае: на яе тэрыторыі налічвалася каля сотні тысяч чырвонагвардзейцаў. Менавіта таму Манэргейм папрасіў яго зрабіць так, каб фінскія белыя змаглі набыць зброю з тых вялізарных прыпасаў, якія французы перавозілі ў Мурманск. Потым зброю на аленях і конях перавезлі б у Фінляндыю. Нісэль паставіўся да гэтай прапановы даволі прыхільна і паабяцаў тэлеграфаваць у Парыж. Манэргейм спяшаўся назад у Хельсінкі, і таму не змог застацца, каб пачакаць адказу. Але Нісэль сказаў, што яго прадстаўнік у Хельсінках перадасць адказ. Спроба не ўдалася. Манэргейм мусіў прадбачыць гэта. На думку фінаў, прасіць аб ваеннай дапамозе Францыю было нязручна, калі ўжо яны атрымлівалі яе ад Нямеччыны і, тым больш, спадзяваліся атрымліваць далей. Манэргеймава спроба супярэчыла знешняй палітыцы,

якую праводзілі сенат і прэм'ер-міністр Свінхувуд. Манэргеймавы дзеянні ўвогуле супярэчылі дзеянням сената. І гэта сведчыць, што канфлікт, які прыхавана доўжыўся на працягу ўсёй вызваленчай вайны, а пасля яе заканчэння прыняў настолькі непрымірэнчыя формы, што Манэргейм мусіў падаць у адстаўку, пачаўся яшчэ да таго, калі шляхі ўрада і Манэргейма перасякліся.

Навагоднюю ноч Манэргейм сустрэў у кватэры сваёй сястры. У яе сабралася цікавая кампанія, дзе былі вядомыя мастакі, медыкі і навукоўцы.

Наступным днём Манэргейм паехаў у маёнтак Мусціа сустрэцца з Ялмарам Ліндэрам, які кароткі час быў Соф'іным мужам і лічыўся самым стыльным, багатым і адважным чалавекам у Фінляндыі. Ён быў таксама уласнікам першага аўтамабіля ў краіне. Час паказаў, што Ялмар Ліндэр быў нават задужа адважны: ён сабраўся і ўцёк ад усяго гэтага вэрхалу ў Швецыю, дзе і праседзеў увесь час, пакуль у Фінляндыі ішла вайна.

## Ваенны камітэт

У Хельсінках рэгулярна збіраўся Ваенны камітэт, які складаўся з былых навучэнцаў кадэцкага корпуса ў Хаміне. Камітэт самастойна ў межах сваёй кампетэнцыі складаў і рыхтаваў планы мабілізацыйнай падрыхтоўкі ўсёй краіны. Турэ Сведлін парэкамендаваў Камітэту Манэргейма, але яго чальцы ведалі, што генерал адмоўна ставіцца да немцаў, і не верылі, што ён можа адразу і карэнным чынам змяніць сваю думку так, як таго хацелася Камітэту. Аднак, даведаўшыся, што Манэргейм здольны і спрактыкаваны франтавы камандзір, пытанне зноў ўзялі да разгляду і аднагалосна зацвердзілі Манэргейма чальцом Ваеннага камітэта.

Ханнэс Ігнацыус і Айма Хальберг пайшлі ў гатэль «Кемп» пагутарыць з генералам. Той папрасіў даць яму неабходную інфармацыю і прыйшоў на пасяджэнне ў Рыцарскую палату. Ён стаў чальцом Камітэта 7 студзеня 1918 года, і ў гэты ж дзень сенат прызнаў Ваенны камітэт дзяржаўным органам, што надало яму афіцыйны статус. Праз два дні Манэргейм і Ігнацыус наведалі ў сенаце Карла Энкеля. Манэргейм звярнуўся да сената з просьбай здабыць зброю і паскорыць вяртанне ў Фінляндыю егерскага батальёна. Адольф фон Рэхаўзэн атрымаў ад Камітэта нялёгкае заданне: высветліць для Манэргейма, колькі фінаў адправіліся на дапамогу Нямеччыне і тым самым звязалі свой лёс з яе перамогамі і паражэннямі. Адначасова ў сенаце нарэшце зафіксавалі імёны чальцоў Ваеннага камітэта. Энкель заносіў іх на паперку ў тым парадку, як прадыктаваў Ігнацыус: на чале Камітэта стаяў старшыня, былы камандзір трынаццатай дывізіі, генерал-лейтэнант Шарпенцьер, а праўдзейнымі чальцамі – Ігнацыус, Хальберг, Хольмберг, Сёдэрхольм, Вілкман, Манэргейм, Окерман, Шаўман і Сільверхьельм.



На трэцім пасяджэнні Камітэта заслухоўвалі паведамленне аднаго з камандзіраў шуцкора. Ён хацеў захапіць берагавы форт рускіх і склад зброі. Прапанову сустрэлі маўчаннем і вырашылі абмеркаваць яе на адным з наступных сходаў. Затое ажыўленая дыскусія разгарэлася па нейкіх нязначных пытаннях. Кожны спяшаўся выказаць сваю думку. Потым старшыня закрыў пасяджэнне. У парушэнне правілаў, Манэргейм папрасіў слова, падзякваў за аказаны давер і абвясціў аб сваім выхадзе з Камітэта. Ён прааналізаваў ход толькі што праведзеных абмеркаванняў і дадаў, што такая акалічнасць, як правядзенне пасяджэнняў у трох розных месцах, паказвае поўнае бяссілле Камітэта. Яго могуць заарыштаваць у любы момант.

У Манэргейма спыталі, што ён можа прапанаваць. Гэта адбывалася адвячоркам, а пятай гадзіне.

– Калі спадары ўжо сёння могуць ад'ехаць на поўнач начным цягнікам, дык трэба так і зрабіць. А па прыездзе на месца – туды, дзе мяркуецца арганізаваць штаб арміі, – трэба неадкладна брацца за справу. Калі магчымасці выехаць сёння няма – трэба выязджаць не пазней як заўтра.

Ад такой прапановы ўсе проста аслупянелі, а старшыня вельмі пакрыўдзіўся. Манэргейма і старшыню Камітэта, генерала Шарпенцьера, папрасілі падаць свае прановы адносна неабходных захадаў у пісьмовым выглядзе. Манэргейм запаліў цыгару і пайшоў прэч. У яго і ў думках не было штосьці пісаць.

Наступным днём некалькі чальцоў Камітэта прыйшлі па Манэргеймаву прапанову, але ён не напісаў ні радка. Госці сказалі яму, што генерал Шарпенцьер напісаў прапанову, змест якой цалкам супадаў з тым, што Манэргейм сказаў на мінулым пасяджэнні.

А ў канцы гэтай памятнай нататкі Шарпенцьер паведамляў пра сваю адстаўку з паста старшыні Ваеннага камітэта, бо пасля далучэння да Камітэта Манэргейма яго становішча, як старшыні, стала невыносным, згода і аднадушша ў Камітэце зніклі, як знікла і магчымасць весці далей супольную працу. Пачуўшы такое, Манэргейм ускіпеў і сказаў, што цяпер ужо ён абражаны да глыбіні душы. Гэтае абурэнне адчуваецца і ў ягоных мемуарах.

Чальцы Камітэта, якія пры гэтым прысутнічалі, адразу папрасілі Манэргейма заняць месца старшыні. Манэргейм паспяшаўся запэўніць іх, што ўвесь час падпарадкоўваўся кіраўніцтву генерала Шарпенцьера. Ён не адзін раз казаў пра гэта і раней.

Тады чальцы Камітэта паўтарылі просьбу, сказаўшы, што ўжо абмеркавалі яго прызначэнне з прэм'ер-міністрам Свінхувудам і той іх запэўніў, што сенат гатовы прызначыць Манэргейма.

Такім чынам, чальцы Ваеннага камітэта паставілі Манэргейма перад фактам, але ён змог абысці гэтую пастку. Генерал сказаў, што спачатку хацеў бы пагутарыць са Свінхувудам і пачуць, як сенат увогуле ацэньвае цяперашняе становішча.

Манэргейм у адно імгненне ўзняўся настолькі высока, што цяпер абмяркоўваў справы ўжо не з чальцамі Ваеннага камітэта, а з урадам краіны.

Паводзіны Манэргейма вызначаліся тонкаю тактыкай і рацыянальнасцю, але адначасова былі вельмі чалавечнымі. Ён быў далікатны, як мімоза, і асцерагаўся прамых дотыкаў. Усяляк манеўруючы, ён змог пазбавіцца ад тых кайданаў, якімі яго аблытвалі розныя інстанцыі, камітэты і ўрадавыя ўстановы. Цяпер ён сам ставіў перад імі новыя ўмовы і заняў былое месца, нібы нічога такога не здарылася. Саслужыўцы апынуліся ў ягоным падпарадкаванні, калегія ператварылася ў канцылярыю кіраўніка або штаб камандуючага, фірма атрымала новага выканаўчага дырэктара, які аздараві ўяе і самым дзейсным чынам прымусіў засяродзіцца на выкананні сваіх задачаў. Спачатку ён быў адзіны, хто працаваў. Іншыя толькі ішлі следам за ім бязладным натоўпам.

У Ваеннага камітэта не было ніякага ясна вызначанага плана дзейнасці, як не было ні смеласці, ні жадання перайсці да ўзброенай барацьбы. Яшчэ ўвосень Ігнацыус выказаў ідэю, каб нямецкія падводныя лодкі атакавалі ваенныя караблі ў Хельсінках і патапілі іх − большая частка рускага Балтыйскага флоту зімавала там, − бо існавала небяспека, што ў іншых партах Балтыйскага мора яны маглі б стаць здабычай нямецкіх сухапутных сілаў. Хельсінкі былі практычна адданыя на літасць цяжкой артылерыі Свеабарга і флоту, як гэта было падчас усеагульнай забастоўкі. Страх перад гарматамі падаўляў усялякую ініцыятыву.



У галаве Манэргейм ужо меў ясную праграму дзеянняў і спяшаўся ажыццявіць яе. Яшчэ напрыканцы лета 1917 года на поўдні Украіны і ў Букавіне ён распрацоўваў яе разам з рускімі генераламі. Сярод іх ён добра ведаў Урангеля, Каледзіна і Дзянікіна, якія годам пазней распачалі ваенныя дзеянні супраць войскаў Леніна на поўдні. Аднак у 1917 годзе гэтыя спадары не лічылі, што ўжо можна пачынаць дзейнічаць. Манэргейм вырашыў, што ў Фінляндыі трэба пачынаць дзейнічаць зараз жа і неадкладна.

15 студзеня 1918 года Манэргейм і Шарпенцьер прыйшлі ў сенат і абвясцілі Свінхувуду, што старшыня Ваеннага камітэта змяніўся. Новым старшынём стаў Манэргейм.

Наступным днём Манэргейм зноў прыйшоў пагутарыць са Свінхувудам, але гэты раз ягоным спадарожнікам быў Ігнацыус. Тады сенат паставіў перад Манэргеймам задачу арганізаваць у Эстэрботніі фінскія сілы аховы парадку. Генерал згадзіўся прыняць камандаванне толькі пры ўмове, што сенат не будзе прасіць дапамогі з-за мяжы, г.зн. ні ад Швецыі, ні ад Нямеччыны. Пазней Манэргейм сцвярджаў, што Свінхувуд згадзіўся на гэтую ўмову. Сведкам таму быў Ігнацыус. Манэргейм прапанаваў, каб Ваенны камітэт неадкладна выехаў у Эстэрботнію.

Свінхувуд не паведаміў Манэргейму, што ўрад яшчэ ў снежні афіцыйна папрасіў дапамогі ад Нямеччыны і што залаты запас дзяржаўнага банку перавезены ў Куопіа. Такім чынам, калі Манэргейм пачаў сваю дзейнасць у Эстэрботніі і адчуваў вострую патрэбу ў грошах, скарыстаць гэтае золата ён не мог. Але Манэргейм дакладна ведаў адно − Харальд Окерман, які ў кастрычніку быў міністрам запасаў харчавання, размясціў купленае па звышвысокіх цэнах зерне ў стратэгічна важных для вядзення ваенных дзеянняў і надзейных месцах. Звышвысокія цэны давалі земляробам надзею на іх далейшы рост, а таму яны нікуды, дзе існавала абмежаванне іх на рост, хлеб не прадавалі, зберагаючы запасы ў

сваіх сусеках. Звесткі пра высокія цэны, прапанаваныя Окерманам, было пастаноўлена захоўваць у сакрэце, але, вядома ж, гэта не ўдалося. Голад мацнеў і пашыраўся, а гэта ставарала выбуховую сітуацыю ў карінe.

Перад ад’ездам у Эстэрботнію Манэргейм дзеля пэўнасці патэлефанаваў яшчэ і Карлу Энкелю, каб пераканаць яго, быццам ён сапраўды едзе туды з мэтай стварэння сілаў аховы парадку. На справе ж ён і не думаў фармаваць новыя паліцэйскія атрады і ўстановы. Аднак, яшчэ 24 снежня ён паводзіў сябе вельмі асцярожна і ў лісце да Свінхувуда прапанаваў ператварыць егерскі батальён, калі той вернецца на радзіму, у полк з асабовым складам у 4000 байцоў. Гэтыя людзі сталі б добрым рэзервам для паліцыі ў гарадах і сёлах. У тым жа выпадку, калі ў Фінляндыі будзе ствараецца армія, яны стануць яе кадравай асновай. Гэты ліст не трапіў да адрасата. Ён затрымаўся на пошце ў Хельсінках, калі Чырвоная гвардыя захапіла ўладу на поўдні, і праляжаў там усю вайну.

Манэргейм заўсёды сцвярджаў, што пра батальён фінскіх егераў у нямецкай арміі ён даведаўся толькі ў студзені 1918 года, калі вёў перамовы з Ваенным камітэтам. Аднак Рэйнгольд Свента ў 1954 годзе распавёў Ю.К. Паасіківі, што пра гэты батальён Манэргейм гаварыў яшчэ падчас свайго прыезду ў Хельсінкі ў 1916 годзе і ўжываў пры гэтым моцныя слоўцы. Ён быў раззлаваны тым, што фіны не запісваліся добраахвотнікамі ў царскую армію. На думку генерала, Фінляндыі варта было б паслаць у Расею на Заходні фронт дзесяткі тысяч салдат, каб тым самым стварыць у рускіх дабразычлівае ўяўленне пра фінаў. Ужо ў 1912 годзе, калі свет стаяў на парозе новай вайны, Манэргейм думаў пра стварэнне двух палкоў з фінскіх добраахвотнікаў. І гэтая ідэя не была плодам імгненнага парыву. Манэргейм выношваў яе даволі доўга. Ён спасылаўся на 1812 год, калі замест адпраўленых на вайну з Напалеонам рускіх войскаў гарнізонную службу ў Фінляндыі неслі фінскія салдаты.

Тады Свента абмяркоўваў з Паўлем фон Этэрынам і Эрнстам Гростэнам ідэю стварэння таварыства Чырвонага Крыжа ў Фінляндыі, дзеля чаго сустрэўся з імі ў рэстаране Біржавага клуба. На гэтай сустрэчы прысутнічаў і Манэргейм. Ён кіпеў і абураўся: на ягоную думку, фіны, якія служылі егерамі ў нямецкіх войсках, былі проста здраднікі. Ён расказаў і пра сваю размову са Стольбергам, які таксама адмоўна ставіўся да егераў, бо лічыў, што, адправіўшыся служыць у армію праціўніка, маладыя людзі парушылі закон. Свента і ягоныя суразмоўцы не пагадзіліся з думкаю Манэргейма. У гэты час яго агортвала пачуццё поўнай самоты, бо амаль ніхто не мог яго зразумець. Толькі Стольберг трымаўся такой самай думкі, хоць меў зусім іншыя палітычныя погляды. Аднак Стольберг быў дальнабачным палітыкам і быў настроены супраць Нямеччыны гэтак сама, як Манэргейм.



Манэргейм сачыў за становішчам у сябе на радзіме. Ужо ў 1916 годзе ён прымерваўся да ролі палітыка ў Фінляндыі, а паколькі ў перыяд вызваленчай вайны ён мусіў супрацоўнічаць з егерамі (пасля якой яны набылі на армію вялікі ўплыў, і гэты ўплыў у час Другой сусветнай вайны ўзрос да таго, што большасць генералітэту складалі былыя егеры), дык такія несвоечасовыя публічныя выказванні адносна сваёй пазіцыі маглі б толькі нашкодзіць Манэргейму.

Сенат не даў Манэргейму грошай, і ён мусіў шукаць сродкі для вядзення вайны самастойна. Выпадкова ён сустрэўся на вуліцы са сваім аднакласнікам, дырэктарам «Прыват-банка» Аксэлем Эрнруўтам, з якім і падзяліўся сваімі клопатамі. Эрнруўт сабраў банкіраў, і тыя, параіўшыся, паабяцалі Манэргейму выслаць у Ваасу 15 мільёнаў марак.

Яшчэ на пачатку 1917 года ў Біржавым клубе сабраліся банкіры і прамыслоўцы. Ротмістр Ханнэс Ігнацыус папрасіў выдзеліць Ваеннаму камітэту сродкі на тое, каб пакончыць з анархіяй у краіне. Калі Аксэль Эрнруўт спытаў, колькі на гэта спатрэбіцца грошай, Ігнацыус назваў суму ў 700000 марак. Эрнруўт і яго калегі ледзьве стрымалі смех. Эрнруўт сказаў, што толькі адзін яго банк можа выдаць такую суму. Гаворка пайшла пра больш буйную пазыку, і кіраўнікі банкаў выйшлі ў другі пакой параіцца. Паколькі названая сума падавалася да смешнага малой, памер пазыкі ўвогуле дакладна не вызначалі. У «Прыват-банку» завялі рахунак Гарантыйнага фонду, адкуль Ігнацыус мог здымаць грошы па меры патрэбы. Праз два дні ён узяў 200000 марак.

Калі на чале Ваеннага камітэта стаў Манэргейм, тактыка змяні-

лася. Да 19 студзеня 1918 года з рахунку знялі 5,7 мільёна марак. У той жа дзень а палове адзінаццатай Манэргейм пазваніў Эрнруўту з Ваасы і папрасіў яшчэ тры мільёны марак, якія патрабаваліся яму неадкладна. Манэргейм прыспешваў суразмоўцу. Тэлефонная сувязь магла перарвацца ў любую хвіліну. Эрнруўт быў прафесійным банкірам, а таму пачаў думаць пра гарантыю пазыкі і пазваніў прэм'ер-міністру Свінхувуду з тым, каб гэтую гарантыю даў урад. Свінхувуд сказаў яму прыйсці ў сенат а дванаццатай гадзіне. Эрнруўт прыйшоў на некалькі хвілінаў раней, аднак Свінхувуда нідзе не было. Той з'явіўся толькі праз дзве гадзіны і быў на падпітку. Эрнруўт ледзь не лопнуў ад злосці. Ён запатрабаваў, каб урад склаў пратакол, дзе было б указана, што ўрад дае сваю гарантыю на гэтую пазыку і абавязуецца кампенсаваць магчымыя страты. «Ну, добра, добра, вядома, ты яго атрымаеш», − запэўніў Свінхувуд, і Эрнруўт кінуўся здабываць для Манэргейма грошы. Але гэтага пратакола так ніхто і ніколі не ўбачыў.

16 мая 1918 года, у дзень вялікага парада, калі Манэргейм арганізаваў шыкоўны спектакль, прайшоўшы са сваёй арміяй маршам па Хельсінках, запазычанасць Гарантыйнага фонду складала 9 мільёнаў марак. Ніякі дакумент не гарантаваў гэтай сумы. Эрнруўт дабіўся размовы са Свінхувудам, але той не даў ніякага выразнага адказу. Эрнруўт адкрыта казаў, што будзе вельмі весела, калі ён падасць рахунак у сенат. Ён быў адным з самых нецярплівых і ўзрушаных гледачоў трыумфальнага маршу Манэргейма. Ён толькі і чакаў канца парада і шукаў месца, дзе можна было б прарвацца да Манэргейма і схапіць яго за рукаў. Гэта ўдалося толькі тады, калі генерал з Сенацкай плошчы накіраваўся ў сенат. Сенатары выказалі пажаданне, каб пераможца з'явіўся туды адзін. Але Манэргейма суправаджала такая вялізная світа, што ўзніклая цісканіна дапамагла Эрнруўту дасягнуць жаданай мэты. Ён бесперашкодна праслізнуў у будынак сената і знайшоў момант сказаць Манэргейму, што пазыку трэба вярнуць неадкладна, што і было зроблена праз адзінаццаць дзён.



## У Эстэрботніі

18 студзеня 1918 года Манэргейм начным цягнікам адправіўся ў Ваасу. З ім разам выехалі чальцы Ваеннага камітэта Ханнэс Ігнацыус, Вальтэр Хольмберг, Адольф фон Рэхаўзэн і дырэктар банка Айма Хальберг, а таксама Марцін Ветцэр і Б.Ф. Лохман, якога вырашылі прызначыць загадчыкам перавозак. З яго атрымаўся б добры начальнік станцыі.

Манэргейм ехаў па фальшывым дазволе на выезд, у якім ён менаваўся гандляром Густавам Мальмбергам. Гэты дакумент даваў яму права вольнага перамяшчэння па ўсёй краіне. Пасля адыходу цягніка з Хельсінкаў Манэргейм і палкоўнік Хольмберг пайшлі спаць у купэ спальнага вагона. На станцыі Тамперэ ў вагон зайшлі тры рускія салдаты. Яны рухаліся ад купэ да купэ, правяраючы асабістыя дакументы і дазволы на выезд. Манэргейма пабудзілі, і ён, убачыўшы перад сабой рускія мундзіры і яшчэ як след не прачнуўшыся, спытаў па-руску, што ім трэба.

− Ты чаму гаворыш па-руску? Ніякі ты не купец.

Манэргейм адказаў, што ведае шмат моваў.

− Не. Ніякі ты не гандляр, − цвердзілі салдаты.

Тут у вагоне з'явіўся малады дзяжурны па станцыі Эйна Лехтээнмякі, якога выклікаў кандуктар, занепакоены тым, што інцындэнт можа выклікаць затрымку цягніка. Такое здаралася рэдка. За ўсе чатыры гады сваёй службы Лехтээнмякі памятаў толькі тры-чатыры падобныя выпадкі. Цягнік павінен быў адысці ў пяць хвілін на першую. Час яшчэ быў.

Лехтээнмякі ўбачыў высокага чалавека са схіленай набок галавой і сумным выразам на твары, які стаяў сярод ваенных, што правяралі дакументы. Лехтээнмякі са здзіўленнем адзначыў, што чалавек не гаворыць па-фінску, але ягоныя паперы ў парадку, і Лехтээнмякі сказаў пра гэта салдатам. І тыя пайшлі. Усё гэта адбылося за некалькі секунд. Чыгуначніку было тады 28 гадоў, і ён ведаў рускую мову, на якой і высвятляліся адносіны.

Пазней, у адзін са сваіх візітаў у Тамперэ, Манэргейм спытаў на станцыі, ці ведае хто таго маладога чалавека. Але ніхто нават і не чуў пра гэтае здарэнне. У памяці Лехтээнмякі гэты эпізод таксама не пакінуў ніякіх асаблівых успамінаў. Ён успомніў пра яго

толькі ў 50-я гады, калі прачытаў мемуары Манэргейма. Лехтээнмякі быў тады дырэктарам класічнага ліцэя ў Тамперэ. У Манэргейма гэты выпадак пакінуў страшнае ўражанне. На пачатку сакавіка ў Пецярбургу, і асабліва ў снежні, калі ён ехаў цягніком з Адэсы ў Пецярбург, яго маглі расстраляць у любую хвіліну. Менавіта ў цягніках шукалі афіцэраў, а калі знаходзілі, дык доўга не важдаліся, а стралялі адразу, проста на пэроне станцыі.

Губернатар правінцыі Вааса Тэадор Хейкель сустрэў на вуліцы знаёмага дырэктара банка Айму Хальберга, і той расказаў яму, што Ваенны камітэт вырашыў сабрацца ў Ваасе і стаць на чале шуцкора. Уліваючы хаду і развіццё падзеяў, было пастаноўлена адначасова стварыць і Стаўку галоўнага камандавання арміі, а на яе чале паставіць генерала Манэргейма. Для размяшчэння Стаўкі неадкладна патрабавалася памяшканне з шасці – сямі пакояў. Але на здзіў адшукаць такое памяшканне аказалася надзвычай цяжкаю справай. Жылля ў горадзе не хапала, а дамаўласнікі не хацелі здаваць свае дамы дзеля такой мэты, бо хто ж добраахвотна аддасць свой дом вайскоўцам. Толькі чакай, што пачнуцца баі, а самыя жорсткія, вядома ж, разгорнуцца вакол дома, ато і ўнутры... Тады губернатар паабяцаў ад сябе аддаць пад штаб сем пакояў з вестыбюлем ды яшчэ два пакоі для прыслугі. Гэты дом быў ягонай службовай рэзідэнцыяй, і ўсе выдаткі па яго ўтрыманню несла дзяржава. Манэргейм агледзеў дом і застаўся задаволены. Больш за тое, ён сказаў губернатару, што сенат ухваліў гэтую ідэю – дом жа быў уласнасцю дзяржавы. Да дзвярэй прыбілі шыльдачку, што тут размяшчаецца дзяржаўная ўстанова.

Так у адзін момант Ваенны камітэт ператварыўся ў штаб арміі, і ўжо 21 студзеня 1918 года Ветцэр разаслаў па мясцовых арганізацыях шуцкора тэлеграму з асабовым складам штаба.

Вырашальную ваенную раду склікалі 25 студзеня 1918 года. Ігнацыус і Ветцэр падтрымалі ідэю Манэргейма аб нападзе на рускія гарнізоны і іх ліквідацыі. Апошнім выказаўся генерал-маёр Эрнст Лёфстром – старэйшы па чыне сярод чальцоў рады. Ён толькі што прыехаў з Расеі і карыстаўся дзявочым прозвішчам сваёй маці – Толь, каб не ставіць у небяспеку сям'ю, якая ў той час яшчэ заставалася ў Расеі. Лёфстром зрабіў бліскучую кар'еру ў рускай арміі. Ён быў камандзірам Сямёнаўскага палка. У кадэцкім корпусе ў Хаміне ён вучыўся разам з Манэргеймам і быў прызначаны ягоным «дзядзькам», таму што кожнаму навічку прызначалі апекуна і куратара – кадэта са старэйшых класаў. Мабыць, у тую пару і ўзнікла паміж імі прыхаване пачуццё непрыязні, якое праяўлялася з любой нагоды і напрыканцы вайны, а асабліва пасля яе заканчэння, дасягнула такога напружання, што аж іскры вылятлі.

Лёфстром лічыў, што ажыццявіць гэтую ідэю было ўвогуле немагчыма. Гаворка ж ішла пра адзін з палкоў 106-й дывізіі! На яго чале стаяў вельмі здольны палкоўнік Свечнікаў, які пазней, у час вайны, распрацоўваў і накіроўваў аперацыі чырвоных. На думку Лёфстрома, пасылаць цывільных дрэнна ўзброеных людзей ваяваць супраць вайсковых частак было поўным вар'яцтвам.

Гэтай ваеннай рады Манэргейму хапіла на ўсё жыццё, і ніякіх такіх нарадаў ён больш не збіраў ніколі.

Дэмакратыя ў арміі не патрэбна, дый увогуле, на ягоную думку, ад яе нідзе не было шмат карысці. Пасля гэтага ён раіўся са сваімі падначаленымі толькі з кожным паасобку, і тыя выказвалі сваю думку наконт той ці іншай справы, калі Манэргейм ім загадваў або прасіў пра гэта, але ніколі болей ён не дапускаў калегіяльных абмеркаванняў і галасаванняў. Гэта расцягвала працоўны дзень Манэргейма да шаснаццаці гадзін і патрабавала шмат сілы. Некаторым афіцэрам такая дзейнасць падавалася непрафесійнай і нагадвала пра тое, што ў Манэргейма не было належнай штабной адукацыі. Ён не ўмеў найлепшым чынам выкарыстоўваць рэсурсы вялікага штаба, а таму ўмешваўся ў справы болей нізкага ўзроўню, парушаючы нармальны парадак працы, і, як сцвярджалі штабныя афіцэры, часам проста заблытваў іх.

Прыезд у Ваасу некалькіх сенатараў зусім не ўзрадваў Манэргейма. Праўда, да месца дабраліся толькі чацвёра з іх, але і гэтага было дастаткова, бо, каб прымаць рашэнні, хапала й траіх. Забаўна, што белыя войскі ўзарвалі чыгунку якраз перад тым цягніком, на якім ехалі гэтыя спадары, і цягнік сышоў з рэек. Сенатарам гэта каштавала ўсяго толькі невялічкага перапуду. Дый Манэргейм, загадваючы перарэзаць чыгунку на Эстэрботнію, зусім не меў на мэце знішчыць сенатараў або перашкодзіць іхняму прыезду – калі ў Эстэрботніі пачалася дзейнасць па ператварэнню края

ў апорную базу белых, яму патрабавалася любою цаной не дапусціць сюды рускага падмацавання.

Сенат не меў ніякага органа па вайсковых справах, бо ў краіне наогул не было войска. У такім становішчы трэба было б як мага хутчэй арганізаваць ваеннае міністэрства, але Манэргейм ні пры якіях умовах не згаджаўся з гэтым. Афіцэрам сувязі пры Манэргейме сенат прызначыў Харальда Окермана.

Прэм'ер-міністр Свінхувуд і пераважная большасць сенатараў хаваліся ў Хельсінках, і пэўны час Манэргейм мог увогуле не звяртаць на іх ніякай увагі. Скарыўшыся перад сваім бяссіллем, сенатары паводзілі сябе надзвычай рахмана, і толькі калі ўрадавыя войскі пачалі перамагаць і наперадзе засвяціўся шчаслівы канец – толькі тады паміж сенатам і галоўнакамандуючым пачаліся нелады. Калі Манэргейм прапанаваў узнагародзіць Йонаса Кастрэна крыжам Свабоды, сенат адхіліў яго прапанову. Тады Манэргейм атэставаў сямідзесяцігадовага Кастрэна прапаршчыкам фінскай арміі і ўзнагародзіў яго крыжам сваёю ўладаю галоўнакамандуючага. Такі свой учынак ён патлумачыў тым, што хацеў ушанаваць аднаго з першых змагароў за незалежнасць Фінляндыі. Ужо тады ён разглядаў падзеі ў гістарычнай перспектыве і распрацаваў сваю іерархію каштоўнасці змагароў за незалежнасць. І гэтая сістэма каштоўнасцяў была зусім не такой, як у сената.

Манэргейм не любіў мяняць людзей вакол сябе. Усё жыццё ён трымаў каля сябе старых супрацоўнікаў. Калі 2 лютага 1918 года адбылося назначэнне на штабныя пасады, начальнікам штаба стаў Марцін Ветцэр, генерал-кватэрмайстрам – Ханнэс Ігнацыус, дзяжурным генералам – Вальтэр Хольмберг, інспектарам артылерыі – фон Рэхаўзэн, а дырэктар Б.Ф. Лохман стаў начальнікам інтэнданцкай службы. Людзі, якія прыехалі ў адным цягніку з Манэргеймам, і далей трымаліся разам, ужо дасягнуўшы кіраўнічых пасадаў.

Пасля пачатку ваенных дзеянняў стаўка Манэргейма перабралася ў Сэйняйокі, а потым ва Усходнюю Карэлію, у Міккелі. Гэтыя месцы былі выбраныя з веданнем справы. Там можна было працаваць спакойна. Там не было ніякіх іншых дзяржаўных органаў кіравання, бо на іх не хапала месца. Так, у Сэйняйокі Стаўка размяшчалася ў вагонах цягніка. На самым пачатку вайны у штаб на дапамогу Манэргейму прыехалі некалькі маладых шведскіх афіцэраў. У адукаваных штабных афіцэрах, якія маглі б планаваць аперацыі і арганізоўваць аператыўныя злучэнні, патрэба была надзвычай вялікая. Маладым шведскім афіцэрам, у сваю чаргу, не хапала ваеннага досведу, і яны спадзяваліся набыць яго тут. Найболей значнымі фігурамі з іх былі Торнгрэн, Пэйрон, Дуглас, Графстром і Гамільтон.



У хуткім часе Ветцэра перавялі на фронт. На ягонае месца начальнікам штаба стаўкі або начальнікам Генеральнага штаба прызначылі Карла Эміля Бэрга. На думку Гёсты Торнгрэна гэта быў абсалютна цывільны чалавек, няздольны выконваць такія абавязкі, а таму хутка на ягонае месца заступіў Гёста Тэслёф, які да таго на кароткі час стаў камерсантам у Стакгольме, але сутыкнуўся там з вялікімі цяжкасцямі. Гёста Торнгрэн лічыў, што ён добра падыходзіў на гэтую пасаду, таму што ўмеў кіраваць. Апроч таго, ён любіў і ведаў літаратуру, а таму Манэргейм, калі пісаў загады і прамовы, карыстаўся ягонаю дапамогай. Тэслёф і Манэргейм вучыліся ў адной рэальнай школе ў Хаміне.

Аператыўнае планаване распрацоўваў і ажыццяўляў генерал-кватэрмайстар Ханнэс Ігнацыус, а не начальнік Генеральнага штаба. Становішча не змянілася і ў час Другой сусветнай вайны, калі гэтым займаўся генерал-кватэрмайстар Аксэль Айра, а не начальнік Генеральнага штаба Эрык Хейнрыкс. Такую сістэму Манэргейм запазычыў з рускай арміі. У шведскай і нямецкай арміях за аператыўнае планаванне адказваў начальнік Генеральнага штаба.

Інгацыус і Тэслёф закончылі акадэмію Генеральнага штаба ў Пецярбургу. Ігнацыус вучыўся у адзін час з Манэргеймам у кадэцкім корпусе ў Хаміне, але на клас пазней. Калі Ігнацыусу споўнілася 50 год, Манэргейм у сваёй прывітальнай прамове сказаў, што ніколі не мог спалучыць у сабе такі светлы аптымізм і такое вялікае творчае натхненне, якія былі ўласцівыя юбіляру. Ігнацыус быў смелы і празорлівы аператар-штабіст, які не баяўся адстойваць сваёй думкі. Генерал Айра меў такія самыя рысы, але пры ўсім ягоным аптымізме, паэтычны запал і натхненне ў яго цалкам адсутнічалі. Гэта быў халодны рацыяналіст. Афіцэры з такімі рысамі якраз і былі патрэбныя Манэргейму, бо сам ён такіх рысаў не меў. Гэтыя людзі натхнялі і стрымлівалі яго.

Паводле Торнгрэна, Ігнацыус і Тэслёф былі безнадзейна цывільнымі людзьмі. Егерскія афіцэры з вялікім задавальненнем размаўлялі з ім, таму што швед мысліў строга ваеннымі катэгорыямі. Фінскія штабісты так не ўмелі.

Шведскія афіцэры паміж сабой называлі Ігнацыуса спеваком. Ён быў вельмі таўсты і гаваркі. Торнгрэн успамінае, што ён гаварыў, а дакладней, шумеў бясконца. А Манэргейм называў яго адзіным вулканам у Фінляндыі. Шведскі афіцэр сцвярджае, што Ігнацыус не меў ніякага ўяўлення аб тым, што такое сістэматычная праца. Ён увесь час штосьці блытаў. Любога бедалагу, якому «пашчасціла» трапіць Ігнацыусу на вока, адразу нагружалі працай, незалежна ад таго, быў той ягоным падначаленым, ці не. Пра гэта расказваў Пер Цыллаус.

Апошні камандзір фінскай гвардыі Мікалай Мексмантан быў высокі, стройны і меў вельмі ваяўнічы выгляд. Гэтыя ягоныя асаблівасці адразу кідаліся ў вочы і замянялі яму поўную адсутнасць ваенных здольнасцяў. Па даручэнні Ваеннага камітэта ён склаў у Швецыі цэлы букет розных ваенных планаў, але затрымаўся там на два месяцы. А калі з усімі сваімі планамі заявіўся ў Эстэрботнію да Манэргейма, той не даў яму на фронце ніякай каманднай пасады, зрабіўшы памочнікам інсперктара пяхоты Паўля фон Герыха. Мексмантан заўсёды меў вельмі парадны выгляд, а таму Манэргейм узяў яго ў сваю світу. На думку Вільгельма Тэслева, Мексмантан уяўляў сабой абсалютны нуль.

Начальнікам этапнага штаба, а дакладней тылавой службы, стаў чалавек з папяровай прамысловасці, былы лейтэнант фінскага вайсковага падраздзялення Рудольф Вальдэн. Напачатку ён быў начальнікам аховы Стаўкі. На гэтым этапе такая пасада была вельмі важная, бо Стаўку было вельмі лёгка знішчыць: раён апорнай базы не быў цалкам ачышчаны, фронт толькі-толькі пачынаў набываць пэўныя абрысы, а таму любы моцны атрад праціўніка мог прарвацца і нанесці па Стаўцы белых смяротны ўдар. Пазней, калі становішча стала не такім вострым, Вальдэн пачаў так старанна і паспяхова займацца складанай тылавой гаспадаркай, што зрабіўся самым блізкім чалавекам Манэргейма, ягоным другім «я». Армейскай гаспадарчай службай займаўся другі прамысловец – Мянцян Гёста Сэрклакхіус.



Выбіраючы галоўнага лекара новай арміі, Манэргейм не прызначыў на гэтую пасаду Освальда Сівеніна, які займаўся актыўным наборам у егерскія часткі. Той у шаленстве помсціў Манэргейму тым, што да самай смерці не сказаў і не напісаў пра генерала ніводнага добрага слова. У маі 1918 года Мексмантан таксама ўзяўся публічна знеслаўляць Манэргейма. Пасля вызваленчай вайны да гэтага нешматлікага хору далучыўся і генерал Лёфстром. Лічыцца, што Манэргейм адплаціў за старыя крыўды ў час Другой сусветнай вайны, калі акрутна абышоўся з сынам Освальда Сівеніна, які быў тады камандзірам палка.

Манэргейм запрасіў на пасаду галоўнага лекара арміі Рыхарда Фальтына, але той не паехаў у Ваасу, бо мусіў прымаць іспыты ў студэнтаў.

9 сакавіка 1918 года Манэргейм стварыў у Стаўцы аддзел, які займаўся палітычнымі зносінамі з сенатам. Начальнікам аддзела ён прызначыў свайго швагра Мікаэля Грыпенберга. Пасля гэтага яго абвінавацілі ў тым, што ён разводзіць у арміі сямейнасць.

Неяк у трыццатыя гады Манэргейм сказаў, што напрыканцы 1917 года ён не меў ніякага ўяўлення аб тым, у якую краіну вярнуўся. Ён нават не думаў, што гэта краіна дробных паноў і падпанкаў. Кажучы гэта, ён, мабыць, меў на ўвазе, што ўсе тут лічылі сябе вялікімі і моцнымі панамі з усімі неабходнымі здольнасцямі і рэсурсамі.

Шведскі афіцэр Торнгрэн лічыў Фінляндыю цалкам цывільнай краінай. Набор у армію ішоў дрэнна. Сяк-так удалося сабраць шэсць батальёнаў, затое шуцкор сфармаваў 10 палкоў, у якіх налічвалася 30 батальёнаў. Шведскія афіцэры настойліва патрабавалі ад Манэргейма ўвядзення ў краіне ўсеагульнай вайсковай павіннасці. Гэта давала камандаванню значна большыя магчымасці падтрымліваць дысцыпліну і патрабаваць ад войскаў нават немагчымага. А з шуцкорам трэба было абыходзіцца іначай: угаворваць, ісці на кампрамісы. Аднак калі Аарнэ Сіхва запатрабаваў на нямецкі лад увесці сярод шуцкораўцаў пакаранне смерцю за невыкананне загадаў, – каб хоць неяк утрымаць іх на перадавой, калі яны збіраюцца яе пакінуць, – Манэргейм на гэта не пайшоў.

Вільгельм Тэслеў скончыў акадэмію расейскага Генштаба з выдатнымі адзнакамі. У верасні 1917 года пад Рыгай ён пры ня-

высветленых абставінах трапіў да немцаў у палон. Манэргейм ставіўся да яго неадабральна, асабліва да таго, што падпалкоўнік пачаў працаваць у палітычным аддзеле нямецкага штаба, а потым служыў у егерскім батальёне. Тэслеў тлумачыў гэта тым, што пры адступленні рускай арміі з-пад Рыгі ён захварэў, а таму і трапіў у палон. Але Манэргейм лічыў такія паводзіны амаральнымі і нават злачыннымі, асабліва службу ў варожым стане.

Тэслеў прыбыў у Фінляндыю з егерамі. Ён прысвойваў ім вайсковыя званні без ведама Манэргейма. Апроч таго, Манэргейм лічыў Тэслева вінаватым у тым, што егеры выступілі супраць планаў, якія былі для іх распрацаваныя. Егеры хацелі, каб іх батальён, падмацаваны іншымі вайсковымі часткамі, пайшоў у рашучы наступ і тым самым пераламаў ход вайны. Манэргейм у студзені 1918 года трымаўся такой самай думкі. Ён пісаў пра гэта прэм'ер-міністру Свінхувуду ў лісце, які да канца вайны так і не знайшоў свайго адрасата. Тады ён быў вымушаны даць загад расфармаваць батальён, а егераў назначыць на пасады камандзіраў розных рангаў у новых егерскіх палках, якія ствараліся на аснове ўсеагульнай вайсковай павіннасці. Канфлікт паміж егерамі і Стаўкай Манэргейм вырашыў проста: ён запрасіў да сябе трох егерскіх камандзіраў і пагутарыў з імі адкрыта і шчыра. Адным з гэтых камандзіраў быў Эрык Хейнрыкс, які тады ўбачыў Манэргейма ўпершыню. Манэргейм забіў жэст добрай волі: ён узяў сабе ад'ютанта з егераў. Гэта быў яснавокі і круглатвары Хэйккі Кэкані, 24-гадовы сын святара з невялічкага мястэчка Хейналы. Ён заставаўся на гэтай пасадзе больш за дзесяць гадоў.

Манэргейм, якога лічылі чалавекам нетаропкім, увесну 1918 года развіў ліхаманкава хуткую дзейнасць. Ужо 18 лютага ён сказаў шведскаму афіцэру Пэйрону, што трэба як мага хутчэй завалодаць Паўднёвай Фінляндыяй, каб захапіць большую частку рускага Балтыйскага флоту, які зімаваў у закаванай ільдом гавані Хельсінкаў. Паводле першапачатковага плана, Манэргейм збіраўся завалодаць Пецярбургам і скінуць бальшавіцкі ўрад. А таму флот ніякім чынам не павінен быў трапіць у Кранштадт, дзе ўвесну ён быў бы гатовы да баявых дзеянняў. Немцы ўвайшлі ў Хельсінкі, а флот толькі вітаў іх узнятымі сцягамі. Паводле дамовы з немцамі флот заставаўся недатыкальным. Караблі адышлі



толькі тады, калі немцы цалкам авалодалі горадам. Рускія матросы проста павыганялі выспяткамі тых чырвоных, якія спрабавалі ўратавацца на іхніх караблях. Выконваючы дадзеныя немцам абяцанні, рускія матросы не ўмешваліся ў ваенныя дзеянні і засталіся нейтральнымі.

Падчас юбілейных урачыстасцяў, прысвечаных 15-й гадавіне ўзяцця Тамперэ, Манэргейм даў непараўнальную па нагляднасці і паўнаце геаграфічную карціну заходняй аперацыі. Ён валодаў вялікімі здольнасцямі рабіць цэласныя геаграфічныя апісанні. Ён сказаў так: «Сціснутая паміж азёрамі наша вызваленчая армія крок за крокам з баямі прасоўвалася да паўднёвых прастораў. Шлях да свабоды Фінляндыі быў адкрыты». Нібыта гаворка ішла пра роды.

23 лютага 1918 года Манэргейм паехаў у Антрэа. Там ён выдаў загад, у якім гаварылася пра ленінскіх хуліганаў, і ён абяцаў не ўкладаць меч у похвы, пакуль Усходняя Карэлія не стане свабоднай. У 1941-м падобны загад выклікаў вялікі шум. Але ў 1918 годзе ён меў свае выразныя, хоць і абмежаваныя мэты. Усё звязвалася з тым, што Ленін нібыта паабяцаў аддаць Усходнюю Карэлію пад уладу ці то Саўнаркому, ці то фінскім чырвоным. А таму Манэргейм павінен быў любым чынам пераадолець уплыў такой абяцанкі як у Фінляндыі, так і ва Усходняй Карэліі. Ён мусіў паабяцаць свабоду карэлам. Гэты загад Манэргейм пісаў разам з Х. Ігнацыусам, а той быў вядомым красамоўцам. Трэба сказаць, што мова палітыкі і прапаганды была ў тыя гады не такая гладкая, якой стала пазней. Калі рускія ў 1939–1940 гадах ужывалі ранейшыя моцныя выразы, фіны проста іх не ўспрымалі і лічылі чужымі і дзіўнымі.

Манэргейм прыспешваў з наступленнем на паўднёвае ўзбярэжжа губерні Уўсімаа, і яно пачалося 26 лютага 1918 года. Наступленнем камандаваў шведскі афіцэр Х'яльмарсон, а дапамагалі яму яшчэ два шведскія афіцэры Дуглас і Глімстэд. У Х'яльмарсона было ўсяго 400 чалавек, і наступ захліпнуўся перад мястэчкам Хейнала. Хейнальскія чырвонагвардзейцы выклікалі дапамогу з Лахці і лёгка адбілі наступ. Аперацыя па ахопу і акружэнню чырвоных таксама не ўдалася.

Першы накід вялікай Тамперскай аперацыі Пэйрон зрабіў у кафэ горада Вааса 24 лютага 1918 года. Манэргейм са сваімі най-

бліжэйшымі памочнікамі адправіўся ў порт сустракаць егераў, што прыбылі з Нямеччыны. Шведскіх афіцэраў ён з сабою не ўзяў, бо тыя насілі шведскія мундзіры, а Манэргейм чула ставіўся да такіх прапагандысцкіх момантаў.

Пэйрону не было чаго рабіць, і час ішоў вельмі марудна. Памочнікі маглі падаваць Манэргейму свае прапановы, нават калі ён і не прасіў пра гэта. Нягледзячы на строгую дысцыпліну і субардынацыю, у штабе Манэргейма панаваў дух вольнай добразычлівасці, таму што генерал ніколі не падаўляў ініцыятыву і фантазію сваіх падначаленых. Пэйрон, як і Манэргейм, быў кавалерыстам. На яго думку, Тамперэ трэба было ўзяць смелым абыходным манеўрам у акружэнне і захапіць, пасля чаго адкрываўся шырокі бесперашкодны шлях у Паўднёвую Фінляндыю.

Абмеркаванне гэтага плана доўжылася два дні. Палкі Ігнацыус цалкам падтрымліваў план Пэйрона, а Ветцэр і Ліндэр выступалі супраць. Манэргейм толькі слухаў, ніяк не выказваючы сваёй пазіцыі. Праўда, па словах Хейнрыкса, пра якую-небудзь дыскусію не было і гаворкі. Манэргейм хацеў толькі атрымаць ад падначаленых інфармацыю, а рашэнне дыктаваў ён сам.

Потым Манэргейм запрасіў Ветцэра да сябе ў купэ і, зачыніўшыся, на працягу некалькіх гадзінаў пераконваў падтрымаць план аперацыі. Нарэшце дзверы купэ адчыніліся і ўслед Ветцэру данеслася ціхае: «Дзякуй, Марцін». Наступным раннем Пэйрону паведамілі, што ягоны план наступлення на Тамперэ прыняты.

Шведскія штабныя афіцэры сведчылі, што Манэргейм патрабаваў немагчымага дзеля таго, каб дасягнуць магчымага.

Задача павінна выконвацца да канца, на паўдарозе нічога пакідаць нельга. З цягам часу гэтая рыса ў Манэргейма не толькі захавалася, але стала яшчэ выразнейшая. Яго падначалаеныя ў час вайны-працягу сведчылі, што ён і сам абдумваў і даваў час іншым абдумваць свае планы, але пасля таго, як рашэнне было прынятае, ажыццяўляць іх трэба было як мага хутчэй. Ён мог быць вельмі нецярплівым і патрабаваў часам абсалютна немагчымага, нават не беручы пад увагу таго, што любое дзеянне або выкананне плана ці загаду, вымагае пэўнага часу.

Манэргейм на той час быў пяцідзесяцігадовым генералам, які прайшоў суровую школу і ўмеў разумець свет і людзей. Ён прайшоў вайну, якая скончылася паразай, і навучыўся разумець тое, чаму ніколі не навучаюцца пераможцы, – разумець пераможаных.



Манэргейм быў чалавек сацыяльны і ніколі не заставаўся адзін. Паказальна тое, што ён не чытаў мастацкай літаратуры, г. зн. літаратуры, якая меней за ўсё прасякнутая калектывізмам. Ён чытаў толькі тое, што яму было патрэбна ў працы і ў грамадскіх зносінах. Калі ўжо на схіле свайго веку ён зацікавіўся гістарычнай і мемуарнай літаратурай, чытаючы яе, ён нібыта зноў гаварыў са знаёмымі яму людзьмі. На палях старонак ён пісаў свае заўвагі або выпраўляў памылкі. У светапоглядзе Манэргейма цэнтральнае месца займаў чалавек.

Аднойчы ў час вызвольнай вайны да Манэргейма звярнуўся шведскі афіцэр з ягонага штаба са скаргай у сувязі з тым, што з-за быкагаловасці і самазадаволенасці фінаў нейкая справа не магла зрушыцца з месца. Манэргейм адказаў яму так: «Дарагі капітан, я ўпэўнены, што як добра выхаваны чалавек вы знойдзеце сродак пераадолець гэтыя цяжкасці».

Звычайна Манэргейм вёў справы ў мяккай манеры, пазбягаючы канфліктаў, мабыць, яшчэ і таму, што лаяцца і крычаць – гэта вульгарна і неэлегантна. Толькі тонкая і вострая сатыра разам з іроніяй надаюць спрэчкам элегантнасць і прыносяць асалоду. Гэтымі прыёмамі ён валодаў непараўнальна.

Йонаса Кастрэна, з якім Манэргейм быў на «ты», генерал паслаў у Швецыю, бо гэты чалавек меў досыць цяжкі характар. Манэргеймаў брат Ёган і пасол Алексіс Грыпенберг патрабавалі адклікаць яго назад у Фінляндыю – на іхнюю думку, у Швецыі ён прыносіў болей шкоды, чым карысці. Але чаму ж тады Манэргейм так цаніў Кастрэна? Напэўна, ён кіраваўся тут збольшага думкаю бацькі. А бацька лічыў, што ў 1905–1906 гадах – падчас вялікай забастоўкі і пасля яе – Кастрэн ўратаваў Фінляндыю. Апроч таго, Манэргеймаў бацька быў зацятым канстытуцыяналістам. Да гэтай групы належаў і Кастрэн. І ў дадатак да ўсяго ён быў гарачым прыхільнікам адзінства. Ягоны лозунг адносна фінаў і шведаў, што насялялі Фінляндыю: «Дзве мовы – адна душа», – Манэргейм узяў сабе на ўзбраенне.

Перамір'е паміж Расеяй і Нямеччынай скончылася 18 лютага

1918 года. Немцы распачалі хуткае наступленне і завалодалі Талінам. Пайшлі чуткі, што хутка настане і чарга Пецярбурга. Праз тры дні пасля ўваходу немцаў у Талін Манэргейм выказаў занепакоенасць, што яны паспеюць у Пецярбург раней за фінаў. Фіны муляць там быць першыя, дый для піцерцаў фіны былі б болей пажаданымі заваёўнікамі і акупантамі, чым немцы.

Манэргейм лічыў гэта лёгкай задачай. Ён добра бачыў, які развал і беспарадак пануюць у расейскіх арміі і ўрадзе. Аднак і сярод белага руху ён не знаходзіў людзей, якія адважыліся б ці былі б здольныя арганізаваць узброены супраціў бальшавікам. Тыя толькі таму і захапілі ўладу, што не сустрэлі ніякага супраціўлення. А гэты меч быў востры з абодвух бакоў. Адсутнасць супраціву не навучыла бальшавікоў быць сапраўднымі байцамі.

Паўгода Манэргейм беспаспяхова вёў пошукі правых сілаў супраціву бальшавікам як у Расеі, так і ў Фінляндыі. Ён займаўся гэтым яшчэ ў снежні 1917 года, калі ездзіў паміж Пецярбургам і Хельсінкамі. У Фінляндыі такі правы супраціў ён мусіў стварыць сам. Аднак пасля яго стварэння яму трэба было спачатку заваяваць свабоду Фінляндыі, і толькі пасля думаць пра вызваленне Пецярбурга. Магчыма, гэтым і можна патлумачыць тую незвычайную і нехарактэрную для Манэргейма хуткасць, з якою ён правёў вызвольную вайну ў Фінляндыі.

У такой сітуацыі дзейнічаюць хутка, не вельмі задумваючыся над цяжкасцямі задачы, тэарэтычным абгрунтаваннем сваіх дзеянняў і над тым, як гэта выглядае збоку. Большасць чыннікаў, якія выклікаюць спрэчкі і звады, проста знікаюць.

Пазнейшыя дзеянні Манэргейма паказваюць, што галоўнай ягонаю мэтай было заваяванне Пецярбурга. Калі гэта зразумець, усё адразу стае на свае месцы. Яго дзейнасць, якая выглядала імпульсіўнай і непрадказальнай, становіцца характэрнаю часткай тагачаснай палітыкі. Манэргейм быў верны не толькі асобным людзям, але і тым ідэям, якія цалкам яго захаплялі. Такіх грунтоўных ідэяў за ўсё жыццё ў яго было няшмат. Хай гэта былі не ім прыдуманыя ідэі, але ягоная вернасць ім з цягам часу ўзнагароджвалася. Ён валодаў здольнасцю тварыць з малога вялікае і рабіў гэта не аднойчы і ў розных галінах.

Напэўна, Паасіківі правільна пісаў у сваім дзённіку, што Манэргейм быў славалюбцам. Тое самае адзначалі і некаторыя праніклівыя афіцэры, якія служылі з ім у Расеі.



Манэргейм валодаў настолькі вольнай фантазіяй, што няцяжка было заўважыць у ім сапраўднага мастака. Яго называлі і вялікім акторам, а ўсё, што ён напісаў − а напісаў ён нямала, − сведчыць пра вялікія пісьменніцкія здольнасці. Тры пакаленні запар яго род вылучаў мастакоў. Мастакамі былі брат ягонага дзеда Аўгуст, яго бацька і яго сястра Ева. І ён сам валодаў творчай фантазіяй, якая дазваляла знаходзіць спосабы і сродкі ажыццяўляць задуманае. 1918 год стаў у гэтых адносінах яго зорным годам. Паасіківі лічыць, што найбольш значны ўклад у гісторыю Фінляндыі Манэргейм зрабіў у першай палове 1918 года.

Яшчэ на ранняй стадыі аперацыі па захопу Пецярбурга быў забяспечаны другі фланг, важны з пункту погляду ўнутранай палітыкі. Перш чым пайсці на гэтую аперацыю, Фінляндыя павінна была ўзважыць, якую канкрэтную карысць фіны атрымаюць ад яе правядзення. Вызваліўшы Пецярбург ад бальшавікоў, Фінляндыя зробіць Расеі такую вялікую паслугу, што тая застанецца ёй вечна ўдзячнаю, прызнае незалежнасць Фінляндыі і заўсёды будзе ёй добрым суседам. Апроч таго, фіны купіліся на магчымасць далучыць Усходнюю Карэлію, якая належала Расеі. Усё гэта не было з боку Манэргейма толькі тактычным ходам. Ён добра ведаў сапраўдную моц Расеі і ўжо ў 1918 годзе думаў над тым, якая магутная дзяржава ўздымецца з руінаў. Ён ведаў і тое, што ніхто ў Расеі не падтрымае ідэю аддзялення Фінляндыі ад метраполіі. А значыць, трэба было правесці здзелку: выгада аднаго боку − гэта цана выгады другога. Манэргейм быў рэалістам. Будучыня і асабліва вайна-працяг паказалі, што, на думку Манэргейма, таварам можа паслужыць усё: і тое, што Фінляндыя некалі зрабіла, і тое, што магла б зрабіць, ды не зрабіла. Адмоўная бяздзейнасць ці запаволенасць дзеянняў магла быць для супраціўнага боку − для ворага − каштоўным таварам у здзелцы. Толькі бяздзейнасць − і болей нічога. І Манэргейм ахвотна браў заклады − ён жа быў з роду камерсантаў Юлінаў. Апроч таго, ён шмат гадоў гандляваў коньмі і ведаў як робяцца справы.

Фінскі пасол у Швецыі Алексіс Грыпенберг быў свёкрам стрыечнай сястры Манэргейма. Ён быў зацятым прыхільнікам немцаў,

як амаль усе ў кіраўніцтве Фінляндыі. Але яго сын быў больш дальнабачны, і Манэргейм хацеў паслаць яго на дапамогу бацьку ў Стакгольм, аднак сенат запрярэчыў гэтаму. А пасол тым часам зайшоў так далёка, што, не дачакаўшыся ваеннай дапамогі ад Швецыі, самадумна паслаў запыт аб ваеннай дапамозе ў Берлін, хоць Манэргейм на самым пачатку сваёй дзейнасці галоўнакамандуючага дамовіўся з прэм'ер-міністрам Свінхувудам, што замежнай дапамогі прасіць не будуць.

Яшчэ 17 лютага 1918 года прадстаўнік Англіі ў Стакгольме рапартаваў у Лондан, што, па словах аднаго пецярбургскага знаёмага Манэргейма, той выключна варожа ставіцца да Нямеччыны і лічыць неабходным дабівацца ўзаемапаразумення з Расеяй. Праз дзесяць дзён нямецкі пасол пісаў са Стакгольма ў Берлін, што ад некаторых фінаў яму стала вядома, што Манэргейм выступае і супраць немцаў, і супраць шведаў, бо па сваім характары ён нахабны, славалюбны і цалкам настроены на карысць рускіх. Усё сваё жыццё Манэргейм быў чалавекам лаяльным. Ён быў лаяльны і да Расеі.

Калі ж фінскі прадстаўнік ад імя сенату звярнуўся па дапамогу да немцаў другі раз, Манэргейм ажно ўскіпеў ад таго, што гэта зрабілі, з ім не параіўшыся і нават не паведаміўшы яму. У размове з Ігнацыусам ён згадаў пра няшчасны лёс Польшчы. Гэтаксама і Фінляндыя магла б ператварыцца ў поле бітвы паміж вялікімі дзяржавамі. Маленькая краіна ў саюзе з вялікай дзяржавай траціць свабоду палітычнай дзейнасці. Апроч Польшчы, ён на свае вочы бачыў і тое, што адбылося з Румыніяй, дзе ён ваяваў апошні час перад прыездам на радзіму.

Манэргейм адмовіўся паслаць ледакол «Сампа» на Аландскія выспы дзеля сустрэчы нямецкіх войскаў. Ігнацыус быў у жаху, і шведскі афіцэр Торнгрэн нават падумаў, што той звязаны з егерамі ды іншымі прыхільнікамі нямецкай дапамогі і яны збіраюцца арыштаваць Манэргейма.

Сенат ужо рыхтаваўся прызначыць новага галоўнакамандуючага. Кандыдатам быў той самы Вільгельм Тэслеў, якога Манэргейм лічыў парушальнікам афіцэрскай прысягі. 4 сакавіка 1918 года швед запісаў у дзённіку, што сенатар Рэнвал, Тэслеў ды Ігнацыус інтрыгавалі за плячыма ў Манэргейма. Ігнацыус ужо два гады заклікаў немцаў дапамагчы Фінляндыі. Ён зрабіў стаўку на Нямеччыну.



А Манэргейм тым часам выставіў немцам свае ўмовы. Нямецкія войскі павінны былі перайсці пад яго камандванне. Гіндэнбург паабяцаў таксама, што немцы не будуць умешвацца ва ўнутраныя справы Фінляндыі. 7 сакавіка сенат прысвоіў Манэргейму званне генерала ад кавалерыі, каб той стаў чынам вышэй за камандзіра нямецкага экспедыцыйнага корпуса. Манэргейм адрэагаваў на гэта са здзеклівым сарказмам, як і на ўсё, што рабіў сенат. Ён сказаў, што ў Расеі ён быў простым кавалерыйскім генерал-лейтэнантам і меў у падначаленні сорак тысяч коннікаў, а цяпер, калі стаў генералам ад кавалерыі, мае пад камандай толькі сорак чалавек.

Падчас вайны-працягу Манэргейм распавёў, як сенат прыслаў да яго сувязнога афіцэра з пасланнем, у якім выказвалася незадавальнене тым, што ў ягонай Стаўцы шмат п'юць. Манэргейм у шаленстве парваў гэты ліст і загадаў перадаць сенату, што менавіта гэта і ёсць ягоны адказ. Калі аднойчы высокапастаўлены чыноўнік-бюракрат адмовіўся выдаць Стаўцы некаторыя карты, Манэргейм загадаў пасадзіць яго пад арышт. У той час да яго на нараду прыехалі некалькі сенатараў. І на працягу амаль усёй нарады яны толькі і рабілі, што ўгаворвалі Манэргейма вызваліць чыноўніка. Але генерал сказаў, што вызваліць чыноўніка толькі пасля вайны, і прапанаваў сенатарам бутэрброды і бутэльку віскі, сказаўшы, што гэта адзіная фінская артылерыя. Ніводзін сенатар не адмовіўся ад пачастунку. Манэргейм казаў, што чалавек, які дарэмна не сушыць сябе ўстрыманнем ад выпіўкі, атрымлівае ад жыцця большую радасць.

Пасля таго, як на захадзе пераважная большасць чырвоных была акружаная ў Тамперэ і зліквідаваная, цэнтр цяжару перамясціўся на ўсход. Пачалася даўно запланаваная аперацыя па ўзяццю Выбарга. Манэргейм перавёў сваю Стаўку ў мястэчка Міккелі. Гэта адбылося 10 красавіка 1918 года. Войскі перакінулі без ніякіх затрымак. Тыл працаваў бездакорна. Вальдэн умеў арганізаваць усё як след і быў яшчэ болей патрабавальны, чым яго начальнік.

### Усходняя аперацыя

Свінхувуд паслаў у Стаўку сувязнога афіцэра з лістом, у якім патрабаваў не прызначаць генерала Лёфстрома камандуючым усходняй аперацыяй, бо той быў непажаданай персонай. На думку сената, аперацыяй павінны былі камандаваць Вілкман, Сіхва або нямецкі афіцэр Аўсфельд. Пасля нарады з Фрэйем і Рэнвалам, якія былі прадстаўнікамі сената ў Стаўцы, быў знойдзены кампраміс: усходнюю аперацыю узначаліў сам Манэргейм. Шведскія штабныя афіцэры Торнгрэн і Пэйрон атрымалі заданне распрацаваць план аперацыі яшчэ 15 лютага. Манэргейм вёў сваю вызваленчую вайну па строга распрацаваных планах. Манэргейм выехаў на сустрэчу з Лёфстромам. Той таксама меў свой план, распрацаваны другім шведам, Аксэлем Рапэ. Па дарозе Торнгрэн прапанаваў Манэргейму некаторыя ўдакладненні свайго плана, і той ухваліў іх. Па словах Рапэ, пасля нарады ён быў у поўнай разгубленасці, як і ягоны начальнік Лёфстром. Замест таго, каб накіраваць сканцэнтраваны ўдар на Выбарг, войскі зрабілі вялікі абыходны манёўр уздоўж расейскай мяжы. Гэта было зроблена з мэтай выявіць планы ленінскага ўрада і дзеянне дамовы з Нямеччынай. Дамова дзейнічала. Рускія не пераходзілі мяжу і раззброілі чырвоных, якія ўцяклі ў Расею, а таксама вярнулі ў Фінляндыю захопленых у палон белых. З ваеннага пункту погляду манёўр удаўся. Манэргейм узяў пад увагу палітычныя абставіны і міжнароднае становішча, што ў выніку і аказалася вырашальным чыннікам. Ён быў сапраўдным генералам-палітыкам і военачальнікам, што і даказаў пры аблозе Тамперэ. Па палітычных матывах Тамперэ трэба было ўзяць, не губляючы часу, і забяспечыць вырашальную перамогу яшчэ да таго, як прыбудуць нямецкія войскі.

Ва ўзяцці Выбарга ўдзельнічалі 12 палкоў 18-й белай арміі – так яна вырасла за апошнія тры месяцы, хоць ёй па-ранейшаму не хапала вывучкі і ўзбраення.

У Міккелях Манэргейма наведала сястра Соф'я з іншымі сваякамі. Генералу падаравалі каня на мянушку Нептун, і 16 мая 1918 года ён узначальваў на ім парад перамогі ў Хельсінках.

24 красавіка 1918 года на станцыі Антрэа генерал Лёфстром выклікаў у Манэргейма сапраўдны шок. Штабныя цягнікі абодвух генералаў стаялі на суседніх рэйках. Але ж калі наступнаю раніцай Манэргейм выйшаў са свайго вагона, ён не мог паверыць сваім вачам: цягніка Лёфстрома на месцы не было, ён знік. Уначы Лёфстром спешным парадкам перабраўся на іншую станцыю: яму непрыемна было адчуваць, як Манэргейм дыхае яму ў патыліцу. Апамятаўшыся ад такога нахабства, свавольства і непадпарадкавання, Манэргейм паслаў Лёфстрому тэлеграму, дзе ўказваў, што паводле правілаў камандуючы арміяй не мае права перамяшчаць свой штаб без дазволу вышэйшага начальства. Лёфстром у адказ напісаў, што такога правіла не існуе, і меў рацыю. Ён меў права размяшчаць свой штаб так, як лічыў найбольш мэтазгодным. Калі пазней было праведзенае грунтоўнае даследаванне гэтага выпадку з яго параўнаннем са звычаямі і правіламі ў іншых арміях, то была зробленая выснова, што Лёфстром мусіў такі паведаміць галоўнакамандуючаму аб перамяшчэнні штаба.



Пасля вайны Лёфстром напісаў для «Ваеннага часопіса» артыкул, у якім сцвярджаў, што менавіта ён, а не Манэргейм праводзіў аперацыю па захопу Выбарга. У лісце да Торнгрэна ў Швецыю Манэргейм пісаў, што яго вельмі пазабавіў гэты артыкул, выразна паказаўшы, як далёка можа зайсці чалавек у сваёй саманадзейнасці і завышанай ацэнцы сваёй асобы. «Праўда, у гэтым выпадку генерал Лёфстром захоплена распавядае пра генерала Толя, але Цэлестын – гэта Фларыдор, а Фларыдор – гэта Цэлестын».

Аднак Торнгрэн цалкам падзяляў думкі Лёфстрома і ўхваліў ягоныя дзеянні. Кіраваць аперацыяй было значна важней, чым падтрымліваць сувязь са Стаўкай.

Манэргейму нялёгка было прызнаць сваю памылку. На часопісе з гэтым артыкулам ён зрабіў заўвагу, што камандзір сярэдняга звяна заўсёды павінен трымаць сувязь з падначаленымі штабамі і абавязкова са сваім начальнікам.

Праз чатырнаццаць гадоў Манэргейм пытаўся ў лісце да Торнгрэна: «Памятаеш, як генерал Толь на станцыі Антрэа паднёс нам сюрпрыз, з'ехаўшы на сваім штабным цягніку невядома куды, і тым самым абарваў сувязь як уверх, так і ўніз? Ты напэўна памятаеш гэты выпадак і тое недарэчнае становішча, калі мы ўранні выйшлі з вагона і не знайшлі на месцы ні самога Толя, ні ягонага штаба».

А праз трыццаць гадоў у сваіх мемуарах Манэргейм старонка за старонкай абскубае генералу Лёфстрому крылле. Ніхто іншы такога гонару ад Манэргейма не заслужыў.

Лёфстром скардзіўся, што Стаўка бясконца ўмешвалася ў ягоныя справы і нават прыслала да яго віжа, які прыдзірліва кантраляваў усе ягоныя дзеянні. Звалі гэтага выведчыка Ісак Альфтан.

Зрэшты, Манэргейм ніколі не прыпісваў сабе гонар перамогі ў Карэліі. Як сцвярджаў Хейнрыкс, ён і не меў на гэта ніякага права. Гэта была аперацыя Лёфстрома. Дый як Манэргейм мог прыпісаць сабе аперацыю, якую лічыў цэлай плоймай памылак. Ён пералічвае іх.

Узяць Выбарг з налёту не ўдалося. Паўднёвая калона Вілкмана, якая павінна была атакаваць горад з усходу, спазнілася, ўвязнуўшы ў малазначных сутычках. Насуперак загаду галоўнакамандуючага, Лёфстром не нанёс у тым кірунку ўдару сканцэнтраванымі сіламі, гэтак сама, як не нанёс яго і ў паўночна-заходнім кірунку, дзе трэба было акружыць войскі чырвоных і не дапусціць іх адыходу да Выбарга. Загад аб наступе Лёфстром аддаў занадта позна. І ў дадатак да ўсяго, ён зняў з гэтага ўчастку цэлы полк і накіраваў яго на поўдзень у той самы час, калі трэба было тэрмінова арганізаваць перaслед праціўніка ва ўсходнім кірунку. Такім чынам, падзеі разгортваліся ў тым жа ключы, як і пад Тамперэ, калі Лёфстром правёў аперацыю толькі напалову. Чырвоным удалося адысці да Выбарга. Завязаліся вулічныя баі, а горш за гэта не бывае нічога.

Чырвоныя з дапамогай крапаснай артылерыі адбілі першы наступ, які, як і ў Тамперэ, таксама не ўдаўся. У рэзерве ў Манэргейма было два палкі. Адзін ён аддаў Лёфстрому, а потым вырашыў аддаць і другі, але якраз у гэты момант Лёфстром немаведама куды знік, і таму не змог атрымаць падмацавання. Зрэшты, Лёфстром завалодаў Выбаргам і без яго, узяўшы 15000 палонных і трафеі ў выглядзе 300 гарматаў і 200 кулямётаў. Перамога была, можа, і не лягчэйшая, але больш відавочная і эфектыўная, чым тая, якую атрымаў Манэргейм у Тамперэ. Там было 11000 палонных і толькі 30 гарматаў.

Пасля парада Манэргейм арганізаваў «сціплы» абед, на які запрасіў камандаванне Усходняй арміі, прэзідэнта Выбаргскага надворнага суда, біскупа з правінцыі Сава і старшыню гарадской рады. Прысутнічаў на абедзе і нямецкі афіцэр сувязі пры Стаўцы. Ён выступіў з прамоваю па-нямецку. У адказ Манэргейм таксама прамовіў па-нямецку, а потым сказаў біскупу, які сядзеў побач, што пра якасць ягонай нямецкай мовы той, пэўна, можа меркаваць лепш, бо некалі гэты самы біскуп паставіў Манэргейму нездавальняючую адзнаку па нямецкай мове падчас выпускных іспытаў, з-за чаго Манэргейм мусіў пераздаваць іспыт праз некалькі тыдняў, калі яго таварышы ўжо сталі студэнтамі універсітэта. «Быць таго не можа!» – жахнуўся біскуп. Такім вось дарэчы прыгаданым выпадкам Манэргейм заканчвае аповед пра захоп Выбарга.



Ёган вярнуўся ў Стакгольм, і Манэргейм папрасіў брата паднавіць яму гардэроб: прыслаць са Стакгольма 12 кашуляў і па дзве пары манжэтаў да кожнай, а таксама дзве пары чаравікоў са шнуркамі з жоўтай ангельскай (а не амерыканскай!) скуры. Дзеля пэўнасці ён яшчэ напісаў, што носіць 43 памер чаравікоў, а яшчэ яму патрабуюцца два трысняговыя хлысты для язды вершкі.

Былы Манэргеймаў швагер Ялмар Ліндэр, які вярнуўся са Швецыі, быў практычна адзіны з белых, хто пісаў у газэтах пра масавыя смяротныя пакаранні чырвонагвардзейцаў і выступаў супраць канцэнтрацыйных лагераў, а таму страціў рэшткі даверу і рэпутацыю. Ягонае эканамічнае становішча прышло ў заняпад. Апошнія свае дні ён правёў у Францыі. Як пазней расказвалі, апошні свой мільён ён раздаў беднякам Марсэля, пасля чаго застрэліўся. У сваіх артыкулах Я. Ліндэр бязлітасна хвастаў сябе і сваіх класавых братоў: «З-за раскошнага жыцця пераважнай большасці вышэйшага класа, у першых радах якога быў і я, дзякуючы нашым буйным ваенным перамогам, з-за нашай непрыхаванай пагарды да неразумных законаў (паглядзіце на «сухі закон» у тэорыі і на практыцы) мы абудзілі натуральнае пачуццё зайздрасці, якое лёгка ператвараецца ў нянавісць». Ліндэр не бачыў, што грамадзянская вайна ўспыхнула з-за рэзкага сутыкнення грамадскіх сілаў у барацьбе за ўладу. Ён лічыў, што прычынамі былі страта людзьмі маралі ды чалавечая эмацыйная няўстойлівасць.

28 мая 1918 года можна лічыць днём сацыяльнага самазабойства Я. Ліндэра. У гэты дзень у шведскамоўнай газэце Хельсінкаў з'явіўся артыкул, у якім Ліндэр пісаў: «Тое, што адбываецца ў

краіне – жахліва... Пакаранні смерцю ідуць бесперапынна. Чырвонае вар'яцтва змянілася сапраўдным белым тэрорам... ахвяраў шукаюць і забіваюць нават там, дзе ніколі не было ніякіх гвалтоўных дзеянняў... і гэта спараджае нязгасную нянавісць там, дзе раней яе ніколі не было... У канцэнтрацыйных лагерах вязні мруць як мухі».

Жывучы ў Пецярбургу, Ялмар Ліндэр, чым мог, дапамагаў Манэргейму, ён быў яго верным сябрам, даваў грошы і зрабіў шмат іншых паслуг. А цяпер ягоны пратэжэ стаў нацыянальным героем. Дык можа ў яго артыкуле сказаўся дух даўняга прыхаванага суперніцтва? Хто можа сказаць, ці хацеў ён, узняўшы голас супраць ідэяў і дзеянняў Манэргейма, стаць упоравень з ім, ці дзейнічаў з чыста гуманістычных памкненняў?

Зводны брат Ялмара, Паўль Ліндэр, даслужыўся у рускай арміі да чына гвардзейскага палкоўніка. У перыяд паміж дзвюма сусветнымі войнамі ён з прычыны поўнай адсутнасці сродкаў стаў старанным пісьменнікам. Ён уваходзіў у кола людзей, блізкіх да Манэргейма, але быў аб'ектыўна крытычным. У любы момант ён мог прыйсці да Манэргейма на сняданак, але грошай той прынцыпова яму не даваў. Паўль Ліндэр казаў, што Манэргейм вельмі добра – ледзь не да сквапнасці – умеў лічыць грошы. Паўль Ліндэр служыў пры двары расейскага імператара і ахвотна падкрэсліваў, што цесных сувязяў з дваром у Манэргейма не было. Гэтак сама, як пазней генерал Айра, ён лічыў карысным для здароўя раз у гадзіну прапускаць чарку гарэлкі – без ніякай шкоды для працаздольнасці. За гэты час чалавечы арганізм паспявае спальваць такі аб'ём алкаголю. Яны абодва лічылі Манэргейма сваім настаўнікам.

Напярэдадні вайны 1918 года Я. Ліндэр з'ехаў у Швецыю. Калі ў 1939 годзе пачалася Зімовая вайна, Паўль Ліндэр прыйшоў да Манэргейма з просьбай даць яму полк.

– Ніводзін з нас ужо непрыдатны камандаваць палком, – адказаў Манэргейм і параіў яму паехаць у Швецыю. Ліндэр так і зрабіў, нібыта гэтая парада была для яго загадам.

### Канцэнтрацыйныя лагеры і пакаранні смерцю

Стаўленне да палонных чырвонагвардзейцаў было непаслядоўным і зменлівым. Калі пасля вайны пачалі з'яўляцца статыстычныя дадзеныя аб колькасці пакараных смерцю і памерлых у канцэнтрацыйных лагерах, ваенныя і цывільныя ўлады ўзяліся абвінавачваць адны аднаго, імкнучыся скінуць з сябе цяжар адказнасці. Усяго белыя пакаралі смерцю 8400 захопленых у палон чырвоных, сярод якіх былі 364 непаўналетнія дзяўчынкі. Самым благім часам стаўся май 1918 года, у якім колькасць расстраляных узрасла да пяці тысячаў. Ад голаду і яго наступстваў у лагерах памерла 12500 чалавек, больш за ўсё ў ліпені 1918 года – 4700 чалавек.



Манэргейм трымаўся жорсткай лініі і аддаваў строгія загады. 25 лютага 1918 года ў цэрквах прачыталі адзін з такіх загадаў. Паводле гэтага загаду, на месцы расстрэльваліся асобы, якія за плячыма ў арміі разбуралі дарогі й масты, псавалі транспартныя сродкі, электрычныя, тэлеграфныя і тэлефонныя лініі. Неадкладнаму расстрэлу падлягалі і тыя, хто аказваў супраціў законным узброеным сілам краіны, хто насіў зброю без адпаведнага дазволу арміі, а таксама тыя, у каго праз восем дзён пасля абнародавання гэтага загаду будзе знойдзена зброя без належнага дазволу.

Мяркуючы па загадах і распараджэннях, Манэргейм хацеў дасягнуць адной выразна акрэсленай мэты: першым сваім загадам ён хацеў выбіць зброю з рук чырвонагавардзейцаў і напалохаць тых, хто мог бы далучыцца да Чырвонай гвардыі, асабліва за лініяй фронту белых ва Усходняй Эстэрбоніі і Паўночнай Фінляндыі. Застрашыць – вось што было галоўнаю мэтай. А калі пазней за адсутнасць дазволу на зброю на поўначы пачалі сапраўды расстрэльваць простых сялянаў і бяззбройных кіраўнікоў рабочага руху, Манэргейм раз'юшыўся і цалкам забараніў гэтыя дзеянні. Сотні маладых людзей, ратуючыся ад расстрэлаў, уцякалі ва Усходнюю Карэлію і Мурманск. Пазней яны ўцякалі, ухіляючыся ад мабілізацыі. Тэрор аказаўся зброяй, вострай з абодвух бакоў. Ён умацаваў баявы дух чырвоных, бо ім не заставалася нічога іншага, як змагацца да канца. Арышт азначаў немінучую смерць. Неабходна было пэўным чынам аслабіць напружанне. А таму пагроза смяротнага пакарання тычылася цяпер толькі кіраўнікоў і завадатараў, а простым байцам гарантаваўся статус ваеннапалоннага.

Прафілактычнай мерай і асновай болей жорсткага курсу быў таксама загад, у якім абяцалі канчаткова разабрацца з рускімі,

якія бралі ўдзел у баях. Гэта былі ваенныя дарадцы, кулямётчыкі, артылерысты і штабныя афіцэры ў стане чырвоных. У Тамперэ на вакзале расстралялі 200 захопленых у палон рускіх. Сярод іх аказаліся і белыя рускія афіцэры, якія хваліся ў горадзе. У Выбаргу таксама расстралялі захопленых у палон рускіх, сярод якіх было шмат цывільных гандляроў і камерсантаў, якія падтрымлівалі белую армію і аказвалі ёй дапамогу. Манэргейм быў у шаленстве.

Звесткі аб жорсткіх карных захадах пачалі распаўсюджвацца за мяжой. Чуткі пра белы тэрор псавалі рэпутацыю Фінляндыі на працягу трыццатых гадоў і нават пазней. Апроч Савецкага Саюза, больш за ўсё пра гэта пісалі ў Швецыі ды іншых Скандынаўскіх краінах.

Манэргейм добра бачыў, якую гэта нясе небяспеку. 26 сакавіка 1918 года ён аддаў загад, паводле якога з чырвонымі, якія здаліся пасля авалодання Тамперэ, трэба абыходзіцца, як з ваеннапалоннымі. У Тамперэ знаходзіліся сотні чужаземцаў, у асноўным супрацоўнікаў замежных пасольстваў, якія ехалі дадому з Пецярбурга праз Фінляндыю, ды затрымаліся ў Тамперэ, чакаючы магчымасці перасекчы лінію фронту. У загадзе Манэргейма гаварылася, што рэпутацыя Фінляндыі як цывілізаванай краіны залежыць ад таго, што тут пабачаць замежныя дыпламаты. А таму – бездакорную славу белай арміі нельга запляміць ніводным ганебным дзеяннем!

Такім чынам, у пытанні стаўлення да палонных чырвонагвардзейцаў Манэргейм кіраваўся чыста практычнымі меркаваннямі. Пасля ўзяцця Тамперэ ён запрасіў на абед найбольш важных супрацоўнікаў розных дыпламатычных місіяў. Дарадцы англійскага пасольства ён падрабязна распавёў усю гісторыю ўзнікнення нямецкай інтэрвенцыі і запэўніў, што зробіць усё магчымае, каб забяспечыць нейтралітэт Фінляндыі. Фінляндыя не ваюе на баку Нямеччыны, хоць нямецкія войскі і знаходзяцца ў краіне. Манэргейм заўсёды трымаў на ўвазе палітычныя аспекты вайны. На яе апошнім этапе ён катэгарычна забараніў усялякія самавольныя растрэлы. Справа кожнага палоннага павінна была разглядацца ў судзе. Да гэтага загаду з дакладна названым тэрмінам, вінтоўкі грымелі з абодвух бакоў. Зрэшты, і пасля самачынныя расстрэлы не спыніліся. Сітуацыя ўжо выйшла з-пад кантролю.



У сваіх успамінах Манэргейм пісаў, што падаў сенату прапанову, каб з лагераў без прамаруджання былі вызваленыя ўсе шараговыя чырвонагвардзейцы, нават захопленыя са зброяй у руках. Толькі вінаватых у цяжкіх злачынствах належала аддаць пад суд. Асноўнай прычынай было безнадзейнае становішча з прадуктамі харчавання. Гэтую прапанову Манэргейм зрабіў у маі 1918 года. І ады ж Ялмар Ліндэр надрукаваў свой трывожны артыкул. Можа, гэта быў пушчаны ім спробны шар, спроба праверыць грамадскую думку, высветліць, якую падтрымку мае такі лагодны пункт погляду? Але спробны шар выбухнуў на вачах у таго, хто яго запусціў. Ці, можа, Манэргейм ведаў пра дзеянні загадзя? Ён увесь час падтрымліваў з Я. Ліндэрам сувязь, і гэты артыкул ніяк не паўплываў на іхнія адносіны. Улетку Ліндэр вазіў Манэргейма на паляванне ў Нарвегію, і яны прабылі там даволі доўга.

Міністр юстыцыі Онні Талас рэзка аспрэчваў сцверджанні Манэргейма. Ён даводзіў, што Манэргейм не падаваў у 1918 годзе ніякіх прапаноў аб вызваленні палонных, тым больш, што ніякіх пісьмовых сведчанняў гэтаму не знойдзена. Можна меркаваць толькі, што свой пункт погляду як галоўнакамандуючага па гэтым пытанні Манэргейм выказаў сенату вусна, але гэта ніяк не паўплывала на агульнае становішча.

Манэргейм не займаўся непасрэдна праблемай палонных. Пасля ўзяцця Тамперэ ён праінспектаваў ваенны шпіталь, які размяшчаўся ў школе. Сярод параненых там былі як белыя, так і чырвоныя. Манэргейм пра гэта нічога не ведаў і ўзнагародзіў ордэнскімі стужкамі шмат чырвонагвардзейцаў. Калі ён пайшоў, узнагароды ў чырвоных паспяшаліся забраць. Манэргейму нічога не сказалі пра ягоную аблуду, але ў канцы візіту, пачуўшы пра чырвоных пацыентаў у шпіталі, ён здагадаўся пра яе сам. На ягоную думку, гэта была недаравальная памылка. Ён апынуўся ў смешным і недарэчным становішчы. І хоць яму, напэўна, варта было б паводзіць сябе так, быццам нічога не адбылося, ён успыхнуў, як порах. Ён загадаў неадкладна перавесці чырвоных у іншае месца, інačай ён зараз жа загадае выкінуць іх на вуліцу. Аднак лекары цвёрда трымаліся лекарскай этыкі, і ніякага пераводу чырвоных не адбылося. Дый параненыя з ліку белых таксама таго не жадалі. Потым доўга і беспаспяхова высвятлялі, хто тут вінаваты, а хто не.

## Пасля парада перамогі

16 мая 1918 года сенатары чакалі Манэргейма ў будынку сената. Яго прасілі з'явіцца аднаго, аднак Манэргейм прыйшоў у суправаджэнні шматлікай світы, у якой было некалькі салдат застрашальнага выгляду (генерал і ўзяў іх з сабою толькі з-за іхняй уражальнай знешнасці). У холе яго чакаў швейцар, які яшчэ раз нагадаў Манэргейму пра пажаданне сената, але генерал не звярнуў на яго ніякай увагі. Не частуючы сенатараў салодкаю кашкай, ён звярнуўся да іх з жорсткімі словамі і запатрабаваў стварэння ў краіне моцнага ўрада з перадачай стырна кіравання дзяржавай у цвёрдыя рукі. Цяпер не пара для партыйных спрэчак і для кампрамісаў. Уладу ў дзяржаве нельга аддаваць за бесцань. Гёста Тэслёф, які дапамагаў Манэргейму складаць гэтую прамову, раіў яму ўстрымацца ад пагардлівых выразаў у адрас сената, але Манэргейм не паслухаў. На думку Тэслёфа, гэтая прамова стала адною з прычынаў хуткай адстаўкі Манэргейма.

Такім чынам, ад вялікага парада перамогі да адстаўкі Манэргейма прайшло ўсяго пятнаццаць дзён. Манэргейм паехаў у Швецыю. Сенат выдзеліў яму пенсію ў памеры 30000 марак у год. Пазней прыватныя асобы і розныя таварыствы сабралі яшчэ сем мільёнаў марак у якасці грамадзянскага падарунка. З гэтага капіталу ён мог атрымліваць працэнты.

Манэргейм заўсёды заставаўся верны людзям, якіх абраў сабе ў паплечнікі, і дараваў ім іхнія слабасці, недахопы і нават неразумнасць. Так, у ягоную світу падчас парада перамогі ўваходзілі Ігнацыус, Хольмберг, два чалавекі-шыльды − Мексмантан і фон Рэхаўзэн, шведскія штабныя афіцэры − Т'ёрнгрэн, Дуглас, Петэрсэн і Пэйрон, а таксама два маладыя сваякі − маёр Грыпенберг і пляменнік, карнэт Манэргейм, сын брата Карла.

Сход выбаргскіх егераў прапанаваў, каб Манэргейм застаўся галоўнакамандуючым, але ягоны штаб трэба было пачысціць. Шведскія афіцэры на парадзе перамогі проста абражалі позірк немцаў і многіх фінаў. Была і яшчэ адна група, якую належала вычысціць − афіцэры, якія служылі ў царскай арміі. Пакінуць можна было толькі самых здольных і прафінскі настроеных, такіх, напрыклад, як Вілкман, які змяніў сваё прозвішча на фінскі лад і



стаў Вілкамам, ці палкоўнік Ненанэн, якога лічылі артылерыйскім геніем.

Манэргейм паспрабаваў закінуць вуду. 20 мая ён падаў прашэнне аб адстаўцы. Ён карыстаўся гэтым сродкам усё жыццё, з той або іншай нагоды. Калі ж праз тыдзень ён паўтарыў прашэнне, сенат ягоную адстаўку прыняў. Сенат рыхтаваў урачыстаці ў гонар Манэргейма, яму хацелі падараваць маёнтак, што змусіла б яго застацца ў Фінляндыі, але генерал, нічога не чакаючы, з'ехаў прэч.

Нямеччына была зацікаўленая ў тым, каб зберагчы ў Расеі бальшавіцкую ўладу, таму што бальшавікі заключылі мір з немцамі. На думку Паасівіві, які быў тады фінскім прэм'ер-міністрам, такое становішча было выгодным і для Фінляндыі, таму што бальшавіцкі ўрад на чале з Леніным прызнаваў незалежнасць Фінляндыі. Астатнія расейскія групоўкі на гэта не ішлі.

Манэргейм, які нядобра ставіўся да немцаў увогуле, не мог цярпець іх яшчэ і з-за таго, што яны абаранялі бальшавіцкі ўрад. Калі немцы прыйшлі ў Фінляндыю і пачалі моцна ўплываць на палітыку краіны, яны зрабілі ўсё магчымае, каб не даць у крыўду расейскіх бальшавікоў. Немцы перашкодзілі Манэргейму ажыццявіць ягоную галоўную мэту, паламаўшы ўсе ягоныя планы наступу на Пецярбург. Ён хацеў быць вызваліцелем і ўратавальнікам Расеі. Сярод прычынаў сваёй адстаўкі Манэргейм называе нямецкі план, які перакрэсліваў ягоны план арганізацыі арміі, звальненне са штаба шведскіх афіцэраў і тое, што ягоная роля галоўнакамандуючага зводзілася да падпісання загадаў, якія складаліся і выдаваліся немцамі, г. зн. галоўнакамандуючы ператвараўся ў гумовую пячатку.

Дый усе дзеянні сената таксама аслаблялі пазіцыю Манэргейма. У толькі што арганізаванае ваеннае міністэрства міністрам прызначылі Вільгельма Тэслева, якога Манэргейм не любіў і да якога ставіўся з пагардай. Перамовы паміж Манэргеймам і сенатам цягнуліся цэлы тыдзень. Як пазней казаў Ігнацыус, узаемаразуменне дасягнулі па ўсіх пытаннях, апроч прызначэння Тэслева ваенным міністрам.

# VII. РЭГЕНЦТВА

## Рускае пытанне

У 50-я гады Хейнрыкс пісаў, што галоўнай прычынай адстаўкі Манэргейма было пытанне Усходняй Карэліі і Расеі. Толькі ўмяшальніцтва Фінляндыі ва ўнутраныя справы Расеі магло гарантаваць фінам трывалую незалежнасць. Створаная з дапамогаю фінскага ўмяшальніцтва ліберальная Расея змагла б завязаць з Фінляндыяй моцныя добрасуседскія адносіны. Такой Расеі Фінляндыя магла б давяраць. Сваімі паслугамі і карыснасцю Фінляндыя заслужыла б давер і добрую рэпутацыю, якія былі так патрэбныя маладой дзяржаве. Парадокс заключаецца ў тым, што Манэргейму і фінскаму ўраду ўдалося ў 1941 годзе і пазней зрабіць для Расеі такія паслугі. Усё пайшло, праўда, на карысць бальшавіцкаму ўраду, але добрая справа заключалася якраз не ў захопе Пецярбурга, а ў тым, што гэты захоп не адбыўся.

Вялікія ідэі і задумы, што ўзнікалі ў Манэргейма на працягу ўсяго жыцця, не забываліся і не знікалі. Часам ён браўся за ажыццяўленне немагчымага і тым самым дасягаў магчымага, як пісаў адзін шведскі штабны афіцэр пра Манэргеймавы аперацыі ў 1918 годзе.

Ужо ў лютым 1918 года найбліжэйшым паплечнікам Манэргейма стала вядома, што ён лічыць захоп Пецярбурга цалкам магчымым. Пэйрон атрымаў тады менавіта такое заданне − распрацаваць план наступу на Пецярбург у канцы лета 1918 года. У маі 1918 года Манэргейм расказаў пра гэтыя планы Хейнрыксу. Свінхувуд і ўрад таксама пачалі пагаворваць пра наступленне, але пры гэтым мелі на ўвазе наступ на Аланец. Але Нямеччына адвергла прапановы Свінхувуда, які так і не здагадаўся, што было сапраўднаю прычынай адмовы. А Манэргейм гэтую прычыну ведаў.

Вільгельм Тэслеў успамінаў, што Манэргейм нібыта намерваўся кінуць на Расею фінскую армію ў 70000 − 80000 чалавек з мэтай аднаўлення манархіі.



Англійскі пасол у Стакгольме пісаў 4 чэрвеня 1918 года, што Манэргейм расказаў адной пранямецкі настроенай даме пра сваё жаданне падавіць паўстанне ў Фінляндыі без нямецкай дапамогі, а потым вярнуць Расеі ліберальны ўрад і ўратаваць Расею ад анархіі і нямецкай акупацыі. У падзяку за гэта Расея прызнала б незалежнасць Фінляндыі і ўстанавіла б з ёй выгадныя стратэгічныя межы.

14 чэрвеня 1918 года такую ж навіну паведаміў свайму ўраду і пасол ЗША.

Нямецкі кайзер Вільгельм, у чыёй галаве раіліся палітычныя планы, што рабіліся пакутаю для краіны і жахалі прыбліжаных, меркаваў выкарыстаць Манэргейма калі не ў Фінляндыі, дык у Расеі, дзе той мог бы дапамагчы навесці парадак. Такой самай думкі трымаўся і балгарскі цар.

За паўгода Манэргейм стаў чалавекам, якога ведаў увесь свет.

Летам 1981 года Манэргейм жыў у «Гранд-гатэлі» ў Стакгольме. Ён захварэў на гішпанку − хваробу якая знесла ў магілу мільёны жыццяў у Еўропе. Паправіўшыся, ён паехаў у Нарвегію падыхаць свежым горным паветрам і пастраляць палярных курапатак. Ён паехаў цягніком са сваім былым швагерам Ялмарам Ліндэрам на поўнач, дзе той купіў ліцэнзію на паляванне на аленяў. Ліндэравы газэтныя выхадкі не пасеялі адчужэння між імі. На пачатку верасня Манэргейм вярнуўся ў Стакгольм, дзе арандаваў на зіму жытло. У Фінляндыі нястача стаяла на парозе кожнага дома. Нямеччына практычна ўжо прайграла вайну. Звязаная з ёю Фінляндыя ішла на дно разам з саюзнікам. Па прапанове прэм'ер-міністра Паасіківі сенат паслаў Карла Энкеля па Манэргейма. 4 кастрычніка 1918 года Манэргейм вярнуўся ў Хельсінкі і пачаў перамовы з рэгентам Свінхувудам, прэм'ерам Паасіківі і міністрам замежных справаў Стэротам.

На думку Манэргейма, Свінхувуд і Паасіківі занадта нерваваліся і толькі міністр замежных справаў Стэрот паводзіў сябе болей ці меней разумна.

Праз два дні Манэргейм сустрэўся ў Хельсінках з былым прэм'ер-міністрам Расеі Трэпавым. Трэпаў лічыў, што Манэргейм − самая прыдатная фігура на пасту галоўнакамандуючага арміяй, якая возьме Пецярбург і вызваліць Расею. Аднак гэтая армія па-

вінна складацца не з фінаў, а з рускіх, хай сабе ўзброеных і арганізаваных немцамі.

На пачатку лістапада Манэргейм папярэдзіў кіруючых дзеячаў Фінляндыі, што надта выступаць у падтрымку Балтыйскіх краінаў не варта, бо іх, напэўна, далучаць да будучай Расеі, што магло быць нават выгодным Фінляндыі.

Думка аб Расеі не пакідала Манэргейма. Ён задаволіў усе яе законныя правы і вярнуў амаль усе яе былыя землі. І ўсё ж Фінляндыі варта было трымацца далей ад Расеі. Манэргейм казаў, што за ўсё трэба плаціць, нават за змену ўрада і палітычнага курсу Фінляндыі. І плаціць муілі заходнія краіны. Падчас Другой сусветнай вайны Манэргейм працягваў распрацоўваць гэтую гандлярскую ідэю. Часам яму трэба было гуляць з неверагодна малымі стаўкамі, але ён гуляў і выйграваў.

На той жа момант трэба было згуляць на боязі англічан перад бальшавікамі. У Фінляндыі панаваў голад. І сітуацыя малявалася так, што калі Англія не прызнае незалежнасці Фінляндыі і не прышле ёй хлеба, дык Фінляндыя непазбежна загіне, і тады бальшавікі, захапіўшы яе, рушаць у паход на Англію. Манэргейм запатрабаваў ад Англіі даволі многа: 20000 тонаў збожжа, эскадру для абароны ўзбярэжжа, прызнання незалежнасці Фінляндыі, згоду на захоп Пецярбурга і ўстанаўлення там такога ўрада, які навядзе парадак у краіне. Такія былі ўмовы і патрабаванні Манэргейма.

Неверагодны ліст Манэргейм напісаў з парыжскага гатэля «Рэгіна» Марыі Любамірскай 28 кастрычніка 1918 года. Ён заўсёды ўмеў пісаць каротка і выразна. Ён пісаў, што, на жаль, не можа цяпер сказаць, якая Расея была б лепшая – тая, што кіруецца бальшавікамі, ці новая ўзроджаная Расея, таму што абедзве Расеі будуць аднолькава небяспечныя для малых суседніх краінаў. Рускія нічога не забылі і нічаму не навучыліся. Раней ці пазней мы апынемся ў такім становішчы, калі Расея стане яшчэ болей магутнай імперыялістычнай дзяржавай і возьмецца аднаўляць старыя межы і веліч імперыі. Пазбегнуць сутычкі з такой дзяржавай, а яна ўзнікне, немагчыма. Расею нельга знішчыць і сцерці з геаграфічнай карты. Паколькі рэчаіснасць менавіта такая, дык лепей за ўсё зрабіць рыцарскі ўчынак, вызваліўшы Пецярбург і тым самым заклаўшы асновы будучых добрых стасункаў. Таму Манэргейм шкадуе, што Фінляндыя не выкарыстала свой шанец і не прыйшла на дапамогу арміі генерала Юдзеніча, якой пагражала пагібель каля Пецярбургскіх брамаў.



Немцы паспелі туды раней за фінаў, але гэта адбылося толькі ў 1941 годзе. І гэты раз Манэргейм не захацеў дапамагчы ім. Яго рыцарскі ўчынак, сяброўская паслуга Расеі і заключаліся ў тым, што ён хацеў стварыць перадумовы для незалежнасці Фінляндыі і ўсталявання добрых дачыненняў з Расеяй. Манэргейм дзейнічаў грунтоўна і лагічна, гледзячы далёка наперад. Ён ніколі не прымаў рашэнняў пад уздзеяннем імгненнага імпульсу. Хутчэй яго можна абвінаваціць у адваротным.

## У заходніх сталіцах

Урад паслаў Манэргейма ў Парыж і Лондан, каб наладзіць стасункі з заходнімі краінамі, дабіцца ад Англіі прызнання незалежнасці Фінляндыі і прысылкі ў знямоглую ад голаду краіну хлеба, таму што Манэргейм не быў заплямлены сімпатыямі да Нямеччыны.

На караблі, які ішоў у Стакгольм, знаходзілася і дэлегацыя фінскага ўрада. Ёй было даручана дабрацца да Нямеччыны і паведаміць прынцу Гесэнскаму, што ён абраны каралём Фінляндыі. Гэтая ж дэлегацыя павінна была паскорыць прыезд прынца ў Фінляндыю. Манэргейм сказаў чальцам місіі, што гэтае мерапрыемства вельмі несвоечасовае. Але з дэлегатаў заявіў у адказ адзін, што фінскі ўрад вырашыў паставіць увесь свет перад фактам. І такім чынам увесь свет будзе танчыць пад дудку фінскага ўрада і парламента. На думку Манэргейма, гэта сведчыла пра манію велічы.

У вялікіх краінах панавала думка, што Фінляндыя пойдзе на ўсё, каб толькі дабіцца прызнання сваёй незалежнасці Англіяй, і некаторыя выказванні фінскага ўрада пацвярджалі гэта. Манэргейм пісаў са Стакгольма міністру замежных справаў Фінляндыі, каб той дабіўся абвяржэння звестак, што Манэргейм нібыта паехаў на Захад у якасці афіцыйнага прадстаўніка Фінляндыі. Ён выступае толькі як прыватная асоба. Афіцыйная ўпаўнаважанасць яму спатрэбіцца пасля таго, як пачатковы этап будзе завершаны і пачнуцца перамовы аб заключэнні дамоваў. Фінляндыя не павінна паказваць свае казырныя карты раней, чым узнікне цвёрдая

надзея выйграць першую партыю ў гульні. Іначай ад Фінляндыі могуць запатрабаваць шмат, а даць вельмі мала.

Манэргейм быў палітыкам, здольным згуляць і ў паддаўкі, калі пазней гэта дазволіць працягваць гульню ў лепшых умовах.

Прыхільнасць Англіі і Злучаных Штатаў магла даць добры вынік, але да Францыі Манэргейм ставіўся з недаверам, бо яе палітыка насіла занадта тэмпераментны і нават капрызлівы характар.

У Англію Манэргейм адплыў з нарвежскага порта Бэрген. Портам прызначэння быў Абердзін. Падчас плавання пачаўся такі моцны шторм, якога Манэргейм ніколі не бачыў. Хвалі залівалі ўвесь карабель. Дзверы кают выходзілі на знешні бок, дзе ішлі трапы, і Манэргейм застаўся ізаляваны ў сталовай, бо дабрацца да каюты не меў ніякай магчымасці. Двое сутак капітан трымаў карабель у адкрытым моры і не заходзіў у порт, баючыся плывучых мінаў. Калі шторм крыху сцішыўся, судна зайшло ў прыстань на Аркнейскіх выспах, каб дагрузіцца вугалем. Толькі на трэція суткі яны ўвайшлі ў порт прызначэння.

Манэргейм прыбыў у Лондан 12 лістапада. Газэты паведамлялі аб заключэнні перамір'я. Народ святкаваў, учадзеўшы ад радасці перамогі. Аднак Манэргейм не меў сілы радавацца. Толькі ў апошнюю хвіліну Фінляндыі ўдалося стаць на бок краін-пераможцаў. Манэргейм прадчуваў, што гэта зробіць выкананне ягонай задачы надзвычай цяжкім.

Аднойчы ў вулічным натоўпе Манэргейм заўважыў жанчыну, выгляд якой яго ўразіў, нібы ўдар маланкі. Як звычайна, яна трымала пальчаткі ў руцэ. На ёй быў выдатны, пашыты па фігуры касцюм, які нагадваў вайсковы мундзір і, магчыма, быў уніформай нейкай паўвайсковай жаночай арганізацыі. Дама выглядала элегантнай і абаяльнай, ва ўсім адчуваўся добры густ, але прыгожай яна не была. Манэргейм спыніўся і прасачыў за жанчынаю позіркам, пакуль яна не знікла ў вулічнай мітусні. Тады ён рушыў далей, працягваючы размову з прыяцелем. Гэтая жанчына была ягонаю жонкай. Праз поўгода ён афіцыйна аформіў развод у судзе горада Торніа. Такое жыццё.

Гёста Тэслёф паслаў у Лондан тэлеграму, у якой паведамлялася, што Манэргейма хочуць зрабіць рэгентам. Тэлеграма прыйшла на адрас англійскага Міністэрства замежных справаў. Чыноўнік



Міністэрства, прафесар Сімпсан, уручыў яе Манэргейму. Той падзякаваў і уважліва прачытаў пасланне, пасля чаго паказаў яго Сімпсану і папрасіў засведчыць, што тэлеграму паслаў Тэслёф, які быў ягоным начальнікам штаба, а не ваенны міністр Тэслеў, які быў настроены на карысць немцаў і з якім у Манэргейма не было ніякіх стасункаў. Гэтыя два прозвішчы былі вельмі падобныя, і іх часта блыталі.

У хуткім часе Вільгельм Тэслеў пайшоў у адстаўку з першага ўрада, а на ягонае месца прыйшоў стаўленік Манэргейма Рудольф Вальдэн. Іншых міністраў падбіралі Свінхувуд з Інгманам, а таму сярод іх было шмат прыхільнікаў Нямеччыны. Англійскі консул у Хельсінках пісаў у Лондан, што, калі гэты ўрад нагадвае аднавокага каня, дык папярэдні быў наогул сляпы. Такім чынам, становішча ўсё ж крыху палепшылася.

### Вяртанне дадому

12 снежня 1918 года парламент абраў Манэргейма рэгентам. Ён расказваў, што выбары адбыліся, калі ён быў у Францыі. Адначасова прызначылі і ўрад, на склад якога Манэргейм паўплываць не мог. Французскі міністр замежных справаў павіншаваў яго з абраннем, але адразу дадаў, што Францыя не можа давяраць новаму ўраду, бо ў яго склад уваходзяць міністры з пранямецкім настроем. Манэргейм трымаўся такой самай думкі, але адказаў, што ў ягоным урадзе няма ні пранямецкіх, ні праантантаўскіх міністраў, а ёсць толькі тыя, хто будзе лепей за ўсіх служыць Фінляндыі. Калі ж Францыя не давярае яму, дык ён гатовы адмовіцца ад пасады рэгента. Наступным днём яму паведамілі, што Францыя яму давярае. Пасля прыезду ў Фінляндыю ён адразу адправіў у адстаўку пасла ў Берліне, які моцна трымаўся нямецкай арыентацыі.

Шведскі марскі міністр Пальмшэрна пісаў у сваім дзённіку, што адразу пасля прыезду ў Стакгольм 18 снежня 1918 года ў Манэргейма ўзнікла сур'ёзная падстава для роздуму. Швецыя патрабавала правядзення плебісцыту на Аландскіх выспах. Яшчэ ранняй вясной 1918 года Швецыя акупавала Аланды і самым нахабным чынам падманула раней пасланыя туды белыя атрады, замяніўшы тэлеграму ад Манэргейма з загадам не спыняць ба-

рацьбы на фальшывую – з загадам скласці зброю. Тады на Аландах высадзіліся нямецкія войскі. Рускія, шведскія і фінскія чырвонагвардзейцы пакінулі выспы, але Швецыя пачала з усяе моцы распальваць настроі насельніцтва на адзяленне ад Фінляндыі і далучэнне выспаў да Швецыі. Манэргейм зачараваў французскага пасла ў Стакгольме, тым больш, што ў гэтага вытанчанага чалавека і ў Манэргейма былі агульныя захапленні, якімі аказаліся геаграфічныя даследаванні. Манэргейму ўдалося абвесці вакол пальца і італьянскага пасла. І той адразу пасля сустрэчы з Манэргеймам прапанаваў міністру замежных справаў Швецыі паспрабаваць правесці абмен Аландскіх выспаў на фінскія тэрыторыі ў Заходняй Эстэрботніі. Напэўна, шведскі міністр ніколі ў жыцці не перажываў такога ўзрушэння. Манэргейм паказаў яму, як трэба гуляць у кошкі-мышкі.

А італьянскі пасол зрабіў яшчэ некалькі не менш цікавых прапановаў. Згодна з адной, Аландскія выспы абвяшчаліся б нейтральнымі і пераходзілі б пад супольную шведска-фінскую абарону і кіраванне. Іншымі словамі, Манэргейм хацеў абараняць Аландскія выспы супольна са Швецыяй. Падчас вайны такая ідэя толькі тлела, аднак пасля заключэння перамір'я, вырасла да таго, што ўжо прапаноўвалася унія дзвюх краінаў і іх зліццё ў адзіную дзяржаву. Але ў снежні 1918 шведы не на жарт спалохаліся. Выходзіла, што Швецыя міжволі павінна была падтрымліваць Фінляндыю зброяй. Шведскі марскі міністр раз'юшана назваў прыхільнікаў Фінляндыі царскімі наймітамі і кандацьерамі. Казалі, што, пераблытаўшы ўсё ад злосці, міністр заклікаў неадкладна вызваліць Аланды з-пад царскага ярма, хоць у той момант яму супрацьстаяла маладая фінская дзяржава, а рускі цар не падаваў пра сябе ніякіх звестак вось ужо другі год – яго ўжо расстралялі.

Свінхувуд – як ён распісаў гэта ў сваіх мемуарах – не стаяў у шэрагах ганаровай роты шуцкора, калі Манэргейм прыбыў у порт Турку.

Адначасова з Манэргеймам у Турку прыйшоў карабель з першай партыяй збожжа – адпаведна з дамовай, якой удалося дамагчыся Манэргейму. Амерыканскі палітык Гувер, які ўзначальваў працу па дапамозе Фінляндыі, выдаў гэтае збожжа з запасаў, сабраных у Даніі і Швецыі.



У Турку Манэргейм папрасіў арцыбіскупа багаславіць яго на пасаду рэгента. Такі звычай быў невядомы ў Фінляндыі. Манэргейм укленчыў перад арцыбіскупам, а той усклаў рукі яму на галаву і прачытаў малітву. Ён маліўся, каб гэтая адказная справа паслужыла да большай боскае славы і на карысць роднай зямлі. Адразу пасля гэтага Манэргейм адправіўся цягніком у Хельсінкі.

Калі ўвосень ва ўрадзе абмяркоўвалася прызначэнне Манэргейма рэгентам, некаторыя міністры казалі, што ён прыдасца на такой пасадзе ўсяго на чатыры месяцы, бо прысхільнасць народа да яго долей не пратрымаецца. Такую вось кароткачасовую ролю адводзілі Манэргейму.

У спальным вагоне начнога цягніка Манэргейм разам з Гёстам Тэслёфам напісаў тэкст прамовы і звароту. Галоўнай тэмай былі адзінства, залечванне ранаў і агульнае прымірэнне.

Паколькі Манэргейм прыязджаў у Хельсінкі на літэрным цягніку, сустракаць яго прыйшоў увесь урад у поўным складзе. Павітаўшыся за руку з кожным чальцом урада, Манэргейм адвёў убок міністра абароны Вальдэна і сказаў яму: «Заўтра ж пачнем ажыўляць шуцкор. Без яго ў краіне не справіцца». Армія ўсё яшчэ не мела сваіх рэзерваў, у краіне існаваў толькі шуцкор.

Але Манэргейм не змог дачакацца заўтрашняга дня. Ужо ўвечары таго ж дня ён разам з Вальдэнам склаў дакладны план дзеянняў.

Раней ваенны міністр быў і галоўнакамандуючым шуцкора. Цяпер было дамоўлена, што шуцкор атрымае асобнага галоўнакамандуючага з шырокімі паўнамоцтвамі і асобным ваенным штабам. Ужо ў сярэдзіне лютага стала магчыма выдаць пастанову аб шуцкоры, у якой выразна акрэсліваліся ягоныя задачы. Паводле пастановы ўрада шуцкор павінен быў займацца абароназдольнасцю народа і ахоўваць законны грамадскі парадак. Камандуючага шуцкорам прызначаў галоўнакамандуючы ўзброеных сілаў, а не прэзідэнт, як гэта задумвалася спачатку.

У краіне было дзве арміі – дзяржаўная, або ўсеагульная армія, і добраахвотная, напалову самастойная, армія буржуазнай часткі насельніцтва, армія міліцэйскага тыпу, якую злыя языкі часам называлі асабістай арміяй Манэргейма. Манэргейм прыклаў усе намаганні, каб легалізаваць і ўмацаваць шуцкор, які дзякуючы гэта-

му, ператварыўся ў сур'ёзную ўстанову рэспублікі. Адначасова правялі скарачэнне арміі. Яна была слабая і аж да трыццатых гадоў знаходзілася ў жалю вартым стане, пакуль не набыла нарэшце свайго фінскага характару, сваёй тактыкі і метадаў навучання. Адначасова пад кіраўніцтвам Манэргейма тады уніфікавалі і паднялі на болей высокі ўзровень увесь камандны склад арміі. Аднак гэта не азначала аслабленне шуцкора, наадварот, ён стаў часткай дзяржаўнай абароннай сістэмы. Ажыццяўленне мабілізацыйнага плана Айры зрабіла шуцкор асновай мабілізацыі і галоўным яе выканаўцам. Манэргейм баяўся, што гэта знішчыць самастойнасць шуцкора. Аднойчы ён нават назваў Айру «пажыральнікам шуцкора».

Шведскі арцыбіскуп, які прыязджаў у Фінляндыю з візітам у 1919 годзе, сказаў, што на працягу аднаго года Манэргейм двойчы ўратаваў сваю краіну.

Заканчваўся 1918 год. Гэта быў год ашаламляльных поспехаў. Падзеі ў свеце развіваліся з надзвычайнаю хуткасцю, і марудлівы Манэргейм дзейнічаў хутчэй за ўсіх. Аднак ён не заўсёды асуджаў марудлівасць. Калі падчас аблогі Тамперэ Ветцэра папракнулі ў марудлівасці, Манэргейм рэзка абарваў такія размовы, сказаўшы, што нават самая прыгожая жанчына Парыжа няздольная даць больш за тое, што ў яе ёсць.

### Змена ўлады

З падарожжа па заходніх сталіцах у снежні 1918 года Манэргейм вярнуўся пераможцам. Яго пасылалі дабіцца прызнання незалежнасці і дамовіцца наконт паставак збожжа ў згаладалую краіну, і ён прывёз і хлеб, і прызнанне фінскай незалежнасці вялікімі краінамі.

У сваіх дачыненнях з фінамі Манэргейм мусіў карыстацца паслугамі перакладчыка. Яго перакладчыкам і настаўнікам фінскай мовы быў Й.Р. Даніэльсан-Калмары, адзін з кіраўнікоў старафінскай партыі, гісторык. Ён не толькі выкладаў Манэргейму фінскую мову, але адначасова тлумачыў яму законныя правы і значэнне фінскай мовы ў жыцці дзяржавы.

Без асаблівых цяжкасцяў, проста сваім асабістым прыкладам Манэргейм стварыў этыку паводзінаў вышэйшых дзяржаўных асобаў. Калі пасля Манэргейма першым прэзідэнтам рэспублікі абралі Стольберга, той старанна высвятляў, дзе, калі і як паводзіў сябе Манэргейм. Ён хацеў ведаць, ці хадзіў Манэргейм па вуліцах адзін, без аховы, ці мог прапанаваць свайму суразмоўцу цыгарэту і да т.п..



Акрэдытаваны ў Хельсінках дыпламатычны корпус быў прадстаўлены рэгенту 23 снежня 1918 года а чацвертай гадзіне ў вялікай зале ўрачыстых прыёмаў урадавай рэзідэнцыі. Нешматлікія паслы Скандынаўскіх краінаў і Нямеччыны размясціліся ў адпаведнасці са сваімі рангамі. Дзверы адчыніліся, і ў суправаджэнні міністра замежных справаў з'явіўся Манэргейм. Паслы былі ўражаныя. Потым адзін з іх казаў, што перад Манэргеймам яны адчулі сябе школьнікамі. Размова ішла на французскай мове, бо нямецкі пасол не ведаў шведскай. Адзін з дыпламатаў апынуўся ў няёмкім становішчы, бо яго французская мова была далёка небездакорная.

Адзін стары, яшчэ варшаўскі, Манэргеймаў знаёмы казаў, што генерал умеў з'яўляцца вельмі эфектна. Гэты ж знаёмец казаў, што Манэргейм быў улюбёнцам варшаўскага вышэйшага свету.

Манэргейм пасяліўся ў былой рэзідэнцыі царскага генерал-губернатара. Калі прайшлі выбары ў парламент, Манэргейм наладзіў урачысты прыём, на які было запрошана 700–800 гасцей. Але 80 дэпутатаў ад сацыял-дэмакратычнай партыі дэманстратыўна не прыйшлі па запрашэнню. Манэргейм паводзіў сябе, як чалавек з народа, часам нават з асобнымі сялянскімі рысамі. На пачатковай стадыі вайны ў 1918 годзе ён імкнуўся звыкнуцца з роляю сялянскага правадыра. Тады Манэргейм адпрэчыў усе аздобы і далікатнасці. Ён нават дазволіў, каб у фінскамоўнай прэсе яго называлі не Густаў, а на фінскі лад – Кустаа. Салдаты белай арміі нават спявалі песню пра «дзеда» Манэргейма. Яго малявалі гэткім народным правадыром у грубай суконнай світцы і з люлькай у зубах. Яму каштавала шмат псіхалагічных намаганняў прывыкнуць да Фінляндыі. Ён недастаткова ведаў краіну і народ. Мундзір царскага афіцэра сваёй вытанчанай прастатой і элегантансцю, не кажучы пра гвардзейскую форму, прывучыў яго да простых ліній у адзенні, якое не кідалася ў вочы сваёй раскошай, хоць у трыццатыя гады – гэты залаты век самых разнастайных мундзіраў – і ён не пазбег пэўнага часовага захаплення аперэтачнай мішурой. Тым

не менш, сялянская грубасць і зухаватасць не былі ўласцівыя Манэргейму. Ён так і не змог звыкнуцца з роляй, якая патрабавала гэтых якасцяў, а таму хутка адмовіўся ад яе. У Эстэрботніі вобраз сялянскага правадыра быў адзіна правільным, каб схіліць народ на свой бок. Насельнікаў Эстэрботніі здзіўляла тое, што Манэргейм не ведаў фінскай мовы, што ў яго быў рускі дзяншчык, што на стале заўсёды стаяў партрэт рускага імператара. Таму яго часам называлі «маскальскім» афіцэрам.

Да ўсяго, што было звязана з грамадзянскай вайной, Манэргейм ставіўся вельмі рэзка. Так, калі ўрад дазволіў прафсаюзам прайсці з чырвонымі сцягамі на пахаванні аднаго прафсаюзнага дзеяча, Манэргейм адмяніў дазвол і забараніў несці чырвоныя сцягі.

Сваіх сяброў і памочнікаў ён не забываў. У снежні 1918 года ён запрасіў Гёсту Тэслёфа на пост начальніка Генеральнага штаба і паслаў яму скрынку гаванскіх цыгараў. Аднак гэта не спрацавала. У студзені 1919 года ён прапанаваў Тэслёфу пасаду камандзіра дывізіі. У тым жа лісце Манэргейм прасіў Тэслёфа прывезці яму са Швецыі заказаную форму, пару штаноў навыпуск і 60 бутэлек шапманскага. Апроч таго, ён папрасіў купіць шапку з белага футра з жоўтым рамянём . Усе выдаткі Манэргейм браў на сябе. А ў знак падзякі прасіў, каб пані Тэслёф выбрала сабе на свой густ багата аздобленыя завушніцы. Спачатку Тэслёф адмовіўся, але потым стаў такі камандзірам дывізіі. Манэргейм смела прызначаў сваіх выпрабаваных паплечнікаў на адказныя пасты. Толькі шведскім афіцэрам давялося адмовіць, бо, на думку Манэргейма, фінскія афіцэры адчулі б сябе абражанымі. Ён не быў помслівым чалавекам. Так, генерал Карл Энкель быў начальнікам кадэцкага корпуса і вытурыў Манэргейма адтуль за дрэнныя паводзіны. Але ягоныя дзеці займалі высокія дзяржаўныя і ваенныя пасады пры Манэргейме. Рэваншам было тое, што Энкель-бацька быў вымушаны вітаць Манэргейма пры наведанні ім кадэцкага корпуса і залічыць кадэтам нумар адзін.

Што да сістэмы абароны, то Манэргейм прапанаваў пакарочаны тэрмін абавязковай ваеннай службы, змяншэнне ваенных выдаткаў і ўмацаванне шуцкора. Прапановаў, падобных дзвюм першым, не вылучаў ніводзін вайсковец у свеце. Гэта паказвае, якім



Манэргейм быў гнуткім і як добра ўмеў дзейнічаць, прыстасоўваючыся да становішча. Яго стаўленне да той ці іншай справы вызначалася практычнасцю і патрэбай. У дадзеным выпадку патрэба была палітычная.

Апорным пунктам сваёй знешнепалітычнай дзейнасці Манэргейм вырашыў зрабіць Капенгаген, і туды ж нанёс свой першы дзяржаўны візіт у якасці рэгента. Вяртаючыся дадому пасля параможнага вояжу па заходніх сталіцах, Манэргейм пазнаёміўся з будучым міністрам замежных справаў Даніі і прынцам Аксэлем, кандыдатуру якога на каралеўскі трон у Фінляндыі ён падтрымліваў. Манэргейм увогуле быў манархістам, а зусім не рэспубліканцам. Паасківі таксама не верыў у рэспубліку, але падтрымаў кандыдатуру нямецкага прынца. Манэргейм лічыў гэта грубай палітычнай памылкай і, як выявілася пазней, меў рацыю. Кандыдатура шведскага прынца нават не абмяркоўвалася. Такімі вострымі былі адносіны паміж дзвюма краінамі.

Завязваючы цесныя стасункі з Даніяй і Нарвегіяй, Манэргейм хацеў паказаць, што Фінляндыя вядзе палітыку, незалежную ад Швецыі.

Падчас візіту ў Швецыю яго ўзнагародзілі найвышэйшымі шведскімі ордэнамі, хоць адначасова былі і варожа настроеныя дэманстрацыі сацыял-дэмакратаў. А ў Нарвегіі рабочыя пагражалі адключыць электрычнасць ад каралеўскага палаца. Была нават небяспека замаху на яго жыццё. І візіт у Нарвегію адмянілі, спаслаўшыся на хваробу Манэргейма. Зрэшты, ён сапраўды моцна прастудзіўся ў Швецыі.

Пасля вяртання на радзіму паміж парламентам і Манэргеймам разгарэлася барацьба за права фармаваць урад. Манэргейм увогуле лічыў, што ў руках кіраўніка дзяржавы павінна быць болей улады. Супраць гэтага вступалі розныя палітычныя партыі ад сацыял-дэмакратаў да аграрыяў.

Але па іроніі лёсу гэтыя ўладныя паўнамоцтвы Манэргейм атрымаў толькі ў 1944 годзе, прычым пры аднадушнай падтрымцы ўсімі партыямі.

На думку белых рускіх эмігрантаў, Манэргейм быў двурушнікам: з аднаго боку, ён выступаў як сябар Расеі, а з другога – цвёрда адстойваў інтарэсы Фінляндыі.

Амаль усе белыя генералы ў Расеі былі старымі знаёмымі Манэргейма. Цяпер яны адзін за адным і ўсе разам выступалі са зброяй у руках супраць ленінскага ўрада. Кіраўнік Украіны, белы генерал гетман Скарападскі служыў з Манэргеймам у кавалергардах. Кіраўнік казацкага паўстання генерал Каледзін быў папярэднікам Манэргейма на пасту камандзіра 12-ай дывізіі. Генерал Красноў змяніў Манэргейма на гэтай пасадзе, калі той стаў камандзірам корпуса. З Дзянікіным Манэргейм сустракаўся ў 1916 годзе на фронце, калі яны камандавалі суседнімі дывізіямі.

Цяпер заходнія дзяржавы захацелі звергнуць ленінскі ўрад. Манэргейм, у якасці цаны за ўдзел Фінляндыі ў гэтым прадпрыемстве, выставіў свае ўмовы. Ён выклаў іх камандуючаму англійскай флатыліяй у Балтыйскім моры. Балтыйскае мора павінна стаць нейтральным, іначай кажучы, там не павінна быць ніякіх ваенных флатоў, ва Усходняй Карэліі павінен быць арганізаваны плебісцыт, каб высветліць, жадае яе насельніцтва далучыцца да Фінляндыі ці не. Заходнія саюзнікі мусяць перадаць у распараджэнне фінаў самалёты, танкі і пазыку ў дзесяць мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Апроч таго, саюзнікі павінны пасля захопу Пецярбурга забяспечыць рэгіён прадуктамі харчавання. Манэргейм сам хацеў даставіць карабель са збожжам у Пецярбург.

Аднак задачай англійскага генерала было не дапусціць фінскага наступу на Пецярбург. Англія была гатовая ўжыць нават эканамічныя санкцыі супраць фінаў, каб толькі не пакрыўдзіць белых рускіх генералаў. А Манэргейм ужо не быў адным з іх. Цяпер ён стаяў на чале фінскай дзяржавы. Калі англійскі флот абараняў улетку фінскае ўзбярэжжа, у яго была і другая задача – стрымліваць Фінляндыю і аказваць на яе пэўны ціск.

У адрозненне ад лета 1918 года Манэргейм ужо быў не адзіны, хто мог паспрабаваць вызваліць Пецярбург. Цяпер вызваліцеляў было столькі, што ў іхніх шэрагах нават узнікла цісканіна. Англія, Францыя і Японія таксама бралі ўдзел у прадпрыемстве.

На думку англійскага адмірала, Манэргейм быў самым раскошным чужаземцам, якога ён сустракаў, – высокі, дазвання элегантны, выдатна апрануты.

Англійскія тарпедныя кацеры атакавалі Кранштадт з базы Койвіста і патапілі рускія ваенныя караблі. Але Англія не хацела ваеннай дапамогі ад Фінляндыі, дый не мела ў ёй патрэбы. Яна баялася, што ў Фінляндыі разгуляецца апетыт. Выгнаць з Пецярбурга эстонцаў пасля яго захопу было б значна лягчэй, чым фінаў.



З красавіка 1919 года Юдзеніч, гэты белы барацьбіт з бальшавікамі, павёў наступленне на Пецярбург з Эстоніі. Ён папрасіў дапамогі ў Фінляндыі, паабяцаўшы ёй Усходнюю Карэлію, апроч Мурманска з чыгункай. Гэтую тэрыторыю Фінляндыя атрымала б толькі пасля пабудовы чыгункі на Архангельск. Такім чынам, ужо тады пачыналі весціся размовы пра гэтую важную чыгуначную каляю, пра якую фіны даведаліся толькі ў 1941 годзе. Юдзеніч паабяцаў аддаць Фінляндыі і Петсама, порт на Ледавітым акіяне. А Фінляндыя абавязвалася не прапускаць праз сваю тэрыторыю войскі, якія мелі на мэце напад на Расею. Так накідвалася Дамова аб дружбе і супрацоўніцтве, падпісаная толькі ў 1948 годзе. Усе гэтыя чыннікі адыгралі важную ролю ў развіцці адносінаў паміж Фінляндыяй і Расеяй. Манэргейму давялося доўга і грунтоўна займацца гэтымі праблемамі. З геаграфіяй нічога не зробіш – так спрошчана выказваўся наконт дачыненняў паміж дзвюма краінамі Паасіківі, цытуючы Сталіна.

## Законны дзяржаўны пераварот

1 ліпеня 1919 года Сантэры Алкіа, сапраўдны народны трыбун, нервуючыся, заявіў, што Манэргейм і Юдзеніч, здаецца, заключылі ваенны саюз. Ён быў упэўнены, што Манэргейм намерваецца захапіць уладу ў Фінляндыі перад прэзідэнцкімі выбарамі. Міністр Вальдэн абверг гэтую заяву і прыгразіў пайсці ў адстаўку, калі яму не павераць. На праўдзе ж дзяржаўны пераварот, які меўся адбыцца на аснове старой канстытуцыі, пачалі рыхтаваць яшчэ тыдзень таму. Манэргейм хацеў вызваліць Пецярбург і ўсю Расею.

Англійскі адмірал успамінае, як раз'юшыўся Манэргейм, калі зразумеў, што Фінляндыю імкнуцца адсунуць убок і зусім адхіліць ад запланаванага паходу на Пецярбург.

Прадстаўнік рускага белага руху ў раёне Ледавітага акіяна генерал-лейтэнант Марушэўскі прыехаў у Хельсінкі на пачатку чэрвеня 1919 года. Ён сцвярджае, што Манэргейм прагнуў прыняць удзел у паходзе. У Манэргейма было 7 дывізіяў, і яшчэ 100000 ча-

лавек можна было мабілізаваць за дзесяць дзён. Ён збіраўся наступаць не на Пецярбург, а прайсці міма – да берагоў Волхава. У горад планавалася ўвесці толькі ўзмоцнены паліцэйскі атрад у некалькі тысячаў чалавек для навядзення парадку. Потым, пры першым жа зручным выпадку, Пецярбург меркавалася перадаць Юдзенічу. У якасці кампенсацыі Фінляндыя атрымала б тое, пра што Манэргейм шмат разоў казаў рускім.

9 чэрвеня 1919 года ён сказаў Г.А. Грыпенбергу, што лепш за ўсё было б пачаць мабілізацыю ўжо заўтра.

Англічане меркавалі, што Манэргейм спяшаўся таму, што набліжаліся прэзідэнцкія выбары, на якіх ён пацярпеў бы паразу. Час падціскаў.

Адмірал Калчак, які наступаў на Маскву з Сібіры, пераслаў праз англічан дзве просьбы Манэргейму. Ён заклікаў Манэргейма наступаць на Пецярбург, але пры ўмове, што з ім будуць і рускія войскі. Кіраўніцтва горадам павінна быць перададзена войскам Юдзеніча. 10 ліпеня Манэргейм адказаў, што спачатку трэба прыняць умовы, пастаўленыя Фінляндыяй.

Тым самым днём, 10 ліпеня, сабраўся з’езд егераў. Яны горача падтрымалі ідэю наступу на Пецярбург. Рэй вёў Кай Донэр, які разам са сваімі прыхільнікамі лічыў, што ў Фінляндыі маюцца падставы для наступлення. Пасада кіраўніка дзяржавы мусіць стаць пастаяннай, а паўнамоцтвы Манэргейма павінны быць пашыраныя.

Артур Вірккунен запрасіў свайго таварыша па Кааліцыйнай партыі Лаўры Інгмана ў Хельсінкі. Падрыхтоўка аперацыі пачалася. Егерскія актывісты прапанавалі Манэргейму зацвердзіць форму кіраўніцтва дзяржавай, распусціць парламент, прызначыць новыя выбары, абвясціць вайну і пачаць наступленне на Пецярбург. Кааліцыйная партыя створыць новы ўрад. Усёй гэтай дзейнасцю павінны былі кіраваць Хуга Суолахці і Эрнст Неванлінна. Але іх, здаецца, напалохалі такія рашучыя выступленні. Неванлінна адмовіўся ад удзелу ў аперацыі, а Суолахці паводзіў сябе няпэўна і ўнікліва.

Лаўры Інгман, палітык, а пазней арцыбіскуп, растлумачыў Манэргейму, што зацвердзіўшы новую канстытуцыю, той атрымае толькі ўладу прэзідэнта і страціць права абвяшчаць вайну, як гэта было ўказана ў старой канстытуцыі, зацверджанай яшчэ каралём Густавам III.



Манэргейм нерваваўся, таму што яму не ўдалося сабраць кіраўнікоў Кааліцыйнай партыі ў Хельсінках, каб абмеркаваць сітуацыю. Калі ж Артур Вірккунен і Харальд Окерман усё ж прыйшлі да яго, ён адлаяў іх за тое, што яны толькі марнуюць час і і нічога не робяць. «Вось пабачыце, з вас тут здзяруць скуру. А я выкручуся», – сказаў Манэргейм, маючы на ўвазе, што бальшавікі завалодаюць Фінляндыяй і пакончаць з усімі.

Манэргейм загадаў адшукаць Інгмана. Неванлінну паслалі тэлеграму. Спешна шукалі паўсюль і іншых кіраўнікоў Кааліцыйнай партыі. На дачы ў Інгмана спачатку пайшлі скупануцца, потым папілі кавы і толькі тады рушылі да Хельсінкаў. Шлях у 60 кіламетраў па тагачасных дарогах заняў дзве гадзіны і дзве хвіліны.

Нарэшце а пятнаццатай гадзіне на кватэры ў Артура Вірккунена сабраліся галоўныя змоўцы.

Інгман сказаў, што роспуск парламента не будзе мець народнай падтрымкі. Калі ж Манэргейм зацвердзіць новую канстытутцыю, а потым пажадае скарыстаць старую, каб на яе падставе сваёй уладаю рэгента абвясціць вайну, дык гэта будзе выглядаць даволі дзіўна. Словам, з вайной, калі яе пачаць толькі з падтрымкай Кааліцыйнай партыі і некаторых шведскіх аб’яднанняў Фінляндыі і не браць пад увагу супраціўленне Аграрнай і Прагрэсіўнай партыяў, нічога не атрымаецца.

Эйна Суолахці, Сэталя і Вірккунен падтрымалі Манэргейма. Хольма вагаўся і не выказаў ніякай думкі.

Калі а дзевятай гадзіне вечара звязаліся з Манэргеймам, той рашуча выказаўся за гэты план. Вызвольная вайна яшчэ не скончаная. Яе канец ляжыць за Пецярбургам. Калі так не будзе, дык шаноўным спадарам давядзецца скласці галовы на эшафоце.

Сэталя спытаў, ці рэальна гэта – ўзяць Пецярбург. Манэргейм адказаў, што ўпэўнены ў гэтым, а іначай і не ўзяўся б за справу.

Інгман выступіў супраць. Ён лічыў, што стварыць кааліцыйны ўрад не ўдасца. Тады вырашылі пачакаць да заўтра. Трэба было зрабіць яшчэ адну спробу сабраць большую колькасць лідэраў Кааліцыйнай партыі.

Наступным раннем з’явіўся Неванлінна. Удалося звязацца і з Паасіківі, які таксама прыйшоў на кватэру да Вірккунена. Прыйшлі Сэталя, Інгман і Хольма, а Эйна Суолахці гэты раз адправіўся на летнік. Неванлінна і Паасіківі рашуча падтрымалі Інгмана. Паасіківі заявіў, што дэмакратычныя краіны не падтрымаюць Фінляндыю. Апроч таго, паход на Пецярбург запатрабуе столькі грошай, што без згоды парламента на субсідыю такая задума проста станецца нерэальнаю. Тым не менш, Сэталя і Вірккунен зноў падтрымалі Манэргейма, а Хольма зноў вагаўся і сумняваўся. А чатырнаццатай гадзіне Інгман і Вірккунен адправіліся да Манэргейма, каб паведаміць яму пра адмоўны вынік нарады. «Добра, тады я праз дзве гадзіны пайду зацвярджаць новую форму дзяржаўнага кіравання. Салдату ў палітыцы без падтрымкі палітычнай партыі няма рабіць чаго». На развітанне Манэргейм сказаў, што заўтра паедзе на курорт Рунне падлячыць свой рэўматызм, і быў у лагодным настроі, нібыта скінуў з плячэй вялізны цяжар.

Манэргейм патрабаваў, каб прэзідэнт валодаў правам вета і абіраўся на асобных выбарах, а не парламентам. Гэта было занесена ў пратакол пасяджэння ўрада. Іронія лёсу была ў тым, што менавіта парламент абраў Манэргейма прэзідэнтам у 1944 годзе. Манэргейм настойваў на ўнясенні ў канстытуцыю пункта, які не дазваляў бы парламенту пераважнаю большасцю адпраўляць прэзідэнта ў адстаўку. Зацверджанне новай формы праўлення было абвешчана неадкладнаю справай і, нягледзячы на Манэргеймаў пратэст, парламент яе зацвердзіў. Але і пасля гэтага Манэргейма працягвалі падбухторваць. Яго ўгаворвалі не зацвярджаць новую канстытуцыю і самавольна падоўжыць тэрмін свайго рэгенцтва. Аграрый Кюёсці Калліа прапанаваў кандыдатуру Манэргейма на пост прэзідэнта з тэрмінам тры гады. Аднак частка аграрарыяў не жадала Манэргейма і вылучыла кандыдатуру кіраўніка і тэарэтыка партыі Алкіа. Будучыя прэзідэнты Калліа і Рэландэр ужо тады думалі пра наступныя прэзідэнцкія выбары і падтрымалі Стольберга. Сацыял-дэмакраты свайго кандыдата не вылучалі, таму што баяліся расцягаць галасы, што пайшло б на карысць Манэргейму. Яшчэ два будучыя прэзідэнты – Свінхувуд і Паасіківі – падтрымлівалі Манэргейма. Газэты супернікаў распачалі супраць Манэргейма кампанію. Алкіа патрабаваў, каб прэзідэнтам стаў сапраўдны фін, маючы на ўвазе, што Манэргейм не гаворыць пафінску.



А той на курорце паводзіў сябе так, нібыта нічога не адбывалася, і ніякім чынам не ўмешваўся ў ход падзеяў. Ён навучыўся пісаць сучасным спосабам, трымаючы ручку паміж указальным і сярэднім пальцамі, што давала апору ягонай рэўматычнай руцэ. У адным лісце да сястры Соф’і ён пісаў пра сваё лячэнне. Ваду здароўя там п’юць, стоячы на калодзе, адначасова гайдаючы яе агульнымі намаганнямі, каб вада ў арганізме плёскалася ўверх і ўніз, абмываючы ўсё нутро. І пры гэтым яны яшчэ спяваюць народныя песні. Гразевыя ванны бяруць, пагрузіўшыся ў паганы карычневы глей, у складзе якога ёсць радон, пасля чаго ўвесь гэты бруд змываюць пад душам. Манэргейм тут з усімі вітаецца і адчувае сябе ці то гаспадаром, ці то мэтрдатэлем. Лячэбная гімнастыка таксама дае вельмі добры эфект.

Манэргейм прабыў у Рунне тры тыдні. Вяртанне ў Хельсінкі стала трыумфальным шэсцем, нягледзячы на тое (ці дзякуючы таму), што прэзідэнцкія выбары з вялізнаю перавагай выйграў Стольберг.

Стольберг прапанаваў Манэргейму пост галоўнакамандуючага, але, калі той пачаў ставіць свае ўмовы, прэзідэнт палічыў гэта за адмову. А Манэргейм патрабаваў гарантыяў і хацеў ведаць, якую палітыку намерваюцца праводзіць урад і прэзідэнт. Тады Стольберг прапанаваў Манэргейму стаць паслом у Парыжы, але той адмовіўся.

Манэргейм хацеў ведаць, як урад ставіцца да захопленых чырвонагвардзейцаў, якую палітыку будзе праводзіць у дачыненні да Расеі і бальшавікоў. Ён казаў, што не адмаўляўся ад паста галоўнакамандуючага, а хацеў толькі гарантыяў, што зможа пасьпяхова працаваць на карысць арміі. Ад новага ўрада на чале з прэм’ерам Венналам ён чакаў цвёрдых гарантыяў таго, што ўрад не пачне скочвацца ўлева. У армію трэба вярнуць кантроль тайнай паліцыі. А сам ён павінен быць адначасова галоўнакамандуючым арміі і шуцкора і самастойна запаўняць афіцэрскія вакансіі без умяшальніцтва ўрада і прэзідэнта. Галоўнакамандуючы павінен падпарадкоўвацца прэзідэнту, а не ўраду, і разам з прэзідэнтам выбіраць ваеннага міністра. Манэргейм патрабаваў права абвяшчаць

ваеннае становішча. Толькі прэзідэнт сваёй уладай можа змяняць галоўнакамандуючага. І трэба рыхтавацца да паходу на Пецярбург. І толькі галоўнакамандуючы разам з ваенным міністрам вызначаюць ход вайны і правядзення вайсковых аперацыяў.

У ваеннага міністра Вальдэна наконт тайнай або дзяржаўнай і палітычнай паліцыі, наконт сферы яе дзейнасці і становішча была свая, зусім іншая думка. У Вальдэна быў незалежны характар, і ён не баяўся апынуцца ў цэню Манэргейма. Сваёй ўладай ваенны міністр аддзяліў дзяржаўную тайную паліцыю ад арміі. Манэргейм жа хацеў вярнуць паліцыю ў склад арміі, каб магчы распараджацца і ёю.

30 жніўня Манэргейм упэўніўся, што ягоныя ўмовы не будуць прынятыя, а таму і не заступіў на пасаду галоўнакамандуючага. Эрнст Ліндэр і Гёста Тэслёф звольніліся з арміі. Ігнацыус падаў у адстаўку з паста начальніка Генеральнага штаба. Некаторыя шведскамоўныя афіцэры пачалі старанна вывучаць фінскую мову.

Пакуль Манэргейм адпачываў у Рунне, кіраўніком дзяржавы быў прэм’ер-міністр. Урад заключыў дамову з англічанамі, згодна з якой былыя чырвонагвардзейцы, якія служылі пад камандаваннем англічан у так званым Мурманскім легіёне, маглі вярнуцца ў Фінляндыю і аўтаматычна атрымаць амністыю. Манэргейм, даведаўшыся пра гэта вельмі разазлаваўся. Ён сцвярджаў, што такая дамова не мае законнай сілы, бо гэта ўжо сфера знешняй палітыкі і адносіцца да ведама рэгента. І праўда, нават па новым законе аб форме дзяржаўнага праўлення гэта безумоўна ўваходзіла ў кампетэнцыю рэгента. Манэргейм выступаў супраць усеагульнай амністыі. На ягоную думку, справа кожнага палоннага мусіла разглядацца асобна.

15 верасня 1919 года ён зачытаў перад кіраўнікамі Кааліцыйнай партыі заяву, а фактычна свой палітычны запавет. Барацьба паміж двума светапоглядамі ідзе не на жыццё, а на смерць. Перамога бальшавікоў будзе азначаць, што ўсе, хто сёння вагаецца ў нерашучасці, капаюць сабе магілу ў будучым. Усе грамадзяне павінны аб’яднацца ў агульную партыю.

Неверагодным здаецца выпадак, пра які Манэргейм расказаў генералу Туомпа 16 мая 1943 года. Гэта адбылося ў гадавіну перамогі 1918 года. Манэргейм і міністр юстыцыі Сёдэрхольм інспектавалі лагер чырвоных ваеннапалонных у Таммісаары. Закончыўшы інспекцыю, Манэргейм загадаў начальніку лагера і ахове пакінуць яго сам-насам з вязнямі. Капітан запярэчыў, што не можа пакінуць рэгента без аховы. «Марш! Выковайце загад!» – скамандаваў Манэргейм. Ён загадаў зачыніць дзверы і пачаў гутарыць з палоннымі чырвонагвардзейцамі. Гутарка праходзіла вельмі цяжка, бо Манэргейм дрэнна ведаў фінскую мову. Падчас абеду ён сеў за стол з вязнямі і з’еў порцыю, у якой кішэлі жукі і вялікія мошкі. Міністр юстыцыі пакаштаваць гэтую страву адмовіўся.

Наконт усякай брыды і гадасці Манэргейм меў багаты досвед, якім ён асабліва ўзбагаціўся падчас падарожжа па Азіі. Там яму даводзілася бачыць рэчы і нашмат болей брыдкія, чым абед вязняў. Манэргейм быў смелым чалавекам, але адначасова добрасумленным, прыдзірлівым і нават педантычным. Інспектуючы лагер, ён нічога не пакінуў без увагі, а потым выслухаў скаргі вязняў без прысутнасці аховы і начальніка лагера. Такі спосаб разгляду скаргаў добра вядомы ў арміі.

З дзяцінства Манэргейм хацеў быць мужным і бясстрашным чалавекам. Яшчэ маленькім хлопчыкам ён сцвярджаў, што не баіцца нічога.

У кастрычніку 1919 года Юдзеніч са сваёй белай арміяй зноў атакаваў Пецярбург, але няўдала. Тады Манэргейм напісаў прэзідэнту Стольбергу адкрыты ліст, які перадаў для публікацыі ў газэтах. Белых рускіх трэба неадкладна падтрымаць. Фіны павінны прыняць удзел у наступленні ці дапамагчы нейкім іншым чынам, пасля чаго будзе магчыма патрабаваць ад рускіх прызнання незалежнасці.

Манэргейм у гэты час быў у Парыжы, і тамтэйшы аптымістычны настрой перадаўся і яму. Генерал быў чалавекам тонкай натуры і часта трапляў пад уплыў навакольнага асяроддзя. Лаўры Інгман паведаміў яму, што прадстаўнікі Англіі і Францыі, акрэдытаваныя ў Фінляндыі, зусім інакш абмалёўваюць становішча на Пецярбургскім кірунку. Манэргейм адказаў, што тыя спадары, знаходзячыся ў Фінляндыі, павінны быць вельмі асцярожнымі, каб не надаваць ад імя сваіх дзяржаваў залішніх абяцанкаў і не набраць непатрэбных абавязкаў.

5 кастрычніка 1919 года Манэргейм пісаў сваёй сястры Соф’і,

што па дарозе ў Парыж яму крычалі «ўра» ў Хельсінках, сустрэлі свістам у Стакгольме, а ў Капенгагене нарэшце пакінулі ў спакоі. Калі ён прыехаў у Лондан, там якраз пачалася забастоўка чыгуначнікаў. Над рабочымі цягнікамі луналі чырвоныя сцягі і гучала маршавая музыка. Усё гэта нагадвала рэвалюцыю. Нешта падобнае Манэргейм назіраў у Расеі і Фінляндыі ў 1917 годзе і нават раней – пасля вайны з Японіяй. Гэтая забастоўка, на яго думку, была самай сур'ёзнаю бітвай паміж краінамі-пераможцамі і Масквой, але ён з палёгкай адзначыў, што англійскі ўрад быў напагатове.

Вельмі небяспечным у характары Манэргейма было тое, што рэвалюцыйныя падзеі і эпізоды настолькі глыбока адбіліся ў ягонай свядомасці, што ён страціў здольнасць адрозніваць адценні і нюансы.

Ліст Манэргейма да прэзідэнта Стольберга апублікавалі ў фінскіх газэтах 2 лістапада 1919 года. Успрыняты ён быў скептычна. Алкіа лічыў, што чым больш хаосу будзе ў Расеі, тым лепш для Фінляндыі. А вось калі там будзе ўсталяваны парадак і адноўлена былая ўлада, Фінляндыі ад гэтага не будзе ніякай карысці.

4 і 12 снежня Манэргейм сустракаўся ў Варшаве з другім выбітным чалавекам, польскім маршалам Пілсудзкім, і абмяркоўваў з ім план нападу на Расею ўвесну 1920 года. Калі Манэргейм ад'язджаў на цягніку з Варшавы ў Парыж, праводзіць яго прыйшоў славуты піяніст Падэрэўскі.

У Лондане Манэргейм спрабаваў дамовіцца аб паходзе аб'яднаных арміяў на Расею. Ён звязаўся з Чэрчылем. Калі наступленне генерала Дзянікіна з поўдня Расеі не ўдасца, тады настане чарга Польшчы і Фінляндыі. Бальшавікі абавязкова перанясуць ваенныя дзеянні на іхнія тэрыторыі.

Думка пра захоп Пецярбурга ўвесь час валодала Манэргеймам, незалежна ад ягонага афіцыйнага ці прыватнага статусу. Гэта была вялікая задача ягонага жыцця. Выканаўшы гэтую задачу, ён адыграў бы сусветна-гістарычную ролю. Але яму не пашанцавала, як і нікому другому.

Калі Манэргейм вярнуўся з Расеі ў Фінляндыю, яго мала хто ведаў. Ён быў вялікі Невядомы і мог стаць кім заўгодна, таму што выявы мінулага не стаялі за плячыма яго новага аблічча, якое толькі пачынала зараджацца. Ягонае імя гучала зусім па-фінску, здавалася адвечна фінскім. Камандуючага чырвоных звалі Манер, а белых – Манэргейм. Шмат хто нават успрымаў гэта як Mannerheimo – кантынентальнае племя. Гэта, безумоўна, адыграла сваю ролю. Французскія прозвішчы генералаў дэ ля Шапэль або Шарпанцье, якіх спачатку меркавалі назначыць камандуючымі белай арміяй, ніякім чынам не змаглі б так хутка засвоіцца народам і ўкараніцца ў яго свядомасці. Хоць Шарпанцье ведаў фінскую мову. Адкуль узяўся Манэргейм? Ён прыйшоў з сусветнай вайны, з Паўднёвага фронту Расеі і рэвалюцыйнага хаосу. Што азначала для яго тая рэвалюцыя? Чаму ён так зацята змагаўся супраць яе? І чаму ён – як і многія іншыя – не змог яе задушыць?

# VIII. ДЗЕСЯЦЬ ГОД У ЦЫВІЛЬНЫМ

## У Алжыры

У 1923 годзе Манэргейм зрабіў паездку ў Алжыр і Марока. У Швейцарыі ён набыў новы раскошны аўтамабіль «Мерсэдэс-Бенц», але ў фінляндыю яго не прывёз, бо там ужо было некалькі аўтамабіляў. Кіроўцам у Манэргейма быў наняты франкамоўны швейцарац Мішэль Гайяр, які праслужыў у Манэргейма з 1923 па 1927 год. Кіровец расказваў, што кожны вечар Манэргейм выклікаў яго да сябе і звяраў гадзіннікі, каб заўтра ён быў на месцы секунда ў секунду. У дарозе Манэргейм звяртаў увагу на самыя нязначныя збоі рухавіка. Кожны раз перад выездам кіровец павінен быў складаць дакладны расклад руху з указаннем адлегласці, разліковы час прыезду на месца і магчымыя аб’езды. Манэргейм меў звычку рабіць каментары наконт прыгажосці краявідаў, што праляталі міма, і распавядаць пра справы краіны, па якой яны ехалі. Пра Фінляндыю, яе армію і палітыку ён не выказваўся ніколі. За гэтыя чатыры гады ён толькі аднойчы закрануў ваенную тэму. Цэлы дзень яны былі ў дарозе і крыху спазніліся. Манэргейм выказаў свой папрок такім чынам: «А што вы зрабілі б, каб вам, як гэта даводзілася мне, трэба было арганізаваць перавозку тысяч людзей?»

Гайяр успамінае адзін забаўны выпадак з ліку тых, што звычайна здараюцца ў падарожжах. Аднойчы чэрвеньскім вечарам яны ехалі з Італіі ў Швейцарыю. Каля перавала Сімплон машыну спынілі швейцарскія мытнікі і сказалі, што праезд праз перавал будзе адкрыты толькі заўтра ўранні. Гэтае правіла ўвялі дзеля бяспекі падарожнікаў. Раззлаваны Манэргейм выйшаў з машыны і сказаў, што зараз патэлефануе ў Берн за адмысловым дазволам на праезд. Праз некалькі хвілін ён вярнуўся з будынку мытні і сказаў, што дазвол атрыманы. Толькі на перавале Манэргейм прызнаўся, што нікуды не тэлефанаваў і ніякага дазволу не атрымліваў, а проста падмануў мытнікаў. Але і тыя разгадалі гэтыя хітрыкі,



а таму на выездзе з перавалу іх спынілі, як след адлаялі і ў дадатак далі Манэргейму 50 швейцарскіх франкаў штрафу.

За мяжой у Манэргейма быў зусім іншы свет, іншае жыццё і такая свабода, пра якую ў Фінляндыі ён мог толькі марыць. На здымках, зробленых за мяжой, ён смяецца, крывіцца і грымасьнічае, ледзь не пускаецца ўпрысядкі. Пасля Зімовай вайны ён стаў славутасцю і за мяжой, а таму мусіў хаваць сваё прыватнае жыццё ад цікаўных вачэй.

У Алжыры Манэргейму прыйшло ў галаву павадзіць машыну. Паездка закончылася катастрофай. Пасля таго ён болей ніколі не садзіўся за руль. У час вайны ён казаў, што не вадзіў машыну некалькі дзесяткаў гадоў, а калі аднойчы ў цяжкай сітуацыі яму давялося зрабіць гэта, дык спроба закончылася няўдала.

У Алжыры машына, якой кіраваў Манэргейм, праскочыла праз прыдарожны вінаграднік і звалілася ў пяціметровую расколіну. Манэргейма выкінула з машыны. Ён ляжаў на зямлі і бачыў, як на яго валіцца вялізны, памерам з дом, аўтамабіль. У гэты момант ён падумаў, што тут яму і канец. Але яму зноў пашанцавала. Ён зламаў нагу, ключыцу і некалькі рэбраў. Чатыры гадзіны ён праляжаў пад дажджом на дне расколіны. Са страхам ён падумаў, што так давядзецца праляжаць усю ноч. Толькі з наступленнем цемры, пры святле ліхтароў, яго знайшлі, перавязалі і завезлі ў шпіталь. У дадатак ён схапіў запаленне лёгкіх і прахварэў два тыдні. Нага была на расцяжцы. Але Манэргейм адчуваў, што падвешаны груз недастатковы. Ён напісаў ліст дадому і падрабязна апісаў Рыхарду Фальтыну характар сваёй траўмы і спосаб лячэння. Фальтын адказаў, што груз недастатковы і яго трэба павялічыць. Манэргейм быў чалавекам тактоўным і не захацеў крыўдзіць лекара. Ён угаварыў медыцынскую сястру падвешваць яму на ноч большы груз, а днём здымаць яго.

У выніку пералому сцягна нага стала карацейшая на два сантыметры. А магчыма, яшчэ і ў выніку залішняй далікатнасці Манэргейма. Да скону ён мусіў хадзіць з падкладкай у чаравіку і прыкарочваць стрэмя з аднаго боку. Гэты дэфект можна было заўважыць толькі ў саўне, бо пры хадзе ён не кідаўся ў вочы. Тады і склалася канчаткова славутая хада Манэргейма − з лёгкім пагойдваннем і ледзь бачным прыседам, нібыта ён знарок сцішаў крокі.

## У Індыі

Азія па-ранейшаму вабіла Манэргейма. Але ў 20–30-ыя гады трапіць туды праз Расею было немагчыма. І ён накіраваўся на поўдзень ад тых раёнаў, якія раней даследаваў і добра ведаў, – ён паехаў у Індыю і Непал, дзе тады ўладарылі англічане.

Першае падарожжа ў Індыю Манэргейм зрабіў у 1927 годзе. На караблі ён дабраўся да Калькуты, адтуль па сушы – да Бірмы, дзе правёў 3–4 тыдні. Ён наведаў Рангун і сталіцу Сіккіма, якая размяшчалася па дарозе ў Тыбет. Потым на аўтамабілі і самалёце праз Басру і Багдад ён вярнуўся ў Каір, адкуль адправіўся на караблі ў Венецыю.

У канцы 1936 года Манэргейм другі раз паехаў у Індыю. Ён зноў падарожнічаў на караблі і прыбыў туды ў апошні дзень 1936 года, не ведаючы, што гэтым днём у далёкай Еўропе памёрла ягоная былая жонка.

Пазней Манэргейм з задавальненнем распавядаў пра сваё падарожжа ў Індыю, шмат пісаў пра яго ў сваіх успамінах і нават дазволіў апублікаваць шмат фотаздымкаў. Азія была добра вядомым яму кантынентам, і, здаецца, ён аднолькава ўтульна адчуваў сябе ў раскошных палацах індыйскіх князёў і ў юртах пастухоў Цэнтральнай Азіі.

Ён паспытаў спёку Чырвонага мора, пабачыў прамяністыя трапічныя зоркі, горад Адэн, куды прывозяць ваду для піцця, вялізны акіян, чыю спусцеласць парушалі толькі трохкутныя плаўнікі акулаў, якія суправаджалі параход, пабыў у Бамбеі, горадзе на цудоўным востраве, злучаным з мацерыком мастамі, у Лукноў, сталіцы Аб'яднаных правінцыяў, зведаў пякучую задуху індыйскіх вагонаў, дзе пыл прасочваўся ва ўсе шчыліны. У вагонах для простага люду цісканіна і гвалт былі яшчэ большыя, чым у Кітаі. Людзі лезлі нават праз вокны. Для пасажыраў першага класа ў вагонах быў душ. Страва ў вагоне-рэстаране была простая і аднастайная. У такой гарачыні мяса ды іншыя прадукты псаваліся імгненна. Падавалася толькі тое, што магло захоўвацца больш-менш доўга.

У джуглях ля падножжа гор на мяжы з Непалам Манэргейм хадзіў на паляванне з палкоўнікам Фаўнторпам. Ім прыслужвалі і гатавалі ежу два слугі з гатэля ў Лукноў. Палкоўнік і Манэргейм, апрануўшы вячэрнія гарнітуры, сядалі вячэраць за стол, накрыты пасярод джунгляў. Вечарамі яны заводзілі грамафон. Пятнаццаць вечароў запар яны слухалі тыя адзіныя дзве пласцінкі, што мелі з сабой. За гэты час яны не ўбачылі ніводнага тыгра. Але палкоўнік забаўляў госця тым, што распавядаў пра гэтых звяроў розныя цікавыя байкі.



У Дэлі Манэргейм сустрэўся з генералам Кірке, які ў 1924–1926 гадах дапамагаў арганізоўваць фінскую армію. Ён стаў аднoй з асноўных палітычных фігураў у Фінляндыі, своеасаблівым «шэрым кардыналам». Манэргейм падтрымліваў з ім сувязь на працягу дваццаці гадоў, да самай ягонай смерці. Кірке памёр годам раней за Манэргейма.

Кірке пазнаёміў Манэргейма з віцэ-каралём Індыі, галоўнакамандуючым ды іншымі высокапастаўленымі чыноўнікамі англійскай адміністрацыі ў Індыі. Генерал Скін выдаў Манэргейму дазвол на паляванне ў раёне Сэона, за 700 кіламетраў на поўдзень ад Дэлі. Манэргейм паехаў туды. Удзень ён хадзіў на паляванне, а ўвечары па яго прыязджаў аўтамабіль і адвозіў яго да акруговага начальніка. І тут, збіраючыся на позні абед, госці апраналіся ў вячэрнія гарнітуры і слухалі грамафонную музыку. Самай папулярнай мелодыяй быў вальс. Пад ягоныя гукі гаспадар і Манэргейм рабілі некалькі тураў з гаспадыняй, каб завязаць размову і, як пісаў Манэргейм, нагуляць апетыт.

Паляванне па-ранейшаму было няўдалым, але затое сацыяльны ўзровень знаёмстваў і раскоша ўзрасталі. Манэргейм быў джэнтльменам, упрыгожаннем любой кампаніі. Такі поспех не патрабаваў ад яго ніякіх намаганняў, а калі б ён стаў праяўляць актыўнасць у гэтым кірунку, дык яго палічылі б выскачкам. Да звычкі англійскіх джэнтэльменаў па-рабску трымацца саслоўных нормаў паводзінаў Манэргейм ставіўся з разуменнем, але і з доляй іроніі.

Сваю другую паездку ў Індыю Манэргейм, якога там ужо ведалі асабіста, зрабіў па запрашэнні пасла Вялікабрытаніі ў Непале, палкоўніка Бэйлі. За некалькі дзён да прыходу «Мультэна», карабля водазмяшчэннем 20 000 тонаў, у Бамбей Манэргейм атрымаў тэлеграму, у якой паведамлялася, што ён будзе ў Індыі госцем генерал-губернатара і запрашаецца на вайсковы парад, які адбудзецца ў дзень прыходу карабля. Генерал-губернатар і ягоная

жонка прынялі Манэргейма ў сваёй рэзідэнцыі непадалёк ад горада. Навокал бушавала мора кветак, а маляўнічасці гэтай карціне дадаваў бенгальскі ўлан, які стаяў на варце ў чырвоным мундзіры, белых ласінах і высокіх ботах са спражкамі. У руцэ вартавы трымаў піку са бандэркаю на вастрыі. Манэргейм прымаў парад разам з генерал-губернатарам у ягоным шатры. Калі генерал-губернатар павітаў батальён, што праходзіў міма, той пачаў страляць з вінтовак і паліў, пакуль не прагучаў сігнал адбою.

Двор генерал-губернатара жыў па строгім распарадку. Ад'ютанты былі загружаныя па самае горла, назіраючы за размаітымі дробнымі справамі. На думку Манэргейма, такое жыццё павінна было здавацца страшэнна аднастайным. Але ж у Фінляндыі ён таксама нагружаў ад'ютантаў, не даючы ім прадыху.

Падарожжа па чыгунцы да лагера палкоўніка Бэйлі заняло два дні. Азія – гэта бязмежны кантынент. Картаграфічныя праекцыі хлусяць, калі памяншаюць памеры краінаў па абодва бакі экватара і робяць іх па велічыні роўнымі Скандынавіі. Да паўднёвых аазісаў Сіньцзяна заставалася 700 кіламетраў, што, на думку Манэргейма, было мізэрнай адлегласцю. Гэтак сама блізка ад гэтых мясцінаў ён быў і падчас свайго першага падарожжа па Азіі.

Было б вельмі дзіўна, каб Манэргейм не ўпаляваў ніводнага тыгра. І ён такі ўпаляваў. Абложаны з усіх бакоў звер неўпрыкмет падабраўся да слана, на якім сядзеў Манэргейм, злева. А Манэргейм чакаў яго справа. І тут раптам тыгр скочыў. Шалёным скачком ён паспрабаваў выскачыць за агарожу. Першы стрэл Манэргейм спудлаваў, затое другім прабіў зверу лёгкае. Тыгр прабег метраў сорак і паваліўся на зямлю. Манэргейм не цярпеў манеры палявання палкоўніка Стывенсона, які вёў беглы агонь па траве, дзе хаваўся звер, хоць такім чынам палкоўнік упаляваў ужо двух тыграў. Манэргейм лічыў такі спосаб палявання брутальным і вульгарным.

Свайго другога тыгра Манэргейм падстрэліў пасля чатырохгадзінных спробаў акружыць звера. Трэба было спяшаццца, бо да наступлення цемры заставалася не болей за поўгадзіны. Напалоханыя сланы – аднаму з іх тыгр параніў хобат і галаву – не хацелі станавіцца ў круг. Манэргейм стаяў побач з кіраўніком палявання, палкоўнікам Бэйлі. Палкоўнік папрасіў Манэргейма ўвайсці



ў круг, але слон не падпарадкаваўся. І тут Манэргейм заўважыў у траве на адлегласці некалькіх дзесяткаў метраў белую палосачку тыгрыных зубоў. Манэргейм старанна прыцэліўся і стрэліў. Пачуўся страшэнны рык, але тыгр не нападаў. Манэргейм разглядзеў у бінокль жоўтую пляму на зямлі і стрэліў яшчэ раз. Звер быў мёртвы – куля трапіла яму не ў грудзі, як думаў Манэргейм, а ў спіну.

У Мадрасе Манэргейм гасцяваў у тамтэйшага генерал-губернатара лорда Эшлі ў ягонай летняй рэзідэнцыі, якая стаяла ў месцы з лепшым на свеце кліматам. Адтуль Манэргейм накіраваўся ў другі лагер Бэйлі, дзе сабралося шмат знатных гасцей. Быў там і адзін амерыканскі адвакат на прозвішча Сміт са сваёй пятнаццацігадовай дачкой, якая паказала сябе выдатным стралком, з аднаго стрэлу ўклаўшы вялізнага буйвала. Прысутнасць гэтай дзяўчыны, здаецца, некалькі ажывіла Манэргейма.

Разам з палкоўнікам Манэргейм пайшоў павітаць мясцовага князя, непальскага махараджу. Ён таксама выехаў на паляванне і стаяў непадалёку лагерам, у якім было больш за 200 сланоў і тысячу чалавек. Да лагера нават падвялі дарогу. З усіх бакоў ён быў абнесены сцяной з частаколу, а ў цэнтры на сваях стаяў дом махараджы. Побач з домам разбілі вялізны шацёр для прыёму гасцей. Махараджа ўпаляваў болей за 200 тыграў, прычым апошняга сёння ўранні. Ён хацеў даць Манэргейму магчымасць застрэліць тыгра-людаеда, які ўжо адчуў смак чалавечай крыві – на ягоным рахунку былі жыцці двух чалавек. Хоць яго ўжо некалькі разоў удавалася акружыць, але падстрэліць пакуль ніяк не выходзіла – ён пазбягаў усіх засадаў і ўцякаў жывы і здаровы. Наступныя некалькі дзён Манэргейм паляваў са сваёй групай, пакуль за ім не прыйшоў аўтамабіль махараджы, каб адвезці на месца, дзе аблажылі тыгра. Махараджа сам пільнаваў, каб звер не ўцёк.

Восемдзесят сланоў утварылі вакол тыгра кальцо. Пяцёра сланоў пачалі вытоптваць усё ўнутры аблогі. Тыгр нечакана напаў на іх, і сланы ўцяклі. Праз пэўны час яны зноў натрапілі на тыгра, але гэты раз ужо ён кінуўся ўпрочкі. Па тым, як гайдаецца высозная трава, Манэргейм мог сачыць за перамяшчэннем звера прыкладна за дваццаць метраў ад месца, дзе ён стаяў. Потым, адышоўшы на адлегласць метраў прыкладна пяцьдзесят, тыгр на кароткі

час паказаўся з травы, і Манэргейм стрэліў, але не пацэліў «пад позіркамі чатырохсот пар вачэй, з якіх 160, не самых дурных, належалі сланам», – пісаў ён пазней ва ўспамінах. Сланы зноў пачалі вытоптваць траву ўнутры аблогі. Праз дзве гадзіны Манэргейму здалося, што ён заўважыў тыгра зноў, і ён стрэліў. Мяркуючы па запаволеных рухах звера, гэты раз ён трапіў. Яшчэ праз паўгадзіны тыгр праімчаўся каля Манэргейма, але той паспеў стрэліць. Ён стрэліў яшчэ пару разоў, і трава перастала варушыцца. Паляўнічыя пад'ехалі бліжэй і ўбачылі, што тыгр ляжыць на зямлі. Махараджа папрасіў Манэргейма на ўсякі выпадак стрэліць яшчэ раз, што ён і зрабіў. Пасля таго звер болей не рухаўся.

Гэты тыгр даўжынёй тры метры дваццацьтры сантыметры аказаўся самым буйным з упаляваных тым годам тыграў у Непале. Махараджа запэўніваў, што з усіх падстрэленых ім тыграў толькі адзін быў усяго на цалю даўжэйшы, а ўсе астатнія былі меншыя.

Пазней Манэргейму пашчасціла здабыць яшчэ аднаго тыгра ў кампаніі палкоўніка Бэйлі. Манэргейм стрэліў толькі адзін раз, і куля трапіла звеpу ў сэрца.

Першы рэгент з роду непальскага махараджы дапамог англічанам задушыць крывавае індыйскае паўстанне. Каралева Вікторыя запрасіла яго ў Лондан. У Оперы каралева выказала шкадаванне, што госць не разумее словаў арыі, якую спявала славутая спявачка Адэліна Патці. Індыйскі князь адказаў: «Я не разумею і салаўіных песень». Гэты адказ Манэргейм палічыў такім годным, што напісаў пра яго ў сваіх мемуарах. На яго думку, адказ індыйца характарызуюць усходнія тактоўнасць і знаходлівасць. Манэргейм так прыхільна ставіўся да Азіі таму, што культура азіяцкіх народаў болей старажытная і вытанчаная, чым наша. 15-гадовая амерыканка, якая гэтак удала палявала на буйвалаў, была прадстаўніцай зусім іншага свету, які зусім не цікавіў Манэргейма. Але ён знайшоў некалькі словаў, каб згадаць і гэтую дзяўчыну.

Напрыканцы 30-х гадоў Манэргейм збіраўся ў Амерыку, каб папаляваць там разам са Смітамі, з якімі доўгі час перапісваўся. Яны збіраліся папаляваць на мядзведзяў. Ужо была складзеная падрабязныя праграма і расклад падарожжа. Але абвастрэнне палітычнага становішча ў Еўропе прывяло да вайны, і падарожжа ў Амерыку не адбылося. Манэргейм так ніколі туды і не трапіў.



Цікава, што мэтаю падарожжа была Аляска, г.зн. амаль тая ж Сібір ці Азія. Міжволі ўспамінаецца верш Кіплінга пра чары Азіі. Ён пісаў, што той, хто аднойчы пачуў кліч Усходу, застанецца ягоным палоннікам на ўсё жыццё.

Азія вельмі добра падыходзіла Манэргейму. Самае галоўнае там было не страціць аблічча, цвёрда трымацца старых звычак і правілаў паводзінаў, быць натуральна цырымонным і паважаць мясцовыя паводзінскія мадэлі. У сувязі з гэтым чалавек не павінен выстаўляць і падкрэсліваць сваю індывідуальнасць, не быць загадкавым. Манэргейм ніколі і не рабіў гэтага. Доказам чаму служыць той факт, што яго заўсёды ўспрымалі як архетып пэўнай чалавечай расы: барон з остзэйскіх немцаў, які ўдыхнуў паветра рускага імператарскага двара, а пасля сусветных войнаў – еўрапейскі арыстакрат з інтэрнацыянальнай арыентацыяй пачатку стагоддзя.

## Застолле

Пра акуратнасць, строгасць і імкненне Манэргейма да дасканаласці гаворыць адзін звычайны выпадак, апісаны адным яго сведкам. Але, па словах таго ж сведкі, ад гэтага выпадку кроў стыне ў жылах – так Манэргейм без ніводнага слова мог выказаць папрок і вымову. Аднойчы прыгожым летнім вечарам у маршала сабралося вузкае кола блізкіх яму людзей. Яны сядзелі на верандзе і курылі цыгары. Адзін госць выкінуў недакурак сваёй цыгары за парэнчы веранды. Манэргейм з безуважным выглядам падняўся з-за стала, спусціўся ўніз, двума пальцамі падняў недакурак, не спяшаючыся прынёс яго назад і паклаў у попельніцу на стале. Чэхаў сцвярджаў, што перакуліўшы кубак з кавай на абрус, ты яшчэ не паказваеш сваёй нявыхаванасці. Ты паказваеш яе, калі звернеш занадта ўвагі на гэты прыкры выпадак. Манэргейм у такіх выпадках не бываў занадта тактоўным – ён абавязкова павінен быў даць вінаватаму пстрычку. У гэтым выпадку ён без адзінага слова і жэста даў урок, які запомніўся на ўсё жыццё.

# IX. НАСУСТРАЧ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЕ

Манэргеймавы каментары да падзеяў на сусветнай палітычнай арэне ў сярэдзіне 30-х гадоў вызначаюцца сваёй выразнасцю. Калі Італія напала на Абісінію, ён сказаў, што Мусаліні хворы на манію велічы. І праўда, пасля акупацыі гэтай краіны Мусаліні абвясціў аб адраджэнні Рымскай імперыі. Савецкую армію Манэргейм лічыў сучаснай і эфектыўнай. Як раней, так і потым ён высока цаніў рускага салдата. Рускі салдат хутка навучаецца, імгненна разумее абставіны, дзейнічае рашуча, лёгка падпарадкоўваецца дысцыпліне, ён адважны і самаахвярны і гатовы біцца да апошняга набоя ў самым безнадзейным становішчы. Расею і рускіх нельга абражаць і бясконца выпрабоўваць іхняе цярпенне. Менавіта каб не раздражняць Савецкі Саюз, Манэргейм не паехаў на сусветны кангрэс Чырвонага Крыжа, які праходзіў у Японіі, бо адносіны паміж гэтымі краінамі былі ў той час вельмі напружаныя. Употай ад усяго свету ішла падрыхтоўка да вайны, якая і ўзгарэлася ўлетку 1939 года ў Манчжурыі – у тых самых мясцінах, дзе ваяваў Манэргейм. Яму было лягчэй, чым фінскім дзеячам ды іншым чужаземцам, ацаніць сур'ёзнасць ваенна-палітычнай сітуацыі.

Намецкі пасланнік у Фінляндыі фон Блюхер добра ведаў і заўсёды памятаў, што Манэргейм ніколі не ставіўся да Нямеччыны па-сяброўску. А Манэргейм і не спрабаваў хаваць сваю непрыязнасць. Яму, напэўна, падабалася знарок злаваць гэтага чалавека, чыя сухарэбрая постаць так яго раздражняла. Блюхер, хоць і быў кар'ерным дыпламатам і дваранінам, спачувальна ставіўся да ідэяў нацыянал-сацыялізму. Манэргейм проста ў вочы сказаў ягонай жонцы, што прычыны, якія Нямеччына нібыта мела для захопу Аўстрыі, – зусім не прычыны, а пустыя адгаворкі.

Манэргейм валодаў добра развітым уяўленнем. Яшчэ ў трыццатыя гады ён сур'ёзна гаварыў пра магчымасць пачатку вайны. Ён чытаў нябесныя знакі лепш за іншых кіраўнікоў Фінляндыі.



Яны лічылі Манэргеймавы страхі і перасцярогі прыкметамі старасці або тактычнымі хітрыкамі з мэтаю выбіць больш грошай на войскі. У 1935 годзе Манэргейм пісаў сваёй нявестцы Палаэмоне, што развіццё палітычных падзеяў асабліва трывожнае для маленькіх нацыяў, якія ў гульнях вялікіх дзяржаваў не маюць аніякага значэння і выкарыстоўваюцца ў якасці дробнай разменнай манеты. Аднак сапраўдная вялікая гульня пайшла толькі праз трычатыры гады, калі Нямеччына праглынула Аўстрыю і Чэхаславакію, а Італія – Албанію.

Увесну 1936 года англійскі ўрад запрасіў Манэргейма паведаць Англію, але абвастрэнне каменна-ныркавай хваробы прыкавала Манэргейма да ложка, і ён змог выправіцца ў падарожжа толькі ўвосень. Ён наведаў азёрны край – Паўночную Англію і Шатландыю.

Непахісны фармалізм англічанаў вельмі нерваваў Манэргейма. Спачатку ён адказваў перабольшанай педантычнасцю, а потым – раздражнёным рыкам. На афіцыйны абед, які даваў англійскі ўрад, ён павінен быў з'явіцца ў фраку. Але сярод ягоных узнагародаў і ганаровых знакаў адсутнічаў маленькі залаты медаль чырвонага Крыжа Фінляндыі. Манэргейм злосна сказаў ад'ютатнту, што без гэтай узнагароды ён не зможа прысутнічаць на абедзе. За два дні, што заставаліся да мерапрыемства, такі медаль знайсці было немагчыма. Тады ад'ютант паслаў тэлеграму знаёмаму ювеліру ў Хельсінкі, і той пераслаў медаль самалётам.

У паездцы Манэргейма суправаджаў стары знаёмец – генерал Кірке. Аднойчы вечарам яны паехалі на танкавыя вучэнні ў Солсберы. Там яны павінны былі заначаваць, а назаўтра вярнуцца на аўтамабілі ў Лондан. Перад ад'ездам Кірке паведаміў, што, калі ўжо яны едуць у мундзірах, дык ніякай вопраткі, апроч смокінгаў, з сабой браць не трэба. Манэргейм вельмі здзівіўся: навошта ім смокінгі. А палове восьмай яны прыехалі на месца, а вячэра была назначаная на восем гадзін. «Апранем смокінгі», – сказаў Кірке, і яны разышліся па пакоях, каб пераапрануцца. У рэстаране нікога не аказалася, бо вячэру замаўлялі толькі на трох спадароў вайскоўцаў. Яны хуценька паелі і зноў разышліся па пакоях, каб гэты раз змяніць смокінгі на мундзіры, пасля чаго адправіліся на баявыя вучэнні. Ідучы пераапранаца другі раз, Манэргейм не змог

стрымацца і сярдзіта сказаў ад'ютанту, што ўвогуле ён паважае і цэніць традыцыі і таму любіць англічанаў, але ў гэтым выпадку з традыцыямі яўна перабралі.

Сустракаўся Манэргейм і з Чэрчылем. Для англічаніна той падаўся Манэргейму занадта гаваркім. Манэргейм прымусіў яго паправіць адно месца ў гісторыі сусветнай вайны, якое тычылася Фінляндыі. У пазнейшых выданнях гэтай кнігі было напісана, што Фінляндыя дасягнула незалежнасці самастойна, без дапамогі і ўмяшальніцтва Нямеччыны.

Неба ў вачах Манэргейма стала чырвоным, калі Францыя і Савецкі Саюз заключылі дамову аб узаемнай абароне і ў Францыі быў створаны ўрад з удзелам Народнага фронту, у якім было шмат левых партыяў. На думку Манэргейма, сітуацыя ў Францыі пагражальна напамінала тую, што склалася ў Расеі ў 1917 годзе. І тое, што ў 1936 годзе Англія пачала завязваць адносіны з Савецкім Саюзам, Манэргейм лічыў цяжкай паразай.

За мяжой добра разумелі, што Манэргейм з'яўляецца ключавой палітычнай фігурай у Фінляндыі. Таму да яго ўвесь час прысватваліся як кіраўніцтва Англіі, так і кіраўніцтва Нямеччыны.

Мюнхенская канферэнцыя, якая пакінула Чэхаславакію на літасць Нямеччыны на пэўны час прыглушыла канфлікт, які непазбежна вёў да сусветнай вайны, хоць кіраўнікі заходніх дзяржаваў, здаецца, зусім гэтага не разумелі. Восень 1938 года была цяжкім выпрабаваннем для Манэргеймавых нерваў. Яго псіхіка апынулася пад такой моцнай імгненнай нагрузкай, што міжволі ў галаву прыходзіць параўнанне з пераходам за апошнюю грань і вяртаннем адтуль. Яго ахапіла паніка.

Аднойчы ў сераду, калі пасля вячэрняй нарады ў прэм'ер-міністра Каяндэра ўсе міністры разышліся па дамах, прыкладна каля поўначы пачуўся тэлефонны званок. Тэлефанаваў Манэргейм. Ён паведаміў, што а дзевятай гадзіне вечара руская эскадра ў складзе двух лінкораў, трох эскадраных мінаносцаў, дваццаці падводных лодак і двух транспартных караблёў прайшла каля выспы Гогланд у заходнім кірунку. Манэргейм прасіў у прэм'ера дазволу неадкладна выслаць з Турку на Аландскія выспы фінскія войскі. На ягоную думку, Аландская дамова давала Фінляндыі такое права. Каяндэр адказаў, што сам ён такі дазвол даць не



можа, трэба сабраць урад. Манэргейм сказаў, што цяпер якраз ёсць усе падставы зрабіць гэта. Апоўначы міністры былі ў зборы. Генерал Леннарт Оэш прадстаўляў Генеральны штаб. Міністры аднадушна вырашылі, што Аландская дамова такога права Фінляндыі не дае. Прэм'ер-міністр тут жа патэлефанаваў Манэргейму, паведаміў яму рашэнне ўрада і зачытаў адпаведныя артыкулы міжнароднай Аландскай дамовы, якія тычыліся гэтай справы. Манэргейм запярэчыў, сказаўшы, што гэтыя артыкулы даюць усе неабходныя падставы, каб неадкладна прыняць патрэбныя ваенныя захады для абароны Аландскіх выспаў. Урад зноў сабраўся на нараду. Урэшце быў знойдзены кампраміс: Манэргейму дазвалялася пасадзіць войскі на караблі і пайсці да Аландскіх выспаў, але высадку без дазволу ўрада рабіць было нельга. Манэргейм адказаў, што такім рашэннем ён цалкам задаволены.

Але ў Турку не аказалася патрэбных караблёў, а калі іх нарэшце знайшлі, дык грузіць войскі не сталі. Да архіпелага было пасланае толькі адно невялікае злучэнне. Міністры напачатку не ўспрынялі пагрозы ўсур'ёз і сцвярджалі, што рускія ваенныя караблі ўжо шмат разоў праходзілі каля Гогланда і нічога новага ў тым, што рускі флот ходзіць у міжнародных водах Фінскай затокі, няма.

19 красавіка 1939 года Манэргейм напісаў рэдактарам найбуйнейшых газэтаў ліст, у якім прасіў іх болей стрымана пісаць пра другія дзяржавы і не ўжываць на іх адрас абразлівых выразаў. Прэса павінна быць аб'ектыўнай і нейтральнай − гэтак сама, як з'яўляецца нейтральнай Фінляндыя. Апроч таго, у гэтым лісце − каб не прыцягваць увагі вялікіх дзяржаваў − прапаноўвалася не пісаць у газэтах пра новыя знаходкі радовішчаў карысных выкапняў, вялікія дзяржаўныя праграмы і фартыфікацыйныя работы.

Яшчэ Бісмарк казаў, што палітыкі павінны плаціць за тыя шыбы, якія паб'юць газэтчыкі. На думку журналістаў, фінскія кіраўнікі перабольшвалі значэнне прэсы ў грамадскім жыцці. Але Манэргейм, які ведаў практычна ўсе еўрапейскія мовы за выключэннем ісландскай і моваў Міжземнамор'я, чытаў замежныя газэты і лічыў, што вобраз дзяржавы і яе палітыкі ствараецца ў замежжы менавіта газэтамі, якія адлюстроўваюць рэаліі жыцця краіны і ўплываюць на яе дачыненні з іншымі краінамі.

Манэргейм не сказаў ніводнага добрага слова пра ўрад і

міністраў. У 1938 годзе ён пісаў аднаму прыяцелю, што падчас святкавання дня незалежнасці, якое адбывалася ў Нацыянальным тэатры, яму здавалася, што там проста паказваюць нейкі дрэнны спектакль.

Калі новым міністрам замежных справаў думалі назначыць прыхільна настроенага да англічанаў газэтнага караля, той сказаў свайму блізкаму сябру, што не возьмецца за гэтую справу, пакуль не скончыць будаўніцтва новай друкарні. «Што вы думаеце наконт гэтага? Няўжо ён сапраўды такі дурань?» − пытаецца Манэргейм у свайго карэспандэнта.

У лістах таго часу пастаянна адчуваецца горкі гумар. У сакавіку 1939 года ён пісаў да сястры Евы, што вельмі лёгка ператварыць еўрапейскія народы ў белых неграў і прымусіць іх служыць Трэцяму рэйху, а дакладней − Гітлеру. На думку Манэргейма, ніхто не заслугоўвае такой пагарды, як кіраўнік дзяржавы, які едзе ў Берлін і пасля начной гутаркі без адзінага стрэлу аддае ў падарунак махляру свой народ і сваю дзяржаву, першым слугою і прадстаўніком якой ён з'яўляецца.

«Яшчэ з першай сусветнай вайны я пагарджаў чэхамі. Яны прадалі Калчака за золата, якое цяпер апынулася ў Берліне». Але абурэнне ў Манэргейма выклікаў не лёс чэхаў. Яго абуралі гвалт і спосабы, якія пры гэтым ужываліся. Дзеянні і метады рускіх − гэта проста дзіцячыя гульні ў параўнанні з дзейнасцю Адольфа і ягонага вярхоўнага чэкіста Гімлера з памагатымі. Перад вачыма паўставала выява Рагнарока − сусветнага пажару са скандынаўскіх міфаў, адным словам, канца свету.

Чэхі прадалі іншыя малыя краіны, сваёй ганебнаю капітуляцыяй яны аслабілі іх становішча. Яны лёгка здаліся Нямечыне і тым самым падалі прыклад, спакусіцца якім у сваіх далейшых дзеяннях могуць як Нямеччына, так і іншыя вялікія дзяржавы. Сваёй нелаяльнасцю і здрадай чэхі зняславілі сябе. Манэргейм заўсёды найбольш жорстка асуджаў такія злачынствы, як здрада, незалежна ад таго, хто быў здраднікам − польскі ксёндз, чэшскі ваеннапалонны, генерал Крымаў ці фінскі чырвонагвардзеец.

У красавіку 1939 года Манэргейм напісаў сваёй дачцы Соф'і ў Парыж, што ў яго няма ніякіх грашовых запасаў за мяжой. Валюта маленькай краіны магла абваліцца ў любы момант. У 1918 годзе фінскія грошы за мяжой нават не прызнавалі за грошы. А цяпер настаў час, калі трэба быць гатовым да ўсяго, нават да самага горшага. Манэргейм прапанаваў дачцы пераехаць у Фінляндыю, дзе ён зможа забяспечваць яе. Маршал штомесяц пасылаў Соф'і грошы на яе патрэбы, але меркаваў, што з пачаткам вайны рабіць гэта стане немагчыма. Дачка была такой непрактычнай, што нават не падумала перабрацца ў Фінляндыю.



Калі даверлівы фінскі ўрад у лістападзе 1939 года заклікаў эвакуяваных у Заходнюю Фінляндыю і ў сельскую мясцовасць карэлаў і местачкоўцаў вярнуцца па дамах, Манэргейм, прадчуваючы вайну, пачаў энергічна пакаваць рэчы і вызваляць дом. На сцянах засталіся толькі пустыя рамы, а самі карціны вывезлі ў бяспечнае месца.

За тры дні да пачатку Зімовай вайны, практычна ў апошні момант, Манэргейм напісаў памятную зацемку пра асноўныя недахопы ў сферы абароны і абвясціў, што ідзе ў адстаўку. Перадача справаў павінна была адбыцца 28 і 29 лістапада. Але сітуацыя так абвастрылася, што на просьбу прэзідэнта і ўрада Манэргейм забраў сваё прашэнне аб адстаўцы назад.

Паехаць у Амерыку на запрашэнне знаёмых, разам з якімі ён паляваў у Індыі, не ўдалося − 30 лістапада 1939 года пачалася Зімовая вайна.

Але яшчэ ў 1938 годзе Манэргейм сказаў аднаму фінскаму генералу, што сусветная вайна пачалася з узбраеннем Нямеччыны.

# X. ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧЫ

## Зімовая вайна

Апошнім днём лістапада 1939 года Манэргейм снедаў з мужам сваёй пляменніцы. Калі яны ўжо заканчвалі сняданак, пачуліся гукі паветранай трывогі і нейкія выбухі. Тым не менш, яны выйшлі на вуліцу і няспешна накіраваліся на службу ў Міністэрства абароны, якое знаходзілася ў цэнтры горада. І тут у небе ўзнік варожы самалёт, які пачаў бамбаваць горад. Гэта сведчыла пра пачатак вайны. Манэргейм адразу спытаў у свайго спадарожніка, ці думаў той калі-небудзь, як яму належыць ісці побач з галоўнакамандуючым – наперадзе, збоку ці ззаду. Пачалася вайна, і Манэргейм аўтаматычна станавіўся галоўнакамандуючым. Дакумент аб гэтым быў напісаны і зацверджаны прэзідэнтам Свінхувудам на пачатку 30-х гадоў, але ўвесь час зберагаўся ў тайне. Манэргейм сказаў міністру: «Спадар міністр, я абвяшчаю, што пачынаю выконваць абавязкі галоўнакамандуючага, аб чым так доўга толькі гаварылі». Ён выглядаў бадзёрым і поўным аптымізму. Потым ён накіраваўся да прэзідэнта. Першы, даволі шматслоўны загад камандуючага напісаў яму ад'ютант. Манэргейм толькі як мог падкарацiў яго і зрабіў выразнейшым. Яго зачыталі наступным днём.

Толькі 3 снежня 1939 года Манэргейм накіраваўся ў Стаўку ў Міккелях, адкуль пазней кіраваў ваеннымі аперацыямі. А ў першыя дні вайны ён жыў у гатэлі «Хельсінкі», дзе была арганізаваная часовая Стаўка. Перадусім ён наведаў шпіталь Чырвонага Крыжа, дзе ляжала 127 параненых у час бамбавання. Ён завітаў і ў кантору Чырвонага Крыжа, дзе даведаўся, што рэзерв медыцынскіх сясцёр колькасцю 3800 чалавек гатовы да працы. Манэргейм падзякаваў, пажадаў усім поспехаў і развітаўся. Ён быў задаволены. Тут усё было ў парадку.

Са шпіталя Чырвонага Крыжа Манэргейм патэлефанаваў свайму сябру камерцыйнаму дарадцу Фазэру і папрасіў яго аддаць свой шыкоўны рэстаран пад ваенны шпіталь, што і было зроблена. 2 снежня ў гатэль «Хельсінкі» выклікалі палкоўніка Талвелу. Палкоўнік з'явіўся туды надвячоркам. Ён быў страшэнна ўзрушаны тэрытарыяльнымі стратамі ў Суаярві, на поўнач ад Ладажскага возера. Талвела ўзбуджана сноўдаў з кута ў кут, страшэнна лаяўся і патрабаваў неадкладна паслаць яго ў Суаярві. У вайсковай вучэльні ён пісаў дыпломную працу на тэму стратэгічнага значэння гэтага раёна, даводзячы, што ў абароне на поўнач ад Ладажскага возера гэты раён з'яўляецца ключавым. Такім чынам, ён лепш за іншых мог ацаніць, наколькі небяспечнае становішча складвалася ў гэтым раёне. Ад таго, ці змогуць фіны зноў завалодаць гэтым раёнам, залежаў лёс усёй краіны. Талвела не мог узяць у галаву, як фінская армія магла кінуцца бегчы, не паказаўшы ніякага супраціўлення. Вальдэну здавалася, што Манэргейм зараз выбухне гневам. Ніхто яшчэ дагэтуль не дазваляў сабе такіх паводзінаў перад галоўнакамандуючым. Але выйшла наадварот. Манэргейм дазволіў свайму ўлюбёнцу паехаць у раён Суаярві, стварыць цуд і абараніць гонар фінскай арміі.

На думку Манэргейма, перамога каля Толваярві вярнула арміі ўпэўненасць у сваіх сілах.

Вайна 1939 года, здаецца, зрабіла добры ўплыў на самотнага і схільнага да дэпрэсіі чалавека. Манэргейм зноў дзейнічаў рашуча і хутка. Гэта стала магчымым таму, што якраз такіх рашучых і энергічных дзеянняў ад яго і чакалі. Няпэўнасць, моцны ўціск звонку, жыццё пад прэсам без магчымасці вызваліцца ад гнятучых пачуццяў – цяпер усё гэта адышло прэч. Праўда, ненадоўга, бо сведкі кажуць, што ў сярэдзіне снежня яго зноў апанавала глыбокая дэпрэсія і ён усіх спрэс вінаваціў у памылках і хібах.

Напэўна, настрой Манэргейма на пачатку вайны і яго зларадныя жартачкі можна патлумачыць і тым, што апраўдаліся менавіта ягоныя касандраўскія прадказанні, а не прадказанні яго ўпартых быкагаловых апанентаў. Так, адзін міністр, назіраючы з акна, як рускія самалёты бамбуюць горад, ніяк не мог даць веры, што пачалася вайна. Ён палічыў гэты налёт проста вайною нерваў, якія ў рускіх канчаткова здалі. Цікава і адначасова невытлумачальна, што Сталін у 1941 годзе, калі немцы пачалі масавы абстрэл рускай тэрыторыі, зрабіў прыкладна такую ж выснову і забараніў сваім войскам весці агонь у адказ. Міністра замежных справаў

ахапіла сапраўдная паніка. Яшчэ некалькі дзён таму ён чуў грукат артылерыі з рускіх кананерак, хоць мора ўвесь час было пустэльнае. Не разумеючы сам, што робіць, міністр на злом галавы кінуўся ў Стакгольм. Іначай кажучы – уцёк са свайго паста і з краіны.

Манэргейм на гэта сказаў, што лепш яму было б пайсці ў лес ды пусціць сабе кулю ў лоб. Паасіківі, якому Манэргейм сказаў гэтыя словы, запомніў іх і пасля вайны вярнуў самому Манэргейму, які тады пакінуў ужо прэзідэнцкі пост і глядзеў на будучыню вельмі змрочна. Паасіківі яму сказаў тады, што чалавеку з такімі думкамі лепш пайсці ў лес ды пусціць сабе кулю ў лоб. Але на пачатку вайны 1939 года Манэргейм меў на ўвазе не ўцёкі міністра замежных справаў, а ягоную знешнюю палітыку, якая грунтавалася на пустых і нерэальных летуценнях.

Ажыўлены настрой і бурная дзейнасць, якую ён разгарнуў у першыя дні вайны, наведваючы аб'екты Чырвонага Крыжа, абсалютна не стасаваліся з тым станам, у якім знаходзіліся і ён сам, і ўсе астатнія напярэдадні таго страшнага ранку.

Падзеі пацвердзілі слушнасць Манэргеймавых прадказанняў. Яны збыліся, і гэта быў рэванш, падараваны яму лёсам. Але становішча было такое, што радавацца рэваншу не выпадала. Першыя тыдні баёў не прынеслі фінскай арміі славы. Але і вораг наперад пасунуўся ненашмат. Вялікі контрнаступ на Карэльскім перашыйку 23 снежня 1939 года ўдаўся не цалкам. Панаваў хаос, кожны ваяваў як хацеў. На паласе наступлення шырынёй 30 км ваявала пяць фінскіх дывізіяў. Наступ давялося спыніць у той жа дзень, бо ён быў безвыніковы. Не хапала сродкаў сувязі і сігналізацыі. Рускія залеглі ў кустах і сваім агнём спынілі фінаў. «Машыністам» гэтай вялікай няўдачы быў генерал Эквіст, пра якога Манэргейм сказаў пасля вайны, што добра той можа рабіць толькі памылкі. Потым прыйшлі паведамленні аб перамозе ў маланаселеных раёнах на поўнач ад Ладажскага возера. Фіны акружылі і знішчылі матарызаваныя рускія дывізіі, якія рухаліся на Фінляндыю па нешматлікіх у тых мясцінах дарогах.

Фінская разведка ва Усходняй Карэліі аказалася мала эфектыўнай, бо лічылася, што наступленне рускіх з паўночнага боку Ладагі немагчымае, а тое, што рускія пабудавалі ўжо там дарогі і падцягнулі войскі, заставалася невядомым.



У 1939–1940 гадах Манэргейм не мог стварыць значных рэзерваў на кірунку Аланец – Паўночная Дзвіна. Але менавіта ў гэтых мясцінах фінская армія дабілася тых перамог, якія ўславілі яе на ўвесь свет і прывялі да зменаў у тактыцы. На цесным Карэльскім перашыйку усё ішло так, як было спланавана. Адзінае, што там было трэба, – упарта трымацца на пазіцыях і зрэдку рабіць лакальныя контратакі. Далей на поўнач распасціралася вялізная прастора для імправізацыяў і эксперыментаў, але сканцэнтраваць там войскі гэтак жа шчыльна, як на Карэльскім перашыйку, было немагчыма. Утрыманне рускіх войскаў ва Усходняй Карэліі прывяло да поўнага спусташэння харчовых запасаў. Жыхары гэтых мясцінаў галадавалі.

Пасля месячнага перапынку рускія зноў пачалі на Карэльскім перашыйку ваенныя дзеянні, але гэты раз ужо з падвойнаю сілай і сістэматычнасцю. Моцныя маразы закавалі мора ў такі моцны лядовы панцыр, што рускія танкі перасеклі Выбаргскую затоку і выйшлі на мацярык у Фінляндыі. Апошнія дні вайны былі для Манэргейма надзвычай цяжкім выпрабаваннем. Страты ўзрасталі, салдаты стаміліся, зброя зношвалася і непапраўна псавалася. На думку Манэргейма, мір быў заключаны літаральна ў апошнюю хвіліну.

Канец вайны Манэргейм сустрэў у маёнтку аднаго знаёмага на ўсход ад горада Міккелі. Генерал Хейнрыкс, які адказваў за абарону ўсяго Карэльскага перашыйка, прыехаў туды 16 сакавіка, праз тры дні пасля заключэння міру. Манэргейм быў моцна прастуджаны. Ён жыў у маленькім, мэбляваным на стары лад пакойчыку. Маршал быў абсалютна спакойны. Ён падзякаваў Хейнрыксу за яго ўдзел у вайне. Але Хейнрыкс заявіў, што лічыць сябе не вартым падзякі, бо пастаўленую задачу не выканаў.

– Было зразумела, што ўсё да таго і ідзе. А вам загадалі камандаваць катастрофай, – сказаў Манэргейм.

Хейнрыкс запярэчыў: у любую хвіліну можна было адступіць далей углыб Фінляндыі. Але ў самы апошні момант быў заключаны мір. Манэргейм зазначыў, што такое адступленне якраз і прывяло б да сапраўднай катастрофы. Флангі былі адкрытыя і безабаронныя, бо лёд на азёрах вытрымліваў нават танкі, не кажучы ўжо пра грузавікі з салдатамі.

Манэргейм сказаў Хейнрыксу, што было б лепш, каб Фінляндыя прыняла ўмовы рускіх увосень 1939 года. Мяжу па Карэльскім перашыйку імператар Аляксандр I пазначыў як мяжу аўтаноміі ўнутры імперыі, і яна ніякім чынам не магла б быць вечнай мяжой між дзвюма самастойнымі дзяржавамі, асабліва, калі адна з іх вялізная краіна, а другая – зусім маленькае дзяржаўнае ўтварэнне.

Можа, перадача тых тэрыторыяў Савецкаму Саюзу нейтралізавала б яго жаданне ісці далей. А так перанос мяжы адбыўся з вялікімі стратамі ў дрэнна ўзброенай арміі.

Аднойчы ўвечары, праз колькі дзён пасля заключэння перамір’я, Манэргейм спытаў у свайго госця (дый у самога сябе), якая, на ягоную думку, якасць палкаводца з’яўляецца галоўнай? Госць пералічыў уменне цвяроза ацэньваць абстаноўку і здольнасць дзейнічаць хутка, мужнасць, асцярожнасць і шанцаванне. Манэргейм з гэтым згадзіўся, але дадаў фізічную трываласць і псіхічную стойкасць, бо яны якраз і з’яўляюцца душэўнымі сіламі, а таму складаюць найбольш важную якасць палкаводца. Потым ён сказаў, што вайна самым рашучым чынам прымушае ацэньваць чалавека па-новаму. Здараюцца самыя нечаканыя выпадкі. Афіцэр, якога ўсе лічылі шэрай і няздольнай асобай, раптам паказвае новыя і карысныя якасці. Ён пачынае раптам выказваць новыя погляды і дзейнічае так, як ніхто ад яго не чакаў.

Такой самай думкі трымаюцца і многія прафесійныя вайскоўцы з багатым досведам. Нельга сказаць загадзя, як будзе паводзіць сябе чалавек у сур’ёзных ваенных абставінах. Хвалько можа стацца добрым салдатам, а чалавек цвёрдых поглядаў і прынцыпаў акажацца баязліўцам. Чалавек не ведае самаго сябе. Ён павінен сябе шукаць, але знайсці можа, толькі калі пройдзе праз цяжкія выпрабаванні.

## Перамір’е

Улетку 1940 года Манэргейм зноў працаваў у Генеральным штабе ў Хельсінках. Аднойчы позна ўвечары камандуючы сухапутнымі войскамі генерал Хейнрыкс, камандзіраваны ў Міккелі, каб узначаліць філіял Стаўкі, атрымаў загад неадкладна прыбыць у Хельсінкі. Ён правёў усю ноч у машыне і да пачатку працы штаба быў на месцы. Манэргейм паведаміў Хейнрыксу, што той назначаны начальнікам Генеральнага штаба. Каб не ўзнікла ніякіх непаразуменняў, Манэргейм адразу сказаў, што не намераны даваць начальніку Генштаба выключныя правы на правядзенне разведкі, аператыўнага планавання і права аднаасобна выступаць у якасці прадстаўніка па гэтых пытаннях. «Я не хачу стаць заложнікам аднаго чалавека, – сказаў Манэргейм. – Я павінен мець усе магчымасці весці перамовы і радзіцца з кім заўгодна, незалежна ад таго, працуе гэты чалавек у штабе, ці не. Потым я магу рабіць свае высновы. Як начальнік Генштаба вы можаце прысутнічаць на такіх нарадах і перамовах, калі толькі захочаце». Сказана было ясна і выразна, але Хейнрыкс доўга думаў, што з гэтага ўсё ткі выйдзе на практыцы. Як будуць падзеленыя абавязкі? Як будзе ажыццяўляцца іх супрацоўніцтва? Хейнрыкс адчуваў занепакоенасць і нават, па яго прызнанні, пэўную падаўленасць.



Вайна скончылася, настаў мір, і прыйшла пара перадаць абавязкі галоўнакамандуючага прэзідэнту. Цэнзуру пакуль не адмянілі, і яна моцна ўплывала на грамадскую думку. Напалоханы прэзідэнт Калліа з расшыранымі ад узбуджэння вачыма, учапіўся ў рукаў аднаго свайго блізкага сябра і ціха – каб ніхто не пачуў – шапнуў, што, маўляў, як бы там ні было, а Манэргейм так і не перадаў яму абавязкі галоўнакамандуючага. Пасля таго, як Калліа ў канцы 1940 года выйшаў у адстаўку і памёр на руках у Манэргейма ад сардэчнага прыпадку, новым прэзідэнтам стаў Руці. Нічога не памянялася. У Фінляндыі па-ранейшаму было два ўрады – адзін у Хельсінках з уладай да ўсходняй мяжы горада і Манэргейм. Дачыненнямі з Нямеччынай займаўся па большасці Манэргейм, але так пажадалі самі немцы. На іхнюю думку, дэмакратыі, парламенту і парламенцкаму ўраду даваць нельга. Яны існуюць толькі дзеля таго, каб іх разганялі і звяргалі. Яны вінаватыя ў заняпадзе дзяржавы і падзенні грамадскай маралі.

Дачыненнямі з Масквой займаўся ўрад, кансультуючыся і ўзгадняючы свае дзеянні з паслом Ю.К. Паасіківі.

Падлічана, што за перыяд з верасня 1940-га па май 1941-га семдзесят фінскіх афіцэраў пабывалі эмісарамі Манэргейма ў Нямеччыне дзеля перамоваў або перадачы пасланняў. З такой самай рэгулярнасцю Фінляндыю наведвалі і нямецкія афіцэры і цывільныя агенты Герынга.

Праз сваіх людзей Манэргейм часткова займаўся і дачыненнямі са Швецыяй, асабліва калі гэта тычылася абаронных і дзяржаўных саюзаў.

Па меры таго, як перамоўныя працэсы Манэргейма шырыліся, а вайсковыя чыны яго эмісараў раслі, адносіны Паасіківі з урадам усё больш псаваліся, і часам ён адчуваў сябе забытым ці адпраўленым у адстаўку. А жаданне рускіх пачаць перамовы павялічвалася з кожным днём.

Манэргейм вельмі добра ведаў, чаго ён хоча ад сябе і ад іншых, чаго можна чакаць і патрабаваць і на што можна спадзявацца. Амаль пра ўсе свае метады і рашэнні, пра якія так зацята спрачаліся як даследнікі, так і былыя яго падначаленыя, ён некалі недзе нешта шчыра і адкрыта казаў, паведамляючы, што ён думае і што хоча атрымаць ад сваіх задумак.

Але ў час перамір'я ён пра свае думкі і намеры маўчаў. Вядома толькі, што ён назваў гэты прамежак часу перыядам узброенага міру. У краіне па-ранейшаму было ваеннае становішча. А гэта давала Манэргейму права заставацца галоўнакамандуючым.

## Гульні вакол улады ў 1940°годзе

Што адбылося ў жніўні 1940 года? Дзе хаваецца праўда? Бо тое, што адбылося, перавышае рамкі любога дэтэктыўнага рамана. Дый самі гэтыя падзеі − сапраўдны дэтэктыўны раман. Я магу толькі паспрабаваць апісаць, як гэта ўжо спрабаваў зрабіць шмат хто іншы, канчатковыя вынікі. Калі было здзейсненае злачынства, дык ці з'яўляецца яго галоўным віноўнікам Манэргейм, а Руці і Вальдэн толькі пазней сталі яго саўдзельнікамі і потым хавалі свае злачынныя дзеянні? Побач з імі трэба назваць і міністра замежных справаў Вітцінга. Ці быў прэзідэнт Калліа ахвярай злачынства? Ці лічыў ён тыя падзеі спробай дзяржаўнага перавароту? Ці адчуваў сябе цалкам залежным ад літасці гэтых людзей, без ніякага спадзявання на дапамогу з чыйго-небудзь боку? І ці не хаваецца пэўны знак лёсу ў тым, што ўсяго праз тры месяцы прэзідэнт Калліа памёр на пэроне вакзала ў Хельсінках прама на руках Манэргейма, − знак, здольны расказаць ісціну таму, хто яго зразумеў?

Усё пачалося на аэрадроме ў Малмі 18 жніўня 1940 года. Манэргейм ехаў у горад Ювяскюля на ўстаноўчы сход Брацтва інвалідаў вайны. Напярэдадні маршал атрымаў ад фінскага пасла ў Нямеччыне паведамленне, што блізкі Манэргеймаў сябар барон Э.Ф. Врэдэ звычайным пасажырскім рэйсам прыляціць на гэты самы аэрадром у той самы час, калі там па дарозе ў Ювяскюля будзе Манэргейм, каб уручыць яму асабістае пасланне. На сустрэчу маршала з баронам Врэдэ ўскладаліся вялікія спадзяванні. Манэргейм, пэўна, ведаў змест ліста і лічыў яго вельмі важным, таму што ўзяў з сабою на аэрадром міністра замежных справаў, міністра абароны і начальніка Генеральнага штаба. З гэтай кампаніі толькі міністр замежных справаў Вітцінг быў цывільны, астатнія двое былі генераламі і блізкімі людзьмі Манэргейма.



Самалёт са Стакгольма прызямліўся своечасова. Барон Врэдэ выйшаў з самалёта, павітаўся з прысутнымі і працягнуў Манэргейму ліст. Манэргейм распячатаў канверт, хутка прагледзеў тэкст і падаў ліст Хейнрыксу, каб той дзеля эканоміі часу прачытаў яго ўголас. Але перш чым перадаць ліст Хейнрыксу, ён прабег яго вачыма яшчэ раз. Змест паслання тычыўся толькі яго, Вальдэна і Вітцінга. Таму маршал папрасіў астатніх трошкі прайсціся, пакуль будзе чытацца ліст. Лішнія адышлі, і Манэргейм паведаміў міністрам, што яго просяць сёння ж прыняць падпалкоўніка Вельцьенса, які павінен перадаць Манэргейму пасланне ад Герынга. Ад'езд Манэргейма ў Ювяскюля затрымліваўся на паўгадзіны.

Вельцьенс на той час пакінуў шэрагі нямецкай арміі. Ён стаў камерсантам і гандляваў зброяй. У Першую сусветную вайну ён служыў разам з Герынгам у славутай эскадрыллі Рыхтгофена, дзе яны і пасябравалі.

Увечары Манэргейм прыняў Вельцьенса ў сябе дома. Той перадаў яму пасланне Герынга. Рэйхсмаршал прасіў дазволу перапраўляць праз Фінляндыю нямецкія вайсковыя часткі з Нарвегіі ў Нямеччыну на адпачынак, а потым зноў у Нарвегію. Калі Фінляндыя пойдзе на гэта, Нямеччына гатовая прадаваць ёй зброю.

Прэзідэнт Калліа быў на дачы непадалёк ад Турку, дзе адпачываў і лячыўся пасля абвастрэння сардэчнага захворвання. Прэзідэнцкія абавязкі выконваў Руці. Манэргейм сцвярджае, што звязаўся з Руці па тэлефоне, і той даручыў яму паведаміць Герынгу, што Фінляндыя можа задаволіць просьбу Нямеччыны.

Пасля вайны, на судовым працэсе над ваеннымі злачынцамі Руці даводзіў, што Манэргейм яму не званіў і ніякім іншым чынам не інфармаваў пра гэтую прапанову. Пра яе яму нібыта расказаў Вальдэн, дый тое толькі праз месяц, 19 верасня. Вальдэн паведаміў яму тады, што ў фінскія порты на трох караблях будуць дастаўленыя нямецкія салдаты і харчовыя прыпасы, а потым усё гэта па сушы будзе перапраўленае ў Нарвегію. І гэтым жа днём нямецкія караблі выйшлі са сваіх гаваняў.

Руці, хутчэй за ўсё, хлусіць, таму што пасля вайны ў Берліне быў знойдзены рапарт Вельцьенса, у якім той паведамляў, што пытанне аб праходзе войскаў праз Фінляндыю абмяркоўвалася і з Руці.

У архіве Міністэрства замежных справаў Вялікабрытаніі знойдзены дакумент, паводле якога Руці запэўніваў англічан, што ён персанальна адказны за выдачу дазволу немцам на транзіт праз Фінляндыю.

Але ж дзяржаўныя паўнамоцтвы на вядзенне знешняй палітыкі Руці ад прэзідэнта не атрымліваў. Знешняй палітыкай займаўся выключна прэзідэнт Калліа. Перадача ўсіх уладных паўнамоцтваў прэм'еру Руці адбылася толькі 27 жніўня 1940 г.

Праз пяць дзён пасля таго, як у Берліне атрымалі рапарт Вельцьенса, прэзідэнт Калліа прыехаў у Хельсінкі на пасяджэнне ўрада, дзе сустрэўся з прэм'ерам Руці і міністрам абароны Вальдэнам. Гутарыў ён і з Манэргеймам. Няўжо яны нічога не сказалі прэзідэнту пра дазвол на транзіт нямецкіх войскаў? Няўжо яны не дамовіліся загадзя, як паднесці гэтую навіну прэзідэнту? А можа, яны баяліся, што Калліа ўчыніць скандал? Астатнія міністры нічога не ведалі пра гэтае пагадненне. Міністр унутраных справаў упершыню пачуў пра яго толькі 21 верасня 1940 года, калі губернатар горада Ваасы патэлефанаваў яму і спытаў, што азначае высадка нямецкіх войскаў у горадзе і ці трэба аказваць ім супраціўленне? Ці не пачалася новая вайна? Нямецкае круізнае судна даставіла ў порт Вааса 3000 нямецкіх салдатаў.

За некалькі дзён да смерці міністр замежных справаў Вітцінг запэўніў Фагерхольма, што нічога не ведаў пра гэтую дамову аж да самага моманту высадкі немцаў у Ваасе. Зрэшты, прэзідэнт Калліа казаў пра Вітцінга, што той трапіў на пост міністра толькі за тое, што ўвогуле не мог нічога ладам сказаць, а толькі заікаўся. Гэта была самая выдатная рыса ў часы вялікага маўчання. Такім чынам пра гэта пагадненне з немцамі ведалі з самага пачатку трое, а па словах Руці − двое: Манэргейм і Вальдэн. Але ёсць доказы, што на перамовах з Вельцьенсам прысутнічалі і Вітцінг, і Руці.



У аўторак 21 верасня 1940 года Манэргейм, Руці і Вальдэн паведамілі, што едуць у рэзідэнцыю прэзідэнта пад Турку, каб з ім сустрэцца. Надвор'е стаяла дажджлівае, было ўсяго 10 градусаў вышэй нуля. Ураганны вецер зламаў на доме прэзідэнта флагшток. Калліа заўсёды надаваў вялікую ўвагу розным прыкметам і, напэўна, той раз таксама адзначыў для сябе гэтае здарэнне.

А дзевятай гадзіне раніцы ад'ютант выклаў прэзідэнту Калліа спіс справаў, якімі ён меў займацца на працягу дня. Калліа прагледзеў пошту. Ён ведаў, што апоўдні да яго мусіла прыехаць тройца − Манэргейм, Руці і Вальдэн, а таму дамовіўся з жонкай запрасіць іх на абед. Фатографа паклікалі загадзя. Раптам, калі Калліа чытаў лісты, у яго заняло мову. Ён падняўся наверх, каб крыху адпачыць. А праз гадзіну з чвэрцю ў яго адбыўся другі прыпадак, і ўсю правую палову цела паралізавала. Ад'ютант выклікаў лекара. З гасцямі сувязі не было. Ад'ютант тэлефанаваў, каму толькі мог, спрабуючы перахапіць гасцей па дарозе і паведаміць, што сустрэча адмяняецца. Але а трынаццатай гадзіне госці ўсё-ткі прыехалі, з-за дрэннага надвор'я спазніўшыся на гадзіну. Ад'ютант сустрэў гасцей і паведаміў ім, што менш як за дзве гадзіны ў прэзідэнта былі два прыпадкі. «Нам прапануюць вярнуцца ў Хельсінкі», − сказаў Манэргейм. Але ад'ютант перадаў ім запрашэнне спадарыні Калліа на абед. Стол ужо быў накрыты. Тут у дзвярах з'явіўся сам Калліа. Ён ледзь ішоў, абапіраючыся жонцы на плячо. Выгляд у яго быў жахлівы. Госці павіталіся з прэзідэнтам і пачалі ўгаворваць яго легчы ў ложак, што ён і зрабіў. Спадарыня Калліа запрасіла ўсіх да стала. За абедам ніхто не сказаў ніводнага слова. Пасля кавы госці падняліся, каб зараз жа адправіцца назад у Хельсінкі. Перад самым ад'ездам Руці падняўся да прэзідэнта, а Манэргейм і Вальдэн з гаспадыняй крыху прайшліся па парку. Манэргейм упершыню быў у Култаранце. Калі яны вярнуліся да прэзідэнцкага дому, то ўбачылі, што на верандзе стаіць Калліа. Ён выйшаў правесці гасцей. Сяк-так ён спусціўся ўніз, і ўсе разам

яны сфатаграфаваліся. Потым госці селі ў машыну і ад'ехалі. Было ўжо тры гадзіны. На здымку Вальдэн стаіць з тоўстым пачкам паперы пад пахай. Гэтыя паперы госці так і не змаглі паказаць прэзідэнту і нават не змаглі намякнуць, што яны прывезлі з сабой.

Наступным днём ваенны міністр генерал Вальдэн адправіў сваіх прадстаўнікоў у Нямеччыну купляць абяцаную зброю. Праз чатыры дні ўрад выдзеліў ваеннаму міністэрству 150 мільёнаў марак на гэтыя закупы. А праз два з паловаю месяцы ўся закупленая нямецкая зброя ўжо была дастаўленая ў Фінляндыю. Манэргейм атрымаў зброю і змог падрыхтаваць яшчэ пяць новых дывізіяў для фінскай арміі.

Дык дзеля чаго прыязджалі госці? Якія паперы былі ў генерала Вальдэна? Ці ведаў Калліа, чаму яго наведвала гэтая тройца, чыё здароўе так рэзка кантраставала са здароўем хворага прэзідэнта? Ці не думаў прэзідэнт, што госці прыехалі з патрабаваннем ягонай адстаўкі? Ён выдатна ведаў, што яго здароўе моцна пахіснулася. Яшчэ за тыдзень да гэтага візіту ў прэзідэнта быў невялікі паляруш. Калі ў сакавіку 1940 года яму давялося падпісваць паўнамоцтвы на вядзенне мірных перамоў з рускімі, ён сказаў, што лепей бы ягоная рука адсохла. Цяпер гэтая рука была паралізаваная. Няўжо цяперашняе становішча зводзіла на нуль мірную дамову, падпісаную ў выніку Зімовай вайны? Менавіта так яно і было, аднак ці ўсведамляў гэта прэзідэнт Калліа? Што яму было вядома? На гэтае пытанне ўжо ніхто не адкажа.

## Стаўка

5 студзеня 1940 года рускія асабліва ўпарта і жорстка бамбавалі Міккелі. Дом дваранскага сходу пашкодзілі, усе шыбы з вокнаў павылятвалі. Аднак маршал загадаў накрыць стол як заўсёды ў сталоўцы. Разам з усім штабам ён абедаў ля разбітага акна, накінуўшы на плечы плашч. Афіцыянтку, якая абслугоўвала іх, ён тут жа ўзнагародзіў стужкай медаля «За свабоду» II ступені, дастаўшы яе з кішэні. На вуліцы трашчаў мароз, водблескі полымя асвятлялі пакой.

Дом хутка адрамантавалі, замест шыбаў у вокны паставілі кардон, замерзлыя трубы адагрэлі. Але Манэргейм перабраўся за горад, у маёнтак Інкеле.



Калі пачалася бамбёжка, Манэргейм працаваў у сваім кабінеце ў настаўніцкай Цэнтральнай народнай школы. Пайсці ў бамбасховішча ён адмовіўся. А калі генерал Айра пачаў яго ўгаворваць, адказаў, што бомба ніяк у гэты дом трапіць не можа. Ён меў на ўвазе, што такая смерць галоўнакамандуючаму не пагражае. Бамбасховішча знаходзілася зусім побач − у глыбіні гары Найсвуоры. Маршал нанёс туды візіт ветлівасці, але ні разу сховішчам так і не скарыстаўся. Ён казаў, што сховішча падобнае на вязніцу.

Падчас бамбёжкі ўначы 3 сакавіка Дом дваранскага сходу згарэў. Рускія выдатна ведалі, дзе размяшчаецца Стаўка Манэргейма і ўпарта бамбавалі безабаронны горад. Толькі падчас першай бамбёжкі згарэла шэсцьдзесят дамоў. Такое паляванне на аднаго чалавека не можа быць паспяховым. І, хутчэй за ўсё, рускія не мелі на мэце яго знішчэнне. Стаўка − гэта вялізная ўстанова, якая размяшчалася ў розных будынках па ўсім гарадку, і бясконцыя бамбаванні вельмі перашкаджалі працы штабоў. У час Зімовай вайны і вайны-працягу Стаўку размясцілі на вялікай тэрыторыі за горадам. Сам жа Манэргейм жыў у розных месцах. Але кожную раніцу ён з'яўляўся на працоўным месцы ў настаўніцкай Цэнтральнай народнай школы, дзе сядзеў да сярэдзіны ночы, а то й пазней.

Як гэта ні дзіўна, але з настаўніцкай не прыбралі ні кніжную шафу, ні чучала савы, і нават гіпсавы бюст фінскага народнага паэта Рунеберга так і стаяў на падваконні непадалёк ад Манэргеймава стала. Усе пяць гадоў упарта сцвярджалася, што Стаўка размесцілася ў школе толькі часова. Нават крэсла для маршала пазычылі ў гаспадара суседняй мэблевай фабрыкі. Вайна − з'ява часовая, школьнае навучанне − вечнае.

Манэргейм правёў у Міккелях пяць гадоў − да канца 1944 года, амаль столькі ж, колькі пражыў у Варшаве. І нават калі ён ужо быў прэзідэнтам і працаваў у Хельсінках, ён рэгулярна наведваў Міккелі, каб выконваць абавязкі галоўнакамандуючага, а то й проста спакойна папрацаваць.

З 1941 года Манэргейм абедаў у Міккельскім клубе, які быў клубам гарадскіх прадпрымальнікаў. Клуб размяшчаўся на другім паверсе гатэля «Калева», адразу за рэстаранам. Вышэйшыя афіцэры Стаўкі жылі на двух апошніх паверхах гатэля і абедалі ў вялі-

кай зале рэстарана. Кухня рэстарана і афіцыянты абслугоўвалі і клубную залу.

Манэргейм быў у выдатнай форме. Ён рэгулярна ездзіў на кані, часта нават па паўтары гадзіны, – а сёмай гадзіне ўранні або адвячоркам. У свой кабінет у Цэнтральнай народнай школе ён прыходзіў а дзевятай гадзіне і выходзіў звычайна а палове дванаццатай ночы. Абедаў ён з паловы першай па другую гадзіну, а вячэраў з 19.30 па 21.00. Пасля абеду ён звычайна адпачываў у кабінеце, седзячы ў вялікім мяккім фатэлі, які дзеля гэтага там і паставілі.

У час Другой сусветнай вайны немцаў вельмі здзіўляла, што маршал ходзіць па горадзе ці ездзіць вершкі па наваколлі толькі з ад'ютантам, без ніякай адмысловай аховы. Ён хадзіў у звычайную цырульню, з якой на гэты час ніколі не выганялі іншых кліентаў. І на крэсле побач з маршалам, у чаканні сваёй чаргі, мог аказацца хто заўгодна. Нельга нават уявіць сабе, каб чалавек такога высокага становішча мог сябе так паводзіць – як у Фінляндыі, так і за мяжой.

Па суботах Манэргейм заканчваў працу раней, чым звычайна, і ішоў у саўну. Пасля саўны ён купаўся у возеры да позняй восені, хоць тэмпература вады апускалася ніжэй ад дзесяці градусаў. У час вайны ён пастаянна лічыў свае паходы ў саўну. Так, напрыклад, ён мог сказаць, што ўлетку, пасля пачатку Другой сусветнай, схадзіў у саўну 16 разоў. Аднойчы яму давялося прапусціць суботнюю саўну, і ён заўсёды помніў пра гэта.

Вядома, што Зімовая вайна доўжылася 17 тыдняў. Але Савецкі Саюз, дый заходнія дзяржавы лічылі час вайны ўвогуле і даволі прыблізна – «пару месяцаў» ці «нешта каля васьмі тыдняў». А Манэргейм у якасці адзінкі адліку часу выкарыстоўваў паходы ў саўну.

Пра ягонае прыватнае жыццё, кватэру і лад жыцця не пісалі нічога. Ён ніколі не даваў інтэрв'ю журналістам. Ён выдаваў загады і выпускаў камюніке, а ў час вайны – толькі загады.

Аднойчы, гэта было ў дні Другой сусветнай вайны, калі Манэргейму было 76 гадоў, ён захацеў паказаць сваім афіцэрам, які ён яшчэ гнуткі і спрытны. Маршал нібы незнарок выпусціў з рук ключы, і яны ўпалі на падлогу. Манэргейм сціснуў абцасы і лёгка, не сагнуўшы ногі ў каленях, падняў іх. На такое здольны не кожны малады чалавек.



Кажуць, што Манэргейм не ўмеў смяяцца. Аўстрыец Ганс Кёпф праслужыў у Манэргейма каля пятнаццаці гадоў і чуў смех гаспадара ўсяго пару разоў. Вядома ж, маршал смяяцца ўмеў. Камандзір зенітнай батарэі з Манэргеймава цягніка лейтэнант Ёрма Оксанен аднойчы ў 1941 годзе пайшоў на возера пакупацца. На беразе стаялі кабінкі, у якіх было тры сцяны і столь. З боку возера сцяны не было. Да кабінак вялі драўляныя прыступкі. Лейтэнант Оксанен пакупаўся і апранаў у кабінцы кашулю. На лесвіцы пачуліся нечыя крокі і бразгат шпораў. Калі лейтэнант апрануў кашулю, ён убачыў перад сабой Манэргейма з ад'ютантам. Збянтэжаны лейтэнант, стоячы без штаноў у кароткай кашулі, казырнуў і выгукнуў: «Лейтэнант Оксанен, спадар фельдмаршал!» Манэргейм засмяяўся. Ён смяяўся бесперапынна, і слёзы цяклі з вачэй. Потым маршал павярнуўся і зайшоў у суседнюю кабінку.

Добра вядомы выпадак, які адбыўся ў час Зімовай вайны. За калядным сталом падавалі любімую страву маршала – смажанага парася. Калі чарга дайшла да школьнага радцы Эрыка Мандэліна, парася звалілася на падлогу. Сітуацыя была не такая, каб адрэагаваць на яе простай усмешкай. Манэргейм рагатаў, трымаючыся за жывот. Хоць маршал і лічыўся вытанчанай натурай, пачуццё гумару ў яго было даволі нескладанае.

У Манэргейма была вельмі добрая памяць на людзей. Ён памятаў вялікую колькасць салдатаў і афіцэраў, але яго тэхнічныя веды былі абмежаваныя. Дзеля гэтага, лічыў Манэргейм, маюцца энцыклапедычныя слоўнікі і даведнікі. Са старадаўніх палкаводцаў толькі Цэзар і Напалеон ведалі на імя незлічоную колькасць сваіх шараговых салдатаў, і тое, дзе кожны з іх нарадзіўся, і якое ў іх сямейнае становішча, і ў якіх бітвах яны ўдзельнічалі. Гэта рабіла на войска моцнае псіхалагічнае ўздзеянне. Такі военачальнік здаваўся клапатлівым камандзірам-бацькам, а ў простых салдатаў нараджалася пачуццё іх агульнай прыналежнасці да адзінай арміі. Вядома, ніхто не можа запомніць усяго і пра тысячу, а не тое што пра сотні тысяч людзей. Але дастаткова і пэўнай колькасці, каб па ўсім войску пайшла добрая слава пра клапатлівага камандзіра. Калі салдаты пасылалі Манэргейму свае саматужныя вырабы, часцей за ўсё выразаныя з дрэва, Манэргейм заўсёды дзякаваў ім, дасылаючы салдату, напрыклад, свой здымак з удзячным надпісам.

Гэта таксама вельмі ўмацоўвала яго папулярнасць у народзе.

Манэргейм толькі аднойчы распавядаў, што ў яго быў сон, – гэта было 25 сакавіка 1939 года, калі ў Маскве ішлі перамовы аб заканчэнні Зімовай вайны. Гэтаю ноччу яму снілася Маскоўская мірная канферэнцыя, бо гэта была самая важная справа, якая непакоіла ўсіх фінскіх дзяржаўных дзеячаў.

Пачуццё гумару ў Манэргейма было вельмі саркастычнае. На ягоную думку, маршал Петэн, кіраўнік урада Вішы, быў вельмі халодны і змрочны чалавек. Здаецца халоднасці ў людзях Манэргейм баяўся болей за ўсё.

Пасля Першай сусветнай вайны Манэргейму давялося размаўляць з Петэнам пра палітку ў рэгіёне Балтыйскага мора, пра ператварэнне яго ў нейтральную зону суднаходства і забарону трымаць на Балтыцы ваенныя флаты. Петэну прынеслі глобус, ён знайшоў там Ісландыю і доўга здзіўляўся, як гэта праблемы Балтыкі могуць хваляваць Фінляндыю. Вялікі французскі дзеяч Клемансо быў поўнай супрацьлегласцю Петэну – энергічны, гнуткі палітык, цікаўны чалавек. Адразу пасля размовы з Манэргеймам, калі той патлумачыў, што Аландскія выспы заўсёды належалі Фінляндыі, Клемансо змяніў свой пункт погляду на праблему выспаў. Падчас гэтай сустрэчы Манэргейм звярнуў увагу на тое, што на руках у Клемансо былі шэрыя пальчаткі.

Манэргейм цаніў у людзях цеплыню, гнуткасць і пачуццё рэальнасці, г.зн. уменне чалавека цвяроза ацэньваць рэальнасць і прыстасоўвацца да рэальнай хады падзеяў. Халодны педантызм быў пастаянным аб’ектам ягоных насмешак.

У вёсцы Самматус на Карэльскім перашыйку Манэргейма, які ўлетку 1943 года праводзіў там інспекцыю будаўніцтва ўмацаванняў, пазнаў адзін прастадушны карэльскі хлопчык «Не, вы толькі гляньце, гэта ж Манэргейм!» – закрычаў хлопчык. Паглядзець на аўтамабілі, вядома ж, збегліся ўсе вясковыя дзеці. «Хто гэта мяне пазнаў?» – спытаў Манэргейм і паклікаў хлопчыка да сябе. Яны пэўны час пра нешта гутарылі, а потым той хлопчык увесь час успамінаў, якія ў Манэргейма былі сумныя вочы. І тое самае можна заўважыць на ўсіх яго здымках. Гэта позірк чалавека, які ўсведамляе наканаванасць людскога існавання, таямніцу жыцця і непазбежнасць смерці і ведае, што такое самота. Некаторыя жанчыны таксама ведалі гэтую ісціну, але яна іх больш абурала, чым вабіла. Разумелі яе і некаторыя мужчыны. «Шкада людзей, – сказала дачка Індры ў адным фільме Стрындберга. – Яны толькі злёгку дакранаюцца да існавання, да экзістэнцыяльнай сутнасці ды іншых пачуццяў». Манэргейм ніколі не хваліўся тым, што спасцігнуў экзістэнцыю існавання, хоць варожая прапаганда называла яго хвальком. У хвалька не можа быць вачэй, якія бачаць пакуту жыцця і свецяцца спагадаю да чалавека.



Генерал Хейнрыкс расказваў, што Манэргейм ніколі не згадваў у размовах і не абмяркоўваў філасофскія пытанні, літаратуру і мастацтва. Ён ніколі не чытаў мастацкія творы. Ён чытаў кнігі па гісторыі, біяграфіі славутых людзей, кнігі па стратэгіі ды тактыцы. Ён чытаў кнігу кітайца Сун Цзы «Мастацтва вядзення вайны».

Пра яе некалі расказаў генарал Айра, і Манэргейм папрасіў здабыць яму гэтую кнігу. Яму знайшлі французскі пераклад. Кніга была напісаная амаль 2500 гадоў назад, але выказаныя ў ёй ідэі вельмі адпавядалі сучаснасці. Вайну трэба лічыць палітычным сродкам. Да яе трэба ставіцца вельмі сурёзна. Армейскія часткі павінны рухацца паасобку, але весці бітву разам. У кнізе падкрэсліваліся і значэнне разведкі, і важнасць забеспячэння.

Генерал Айра стаў для Манэргейма нечым накшталт шчаслівага талісмана ці чарадзейнай палачкі. Гэта быў бясстрашны, немітуслівы, разважны чалавек. Генерал ніколі не даваў волю нервам, а таму яго вечнаю прымаўкай была фраза: «Нічога страшнага не здарылася». Для неспакойнага і надзеленага багатаю фантазіяй Манэргейма, які з-за гэтых рысаў свайго характару часта ўпадаў у прыгнечаны стан, Айра быў найлепшым супрацоўнікам. Так і хочацца сказаць, што ўласцівасці Айравай натуры ў пэўнай ступені вызначаліся характарам Манэргейма. Супрацьлегласці прыцягваюцца: так жонка летуценнага і мяккага характарам мужа заўсёды становіцца рэалісткай і чалавекам практычных дзеянняў. Айра павінен быў захоўваць халодны спакой і рацыянальнасць мыслення. Магчыма, і прэзідэнт Руці ў сваіх дачыненнях з Манэргеймам адыгрываў тую ж ролю. Яго таксама лічылі стрыманым чалавекам, які рэдка паказваў свае пачуцці, але ягоныя таленты і добрая галава выклікалі павагу. Ён часта ўранні тэлефанаваў Айру, які

рабіў яму справаздачу пра абставіны на франтах, каб праз пэўны час абмеркаваць гэта з Манэргеймам. Часам ён тэлефанаваў спачатку Манэргейму. Маршал вельмі злаваўся, што прэзідэнт лепей інфармаваны, і яму даводзіцца слухаць ад Айры тое, што некалькі хвілінаў таму ён чуў ад прэзідэнта Руці. Тады Манэргейм пачынаў вінаваціць Айру ва ўсіх грахах.

Айра быў нізкарослы і меў самую звычайную знешнасць. Па ягоных словах, ён быў самы маленькі афіцэр ва ўсёй арміі. Ён курыў груба нарэзаны моцны тытунь, які палілі лесарубы ды сплаўшчыкі. Часам, забаўляючыся са сваімі гасцьмі ў нумары гатэля амаль да рання, ён дазваляў сабе моцна выпіць, але на службу з'яўляўся хвіліна ў хвіліну.

Але Манэргейм дазваляў сабе адпускаць на адрас Айры жарты з серыі «паміж намі, мужчынамі». Неяк артылерыйскі генерал Нэнанен адмовіўся есці на снеданне аўсяную кашу, сказаўшы, што, па словах ягонай маці, Гасподзь адмервае кожнаму пэўную колькасць стравы, якую той мусіць з'есці. Дык, вось ён, Нэнанен, сваю аўсянку ўжо з'еў. Манэргейм на гэта адразу заўважыў, што, відаць, пры нараджэнні генерала Айры Творца змайстраваў для яго велізарную біклагу з гарэлкай.

Манэргейм увесь час трымаў Айру пры сабе, каб падкрэсліць сваю прадстаўнічасць, бо Манэргейм лічыўся самым статным афіцэрам у фінскай арміі, а генерал Айра – самым несамавітым.

Багатыя ды вытанчаныя людзі заўсёды імкнуцца пазбягаць непрыемнасцяў і непрыемных звестак, тым больш, што такія магчымасці ў іх ёсць. Пасля вайны генерала Айру павінны былі арыштаваць, як ваеннага злачынцу. Манэргейм, якому гэта было вядома, запрасіў Айру да сябе на абед, але ніяк не паказаў, што ведае пра будучы арышт свайго паплечніка. Ён толькі абмовіўся некалькімі словамі пра кантрабанду зброі, у якой пазней быў абвінавачаны генерал Айра. Руская кантрольная камісія патрабавала пакараць ваенных злачынцаў, і Айра трапіў у чорны спіс па рашэнні фінскага Камітэта па знешніх справах. Пасля абеду Манэргейм толькі параіў генералу схадзіць да прэм'ер-міністра Паасіківі. Гэта была іх апошняя сустрэча. Айру пасадзілі ў турму, дзе ён правёў два гады проста таму, што меў высокі чын і значную пасаду.

Паасіківі адзначае ў сваім дзённіку, што Манэргейм, зберагаючы свой вобраз папулярнага камандзіра і палітыка, не любіў гаварыць людзям прыкрыя словы і паведамляць непрыемныя навіны і звесткі. Гэтую задачу ён перакладваў на плечы іншых.



Манэргейм выдатна ведаў цану публічнасці. Ён асабіста адбіраў свае здымкі для публікацыі ў прэсе. Калі, напрыклад, вецер адхінаў крыссе летняга мундзіра, здымак не падыходзіў. Усё павінна было выглядаць як след. Падчас Зімовай вайны дазвалялася публікаваць толькі адзін здымак, на якім Манэргейм у акулярах сядзеў і працаваў за сталом у сваім кабінеце галоўнакамандуючага. Сам ён казаў, што на гэтым здымку падобны да пугача. Ніякай параднасці. Гэта было фота звычайнага, вельмі паджылага чалавека, які старанна выконвае канторскую працу на карысць сваёй фірмы. Так людзям даводзілася, што гэта той самы спрадвечны правадыр сялянаў, які іх вызваліў і ніяк не змяніўся з 1918 года.

## Ленінград

У час перамір'я генерал Талвела кіраваў Паўночнай транспартнай кампаніяй. Тысячы аўтамабіляў гэтай кампаніі перавозілі тавары з Петсама, паўночнага фінскага порта на Ледавітым акіяне, і з нарвежскага порта Ліінахамары ў Паўднёвую Фінляндыю і назад. Нават Швецыя карысталася паслугамі фінскіх перавозчыкаў. Але і ў мірны час Талвела рэгулярна, два разы на месяц, сустракаўся з Манэргеймам. Апроч таго, Талвела быў сябрам Саюза братоў па зброі. 5 чэрвеня 1941 года ён разам з сябрамі расчышчаў поле пад летні лагер непадалёк ад Хельсінкаў. Каля чатырнаццатай гадзіны на ўскрайку паляны з'явіўся салдат. Ён паведаміў, што Талвела павінен тэрмінова патэлефанаваць Манэргейму. Ён пазваніў, і Манэргейм загадаў яму ўвечары быць у Хельсінках у кабінеце рэстарана «Савоя». «Мне трэба яшчэ праверыць, як будзе працаваць дрэнаж і куды будзе сцякаць вада», – сказаў Талвела. «Вам трэба займацца не гэтым, а быць увечары тут», – адрэзаў Манэргейм.

А восьмай гадзіне вечара Талвела быў у кабінеце № 1 рэстарана «Савоя», дзе яго ўжо чакалі Манэргейм і генералы Вальдэн і Хейнрыкс. Маршал прама сказаў Талвелу, што пэўным днём Нямеччына нападзе на Савецкі Саюз. Гэта было абвешчана ў Зальц-

бургу на Ваенным камітэце пад кіраўніцтвам Хейнрыкса. Немцы спадзяваліся, што Фінляндыі нічога не застанецца, як нанесці магутны ўдар у кірунку Ленінграда. Дзеля гэтага патрэбна стварыць адмысловую вайсковую групоўку. Ці не захоча Талвела ўзначаліць гэтую групоўку? Пазней Талвела пісаў: «Я маланкава ўскочыў з крэсла і выгукнуў, што гэта самы вялікі момант у маім жыцці!» Манэргейм паведаміў, што з заўтрашняга дня генерал Талвела прызываецца на вайсковую службу і прыступае да выканання абавязкаў камандзіра корпуса ў горадзе Саванлінна. Гэта адбылося 10 чэрвеня 1941 года. Здаецца, Талвела проста невыразна памятае, што тады адбылося і пра што маршал гутарыў з генераламі.

Яго паставілі камандуючым не Ленінградскім кірункам, а палітычна бяспечнай акругай за Ладажскім возерам. Аповед Талвелы даверу не выклікае, але сам ён шчыра ў яго верыў і пазней апісваў гэтую сцэну не адзін раз. Ганс Метцгер, прэс-аташэ нямецкага пасольства, распавядаў, што, як паведаміў яму адзін нямецкі ваенны спецыяліст, Ваеннаму камітэту Хейнрыкса яшчэ 25 мая 1941 года была зробленая прапанова, каб фіны атакавалі Ленінград з поўначы, а немцы павялі б наступ з поўдня, і такім чынам разам авалодалі б горадам. Гэты ж ваенны спецыяліст казаў, што ўжо 4 чэрвеня 1941 года Манэргейм быў гатовы павесці наступ на Ленінград адпаведна з планам начальніка нямецкага Генеральнага штаба генерала Гальдэра. Ён не называў свайго інфарматара, але казаў, што крыніца вельмі надзейная. Калі Талвела правільна паказвае даты, то ён не мог быць тым інфарматарам. Міністр Кукканен таксама не верыў немцам, што Манэргейм, ці нехта з міністраў, ці прэзідэнт збіраліся ісці ў наступ на Ленінград. Можа быць, на падпітку ды за добрай бяседай Манэргейм і выказваў калі-небудзь такую думку... Ці, можа, гаворка ішла пра яго найвялікшую і даўнюю мару – захоп Пецярбурга ў 1917–1919 гадах? Цяпер гісторыя давала яму магчымасць узяць рэванш. І магчымасць была даволі рэальная. Але Манэргейм даўно і назаўсёды выкінуў з галавы гэтую ідэю. Нідзе пра гэта няма ніводнага пісьмовага сведчання, а калі такія й былі, дык усе зніклі. Фінляндыя цвёрда і паслядоўна трымалася ў баку ад ваенных дзеянняў на Ленінградскім кірунку. Па горадзе не страляла фінская артылерыя. І горад не бамбаваў і не руйнаваў ніводзін фінскі самалёт. З самага пачатку маршалавы халодны палітычны разлік і асцярожнасць грунтоўна патушылі сляпучае полымя пустых летуценняў.



## Станцыя Парандова

На пачатку 1942 года генерал Айра наведаў камандзіра 14-й дывізіі генерала Рааппану на ягоным камандным пункце. Туды ж запрасілі і камандзіра танкавай дывізіі генерала Лагуса. Яго войскі стаялі непадалёк, трошкі далей на поўдзень. Гэтыя тры маларослыя генералы бавілі час па-дамашняму ўтульна: апранутыя ў ваўняныя швэдары, яны раіліся ў цёплай карэльскай хаце недзе на задворках Еўропы. У Айры быў вялікі план, які мог бы змяніць увесь ход вайны і сусветнай гісторыі. А лёс ужо выбраў выканаўцаў гэтага грандыёзнага плана – генералаў Лагуса і Рааппану.

Айра ўсё астатняе жыццё верыў у рэальнасць свайго плана і ніколі не сумняваўся, што яго можна было ажыццявіць.

Фінскія войскі павінны былі захапіць чыгуначную станцыю Сароку на старой мурманскай чыгунцы і яе адгалінаванні на Архангельск. Такім чынам фіны перашкодзілі б саюзнікам пастаўляць ваенную дапамогу рускім. Але галоўнае ў плане Айры было не гэта. Правёўшы такую аперацыю, можна было акружыць рускія войскі на Кольскай паўвыспе і ў Запаляр'і. Яны траплялі б у мяшок і без дапамогі з мацерыка былі б не здольныя доўга супраціўляцца. А фіны перадалі б захопленую тэрыторыю і станцыю нямецкай арміі. Канцэнтрацыя нямецкіх войскаў на Поўначы была цалкам дастатковая, каб адбіць самыя шалёныя контратакі рускіх. Бо рускія, вядома, што ёсць моцы пастараліся б адбіць гэтую жыццёва важную чыгунку. Па разліках генерала Айры дзеля ажыццяўлення такой аперацыі хапіла б шасці нямецкіх дывізіяў. І калі б шляхі зносінаў былі надзейна заблакаваныя, паўночная групоўка рускіх войскаў страціла б усялякае ваеннае значэнне. Не атрымліваючы ніякіх падмацаванняў, рускім заставалася б толькі адно – пакінуць заблакаваны рэгіён па лёдзе Белага мора. А немцам, каб утрымаць яго, спатрэбіліся б зусім нязначныя сілы, затое асноўныя сілы яны маглі б перакінуць з Поўначы на болей важныя ўчасткі фронту. Адначасова скарацілася б і набыла выразны абрыс лінія фронту фінскіх войскаў. Цяпер яна была падобная да

парванай вяроўкі, ідучы толькі па водападзелах, тымчасам як у глухіх месцах ніякіх войскаў не было зусім, а значыць, не было і самой лініі фронту.

Бліжэй за ўсіх ад Сарокі стаялі злучэнні 14-й дывізіі генерала Раапланы. Яны падпарадкоўваліся наўпрост Манэргейму. Айра казаў, што Раапана не хацеў падпарадкоўвацца нікому, апроч маршала. Дывізія стаяла паміж нямецкімі і фінскімі войскамі, ізаляваная ад усіх астатніх вайсковых частак. Яна займала стратэгічна важную пазіцыю, і, напэўна, таму, знаходзілася ў непасрэдным падпарадкаванні Манэргейму.

Гэтыя тры нізкарослыя, але ўчэпістыя, як тэр'еры, генералы дамовіліся аб падзеле працы і абмеркавалі іншыя дэталі сваіх абавязкаў. Айра вярнуўся ў Стаўку з гатовым планам і перадаў яго Манэргейму. Айра вельмі ганарыўся гэтым планам. Пазней ён казаў, што за ўсю вайну гэта была адзіная аперацыя, якую ён сам спланаваў і хацеў ажыццявіць. Манэргейм адразу пачаў паціху, неўпрыкмет, сабатаваць гэты план. Ён не хацеў абражаць свайго памочніка простай адмовай, што неверагодна б таго пакрыўдзіла.

У сваіх мемуарах Манэргейм называе гэты план планам Айры. Увогуле, гэта адзіны выпадак, калі Манэргейм каментуе Айраву дзейнасць.

Манэргейм ацаніў план Айры і сказаў, што паедзе ў Хельсінкі пагутарыць з прэзідэнтам, а потым зможа прыняць рашэнне. І ён сапраўды паехаў да Хельсінкаў, але ўзяў з сабою не аўтара плана, генерала Айру, а яго памочніка падпалкоўніка Вільянена. Гэты памочнік і зачытаў прэзідэнту план. Сам генерал падазраваў, што Манэргейм не ўзяў яго з сабою знарок, бо баяўся, што ён зможа пераканаць прэзідэнта Руці. А Манэргейм тлумачыў гэта зусім іншымі, практычнымі мэтамі. Маўляў, Айра склаў добры план аперацыі, і ў гэтым выпадку мелася на ўвазе нішто іншае, як простае азнаямленне з планам вышэйшай палітычнай улады, да якой Айра не меў ніколі ніякага дачынення.

Пасля таго, як падпалкоўнік зачытаў план, Манэргейм папрасіў яго пакінуць іх сам-насам з прэзідэнтам. А вярнуўшыся ў Міккелі, паведаміў Айру, што прэзідэнт яго план збракаваў, як гэта відаць з ліста, які Руці даслаў Манэргейму. Ён даў Айру прачытаць гэты ліст. На думку генерала, нічога адмоўнага ў дачыненні да яго плана ў тым лісце не было. Агульны яго сэнс складаўся ў тым, што, калі аперацыя будзе прызнаная неабходнай з ваеннага пункту погляду, прэзідэнт падтрымае яе правядзенне. Але Манэргейм стаяў на тым, што ліст рэзка адмоўны, і таму пахаваў гэты дзёрзкі план назаўжды.



У сваіх мемуарах Манэргейм падрабязна аналізуе план гэтай аперацыі. Нямецкія войскі ў Лапландыі складаліся з самастойнай горна-стралковай арміі, камандаванне над якой прыняў генерал Эдуард Дзітл. На пачатку лютага 1942 года гэты новы камандарм прыехаў у фінскую Стаўку і прапанаваў Манэргейму захапіць Сароку сіламі фінскай арміі. Праз некалькі дзён фельдмаршал Вільгельм Кейтэль прыслаў Манэргейму ліст са Стаўкі Гітлера, дзе паўтараў гэтую прапанову і абяцаў моцную падтрымку нямецкай авіяцыі пры наступе фінскіх войскаў на станцыю Сарока. Манэргейм пісаў у мемуарах, што не прыняў гэтую прапанову па ваенных і палітычных прычынах. Ён паехаў да прэзідэнта Руці і выказаў яму сваю думку наконт гэтага мерапрыемства. Прэзідэнт цалкам з ім пагадзіўся.

Паводле Манэргеймавых мемуараў, у інтарэсах Фінляндыі было б лепш скараціць лінію фронту, пасунуўшы яе крыху наперад. А план Айры прадугледжваў наступ фінскіх войскаў уздоўж чыгункі паміж Сарокай і Петразаводскам да станцыі Парандова, якая знаходзілася ў адлегласці 50 кіламетраў на поўдзень ад станцыі Сарока. Манэргейм адмовіўся ад гэтай аперацыі таму, што рускія маглі палічыць, што яна мае на мэце захоп усяго чыгуначнага адгалінавання.

Манэргейм сцвярджаў, што паехаў да Руці, каб выказаць яму сваё адмоўнае стаўленне да гэтага плана, і быў вельмі здзіўлены, калі неўзабаве атрымаў ліст, у якім прэзідэнт, згадваючы яго адмоўныя довады супраць наступу на Парандову, называў іх сваімі. Гэты ліст зачытвалі ў час працэсу над ваеннымі злачынцамі. Манэргейм прызнаваўся, што пры чытанні ліста ў чалавека недасведчанага магло ўзнікнуць уражанне, што Манэргейм ужо нават даў загад пачаць наступ на Парандову, а Руці сваёй прэзідэнцкай уладай яго спыніў.

На тым жа працэсе Руці сцвярджаў, што Манэргейм падчас свайго візіту 24 сакавіка 1942 года, падрабязна апісаўшы план

Айры, пераконваў яго, што ўсё неабходнае дзеля захопу станцыі Парандовы гатова, і нават запэўніваў, што войскі стаяць на месцах у чаканні загаду.

Манэргейм жа ў сваіх мемуарах піша, што тут адбываецца нейкае непаразуменне або Руці падводзіць памяць.

Манэргейм абмежаваў наступ і ўвесь план Айры толькі чыгуначнай станцыяй Парандова, даючы такім чынам зразумець, што ў гэтым і заключаецца ўвесь план аперацыі. Мемуары прызначаліся для заходняга кніжнага рынку. Манэргейм не быў упэўнены, што іх надрукуюць у Фінляндыі з-за рэзкіх нападкаў на Савецкі Саюз. І нават між радкоў ён нічога не казаў пра станцыю Сарока, бо так ці гэтак ёй карысталіся заходнія дзяржавы.

Айра ў сваім плане ахопліваў амаль усё запалярнае ўзбярэжжа СССР. Але калі ацэньваць гэта рэалістычна, дык можна ўбачыць, што ён не заўважыў ці проста не звярнуў увагі на шматлікія важныя акалічнасці. А Манэргейм зазначыў найважнейшыя з іх. Мурманск быў портам, куды саюзнікі прыводзілі свае марскія канвоі са зброяй, ваенным рыштункам і новымі ўзорамі тэхнікі. Пасля таго, як фіны перарэзалі б чыгунку ў Сароцы, уся гэтая зброя і боепрыпасы, а таксама харчаванне засталіся б у распараджэнні паўночнай групоўкі рускіх войскаў. Людское папаўненне Савецкі Саюз змог бы наладзіць самалётамі. А магло стацца і так, што гэтая аперацыя паслужыла б штуршком для высадкі на Поўначы саюзных войскаў. Немцы ж, у сваю чаргу, стаялі ў глухамані і мелі вялікую патрэбу ў папаўненнях і ваенных прыпасах. Манэргейм улічыў і гэта. І якім чынам Айра мог ачысціць усё ўзбярэжжа Ледавітага акіяна ад рускіх войскаў? Гэты «адзіны» за ўсю вайну план, складзены Айрам, аказаўся даволі дзіўнаю птушкай. Яна добра і высока лятала, але ніяк не магла сесці на зямлю.

Пазнейшыя выказванні Айры наконт таго, што ўзяцце Сарокі перавярнула б усю ходу ваенных дзеянняў, паказваюць, што генерал, сапраўды, зусім не ўлічваў палітычных наступстваў ды іншых важных фактараў. Такім чынам, сваімі выказваннямі ён апраўдвае дзеянні Манэргейма. Айра чытаў Манэргеймавы мемуары і добра ведаў, што той знаходзіць яму, як свайму падначаленаму, пэўныя апраўданні ў гэтай справе. Але Айра не скарыстаўся гэтым, а паранейшаму ўпарта трымаўся свайго перканання.



## Візіт Гітлера

Свой дзень нараджэння 4 чэрвеня 1942 года Манэргейм намерваўся правесці ў паездцы на фронт. Такім чынам ён хацеў пазбегчы афіцыйна-дзяржаўнага святкавання гэтай даты. Сваёю паездкай Манэргейм хацеў выказаць павагу да дзеючай арміі, падкрэсліць яе значэнне і паказаць усім, што ён таксама салдат гэтага войска. Але прэзідэнт Руці і чальцы ўрада лічылі, што трэба арганізаваць святкаванне. Руці заявіў, што дзеля гэтага яны прыедуць, куды Манэргейм скажа. І Манэргейм зрабіў выбар. Свята адбылося ў цягніку, у двух счэпленых вагонах-рэстаранах. Госці меліся прыехаць па чыгунцы з Хельсінкаў. Непадалёк быў і важны аэрадром Імала, куды маглі прыляцець замежныя госці. Буяла зялёнымі фарбамі лета, блішчалі воды блізкага возера Сайма.

Прэзідэнт асабіста заняўся арганізацыяй свята і склаў меню ўрачыстага абеду.

Аб прыездзе Гітлера фінам паведамілі літаральна ў апошнюю хвіліну. Манэргейм даведаўся пра гэта напярэдадні а 17 гадзіне. Такім чынам немцы клапаціліся пра бяспеку свайго фюрэра. На здзіў, у фінскіх генералаў склалася аб Гітлеры даволі прыхільнае ўражанне. Замест дэмагога з пенай на вуснах, яны ўбачылі звычайнага чалавека, дзелавітага і стрыманага, які крыху няўцямна гаварыў пра свае пралікі і шкадаваў аб іх. На думку генерала Айры, Гітлер быў падобны да простага фінскага селяніна.

Абед пачаўся ў 13.15. Меню складалася з яек, пірагоў з рысам і капустай, варанага ласося, шпігаванай гусі, фруктовай салаты і кавы. Гітлер пакаштаваў пірага, але замест рыбы яму падалі суп са спаржы, а замест гусі – пудынг з гародніны, які камендант прэзідэнцкага палаца прывёз сабою з Хельсінкаў. Гітлер піў толькі мінеральную ваду, якую ў вагон прынёс нямецкі вайсковец. На працягу ўсяго абеду гэты вайсковец стаяў ля дзвярэй вагона. Фруктовую салату для Гітлера не сталі прыпраўляць вішнёвай вадой, як для ўсіх астатніх.

Абед у двух вагонах быў накрыты на 70 асобаў. Свае ўражанні аб Гітлеры Манэргейм выказаў толькі сваёй сястры Еве ды зяцю Грыпенбергу. Маршал заўважыў, што Гітлер набраў вагі, скура на твары сапсавалася, але яго простыя і натуральныя манеры многім прыйшліся даспадобы.

Прыезд Гітлера быў для Манэргейма ды фінскіх палітыкаў падзеяй даволі трывожнай. Пасля яго ад'езду ўсе ўздыхнулі з палёгкай. Нямеччына не вылучыла ніякіх новых патрабаванняў. Нічога не сказаў Гітлер і пра далейшае ваеннае супрацоўніцтва. Але былі ўсе падставы баяцца негатыўнай рэакцыі сусветнай грамадскасці. І такая рэакцыя праявілася неадкладна. Дзяржаўны дэпартамент ЗША выказаў паслу Фінляндыі занепакоенасць, апасаючыся, што Гітлер патрабаваў ад фінаў захапіць Сароку – станцыю, па якой ішла заходняя дапамога Савецкаму Саюзу. Пасля таго, як Манэргейм у сваю чаргу нанёс візіт у Нямеччыну, ЗША зачыніла сваё консульства ў Фінляндыі і таго ж запатрабавала ад Фінляндыі ў ЗША. На агульную думку, Фінляндыя была цяпер прывязаная да Нямеччыны яшчэ больш, чым раней. Манэргейм, па сваёй заўсёднай звычцы, чакаў самага горшага. Прайшоў час, але ад Нямеччыны не было ніякіх патрабаванняў, і Манэргейм пацікавіўся у шведскага даследчыка Свена Гедына, які асабіста ведаў Гітлера, чаму той усё-ткі прыязджаў да яго на дзень нараджэння. Гедын адказаў, што Гітлер высока цэніць Манэргейма і ягоны візіт быў знакам глыбокай павагі да фінскага маршала. Недаверлівы Манэргейм палічыў такі адказ занадта добрым і простым, каб ён быў праўдай.

З Гітлерам Манэргейм паводзіў сябе вельмі карэктна і стрымана. А калі яны пайшлі ў вагон-салон, каб там пагутарыць сам-насам, іх размова ўпотай была запісаная. Гітлер ажыўлена гаварыў пра незвычайную ваенную моц Савецкага Саюза – колькасць знішчаных савецкіх танкаў дасягала 24 тысячаў. Манэргейм толькі зрэдку паўтараў асаобныя фразы субяседніка, імітуючы захапленне і жах.

Ён не вытрымаў толькі адзін раз – калі міністр замежных спраў Фінляндыі Вітцінг падышоў да яго з сумесным нямецка-фінляндскім камюніке, прысвечаным візіту Гітлера. Манэргейм якраз садзіўся ў машыну, каб правесці Гітлера да аэрадрома, завяршаючы гэты першы і апошні візіт фюрэра ў Фінляндыю. Візіт доўжыўся шэсць гадзін і пятнаццаць хвілін. Манэргейм нахмурыўся і недаверліва паглядзеў на паперу. У камюніке гаварылася пра фінска-нямецкае ваеннае братэрства. Манэргейм тонам, які не церпіць пярэчання, заявіў, што з такімі дакументамі да яго не варта і падыходзіць.



Праз пару дзён пасля дня нараджэння Манэргейм паехаў у Хельсінкі, каб паглядзець, як ідуць справы ў сямідзесяці пісарчукоў, якія адказвалі на тыя сем ці восем тысяч віншаванняў і падарункаў, якія прыслалі маршалу розныя людзі з усёй Фінляндыі.

Праз месяц Манэргейм зрабіў візіт у Нямеччыну ў адказ на візіт Гітлера. Той прыслаў яму свой асабісты адзінаццацімясцовы самалёт з крэсламі і сталамі. І гэты раз Гітлер таксама нічога не запатрабаваў ад Фінляндыі. Усё прайшло строга пратакольна.

Пазней немцы распавядалі, што Гітлер быў вельмі рады, атрымаўшы ў падарунак ад Манэргейма фінскі аўтамат «Суомі» ў прыгожым футарале са срэбнай таблічкай. А фіны, якія суправаджалі Манэргейма, казалі, што Гітлер нават і не паглядзеў на гэты падарунак і загадаў неадкладна знесці яго куды далей. Але фіны памыляліся, а немцы казалі праўду. Бо наступнаю раніцай Гітлер адправіўся пастраляць з таго аўтамата і быў вельмі задаволены якасцю зброі. Ён радаваўся як дзіця, што яна належыць асабіста яму. Хутчэй за ўсё, Гітлеру спадабалася, што да яго ставяцца, як да сапраўднага салдата. Гітлер, як і Манэргейм, быў палоннікам папераў ды пісьмовага стала, а таму цешыўся пры кожнай нагодзе ўхіліцца ад выканання звычайнага распарадку.

Манэргейм наведаў генерала Гальдэра, начальніка штаба сухапутных войскаў Нямеччыны, хоць той і быў у апале. У хуткім часе Гальдэра звольнілі са службы і адправілі ў канцлагер.

Апошнім Манэргейма прыняў у сваім маёнтку Карынхалле Герынг. Усё было на старажытнанямецкі лад, у вялізным агменю палалі вялікія бярвенні. Манэргейм звярнуў увагу на тыя змены, што адбыліся з Герынгам. Той жыў сярод нарабаванага багацця і раскошы, нібы персідскі шах. Ён падараваў Манэргейму скрынку найлепшага французскага шампаню, сказаўшы, што ў яго ў сутарэннях маецца яшчэ 35000 такіх бутэлек на штодзённыя патрэбы, так што іх не выпіць і за ўсё жыццё.

### Адпачынак у Швейцарыі

У снежні 1943 года Манэргейм на фінскім ваенным самалёце вылецеў у Швейцарыю, каб крыху адпачыць і паправіць здароўе. Вальдэн пазваніў Талвелу ў Берлін, дзе той быў афіцэрам сувязі, а практычна – вачыма і вушамі Манэргейма ў Нямеччыне. Талве-

ла атрымаў загад зрабіць усё магчымае, каб немцы не даведаліся, хто ляціць на самалёце, што рабіў пасадку ў Берліне дзеля дазапраўкі. Было сказана, што ў самалёце знаходзіцца хворая жонка начальніка фінскага Генеральнага штаба, якая ляціць у Швейцарыю падлячыцца. Але Талвела здагадаўся, пра каго гаворка. Тым не менш, на аэрадром ён прыехаў у суправаджэнні нямецкага маёра фон Альбедзіла, які быў жанаты на шведскай графіні фон Эсэн і выдатна гаварыў па-шведску. Талвелу гэты маёр вельмі падабаўся, і ён меркаваў, што Манэргейму ён спадабаецца таксама, а можа, нават будзе карысны. Аднак Манэргейм раптам узарваўся і ў нечакана грубых выразах, даволі распаўсюджаных у арміі, але зусім не ўласцівых самому Манэргейму, адрэагаваў на рапарт Талвелы.

– Чорт раздзяры! Я ж сказаў, што не хачу ні з кім сустракацца, а вы прывалаклі сюды нейкага фон Альбедзіла! – крычаў Манэргейм на афіцэра, які падняўся на борт самалёта. Фон Альбедзіл тым часам пачціва чакаў на лётным полі. Урэшце Манэргейм выйшаў і ветліва павітаўся з нямецкім афіцэрам, нічым не выдаўшы сваёй злосці. Ён увогуле не любіў казаць людзям непрыемныя словы. Ён дазваляў сабе гэта толькі ў дачыненнях з самымі блізкімі сябрамі.

Талвела быў у роспачы. Асабісты Манэргеймаў лекар, доктар Лаўры Калайя, стаў суцяшаць палкоўніка, шапнуўшы, каб той не браў усяго гэтага да галавы: маршал проста на добрым падпітку. Аказалася, што доктар, баючыся, каб Манэргейму падчас пералёту не зрабілася блага, старанна напампоўваў яго каньяком.

Талвела адвёў Манэргейма ў будынак на ўскрайку лётнага поля. Там ім адвялі асобны пакой, дзе палкоўнік змог пачаставаць Манэргейма шампанем. А нямецкі маёр фон Альбедзіл запрасіў ад'ютатнта і доктара ў суседні домік на аэрадроме. Менавіта дзеля гэтага Тадвела і ўзяў яго з сабою, каб мець магчымасць перагаварыць з маршалам сам-насам.

Даклад Талвелы пра тое, што яму ўдалося ўбачыць падчас знаходжання ў Нямеччыне, Манэргейм выслухаў прыхільна, напрыканцы паабяцаўшы, што, калі вайна ўзгарыцца з новаю сілай, перавядзе палкоўніка на фронт. Апроч таго, ён дадаў, што, калі справа пойдзе да заключэння міру, Нямеччына, вядома, пакіне Фінляндыю выкручвацца саму. Але ставіцца да Нямеччыны трэба лаяльна і карэктна і як мага часцей звяртацца да рыцарскіх пачуццяў немцаў, якія, нягледзячы на ўсю нямецкую жорсткасць, у іх ёсць, і ім падабаецца, калі пра гэта згадваюць. Але ніякія саюзы і дамовы з Нямеччынай заключаць не трэба, і не варта нават абмяркоўваць такія магчымасці. Калі вялікія дзяржавы стомяцца ад вайны, яны могуць заключыць мір у любы момант, а маленькія дзяржавы зноў стануць дробнымі разменнымі манеткамі ў гэтай гульні.



Самалёт мусіў прызямліцца ў Штутгарце, дзе праводзіўся пашпартны кантроль. Тут высветлілася, што адзін рухавік у фінскім самалёце мае нейкую загану, і яго трэба мяняць. Але побач на полі стаяў серабрысты швейцарскі «Дуглас», і Манэргейму са світай дазволілі ў яго перасесці. Іх сустракаў начальнік пратакольнага аддзела швейцарскага Міністэрства замежных справаў. Ён узяўся арганізаваць усё, што трэба, і прыставіў да Манэргейма двух чалавек са службы бяспекі, якія пастаянна следавалі за ім. Манэргейму гэта прыйшлося недаспадобы, але прадстаўнік Міністэрства замежных справаў навёў яго на думку, што для Фінляндыі вельмі важна мець працаздольных, добра выхаваных і адукаваных дыпламатаў, якія ўмелі б яшчэ й падпарадкоўвацца дысцыпліне. У Манэргейма ўзнікла такое пачуццё, што хутка абаронай краіны будуць займацца не вайскоўцы, а дыпламатычныя прадстаўнікі за мяжой. Ён так і напісаў пра гэта ваеннаму міністру Рудольфу Вальдэну, калі дабраўся нарэшце да Лугана. Швейцарскія мір і спакой, элегантныя і руплівыя чыноўнікі паказалі яму зусім іншы свет – цалкам адрозны ад таго, які вось ужо два гады атачаў галоўнакамандуючага ў Стаўцы, дзе ён не бачыў нікога, апроч вайскоўцаў. І гэты вельмі прыгожы і прывабны свет прымусіў яго паверыць у рэальнасць хуткага міру. Але гэта была толькі кароткая вясна, а за ёй зноў пачалася доўгая і суворая зімовая сцюжа.

Кампанія фінаў сядзела ў рэстаране «Бельвю» за вуглавым столікам. Манэргейм размясціўся за столікам у куце насупраць, далей ад цікаўных вушэй сваіх спадарожнікаў, у кампаніі са славутай прыгажуняй, нязменнай спадарожніцай, а з сярэдзіны 1944 года – жонкай добра вядомага еўрапейскага плэйбоя, індыйскага прынца Ага Хана.

Мяркуючы па ўсім, Манэргейм быў знаёмы з будучай індыйскай прынцэсай яшчэ з даваенных часоў. Станістая жанчына працінальнае прыгажосці, яна яшчэ ў юнацтве выглядала даволі дарослай. Гэта была француженка Івона ля Брус. Як толькі Манэргейм прыехаў у Швейцарыю, яна адразу затэлефанавала ў фінскае пасольства і спытала, ці можа пабачыцца з маршалам. «Адкуль вы ведаеце, што Манэргейм тут? − здзіўлена папытаўся пасольскі чыноўнік. − Ён падарожнічае інкогніта, і афіцыйна яго ў Швейцарыі няма!» Мадмуазэль адказала, што пра гэта ёй паведамілі непасрэдна з Фінляндыі. Можа быць, гэта зрабіў сам Манэргейм. Як бы там ні было, здымак Івоны ля Брус адразу ўзнік на стале ў маршальскім пакоі.

Гэтая чароўная, добра вядомая ўсёй Еўропе прыгажуня, была своеасаблівым кур'ерам паміж Манэргеймам і Ага Ханам, якія былі грамадзянамі краінаў-праціўнікаў і не лічылі магчымым сустракацца адкрыта. Больш за тое, яны нават пазбягалі трапляць адзін аднаму на вочы. Аднойчы, калі Манэргейм выходзіў з гатэля, Ага Хан схаваўся за калону ў вестыбюлі, каб ніяк не паказаць, што яны знаёмыя, і не вітацца з маршалам пры сведках.

Ага Хан быў на дзесяць гадоў маладзейшы за Манэргейма, але не вызначаўся здароўем і быў тоўсты. Свецкая публіка лічыла, што Ага Хан прывабіў самую прыгожую жанчыну Еўропы сваімі незлічонымі мільёнамі, але цяпер у Манэргейма было болей шанцаў, бо часова Ага Хан прыхварэў. Зрэшты, старонка інтымных стасункаў Манэргейма і мадмуазэль ля Брус так і засталася ненапісанай.

Манэргейм ужо дзесяткі гадоў знаходзіўся ў колах, якія належалі да вышэйшага свету Еўропы, ён быў знаёмы з вялікаю колькасцю вядомых людзей і сам належаў да гэтага класу як сацыяльна, так і па перакананнях. Але вайна пахавала былое бесклапотнае жыццё. Манэргейм нястомна працаваў і набыў важкае значэнне ў еўрапейскай палітыцы. Хоць да вайны ён славіўся як чалавек бесturботны.

Манэргейм прыехаў у Швейцарыю інкогніта і хаваў сваё імя пад псеўданімам, над якім думаў не надта доўга, выбраўшы прозвішча вельмі падобнае да сапраўднага − «Маргем». Але схавацца ад швейцарцаў спадару «Маргему» ўсё адно не ўдалося, і шмат хто прыходзіў прасіць у яго аўтограф. Адзін чалавек папрасіў яго нават распісацца на нямецкай газэце «Сігнал», дзе на ўсю першую паласу быў вялікі Манэргеймаў здымак. Але на расчараванне аматара рэдкіх аўтографаў Манэргейм падпісаўся «Маргем», хоць і лічыў, што здымак у газэце быў вельмі ўдалы.



Рускія аб прыездзе Манэргейма даведаліся адразу і іхняя служба франтавой прапаганды пачала бесперапынна вяшчаць, што Манэргейма выслалі з Фінляндыі, а на ягонае месца паставілі нямецкага генерала Хейнрыкса, а значыць, уся Фінляндыя трапіла ў васальную залежнасць ад Нямеччыны.

Аднойчы Манэргейм адпачываў у шэзлонгу. Міма праходзіла паджылая свецкая дама, якая павіталася з імі, зрабіўшы кніксен. Каб адказаць на прывітанне жанчыны належным чынам, маршал адразу ўскочыў... і зноў падвярнуў калена, параненае шмат гадоў таму. Нага распухла, яго пачалі лячыць, прыкладваючы борныя кампрэсы.

Гэтым часам у Швейцарыі папраўляў здароўе і будучы міністр замежных справаў Фінляндыі Карл Энкель. Манэргейм папрасіў яго наведаць рэдактара франкамоўнага часопіса «Журналь дэ Жэнэв» Жана Мартэна, які жыў у сваім маёнтку непадалёк ад Эневы. Энкель прывёз да Мартэна рэкамендацыйны ліст, у якім Манэргейм пісаў, што Карл Энкель − яго стары сябар і чалавек надзейны. Маршал прасіў Энкеля задаць Жану Мартэну толькі адно пытанне і спадзяваўся, што той адкажа на яго шчыра. Мартэн згадзіўся адказаць.

− Маршал хоча ведаць, калі скончыцца вайна, − сказаў Энкель.

Мартэн адказаў, што маршалу гэта павінна быць вядома лепш, чым яму.

− Маршал прасіў вам сказаць, што ён атрымлівае інфармацыю толькі з аднаго боку барыкады, а вы атрымліваеце звесткі адусюль.

− Тады можаце перадаць маршалу, што немцы не прайграюць вайну − яны яе ўжо прайгралі.

Манэргейм і сам даўно прыйшоў да такой высновы. Ён доўга падтрымліваў сувязь в Жанам Мартэнам. У студзені 1945 года

ён напісаў Мартэну ліст на прэзідэнцкім бланку, дзе расказваў пра цяжкае становішча Фінляндыі і мноства праблемаў, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння. Жыць даводзіцца толькі адным днём, трэба старацца ўмацоўваць дух і волю да супраціўлення. Рэзкае сутыкненне з брыдкай рэчаіснасцю прыносіць пэўную карысць, бо тады разумееш, што трэба перанесці духоўныя пакуты, каб скласці рэальнае ўяўленне аб жыцці.

Да такой вось глыбокай асабістай філасофіі жыцця прыйшоў Манэргейм у старасці. У тым лісце ён дадаваў таксама, што духоўныя пакуты вучаць ісці па жыццю з высока паднятаю галавой.

## Турэцкі кабінет

У кастрычніку 1943 года у Міккелі, дзе была Стаўка фінскага камандавання, прыехаў генерал Йодль. Да немцаў дайшлі чуткі, што фіны занепакоеныя лёсам ленінградскага і эстонскага кірункаў, дый наогул будучымі планамі нямецкага камандавання. Фіны баяліся, што немцы адступяць і пакінуць Фінляндыю адну абараняць усё ўзбярэжжа Фінскай затокі. Немцы ж, у сваю чаргу, запэўнівалі, што фартыфікацыйныя работы на захад ад Пэйпсіярві і Нарвы – гэта толькі прафілактычныя меры і не больш за тое.

Ведаючы гэта, нямецкая Стаўка спачатку прыслала да фінаў у Міккелі свайго афіцэра сувязі – генерала Эрфурта. Пасярэднікам у гэтай справе быў начальнік Генеральнага штаба Фінляндыі генерал Хейнрыкс. Эрфурт вельмі здзівіўся, калі міністр Таннэр пачаў казаць пра здачу рускім захопленых у 1941 годзе тэрыторыяў Усходняй Карэліі. Бо гэта ж вяло да яўнага аслаблення становішча самой Фінляндыі.

Эрфурт прапанаваў нямецкай Стаўцы прысласць у Фінляндыю Йодля, каб супакоіць Манэргейма. Эрфурт меў у Міккелях свой уласны штаб і лагер, а таму вельмі добра бачыў, якія змены адбыліся ў агульным настроі фінаў. Прыезд Йодля быў прызначаны на 14 кастрычніка 1943 года.

Манэргейм вельмі ўзлаваўся, калі пачуў, што Йодль хоча сустрэцца тут, у Міккелях, адначасова і з ім, і з камандзірам Лапландскай арміі генерал-палкоўнікам Дзітлам. Такая сустрэча паніжала б Манэргейма да ўзроўня генерал-палкоўніка, і ўвогуле гэта выглядала б так, быццам вышэйшы нямецкі начальнік радзіцца з



двума падначаленымі яму камандзірамі. Манэргейм загадаў Хейнрыксу патэлефанаваць Эрфурту і сказаць, што маршал вельмі ацаніў бы, калі б Йодль сустрэўся з ім у першы ж дзень свайго візіту. А сустрэцца з Дзітлам Йодль зможа і на другі дзень, напрыклад, у рэзідэнцыі афіцэра сувязі генерала Эрфурта. Такая размова паміж нямецкімі генераламі выглядала б абсалютна натуральна: нямецкія вайскоўцы вырашаюць свае службовыя справы.

Эрфурт добра разумеў, у якім чаравіку муляе. Манэргейм, як заўсёды, быў непахісны адносна розных адценняў этыкету.

На сустрэчы Йодль патлумачыў, што становішча Нямеччыны не такое ўжо й дрэннае. Лічыцца, што высадку заходніх краінаў на мацярык можна будзе лёгка адбіць. Манэргейм гэтаму не надта верыў, але насцярожыўся, калі пачуў разважанні Йодля наконт таго, што адбудзецца, калі Фінляндыя выйдзе з вайны. Йодль прааналізаваў магчымасці заключэння сепаратнага міру і сказаў, што з нямецкага пункту погляду вайна на баку Нямеччыны не нясе ніякай небяспекі для Фінляндыі. Тут упершыню з нямецкім кіраўніцтвам гаварылася аб магчымасці заключэння сепаратнага міру.

Йодль выехаў з Фінляндыі, а Манэргейм накіраваўся ў Хельсінкі і арганізаваў у Дваранскім сходзе маленькі турэцкі абед. Ён запрасіў прэм’ер-міністра, старшыню парламента, міністраў абароны і замежных справаў Вальдэна і Таннэра. Манэргейм хацеў абмеркаваць з імі становішча.

Турэцкі кабінет знаходзіўся у задняй частцы рэстарана ў доме Дваранскага сходу на другім паверсе. Вокны кабінета выходзілі ў вялікую рэстаранную залу, адкрываючы агляд у бок вестыбюля. У кабінет з залы вяла вузкая лесвіца. Швейцар на гэтай лесвіцы мог не прапусціць любога непажаданага госця.

У Таннэра склалася ўражанне, што Манэргейм хацеў выгаварыцца і тым самым аблегчыць душу. Маршал рэзка асудзіў знешнюю палітыку Фінляндыі. Стасункі з Нямеччынай пагаршаліся дзень пры дні, і гэта вельмі раздражняла немцаў. Газэты і палітыкі захлыналіся, абмяркоўваючы тэму сепаратнага міру і патрэбнасць яго заключэння. Гэта злавала немцаў, але ў медаля быў і другі бок: гэта мела свой уплыў і на фінскую армію, на яе баявы дух і баяздольнасць. Калі Фінляндыя заключыць сепаратны мір,

Нямеччына парве з ёй усе дачыненні, а чакаць дапамогі ніадкуль не давядзецца. Швецыя дапагчы не зможа. З Англіяй мы ў вайне. А яшчэ больш раздражняць вялікія дзяржавы – вельмі неразумна. Бо Савецкі Саюз вельмі раздражняецца, калі гаворка заходзіць пра палітычную падтрымку Фінляндыі Злучанымі Штатамі ці пра супрацоўніцтва Скандынаўскіх краінаў. Безупынныя размовы пра тэрміновае заключэнне сепаратнага міру і яго непазбежнасць аслабляюць становішча Фінляндыі. Усякі дзяржаўны дзеяч, які валодае пачуццём адказнасці за дзяржаву, можа дазволіць сабе сказаць такое толькі аднойчы. І гэтага дастаткова. Пасля – трэба замаўчаць.

А закончыў свой выступ Манэргейм, узарваўшы невялікую бомбу, сказаўшы, што ходзяць чуткі, быццам Фінляндыя ўжо цяпер рыхтуецца здаць Усходнюю Карэлію, адзіную сваю казырную карту ў будучых мірных перамовах. Хоць яе да гэтых самых перамоваў якраз і трэба трымаць. І вінаватыя ў такой сітуацыі сядзяць тут, за гэтымі столікамі.

Таннэр разумеў Манэргеймавы аргументы. Яшчэ раней ён рэзка запатрабаваў у фінскага народа трымаць рот на замку. Месяц назад, выступаючы ў Рабочым доме ў Хельсінках, ён загадаў: «Рот на замок!» Трэба заканчваць усе публічныя размовы пра заключэнне міру. Але ён быў не толькі дзяржаўным палітыкам, але і кіраўніком працоўнага люду, і яму было цяжэй, чым каму іншаму, казаць і рабіць такое.

Канец Манэргеймавай прамовы быў спакайнейшы за яе пачатак. Маршал падкрэсліў, што становішча вельмі хісткае і няяснае, а таму кожнае дзеянне трэба ўзважваць вельмі асцярожна і з халоднаю галавой. А найлепшая тактыка ў такой крызіснай сітуацыі – не распускаць языкі. Такую ж прамову Манэргейм сказаў пазней у Стаўцы ў прысутнасці Хейнрыкса.

8 лютага 1944 года Манэргейм сустрэўся ў Хельсінках з прэзідэнтам Руці. Ён сказаў прэзідэнту, што Нямеччына фактычна ўжо прайграла вайну супраць Расеі і цяпер Фінляндыі не варта спадзявацца, што ўмовы міру будуць лепшыя, чым пасля Зімовай Вайны. Дзеля чаго Расеі, перамогшы ў вайне, прапаноўваць Фінляндыі болей мяккія ўмовы міру? Руці таксама лічыў, што мірныя ўмовы будуць відавочна больш жорсткія, чым пасля Зімовай вайны.



Прэзідэнт спытаў, як Фінляндыі можна было б пазбавіцца ад нямецкіх войскаў, і Манэргейм адказаў, што зрабіць гэта будзе вельмі цяжка. Тады Руці са страхам выказаў меркаванне, што супраць Нямеччыны можа спатрэбіцца распачаць вайну, а гэта ўнясе вялікі раскол у грамадства і здольна нават справакаваць грамадзянскую вайну. Ён спытаў, ці спадзяецца Манэргейм, што афіцэрскі корпус будзе выконваць загады і паверне зброю супраць любога. Манэргейм запэўніў, што сваім афіцэрам ён цалкам давярае.

Тады Руці пачаў аналізаваць ход вайны. Калі рускія мірныя ўмовы будуць занадта цяжкія, вайну давядзецца працягваць любымі сродкамі. Руці сказаў, што ён гутарыў з ваенным міністрам і той выказаўся, што трэба разгарнуць фартыфікацыйныя работы на Карэльскім перашыйку і перакінуць туды дадатковыя войскі, бо калі рускія пачнуць вялікае наступленне, то будуць наступаць менавіта там – па-першае, таму што гэта самы кароткі і лёгкі шлях, а галоўнае, таму што там мала фінскіх войскаў.

Манэргейм адказаў, што ўжо аддаў загад перакінуць у гэты раён сваю адзіную бранятанкавую дывізію з Усходняй Карэліі. Апроч таго, лінію абароны на поўдзень ад горада Ухтуа згадзіліся ўтрымліваць немцы. Такім чынам, там вызваляецца адна дывізія, якую таксама перакінуць на Карэльскі перашыек. Манэргейма вельмі пакрыўдзіла і засмуціла, што прэзідэнт Руці, чалавек цывільны, умешваецца ў ваенныя справы і, больш за тое, абмяркоўвае ход вайны ў першую чаргу не з ім, галоўнакамандуючым, а з ваенным міністрам.

Начальнік аператыўнага аддзела палкоўнік Ніхтыля паведаміў Манэргейму, што змена войскаў на напрамку Ухтуа патрабуе пэўнага часу, і фінская дывізія проста не паспее перадыслакавацца адтуль да галоўных падзеяў на Карэльскім перашыйку. На яго думку, туды лепш было б перавесці нейкую іншую дывізію, а не тую, што трымала абарону ў Паўночнай Карэліі. Генерал Айра трымаўся такой самай думкі. Але Манэргейм не прыняў гэтую прапанову: у палітычнай гульні ў яго была адзіная казырная карта – Усходняя Карэлія, і маршал хацеў яе ўтрымаць. Гэта было ясна, як дзень, пра што Манэргейм і сказаў у турэцкім кабінеце Дваранскага сходу.

## Вялікае наступленне рускіх

2 мая 1944 года палкоўнік Лехмус дакладваў Манэргейму дадзеныя разведкі аб становішчы на франтах. Усё сведчыла аб тым, што ў хуткім часе пачнецца вялікае наступленне рускіх войскаў. У сярэдзіне даклада Лехмус перапыніўся і пайшоў у свой кабінет па карты. Вяртаючыся, ён сутыкнуўся ў дзвярах з генералам Айрам. Той злосна прасіпеў, што Лехмусу зноў удалося напалохаць Вярхоўнага галоўнакамандуючага. Пасля даклада Лехмус заўшоў да генерала, каб атрымаць тлумачэнні. Генерал быў раззлаваны, што галоўнакамандуючаму дакладваюць тое, што прыгнятальна дзейнічае на яго псіхіку. Аднак Айра мусіў прызнаць, што рускія войскі сапраўды канцэнтруюцца. Тым не менш, на думку Айры, фіны здольныя ўтрымліваць свае пазіцыі на Карэльскім перашыйку яшчэ не меней за месяц. Калі ж Лехмус паведаміў гэтую Айраву думку Манэргейму і Вальдэну, тыя нічога не адказалі, а толькі пацiснулі плячыма.

8 мая 1944 года фінскі ваенны аташэ ў Стакгольме палкоўнік М.К. Стывен даслаў начальніку Генштаба Хейнрыксу сакрэтны даклад, у якім паведамляў, што паводле звестак, якія ён атрымаў ад японскага ваеннага аташэ, японская разведка выявіла факт канцэнтрацыі чатырох савецкіх арміяў непадалёк ад Ленінграда, магчыма, дзеля таго, каб скарыстаць іх супраць фінаў. Цяпер гэтыя арміі, змучаныя папярэднімі баямі, не маюць поўнага асабовага складу, але ў чэрвені-ліпені зноў набудуць былую сілу. Ні Айра, ні Хейнрыкс ні словам не абмовіліся пра гэты рапарт Манэргейму, у чым самі прызналіся палкоўніку Стывену, калі той прыехаў у Міккелі.

Праз тыдзень пасля пачатку савецкага наступлення Манэргейм сказаў Лехмусу, што верыў яго дакладам менш, чым планам і меркаванням Айры. Але ў любым выпадку ён не паспеў бы нічога зрабіць − у Фінляндыі проста не хапала людзей. Фінская армія была маленькай арміяй маленькай краіны. І калі ўвесну палітыкі папракалі Манэргейма тым, што на Карэльскім перашыйку дзеля супрацьстаяння рускім на Ленінградскім кірунку замала войскаў і туды варта перакінуць злучэнні з Усходняй Карэліі, маршал іранічна спытаўся: а хіба ва Усходняй Карэліі войскаў лішак?

За пяць дзён да пачатку вялікага наступу рускіх Манэргейму споўнілася 77 гадоў. Генеральны дырэктар буйной прамысловай кампаніі Вяйнё Коцілайнен наладзіў вялікі святочны стол. Яго ўпрыгожвалі 700 цюльпанаў. Ціха цурчаў зроблены на падлозе вадаграй. Мэтрдатэль апрануў свой лепшы фрак. Кухар, хутчэй за ўсё, быў мясцовы, бо ведалі, што Манэргейм вялікі аматар рускай кухні. У меню былі гарачыя закускі, суп з ласося, сядло барана з салатай і пірагом з садавіны. Пасля абеду Манэргейм пайшоў на кухню, каб падзякаваць кухару. Маршал гаварыў з ім па-руску. А калі вярнуўся ў Міккелі, выказаўся наконт якасці стравы адмоўна. Соус для піражкоў, якія падаваліся да супа, быў на акунёвым булёне, а не на булёне з плотак, як таго патрабаваў рэцэпт. Нікому і ў галаву не прыйшло лавіць такую беспародную рыбу, як плотка, дзеля такой урачыстай падзеі. А ўвогуле Манэргейм не любіў выказвацца наконт якасці стравы.

Гэты маршалаў дзень нараджэння святкавалі па патрабаванню прэзідэнта Руці, які асабіста выступіў на банкеце з прамовай. Наступным днём Манэргейм і генерал Вальдэн вярнуліся ў Міккелі, дзе размяшчалася Стаўка. Там яны паабедалі, і а пятай гадзіне вечара Вальдэн ужо намерыўся ад'ехаць да Хельсінкаў, калі Манэргейм раптам вырашыў правесці яго да горада Лахці. Па тэлефоне замовілі асобны кабінет у Дваранскім сходзе і запрасілі міністра замежных справаў Рамсая. Гасцям накрылі стол. Дзеля такіх выпадкаў Вальдэн меў у рэстаране ўласны халадзільнік. Халадзільнік быў поўны ўсялякіх прысмакаў, і Вальдэн нікому не выдаваў ад яго ключ. Парэкамендаваўшы гэты рэстаран, у якім нібыта гатаваліся далікатэсныя стравы, а порцыі па велічыні не ішлі ні ў якое параўнанне са звычайнымі рэстаранамі, Манэргейм не меў ніякага ўяўлення аб сапраўдным становішчы з харчаваннем у краіне і аб існаванні картачнай сістэмы. Ён не ведаў, што Вальдэн частаваў іх сваімі даэлікатэсамі, здабываючы іх у абыход усіх правілаў. Генералы былі расчараваныя, ўбачыўшы, што порцыі ў Дваранскім сходзе такія ж маленькія, як у іншых рэстаранах. Увогуле, Манэргейм не падазраваў аб існаванні шмат якіх рэчаў. Аднойчы пасля вайны яму спатрэбілася пазваніць па тэлефоне-аўтамаце, але ў яго нічога не выйшла. Тады ад'ютант зайшоў у кабінку і апусціў у аўтамат манету. Манэргейма вельмі здзівіла, што плаціць трэба было яшчэ да размовы.

А другой гадзіне ночы Манэргейм вярнуўся ў Стаўку. А праз гадзіну пачалася высадка войскаў заходніх дзяржаваў у Нармандыі. Праз тры дні рускія адкрылі ўраганны артылерыйскі агонь, праводзячы падрыхтоўку да вялікага наступлення. Ад выбухаў дрыжэла палова тэрыторыі Фінляндыі. Гэта быў чацвер 6 чэрвеня 1944 года. Стомлены святкаваннем, Манэргейм спаў кароткім, але глыбокім і спакойным сном. Гэта было апошняе афіцыйнае святкаванне яго дня нараджэння. Пазней ён заўсёды дні за два да падзеі кудысьці знікаў. А стаўшы прыватнай асобай, ужо нікуды не знікаў, але і не прымаў нікога.

Уранні 9 чэрвеня 1944 года, у дзень пачатку буйнамаштабнага наступлення рускіх, Манэргейм падняўся раней, чым звычайна. Грукат артылерыі даносіўся і да Стаўкі фінскага камандавання. Назаўтра падчас абеду, у 12.30 стала вядома, што рускія глыбока ўкліniліся ў распалажэнне фінскіх войскаў. Войскі ў паніцы бягуць, салдаты дэзертуюць, і толькі адзін 1-ы егерскі батальён стрымлівае націск праціўніка. Чырвань заліла твар Манэргейма. Упарта працягваючы абедаць, ён папытаўся ў генералаў Хейнрыкса, Айры і Нэнанена, як яны ацэньваюць абстаноўку і што, на іх думку, трэба рабіць. Звычайна гаварыць пра вайну за абедам было непрынята. Але гэты раз маршал зрабіў выключэнне. Ён дапіў каву і накіраваўся ў Стаўку, якая месцілася ў Цэнтральнай народнай школе. Звычайна ён выкідаў недакурак сігары, толькі падышоўшы да школы, але гэты раз шпурнуў яго ў канаву адразу, як выйшаў на вуліцу. Вялікі наступ рускіх падзейнічаў на маршала, як ін'екцыя бадзёрасці і сілы. Такая самая рэакцыя ў яго была на пачатку Зімовай вайны. Эмацыйныя людзі з багатай фантазіяй, калі настае час дзеяў, адкідаюць усякія мары, спадзевы і страхі і пачынаюць дзейнічаць неадкладна.

# XI. АД БУРЫ ДА ЗАЦІШША

## Прэзідэнт

Ноч на 29 ліпеня 1944 года Манэргейм правёў за чытаннем твора пад назвай «Канстытуцыя Фінляндыі». Ён імкнуўся высветліць, якія там маюцца варыянты змены кіраўніка дзяржавы. І ўпэўніўся, што стаць рэгентам – як яму было прапанавана – немагчыма. Ва ўрадавых колах даўно абмяркоўвалася магчымасць назначэння Манэргейма рэгентам або прэзідэнтам на два гады – гледзячы на які тытул ён сам дасць згоду. Манэргейм вырашыў спыніцца на звычайным прэзідэнцтве з шасцігадовым тэрмінам. Паводле канстытуцыі прэзідэнт мог ускласці частку сваіх абавязкаў на прэм'ер-міністра. І Манэргейм не прамінуў вылучыць такое патрабаванне.

А псіхасаматычныя праблемы з яго здароўем ускладняліся. Увосень 1944 года ў яго на руках узнікла экзэма ў вельмі цяжкой форме. Яму было вельмі складана пісаць, бо рукі пакрыліся язвамі. Струпы пры дотыку да вопраткі лопаліся і крывянілі. Хваробу лячылі святлом. Гэта была экзэма нервовага паходжання. Яму было цяжка сабрацца з думкамі, у лістах пачало ўзнікаць шмат арфаграфічных памылак. Ён пачаў часцей ужываць моцныя выразы, праўда, самыя бяскрыўдныя – такія, як «чорт» і «д'ябал». Ён мог успыхнуць з любой нагоды, але праз некалькі хвілінаў ачуваўся.

Манэргейм прынёс прэзідэнцкую прысягу ў парламенце, апрануўшыся ў форму фінскай Белай Гвардыі. Паводле статуту палявую фуражку павінна была ўпрыгожваць вузкая шэрая стужка. Але замест яе была нашыта жоўтая кавалерыйская. Манэргейм заўважыў гэта, толькі калі вярнуўся ў сваю рэзідэнцыю, і быў вельмі раззлаваны.

Неўзабаве пачалася Лапландская вайна, падчас якой фіны мелі на мэце выцесніць нямецкія войскі з Фінляндыі. Кіраваў аперацыямі генерал Айра. У сярэдзіне верасня Манэргейм настойваў

на моцным наступе фінскіх войскаў. Але Айра лічыў, што гэта неразумна і непатрэбна, бо прывядзе да адкрытай вайны з немцамі. А тыя хочуць проста вывесці свае войскі з Лапландыі і робяць гэта так хутка, як могуць. Навошта ж зноў ваяваць і ахвяраваць салдатамі? Іншым Айра адкрыта казаў, што прысутнасць нямецкіх войскаў на поўдні − цалкам віна Манэргейма, бо маршал сам прымушаў немцаў усё больш выцягваць сваю лінію фронту, каб вызваліць больш фінскіх войскаў. Зыходзячы з палітычных меркаванняў, Манэргейм патрабаваў паскорыць рух фінскай арміі, але Айра з ваенных меркаванняў стрымліваў яе.

17 жніўня 1944 года да Манэргейма ў якасці даверанай асобы Гітлера прыехаў фельдмаршал Кейтэль. Ён прачытаў Манэргейму вельмі красамоўную і настолькі ж пустаслоўную лекцыю, больш падобную да прагандысцкага выступу, чым да дзелавога даклада. Кейтэль сцвярджаў, што становішча Нямеччыны не такое ўжо і цяжкое, а на поўдзень ад Фінскай затокі яно нават вельмі надзейнае. У хуткім часе немцы пачнуць наступ і забяруць у рускіх горад Шаўляй. Становішча на Заходнім фронце не такое бліскучае, але гэта не мае ніякага значэння, бо Нямеччына можа ваяваць так яшчэ дзесяць гадоў.

Ва ўвесь гэты слоўны паток Манэргейм толькі і змог уставіць, што немцы павінны разумець становішча Фінляндыі, якое ні ў якім выпадку не дазволіць ёй ваяваць так доўга.

Калі ж крыніца Кейтэлева красамоўя перасохла, Манэргейм папрасіў яго ўлічыць яшчэ адну важную акалічнасць: ён, Манэргейм, не лічыць сябе звязаным з Нямеччынай дамоваю, заключанай яго папярэднікам, прэзідэнтам Руці. Гэтая дамова не адпавядае настроям, якія сёння пануюць у фінскім парламенце.

Кейтэль адказаў, што ён усяго толькі салдат і можа меркаваць толькі пра ваенныя справы, але ў палітыку ўмешвацца не будзе.

Манэргейм такім чынам паказаў, што разрывае дамову Руці з Рыбентропам і ні ён сам, ні яго ўрад выконваць яе не будуць. Няўжо Кейтэль не звярнуў ніякай увагі на гэтае заяўленне? Няўжо Манэргейм усур'ёз думаў, што гэты несамавіты паслугач Гітлера зразумеў, пра што вялася гаворка і якое ўсё гэта мае значэнне?

У Кейтэля была яшчэ адна справа да Манэргейма: ён прывёз фінскаму маршалу дубовыя лісты да Жалезнага крыжа.



Пасля гутаркі адбыўся абед, падчас якога Кейтэль быў у выдатным настроі, што вельмі здзівіла Манэргейма. Праўда, абед быў адмыслова смачны. Манэргейм лічыў, што зрабіў вельмі важную дзяржаўную справу: ён разарваў дамову з Рыбентропам. Паводле гэтай дамовы Фінляндыя не магла заключыць мір з Савецкім Саюзам і была абавязаная весці вайну далей. А Нямеччына абавязвалася пастаўляць Фінляндыі хлеб і зброю. Цяпер ён спіхнуў гэты камень і чакаў, калі гэта выкліча каменяпад.

Увечары ў вагоне маршала адбылася вячэра, на якой прысутнічалі прэм'ер-міністр і міністры абароны і замежных справаў. Гутарка пасля вячэры цягнулася вяла, бо Манэргейм пазбягаў выказванняў на тэму мірных перамоваў з рускімі. Наступным днём міністр замежных справаў выказаў незадаволенасць тым, што час ідзе, а нічога не адбываецца. І міністры зноў сабраліся на сустрэчу да Манэргейма. Той растлумачыў ім прычыны сваёй пасіўнасці. Трэба даць час, каб усе высокапастаўленыя асобы ў Нямеччыне даведаліся, што Манэргейм разарваў дамову з Рыбентропам. Кейтэль ужо вярнуўся ў стаўку Гітлера і паведаміў пра тое, што пачуў ад Манэргейма. Цяпер трэба пачакаць. Гітлер − істэрык і ягоны гнеў можа прыняць самыя вар'яцкія формы з цяжкімі наступствамі для Фінляндыі. «А калі ў наступныя дні не будзе ніякай рэакцыі −можна зрабіць і наступныя крокі», − дадаў маршал.

Манэргейм, здаецца, чакаў, што Нямеччына сваімі дэманстратыўна агрэсіўнымі дзеяннямі разарве ўсялякія адносіны з Фінляндыяй і тым самым вызваліць яго ад патрэбы рашаць гэтую задачу самому. І ён пусціў спробны шар. Трэба было даведацца, ці ўжыве Нямеччына супраць Фінляндыі грубую ваенную сілу. Манэргейм пакутаваў ад нястачы інфармацыі. Каб прыняць рашэнне, трэба валодаць фактамі, здольнымі паўплываць на такое рашэнне. Увечары, каля 23-й гадзіны, у маршальскім вагоне сабраліся міністры абароны і замежных справаў. Манэргейм быў у выдатным настроі, ён жартаваў і смяяўся. Але раптам зусім пасур'ёзнеў. Ён абвясціў, што, калі немцы пасля перамір'я не адступяць з Паўднёвай Фінляндыі, ён вырашыў выгнаць іх адтуль з дапамогаю зброі. Манэргейм быў у добрым стане. За апошнія два гады ён ні разу не выглядаў такім актыўным і энергічным, ён нават памаладзеў.

Вырашальным днём стала 24 жніўня, калі прэм'ер-міністр і міністр замежных справаў паведамілі, што ўрад аднадушна прыйшоў да высновы, што з Савецкім Саюзам трэба пачынаць перамовы. Але маршал, здаецца, рашэння яшчэ не прыняў.

Міністр па сацыяльных пытаннях на пасяджэнні камісіі парламента па замежных справах ад імя фракцыі сацыял-дэмакратаў запатрабаваў неадкладна пачаць мірныя перамовы. Манэргейм падзяляў гэтую думку. Прэм'ер-міністр Хакзель абгрунтоўваў такую паспешлівасць тым, што рускія, каб паскорыць прыняцце рашэння, могуць пачаць бамбаванне Хельсінкаў, як зрабілі гэта ўзімку. У народзе пачнуцца хваляванні, а гэта можа прывесці да ўтварэння новага, болей падатлівага ўрада. Манэргейм загадаў неадкладна звязацца з паслом Савецкага Саюза ў Швецыі спадарыняй Калантай з просьбай тэрмінова пачаць мірныя перамовы. Як і патрабаваў Савецкі Саюз, гэтая просьба была накіраваная ў пісьмовай форме. Адразу пасля гэтага Манэргейм прызначыў чальцоў дэлегацыі для перамоваў. Прыняўшы рашэнне, ён цяпер вельмі спяшаўся. Ён вырашыў пасляць у Маскву зусім іншых вайскоўцаў, якіх не было ў складзе дэлегацыі, што вяла мірныя перамовы ў канцы Зімовай вайны. Цяпер, калі ён стаяў на чале дзяржавы і адказваў за заключэнне міру, ён хацеў паказаць, што цвёрда трымае ўсе матузкі ўлады ў сваіх руках. Пасля гэтага прысутныя павесялелі. Манэргейм запатрабаваў, каб ўсе паспыталі ягоныя цыгары і віскі. Ніхто не пратэставаў.

Адразу пасля, на пачатку верасня, Манэргейм напісаў доўгі і ветлівы ліст да Гітлера. У гэтым лісце ён абгрунтоўваў рашучы крок Фінляндыі і прасіў Нямеччыну зразумець яго. Вялікі нямецкі народ знішчыць немагчыма, а вось маленькі фінскі народ можна лёгка сцерці з зямлі. Манэргейм хацеў заставацца джэнтльменам і застаўся ім нават у гэтай сітуацыі. Усё мусіла быць зроблена карэктна.

Тады Манэргейм, напэўна, яшчэ не ведаў, што Гітлер знішчыў у Еўропе народ, які па сваёй колькасці перавышаў фінаў амаль у два разы. Калі Манэргейм пісаў, што фінскі народ можна вынішчыць фізічна, ён збольшага выказваў гэта як тэарэтычнае апасенне. Але Гілер выдатна ведаў, што такі генацыд цалкам магчымы. І зразумеў ліст фінскага маршала цалкам па-свойму. Можа быць, ён нават скалануўся пры думцы, што Манэргейм ведае пра яго злачынствы супраць еўрапейскіх жыдоў.



Калі Фінляндыя заключыла перамір'е, Гітлер сказаў, што Манэргейм, гэты «сусветны вялікі князь», – слабы чалавек, які не здолны трымаць у руках лёс свайго народа, не здолны згуртаваць яго ў патрэбны момант. Манэргейм – выдатны салдат, але дрэнны палітык. Хутка яму давядзецца паплаціцца за сваю слабасць – бальшавікі расстраляюць яго.

Манэргейм сапраўды баяўся, што бальшавікі яго растраляюць. Ён баяўся гэтага ўсе трыццаць апошніх гадоў і будзе баяцца да вясны 1946 года. Гітлер назваў ягоную ветлівасць слабасцю. Рэакцыя Гітлера была млявая і лёгка прадказальная. У ёй не адчувалася ні злосці, ні жадання адпомсціць. Гітлер не адказаў на ліст Манэргейма.

Апошні тыдзень жніўня 1944 года стаў для Манэргейма, як для кіраўніка дзяржавы, сапраўднаю кульмінацыяй. Гэта быў тыдзень маланкавых рашэнняў і дзеянняў. Нават калі чытаеш пра іх, пачынаеш ужо задыхацца. Пасля трохтыднёвага маўчання і чакання Манэргейм 24 жніўня 1944 года прымае рашэнне. Наступным днём Міністэрства замежных справаў пасылае паслу Савецкага Саюза ў Стакгольме спадарыні Калантай просьбу пачаць мірныя перамовы ў Маскве. Папярэднія ўмовы мірных перамоваў прысылаюць з Масквы 29 жніўня. Наступным днём яны ўжо ў прынцыпе адобраныя кансультацыйнай камісіяй прэзідэнта. 1 верасня 1944 года Манэргейм пасылае Сталіну тэлеграму з прапановай спыніць ваенныя дзеянні. 2 верасня парламент на закрытым пасяджэнні ўхваляе дзеянні ўрада. Адразу пасля пасяджэння прэм'ер-міністр па радыё абвяшчае аб прынятым рашэнні на ўсю краіну. Тым жа днём генералу Эрфурту даручаецца перадаць Гітлеру ліст ад Манэргейма. Увечары 3 верасня ў Стакгольме атрымліваюць паведамленне, што Савецкі Саюз прыняў прапанову Манэргейма аб спыненні агню. Далей падзеі разгортваюцца не дзень за днём, а гадзіна за гадзінай. На світанні Манэргейм прымае ўмовы перамір'я, прапанаваныя Савецкім Саюзам. Радыё і газэты павінны як мага хутчэй абвясціць, што Фінляндыя парывае ўсе адносіны з Гітлерам і патрабуе вываду нямецкіх войскаў са сваёй тэрыторыі не пазней як 15 верасня. Той жа ноччу ўсе армейскія

падраздзяленні атрымліваюць паведамленне, што праз некалькі гадзінаў, г. зн. а восьмай гадзіне раніцы, усе ваенныя дзеянні спыняюцца.

Раніцай 7 верасня Манэргейм выехаў у Стаўку. Ён ехаў тым жа цягніком, што і дэлегацыя на мірныя перамовы ў Маскву. Манэргейм вырашыў эвакуяваць насельніцтва Паўночнай Фінляндыі, баючыся, што яна ператворыцца ў суцэльнае поле бою.

У крызіснай сітуацыі Манэргейм выкарыстаў стары спосаб яе вырашэння. У жыцці такія сітуацыі час ад часу паўтараюцца. Генерал Сііласвуо атрымаў загад правесці такі самы манеўр, які яны з генералам Талвелам правялі на пачатку Зімовай вайны і які прынес ім тады перамогу. І генерал зноў правёў аперацыю нахабна і смела. Ён высадзіўся ў тыле немцаў, ніколькі не клапоцячыся пра абарону сваіх марскіх канвояў, дый не маючы ніякай магчымасці іх абараніць. Але і цяпер усё паўтарылася так, як у час Зімовай вайны − праціўнік быў вымушаны дзе адступіць, а дзе трапіў у мяшок.

Манэргейм апынуўся паміж двух агнёў. Ён быў абавязаны выконваць падвойныя абавязкі − і галоўнакамандуючага, і прэзідэнта. Таму не дзіўна, што ён даволі часта вельмі раздражняўся. Аднойчы, калі генерал Сііласвуо дакладваў яму пра магчымасць ажыццявіць высадку некалькіх палкоў у Кемі, а потым у Торнеа, Манэргейм перабіў яго словамі: «Вы казалі мне гэта ўжо дваццаць разоў. Няўжо я абавязаны выслухоўваць гэта і дваццаць першы?». Маршал не любіў ці рабіў выгляд, што не любіць розных цырымоніяў, − напрыклад, калі прапаноўваў каму-небудзь выпіць ці закурыць. Хто адмаўляўся, той заставаўся ні з чым, бо Манэргейм ніколі не паўтараў сваю прапанову. Гэта прывучвала людзей не траціць дарэмна нервы і сілы, а дзейнічаць упэўнена і рашуча. Маршал ненавідзеў, калі яму паўтаралі нешта ўжо раней сказанае.

Манэргейм ні ў якім выпадку не хацеў дапускаць да ўлады мірную апазіцыю. Яшчэ больш ён не хацеў, каб ва ўрад уваходзілі камуністы. У гэтым яго падтрымлівалі амаль усе аўтарытэтныя палітыкі, і Паасіківі ў тым ліку. Ён лічыў, што камуністы яшчэ не заслужылі права ўваходзіць ва ўрад.

Да Кеканена Манэргейм ставіўся рэзка адмоўна. Ён быў адным з тых, хто памяняў афарбоўку ў апошні момант і, дзякуючы гэтаму, паспеў ускочыць ва ўсходні цягнік. Але Кеканена безаглядна падтрымліваў Паасіківі, які лічыў яго незаменным у дачыненнях з савецкай Кантрольнай камісіяй і камуністамі.



Прызначэнне прэм'ер-міністра ўваходзіла ў паўнамоцтвы прэзідэнта. І таму, калі парламент прапанаваў на гэты пост кандыдатуру Паасіківі, Манэргейм палічыў, што гэтым быў здзейснены свайго роду дзяржаўны пераварот. Але за прэзідэнтам не стаяла ніводнай партыі, ён не меў у грамадстве ніякай палітычнай апоры. І калі да яго прыйшлі прадстаўнікі парламенцкіх фракцыяў, каб паведаміць склад новага ўрада, Манэргейм толькі насмешліва заўважыў, што прачытаў нядаўна ў газэце, быццам парламент хоча аблегчыць прэзідэнту працу і таму ўзяўся рабіць кадравыя перастаноўкі ва ўрадзе сам.

Пра рускіх у размове з Паасіківі Манэргейм казаў, што ведае тых, «царскіх» рускіх, а не новых, «савецкіх». Ён заўсёды карыстаўся словамі «Расея», «Пецярбург», а не «Савецкі Саюз» і «Ленінград».

Паводле інфармацыі англічан, Манэргейм тройчы падкрэсліваў Паасіківі, што фінскі ўрад ні ў якім разе не павінен скаціцца на занадта левыя пазіцыі. Ён прама казаў, што фіны мусяць цвёрда сядзець у сядле, каб у выпадку канфлікту з рускімі, паказаць ім сваю волю да змагання. Паасіківі лічыў такія ідэі вельмі небяспечнымі. А Манэргейм не аднойчы настойваў, што будаваць адносіны з рускімі трэба толькі на такой аснове.

У дзень незалежнасці 6 снежня 1944 года Паасіківі выступіў з вялікай прамовай аб новым тыпе добрасуседства. А Манэргейм у гэты час прымаў удзел ва ўрачыстых памінках па 23 фінскіх габрэях, якія загінулі на вайне. Габрэйская грамада хацела выказаць фінскай дзяржаве і Манэргейму сваю ўдзячнасць, бо дабрацца да габрэяў у Фінляндыі вынішчальнай машыне Гімлера так і не ўдалося. Безумоўна, Манэргейм выдатна ўсведамляў значэнне таго, што Фінляндыя ў гэтых адносінах нічым сябе не заплямiла. Маршал не надта разумеў у рэлігійных тонкасцях. Ён лічыў, што ў сінагогу трэба ўваходзіць без абутку, а таму загадаў ад'ютанту надзець чыстыя шкарпэткі.

Манэргейм баяўся, што будзе прыцягнуты да працэсу над ваеннымі злачынцамі. Але рускія прыслалі свайго прадстаўніка, каб

паведаміць, што Савецкі Саюз не будзе патрабаваць працэсу над ім. Як стала пазней вядома, Сталін, звяртаючыся да фінскай дэлегацыі, сказаў, што Фінляндыя шмат чым абавязаная свайму старому маршалу, бо толькі дзякуючы яму Фінляндыю не акупавалі савецкія войскі. Тое самае Сталін паўтарыў і ў 1948 годзе.

Да рускіх Манэргейм ставіўся выключна карэктна і таго ж патрабаваў ад іншых.

Афіцыйная рэзідэнцыя прэзідэнта ў Тамміеміе была месцам, дзе панаваў выключна ваенны і мужчынскі дух. Калі старшыня Кантрольнай камісіі, набліжаны да Сталіна генерал-палкоўнік Жданаў прыехаў туды першы раз, гаспадары былі ў жаху. Перад машынай Жданава ішлі некалькі грузавікоў з узброенымі салдатамі, якія адразу рассыпаліся па ўсім наваколлі.

Ад'ютанты пачалі хапацца за пустыя кабуры. Яны вырашылі, што рускія ўчыняюць дзяржаўны пераварот. Але праз некалькі хвілінаў з прэзідэнцкага кабінета пачуліся цывілізаваная гутарка і смех Манэргейма. Жданаў належаў да цывілізаванага класу. Калі ён ад'язджаў, узнікла няёмкая сітуацыя. Паколькі Манэргейм быў арыстакрат і стаяў на чале дзяржавы, яму і ў галаву не магло прыйсці падаць Жданаву шынель. Ад'ютанты былі на другім паверсе і не пачулі, што Манэргейм іх кліча. Яны вельмі разгубіліся, калі ўбачылі раз'юшанага Манэргейма, які напамінаў ім пра забытыя абавязкі.

Манэргейм вельмі злаваўся на тых міністраў, якія дазвалялі сабе п'янстваваць з рускімі. Маршал лічыў, што фіны мусяць зберагаць сваю годнасць. Але Паасіківі трымаўся іншай думкі. Ён вельмі прыхільна ставіўся да таго, што Кеканен можа да ранняга піць гарэлку з паслом Савецкага Саюза. Гарэлка адкрывае душы і развязвае языкі.

Сам Манэргейм нават у размовах з англійскімі дыпламатамі быў вельмі абачлівы. Зрэшты, і ён часам зрываўся, даючы бальшавікам з'едлівыя мянушкі. Ён сцвярджаў, што бальшавікі ствараюць вакол СССР буферныя дзяржавы і гэты працэс далёка не скончаны. Так, у дачыненні да Балканаў яны маюць чыста імперыялістычныя намеры, якія грунтуюцца выключна на жаданні тэрытарыяльнага пашырэння. Бальшавізм – гэта чорнае пудзіла. Таму Манэргейм не хацеў заключаць з бальшавікамі ніякіх пагадненняў. З 1917 года ягонае стаўленне да бальшавікоў не змянілася. Пра гэта яскрава сведчаць яго мемуары і прыватнае ліставанне. Але ўрэшце Манэргейма пераканалі называць бальшавікоў камуністамі – каб не было так зразумела, пра каго вядзецца гаворка.



Увосень 1944 года Манэргейм неяк сказаў Паасіківі, што рускія, відаць, вельмі хацелі б арыштаваць яго і расстраляць. Але Паасіківі запэўніў, што, хоць бальшавікі, сапраўды, яго любяць не надта, але расстрэльваць не будуць, бо лічаць, што з жывым Манэргеймам ім будзе болей карысці. Манэргеймаў страх арышту і расстрэлу паходзіў яшчэ з 1917–1918 гадоў, калі афіцэраў расстрэльвалі паўсюдна як у Расеі, так і ў Фінляндыі.

Увосень 1944 года стрэс у Манэргейма ўзмацніўся. Экзэма пашырылася і перайшла з рук на галаву і на твар. Манэргейм лічыў, што гэта ад нерваў. Увосень 1945 года ў яго пачаў моцна балець страўнік, баяліся, што гэта рак. Два ягоныя браты, а верагодна, і сястра Соф'я памерлі ад раку. Па рэкамендацыях лекараў Манэргейм вырашыў паехаць на поўдзень, у Партугалію на курорт Прайя дэ Роша, дзе быў такі самы клімат, як у Афрыцы.

Паасіківі папрасіў для Манэргейма дазвол на выезд з краіны. Але Жданаў паставіўся да гэтага негатыўна. І Манэргейм мусіў адмяніць паездку. Аднак на другі дзень Жданаў ужо сказаў, што Манэргейм, безумоўна, можа паехаць. Пасол Арлоў нават рэкамендаваў яму ехаць у Крым, дзе былі выдатныя курорты і клімат. Манэргейм, вядома, мог бы туды паехаць і выдатна там адпачыць. Але псіхалагічна быў да гэтага не гатовы. У Паасіківі той дзень выдаўся зусім няўдалым – ён, нібы чаўнок, сноўдаў паміж Манэргеймам і Жданавым і пачуваў сябе, як хлопчык на пабягушках. Яго пачуццё годнасці цалкам было растаптанае.

Манэргейм на параходзе выправіўся ў Стакгольм. Разам з ім былі яго асабісты лекар з часоў вайны прафесар Лаўры Калайя і ад'ютант, палкоўнік Гр'ёнваль. Са Стакгольма яны вылецелі ў Парыж. Чыноўнік французскага Міністэрства замежных справаў, які быў прыстаўлены да Манэргейма, адзначыў, што той захаваў выдатную выпраўку і бліскучыя манеры. Па словах француза, Манэргейм паводзіў сябе, як прыбалтыйскія бароны, што служылі пры двары расейскага імператара. Ён па-ранейшаму ненаві-

дзеў бальшавікоў і апасаўся нацыстаў. Невядома чаму ў яго дагэтуль заставалася боязь да немцаў, хоць тыя ўжо былі пераможаныя і выйшлі з гульні. Манэргейм сцвярджаў, што Савецкі Саюз робіць моцны ціск на Фінляндыю і без ніякіх падставаў вінаваціць фінаў, што яны бамбавалі Пецярбург. Слова Ленінград для яго не існавала.

Заходнія дзяржавы ўсяляк стараліся папсаваць жыццё Іспаніі, дакладней – яе франкісцкаму ўраду. Самыя палкія дэмакраты лічылі гэты ўрад цалкам фашысцкім. Пад ціскам Жданава Фінляндыя зачыніла сваё пасольства ў Мадрыдзе, пакінуўшы ўсе пасольскія справы на аднаго нязначнага пісарчука. А цяпер Манэргейм мерыўся трапіць у Партугалію праз Іспанію. На памежнай станцыі яго сустрэлі з дэманстратыўнай раскошаю і павагай. У чаканні госця тут стаяў асабісты салон-вагон былога дыктатара Прымы дэ Рыверы. Губернатар выступіў з гцчнай прамовай, а за машыніста быў герцаг Сарагоскі. У мадрыдскім гатэлі да Манэргейма прыйшоў родны брат Франка, каб перадаць маршалу асабістае прывітанне іспанскага правадыра.

Спачатку Манэргейм хацеў паехаць у Таледа, але потым змяніў намер і паляцеў у Лісабон.

У Іспаніі быў пашыраны міф, які, дарэчы, жыў і пасля смерці маршала, згодна з якім Манэргейм быў першы, хто здолеў паспяхова спыніць націск камуністаў. Такім чынам, ён лічыўся папярэднікам Франка і яго сабратам (а франкаўская прапаганда называла камуністамі ўсіх праціўнікаў Франка падчас грамадзянскай вайны). Іспанцы пачалі спакушаць Манэргейма яшчэ ў Парыжы, а калі ён прыехаў у Іспанію, спакуснікі цалкам аблыталі яго славай і ўшанаваннямі. Але збіць Манэргейма з тропу ім не ўдалося. Рэпутацыя краіны ў свеце была дрэнная. Фашысцкая сімволіка траплялася на кожным кроку. Але гэта не выглядала вульгарна. Іспанцы ўмелі паводзіць сябе належным чынам. А Манэргейм умела выкарыстоўваў тактыку супрацьстаяння. Гэта патрабавала ад яго ясных і адназначных рашэнняў, якіх ён не любіў, і таму заўсёды прымаў такія рашэнні з вялікаю цяжкасцю. Як бы там ні было, ён адмовіўся ад сустрэчы з Франкам, матывуючы гэта тым, што не хоча пагаршаць адносіны паміж Фінляндыяй і Савецкім Саюзам. Хоць паводле пратакола такая сустрэча паміж



кіраўнікамі дзвюх дзяржаваў была пажаданай і цалкам легітымнай.

У Партугаліі Манэргейм прабыў шэсць тыдняў. Дыктатар Салазар перадаў яму ў карыстанне свой асабісты аўтамабіль. Яны сустракаліся двойчы. Гэта быў незвычайны дыктатар, былы прафесар эканомікі. Ён нават жыў у сваім ранейшым уласным жытле, не змяніўшы ні ладу жыцця, ні грашовых выдаткаў, ні вопраткі. Манэргейма на Іберыйскай паўвыспе ў той час цанілі вышэй, чым у любым іншым месце, і бляск ягоных шчыта і мяча не замутнялі ніякія плямы крытыкі і недаверу. Яму імпанавала гэтая ўвага, якая ішла з самых вяршыняў улады.

Шведскае міністэрства замежных справаў узялося перадаваць яму пошту, але за ўвесь час свайго адпачынку ў Партугаліі, ён нічога не атрымаў. Швецыя не змагла арганізаваць афіцыйнага канала для перадачы карэспандэнцыі. Нават дыпламатычную пошту перадавалі з выпадковымі падарожнікамі, а таму яна паступала нерэгулярна. Манэргейм апынуўся ў поўнай ізаляцыі ад сваёй краіны і вельмі праз гэта пакутаваў. Ён увесь час думаў, што яго ўжо выкінулі з палітычнага жыцця Фінляндыі, адсунулі ўбок і паклалі на паліцу, як непатрэбную рэч.

Манэргейм залекаваў запаленне лёгкіх і падлячыў язву страўніка. Але па дарозе назад паміж Мадрыдам і Парыжам адбыўся рэцыдыў. Манэргейм мусіў легчы ў парыжскі шпіталь.

Гэты раз Парыж зрабіў на яго жахлівае ўражанне. Горад быў спусцелы, паўсюль панавалі беспарадак і беднасць, ад былой элегантнасці і вытанчанасці не засталося следу. Дачка Соф'я таксама была ў вартым жалю стане. Яна жыла ў цесным пакойчыку на першым паверсе. Кашэчы смурод напаўняў усё жытло. Соф'я хварэла, але вяла нездаровы, калі не сказаць бязглузды, лад жыцця. Усе дні яна бавіла са сваімі сяброўкамі-эмігранткамі ў нейкай паганай забягалаўцы, дзе яны пілі дрэннае віно. Манэргейм жахнуўся. Ён ніяк не мог зразумець, чаму дачка не звярнулася да яго па дапамогу.

Набыць білет на самалёт да Стакгольма не ўдалося, і Манэргейм мусіў сустракаць Каляды ў Парыжы. Толькі 29 снежня ён вылецеў у Швецыю, дзе на два дні спыніўся ў фінскім пасольстве, каб сустрэцца са сваімі шведскімі знаёмцамі і сваякамі.

На караблі ён дабраўся да Турку, а адтуль цягнікам – да Хельсінкаў, куды прыбыў 3 студзеня 1946 года.

У Стакгольме Манэргейм вельмі нерваваўся, бо не ведаў, ці варта яму вяртацца ў Фінляндыю. Ён увесь час абдумваў розныя варыянты. Ён баяўся, што, вярнуўшыся ў Фінляндыю, можа трапіць у пастку. Калі ў Стакгольме на карабель села вялікая група савецкіх афіцэраў, Манэргейм не на жарт спалохаўся. Па словах аднаго сведкі, вярнуўшыся дамому, ён паводзіў сябе так, нібыта стараўся як мага больш узлаваць Паасіківі. Кульмінацыяй стала размова, падчас якой Манэргейм з прастадушным выглядам папрасіў Паасіківі параіць, ці не варта яму падацца ў адстаўку.

Адразу пасля прыезду ў Хельсінкі Манэргейм лёг у шпіталь Чырвонага Крыжа. Яго язва вельмі чуйна рэагавала на ўсе хвалянні і клопаты. Асабісты Манэргеймаў лекар Калайя казаў, што яго пацыент захворвае ад кожнага палітычнага крызісу. Розныя немачы апаноўвалі яго з 1943 года. Толькі ён вылечваўся ад аднной хваробы, як накідвалася другая.

У шпіталі Манэргейм або нерухома сядзеў, або, як дзікі звер, кідаўся ад сцяны да сцяны. Ён і сам так апісвае свой тагачасны побыт у шпіталі. Пяць разоў на дзень ён еў і столькі ж разоў прымаў лекі.

30 снежня 1946 года Паасіківі паведаміў ураду, што наведаў Манэргейма ў шпіталі і адкрыта спытаў у яго, што ён думае рабіць далей. Манэргейм яснага адказу не даў. Тады Паасіківі прыгразіў, што пакіне пост прэм'ер-міністра. Манэргейм на гэта адказаў, што не будзе абмяркоўваць пытанне ні пра сваю адстаўку, ні пра стан здароўя, пакуль у прэсе супраць яго вядзецца кампанія. Пасада прэзідэнта патрабуе ад чалавека, які яе займае, настолькі дбаць пра сваю годнасць, што ён не можа пайсці ў адстаўку ў той самы момант, калі на яго робіцца ўціск.

Хутка Манэргейм пачаў папраўляцца. У лютым 1946 года ён ужо не адчуваў болю, калі сядзеў, але яшчэ моцна пакутаваў ад галавакруту. Нават у шпіталі ён старанна сачыў за сваім знешнім выглядам, акуратна прычэсваў валасы, каротка стрыг бараду. Ён схуднеў і выглядаў яшчэ болей вытанчаным, чым звычайна.

Як і ўсе старыя людзі, Манэргейм быў недаверлівы і да ўсяго ставіўся з падазрэннем. Калі газэты пісалі пра яго ў адмоўным



тоне, Манэргейм лічыў, што тут не абышлося без умяшальніцтва Паасіківі. А гэта значыла, што прэм'ер-міністру было вельмі важна адсунуць яго, Манэргейма, убок, іначай кажучы – адправіць у адстаўку. Таму Манэргейм і сказаў, што перашкодай для яго адстаўкі з'яўляецца кампанія ў прэсе.

3 сакавіка 1946 года Манэргейм вярнуўся да сваіх прэзідэнцкіх абавязкаў. Але толькі на адзін дзень. Ён хацеў выкарыстаць свой уплыў як прэзідэнта на справу некалькіх дзесяткаў афіцэраў, якіх выганялі з арміі. На яго думку, на абдумванне сітуацыі ім трэба было даць некалькі тыдняў, а не некалькі дзён. Настолькі малою стала сфера яго паўнамоцтваў. Але не дзіўна, што яго апошняе распараджэнне на пасадзе прэзідэнта тычылася армейскай справы – на працягу шасцідзесяці гадоў армія была для яго і домам, і працоўным месцам. Тым жа днём Манэргейм напісаў заяву аб адстаўцы, пра што і паведаміў прэм'ер-міністру. Назаўтра ад'ютант адвёз яе Паасіківі. Урад прызнаў за Манэргеймам права мець ад'ютанта і карыстацца армейскім аўтамабілем.

У жніўні 1945 года Манэргейм купіў маёнтак Кіркніемі ў камуне Лох'я. Спачатку ён хацеў набыць нерухомасць у Хельсінках, але не знайшоў там нічога вартага ўвагі. Што да вілы ў Кайвапуйсце, якую парламент з вялікаю помпай падараваў яму на 75-годдзе ў 1942 годзе, то яе перадача тады не была аформленая належным чынам, дый пазней гэтага не зрабілі таксама. Уласнік вілы апынуўся ў няёмкім становішчы, бо парламент дзейнічаў настолькі нетактоўна і нават свавольна, нібыта прымушаў яго перадаць тую вілу пад сваім уціскам. А ўласнікам быў славуты цукерачны кароль Фазэр. Такое стаўленне да сябе яго вельмі пакрыўдзіла, і цяпер на ўсе прапановы парламента абмеркаваць гэтую справу ён адказваў адмовай.

У якасці кампенсацыі за страту вілы ў Кайвапуйсце парламент падараваў Манэргейму 12 мільёнаў марак. Гэтага і хапіла на пакупку маёнтка.

На пісьмовым стале маршала пачалі з'яўляцца сельскагаспадарчыя даведнікі, якія ён старанна вывучаў. Ён вырашыў вырошчваць яблыкі і раз на тыдзень пачаў ездзіць па самых буйных садаводчых гаспадарках Фінляндыі. Як некалі на пачатку сямейнага жыцця ён займаўся сельскай гаспадаркай у маёнтку сваёй

жонкі пад Масквой, так і цяпер ён зноў апынуўся ў становішчы земляроба і гаспадара вялікага маёнтка. Толькі гэты раз ён дзейнічаў нашмат абачлівей, чым тады.

Да маёнтка Кіркніемі з Хельсінкаў было ўсяго каля гадзіны язды на аўтамабілі. Агульная плошча маёнтка складала 2300 гектараў, з якіх толькі прыкладна на сотні зямля была апрацаваная.

Манэргейм па-ранейшаму крыстаўся і вілай у Хельсінках. Калі ён ехаў з Хельсінкаў у маёнтак ці з маёнтка ў Хельсінкі, за ім звычайна ішоў аўтобус з прыслугай і кухарамі. У багажнік аўтамабіля часцяком без ведама маршала напакоўвалі ўсякіх тавараў, а аднойчы ўвапхнулі нават цэлае цяля. Кіровец, не ведаючы, што ў багажніку ляжыць туша цяляці, паехаў у гараж. Туды адразу патэлефанавалі спалоханыя кухаркі, і кіровец, не марудзячы, пагнаў назад у Хельсінкі. А ў гараж тым часам патэлефанаваў сам Манэргейм, запатрабаваўшы машыну. Яму адказалі, што кіровец павёз у Хельсінкі цяля. Перадаўшы тушу кухаркам, кіровец павярнуў і памчаўся па Манэргейма, але той ужо выправіўся да Хельсінкаў пешкі. Калі аўтамабіль нарэшце дагнаў маршала, той сказаў шафёру: «Даруйце, што перашкодзіў, у вас, пэўна, была болей прыемная кампанія». Рэч у тым, што нават чалавек, для якога фінская мова родная, не здолеў бы ладам зразумець, пра што вялася гаворка, не ведаючы, што ў багажніку ляжала менавіта туша цяляці. Па-фінску адно і тое ж слова азначае і цяля, і паліцэйскага шпіка, і маладую дзяўчыну.

У галоўным будынку маёнтка было 15 пакояў і толькі адна ванная. Саўна і пляж былі непрыдатныя для карыстання. Дом ацяпляўся кафлевымі печкамі па адной у кожным пакоі. На ацяпленне патрабавалася шмат працы і грошай. Манэргейм вырашыў наладзіць у доме цэнтральнае ацяпленне ды іншыя сучасныя зручнасці. Ён жыў у маёнтку ўлетку 1946 года, а таксама наступным летам. Вясну з-за хваробы ён правёў у Швейцарыі. Лета 1947 года было такое пагожае і цёплае, якога Манэргейм не памятаў аж з часу свайго вяртання ў гэтую паўночную краіну. Тым жа летам у маёнтку пабудавалі новыя гаспадарчыя будынкі.

Маршал вельмі ганарыўся сваім паркам і цяпліцамі. Аднойчы горны дарадца Рафаэль фон Фрэнкель занадта, на думку Манэргейма, захваліўся сваімі ўраджаямі памідораў. Тады Манэргейм з самым сур'ёзным выглядам заявіў, што яго памідоры даюць па дваццаць кілаграмаў ураджаю з куста. І маршал папрасіў свайго знямелага ад здзіўлення агародніка пацвердзіць гэтыя словы. Пазней ён патлумачыў яму, што мусіў шчыра нахлусіць, бо яго суразмоўца сам называў проста неймаверныя лічбы.



Маршал рабіў доўгія пешыя праходкі і выходзіў з саўны купацца ўжо ў маі. Ён купаўся пры 18 градусах вады. На свой 79-ты дзень нараджэння маршал цішком ад усіх паехаў да свайго былога ад'ютанта, генерал-маёра Кекане, які цяпер быў дырэктарам тытунёвай фабрыкі. Там яму стала блага, і гаспадар мусіў паклікаць доктара. Доктар засведчыў, што ў маршала адкрылася язва страўніка. Паблізу не мелася ні аэрадрома, ні станцыі хуткай дапамогі. Тэмпература расла, самаадчуванне пагаршалася. Складвалася становішча, небяспечнае для жыцця маршала. І ў сувязі з адсутнасцю адмысловага спецыяліста, доктар мусіў зрабіць аперацыю сам.

Два гады Манэргейм трымаў канюшню і коней для верхавой язды, хоць сам болей не ездзіў, бо здароўе не дазваляла. Нібы ў пацверджанне гэтага ён вярнуў сыну нябожчыка генерала Ліндэра старое сядло, якое некалі пазычыў у бацькі. Ён ад'ездзіў на ім усе апошнія гады. А вось цяпер, вяртаючы, паказваў, што на каня больш ніколі не сядзе – ён ніколі не ездзіў на новых сёдлах, карыстаючыся толькі старымі і добра абкатанымі. Нават купляючы новае сядло, ён даваў яго знаёмым, каб тыя паездзілі на ім некалькі тыдняў. Гэтак сама ён рабіў і з новымі чаравікамі, як сапраўдны англійскі джэнтльмен даючы іх панасіць некалькі тыдняў слугам, каб чаравікі памякчэлі і ямчэй сядзелі на назе.

У апошнія гады Манэргейм нечакана ўзяўся складаць план вялікага падарожжа на паляванне ў Лапландыі. Яму было ўжо восемдзесят гадоў. Ён ніколі не паляваў на ваўкоў, хоць, калі жыў у Расеі, не аднойчы збіраўся гэта зрабіць. Яго нават запрашалі ў паляўнічыя кампаніі, але паўдзельнічаць у паляванні на ваўкоў яму так і не ўдалося. Цяпер ён прачытаў у газэтах, што ў паўночнай Фінляндыі развялося шмат ваўкоў. Іх спрабавалі страляць з самалётаў, на зямлі палявалі з аўтаматамі, але безвынікова. Манэргейм запрасіў да сябе прафесійнага паляўнічага на ваўкоў, Оскара Пэро, якому споўнілася 85 гадоў і чый бацька таксама быў паляўнічым на ваўкоў. У шаснаццаць гадоў Оскара Пэро

пасылалі вучыцца паляванню ў царскіх мысліўцаў і паляўнічых. А ў дваццатых гадах яго аднойчы запрасілі ўпаляваць ваўка-адзінца аж на другім канцы Фінляндыі.

Манэргейм быў надзвычай зацікаўлены і поўны натхнення. Ён хацеў, каб Пэро адкрыў яму свае сакрэты. Але той адказаў, што нават яму царскія мысліўцы не раскрылі сваіх таямніцаў, бо гэта на дзесяць гадоў пазбавіла б іх паляўнічага шчасця. Але некаторыя свае сакрэты Пэро ўсё ж паведаміў маршалу. Паколькі той ніколі не паляваў на ваўкоў, Пэро пачаў з аповеду пра рысяў. Рысі і ваўкі паводзяць сябе аднолькава. Калі ім удаецца ўпаляваць якую жывёліну, яны ядуць, пакуль не насыцяцца. А праз гадзіну-другую пачынаюць шукаць дзе-небудзь пад скалой месца, куды не далятае вецер і не разносіць іх пах па наваколлю. Такім чынам, галоўная задача ў паляўнічага – знайсці рэшткі ваўчынай або рысевай здабычы, пасля чаго трэба адшукаць месца, дзе хаваецца воўк або рысь, страўляючы ежу. Толькі так да іх і можна дабрацца.

Манэргейм папрасіў Пэро распрацаваць план сапраўды вялікага палявання на ваўкоў. Паляванне мела адбыцца ў Лапландыі з ужываннем добрых старых паляўнічых прыёмаў. Абодва старыя аднадушна трымаліся думкі, што ваўкі лютуюць у краіне толькі па адной прычыне – былое майстэрства і старыя навыкі палявання даўно страчаныя. Сотні мужыкоў гойсаюць на лыжах з губерні ў губерню і не могуць упаляваць ніводнага звера. Ад такой ганьбы кроў кіпела ў жылах старых паляўнічых, якія самі былі ўжо нядольныя ні на лыжах, ні пешкі ўзыходзіць на крутыя скалістыя схілы сопак.

Напэўна, Лапландыя ўпершыню так вабіла да сябе Манэргейма. Ён верыў, што яшчэ здолее набыць новы досвед і пакарыць гэты новы для сябе кантынент. Але запланаванае падарожжа ён вымушаны быў рабіць толькі ў сваім уяўленні. Хоць, зрэшты, пад кіраўніцтвам апошняга прафесійнага паляўнічага на ваўкоў ён змог бы ўзяць усё магчымае нават з такога падарожжа.

Сёмага жніўня 1945 года Паасіківі пісаў у сваім дзённіку, што Манэргейм, па яго словах, едзе ў Лапландыю. На той час ужо даўно вяліся размовы пра суд, які трэба было заснаваць для правядзення працэсу над ваеннымі злачынцамі. Гэта мусіў быць незвычайны суд, бо судавытворчасць у ім павінна была ажыццяўляцца не на аснове фінскага заканадаўства. На думку Манэргейма, разгляд справаў у такім судзе трэба было як мага долей зацягваць, каб выйграць час. Бо развіццё падзеяў магло б прыняць такі паварот, што гэтыя справы страцілі б усё сваё значэнне. З такога пункту погляду, лапландскае падарожжа якраз і было спробай зацягнуць судовы разгляд. Самым лепшым у такіх акалічнасцях было надоўга знікнуць у лапландскай глушы. На замежнае падарожжа Манэргейм не разлічваў. Пра яго ён пачаў гаварыць значна пазней, дый тое з вялікім сумневам.



Пасля адстаўкі з паста прэзідэнта ён наладзіў добрыя адносіны з Паасіківі. Манэргейм быў зусім не злапамятны.

## У Швейцарыі

У канцы лістапада 1947 года ў Манэргейма зноў адкрылася язва страўніка і ўзнік крывацёк. Яго адразу паклалі ў шпіталь Чырвонага Крыжа. Пераліванне крыві не палегчыла яго стану, і таму было вырашана рабіць аперацыю. Яшчэ раней Манэргейм выказаў пажаданне, каб аперацыю рабілі ў Стакгольме. Лекар і ад’ютант узяліся за арганізацыю падарожжа. У гэты час ішла забастоўка служачых. Падарожжа на караблі вымагала шмат часу. А аэрадромы баставалі таксама. Па дапамогу звярнуліся да вайсковай транспартнай авіяцыі. 2 снежня была вялікая бура, але самалёт усё ж прызямліўся ў Хельсінках. Экіпажу далі крыху адпачыць, а самалёт тымчасам пачысцілі ад лёду. Стан хворага пагаршаўся, і ляцець вырашылі тым самым днём, не зважаючы на жахлівае надвор’е – стаяў густы туман, у паветры вісела ледзяная імжа. У чувязі з забастоўкай самалёт самотна стаяў на пустым аэрадроме. Манэргейма павезлі ў аэрапорт на санітарнай машыне, але дабрацца да месца не ўдалося – па дарозе машына зламалася. Маршал злаваўся, хоць быў слабы ад страты крыві. Нарэшце знайшлі другую машыну. Над аэрадромам вісеў такі густы туман, што многія былі супраць палёту. Але пілот вырашыў паспрабаваць, і самалёт паспяхова ўзляцеў. У Хельсінках ды іншых гарадах Фінляндыі самалёты не прымалі. Не было ўпэўненасці і наконт Стакгольма. На падлёце да шведскай сталіцы ў самалёце сапсавалася радыё. Паводле апошніх атрыманых на борце звестак,

прызямліцца ў Стакгольме можна было толькі праз дзесяць хвілін, а калі не, то трэба было тэрмінова прасіць пасадку на іншых аэрадромах. На шчасце, хмары над Стакгольмам на вельмі кароткі час разышліся, але і гэтага пілоту хапіла, каб пасадзіць самалёт. Калі ж Манэргейма ўжо везлі на санітарнай машыне ў шпіталь, малочны туман зноў шчыльна ахутаў зямлю. Маршалу зрабілі аперацыю ў Каралінскай клініцы Стакгольма. У гэтай клініцы працавала прафесар Нана Шварц. Яна парэкамендавала маршалу пажыць у маленькай швейцарскай вёсцы Гліён-сюр-Тэрытэ, якая знаходзілася на схіле гары над Жэнеўскім возерам каля гарадка Мантрэ, што непадалёк ад Лазаны ў франкамоўнай частцы Швейцарыі. Там ёсць маленькі, бездакорна чысты гатэль «Валь-Мон», а вакол гатэля − раскошны парк, адкуль выдатна бачна Жэнеўскае возера. Вёсачка знаходзіцца ў той мясцовасці, дзе манархі, што страцілі свае кароны, ездзяць на аўтобусах і пачуваюць сябе шчаслівымі, пісала газэта «Журналь дэ Жэнэв».

Гатэль «Валь-Мон» быў санаторыем. Спальны пакой маршала быў на другім паверсе. Акно і зашклёныя дзверы адкрываліся на поўдзень. Дзверы вялі на шырокі балкон, які ішоў уздоўж усёй сцяны. Калі Манэргейм пачаў працу над сваімі мемуарамі, яму знялі яшчэ адзін пакой на трэцім паверсе ў якасці кабінета. Свой архіў маршал трымаў у гардэробным пакоі, а пісьмовыя прылады − у шафе для адзення.

Манэргейм завёў звычку хадзіць на шпацыр да пратэстанцкай царквы, што была ў Гліёне. Адтуль ён паварочваў і ішоў назад у гатэль. Калі ж пачынаўся дождж, Манэргейм затрымліваўся ў царкоўнай прыбудове. І ўвесь час, пакуль ліў дождж, ён, не спыняючыся хадзіў сюды-туды па будынку, даўжыня якога была каля сарака метраў.

Гатэль быў старадаўні, і гэта выклікала пэўныя цяжкасці. Перадусім, персаналу было цяжка гатаваць маршалу дыетычныя стравы. А страўнік у яго з-за двух аперацыяў быў не ў парадку. Язва такі адыграла сваю фатальную ролю.

У Швейцарыі да Манэргейма ставіліся з выключнай павагай. Для мясцовага люду ён, перш за ўсё, быў героем Зімовай вайны. А швейцарцы лічылі сябе падобнымідa фінаў − у тым сэнсе, што Швейцарыя таксама была заціснутая паміж двума варожымі ба-



камі ў апошняй вайне: фашысцкімі Нямеччынай ды Італіяй, з аднаго боку, і Францыяй − з другога. За некаторыя паслугі гатэль нават не выстаўляў яму рахункі. Да гэтага ён паспеў прызвычаіцца ўжо і ў Фінляндыі. Паміж дзвюма войнамі Манэргейм хадзіў абедаць у славуты рэстаран «Кямп», дзе яго кармілі бясплатна. А перастаў яго наведваць пасля аднаго выпадку. Аднойчы ён убачыў, як новы афіцыянт, ідучы на кухню, узяў з сервіровачнага стала прыгатаваны для Манэргейма смажаны бок барана і з'еў яго на хаду. Тады маршал устаў з-за стала і, з жалем сказаўшы, што абслугоўванне ў ягоным улюбёным рэстаране стала нікуды не вартае, выйшаў на вуліцу. Хоць той раз кухары зрабілі дзеля яго ўсё магчымае. На пачатку абеду Манэргейму падалі яйка, якое варылася роўна 50 секунд. Кухар разбіў каля пяцідзесяці яек, пакуль маршалу змаглі падаць гэтае дзіва на вялікай лыжцы. Такога мастацтва дасягалі толькі ў рэстаранах старога Піцера. Манэргейм быў патрабавальным гаспадаром і патрабавальным госцем.

У Лугана, куды Манэргейм прыехаў у сакавіку 1948 года, перанёсшы цяжкую аперацыю, яго жыццё было поўнае рознымі абмежаваннямі. Ён штодня хадзіў на шпацыр, зранку выпіваў кубак чаю, за абедам дазваляў сабе піва, а ў час вячэры − шклянку к'янці. Пасля яды можна было таксама выпіць філіжанку кавымока. І гэта былі ўсе жыццёвыя ўцехі, якія ў яго засталіся. Каву ён піў з падвойнай порцыяй цукру, бо страціў былыя смакавыя адчуванні.

З пачаткам халодных дажджоў Манэргейм перабраўся на паўднёвы бок Альпаў, у Мілан, дзе тры вечары запар праседзеў у славутым тэатры Ла Скала. Два вечары ён слухаў сваю ўлюбёную оперу «Багема» Пуччыні ў кампаніі графіні Гертруды Арка. Калі маршал з графіняй увайшлі ў залу Ла Скалы, усе ўсталі ў знак павагі і пашаны. У Фінляндыі публіка так вітала яго з 1918 года. З графіняй Арка Манэргейм пражыў свае апошнія два з паловай гады.

Па дарозе ён на дзесяць дзён затрымаўся на Рыўеры, якая патанала ў кветцені, што было для маршала сапраўднаю асалодай.

Дзяржаўны дэпартамент ЗША паслаў на сустрэчу з Манэргеймам Р. Хігса. Хігс быў першым прадстаўніком ЗША ў Фінляндыі пасля вайны і тады ўжо сустракаўся з Манэргеймам. Цяпер яны

зноў сустрэліся 20 красавіка 1948 года ў Лугана. Хігс сказаў, што дзяржаўны дэпартамент ЗША хацеў бы, каб Манэргейм як мага хутчэй вярнуўся ў Фінляндыю. Яго прысутнасць у краіне добра паўплывала б на грамадскую думку, умацавала б пачуццё стойкасці ў народзе і ўсяліла б у яго цвёрдую веру ў будучыню. Але Хігс на свае вочы ўбачыў, што гэтым спадзяванням амерыканцаў не наканавана спраўдзіцца: Манэргейм выйшаў з гульні. Гэта быў ужо не палітычны лідэр. Гэта быў стары і стомлены чалавек, адзінымі жаданнямі якога былі спакойны адпачынак ды цёплае сонейка.

Манэргейм не захацеў нават гутарыць з амерыканцам пра палітыку. Ён сказаў, што паедзе ў Фінляндыю ў канцы чэрвеня – прагаласаваць на выбарах. Тым не менш, Хігс зрабіў выснову, што, нягледзячы на фізічную непрацаздольнасць Манэргейма, амерыканцам усё-ткі варта падтрымліваць з ім сувязь.

Наконт непрацаздольнасці Хігс памыляўся. Манэргейм даўно задумаў і ажыццяўляў вялікую аперацыю: напісанне сваіх мемуараў у двух частках. Ён паставіў перад сабой важную мэту і акрэсліў строгія фармальныя патрабаванні да гэтай працы.

Манэргейм дыктаваў і пісаў па-шведску, тэкст адначасова перакладаўся на фінскую мову. Трымаючыся сваёй старой звычкі, Манэргейм правяраў тэкст нават у перакладзе. Адначасова з напісаннем шведскай і фінскай версіяў вёўся пераклад на англійскую мову.

Манэргейм часта скардзіўся, што з-за гэтай працы не можа як след высыпацца. Мемуары займалі ўсе яго думкі. Ён лічыў сваю працу надзвычай важнай, бо хацеў з яе дапамогай змяніць уяўленне аб Фінляндыі, як аб верным гітлераўскім хаўрусніку і сатэліце, якое склалася ў свеце. Маршал хацеў паказаць, што Фінляндыя змагалася за сваё існаванне і вяла сваю, асобную ад Гітлераўскай, вайну.

Манэргейм не хацеў падтрымліваць камуністаў і Савецкі Саюз. Ён ніколі не імкнуўся ні абараніць, ні зразумець іх. Але толькі ў прыватным ліставанні даваў волю сваім пачуццям. Пра асаду Берліна ў 1918 годзе ён пісаў, што быў вельмі пазабаўлены тым покерам, у які Трумэн так лоўка здолеў уцягнуць Амерыку, Еўропу ды ўвесь свет. Калі б народы планеты трыццаць гадоў таму (у 1918 годзе) не былі так закалыханыя пачуццём уласнай бяспекі, а зірнулі б цвярозымі вачыма на жыццёвую небяспеку, якую несла ў сабе распаўсюджванне бальшавізму, то сёння свет быў бы зусім інакшы.



Шчыра кажучы, у аўтабіяграфіі Манэргейм выказваўся нават яшчэ больш рэзка і катэгарычна – з той самай прамалінейнасцю, якая ўпотай жыве ў кожным салдаце, як бы старанна ён не хаваў яе. Ён біў па Усходзе прамой наводкай, калі пісаў:

«З-за сваёй няцвёрдасці ў адносінах да экстрэмістаў і іх супрацьдзеяння ўсякім спробам умацаваць дзяржаўную ўладу, сацыяліст Керэнскі вельмі эфектыўна садзейнічаў пагібелі Расеі... Апроч таго, ён нясе адказнасць за ўсе памылкі шматлікіх урадаў. Самая вялікая памылка заключаецца ў затрымцы зямельнай рэформы і склікання Устаноўчага сходу. Калі б гэтыя мерапрыемствы правялі своечасова, была б магчымасць стабілізаваць становішча, а так усё толькі ліло ваду на млын бальшавікоў. У Расеі, як пазней і ў іншых краінах, сацыялісты не змаглі абараніць дэмакратыю. Перад ленінскім пераваротам адкрылася добра ўезджаная дарога, і зрабіць яго было не цяжкай задачай.

Бальшавіцкая партыя была нязначная як па сваёй колькасці, так і па той падтрымцы, якую мела ў краіне. Цвёрдая апора ў яе была толькі ў Маскве і Пецярбургу. Таму задавіць гэты па сутнасці анархічны рух былі вялікія магчымасці. Новыя ўладары Расеі самі здзіўляліся, як лёгка ім удалося зрабіць пераварот, і нават не хавалі, наколькі няпэўна адчуваюць сябе ў сядле ўлады. Лепшым доказам гэтаму служыць тое, што яны не насмеліліся выступіць супраць выбараў ва Устаноўчы сход, назначаных на канец лістапада яшчэ ўрадам Керэнскага. З 36 мільёнаў галасоў бальшавікі атрымалі толькі 9 мільёнаў. Калі ж у студзені 1918 года Сход сабраўся на першае пасяджэнне, то яно стала і апошнім, бо за мінулы час Ленін змог згуртаваць і ўмацаваць сваю ўладу. Па загадзе бальшавіцкага ўрада Устаноўчы сход разагналі. Рускі народ не змог як след скарыстаць нечаканую свабоду і трапіў у рабства, якое ператварылася ў небяспеку для ўсяго свету».

Графіня Гертруда Арка ўсяляк падбадзёрвала і натхняла Манэргейма ў час працы над мемуарамі. Яна пабудавала для іх дваіх дом у Швейцарыі. Пасольства Фінляндыі ў Парыжы з жахам са-

чыла за развіццём адносінаў паміж імі, баючыся, што гэтае старэчае каханне стане прычынай скандалаў і ўсякіх пратакольных непрыемнасцяў, калі для гэтай парачкі ўсё вырашыцца шчасліва. А пасля смерці Манэргейма баяліся, што графіня выставіць добры рахунак за свае клопаты і шматлікія пакупкі. Гэтак сама звычайна ўсе блізкія, глядзячы на каханне старых людзей, нервуюцца так, быццам гэта тычыцца іх саміх.

Свае ўспаміны Манэргейм пісаў як апавяданне пра гістарычныя падзеі. Усё асабістае, інтымнае ці падзеі, якія тычыліся прыватнага жыцця, толькі аслабілі б агульнае ўражанне ад твора, а таму адсутнічалі. Калі ж фінскі выдавец мемуараў намякнуў маршалу, што чытачы просяць дадаць крыху фактаў з прыватнага жыцця, Манэргейм дадаў два сказы: «Што тычыцца майго прыватнага жыцця, то магу сказаць, што ў 1892 годзе я заключыў шлюб з Анастасіяй Арапавай. Яе бацька, нябожчык Мікалай Арапаў, быў генерал-маёрам світы імператара ды кавалергардам».

## Апошнія дні

17 студзеня 1950 года Манэргейм быў у Фінляндыі, куды прыехаў прагаласаваць на выбарах. А ў сакавіку, ужо зноў вярнуўшыся ў швейцарскі гатэль «Валь-Мон», з асалодай шпацыраваў па яго пустых калідорах. Разам з дачкой Соф'яй ён з'ездзіў у Ніццу і Монтэ Карла. Стаяла сырая і халодная вясна. Такую познюю вясну Манэргейм бачыў упершыню за ўсе гады, праведзеныя ў Швейцарыі.

На Вялікдзень ён на тры дні зноў ездзіў на Рыўеру. Ногі ў яго там апухлі, хоць ложак спецыяльна падаўжалі на 35 сантыметраў. Ён адчуваў сябе вельмі стомлена. Яму абрыдла прэсная ежа, якою ён вымушаны быў харчавацца з-за язвы страўніка. Мір і спакой прыходзілі толькі за падвойнымі дзвярыма пакоя – так ён пісаў у канцы красавіка. Ён важыў усяго 67 кілаграмаў.

6 верасня 1950 года Манэргейм ужо быў у сваім маёнтку паад Хельсінкамі. Ён прыехаў у Фінляндыю, каб заключыць дамовы з выдаўцамі сваіх мемуараў. Але 17 верасня 1950 года яго скруціла хвароба. Балела горла, тэмпература дасягала 39 градусаў. Ён зусім аслабеў ад прыёму лекаў.

25 кастрычніка 1950 года Манэргейм вылецеў у Швецыю. Тыя, хто сустракаў маршала ў аэрапорце, былі ўражаныя яго выглядам: у яго былі вялікія чорныя кругі пад вачыма і ён ледзь варушыў языком. Перад вылетам з Хельсінкаў тэмпература ў яго была 38,6, але яго лекар, як заўсёды, сказаў на адзін градус менш. Ён рабіў так і ў час вайны, каб Манэргейм не хваляваўся і не ўпадаў у дэпрэсію. Прафесар Нана Шварц жахнулася. На яе думку, у маршала было не ў парадку сэрца. Але абследаванне паказала, што ў яго запаленне лёгкіх сярэдняй цяжкасці.

Праз тры дні Манэргейм зноў, як заўжды, жартаваў і сустракаўся са знаёмымі. Ён казаў, што ягоная дачка Анастасія не цікавіцца нічым, апроч малітваў ды ежы. Апроч таго, ён даў свой каментар да мемуараў французскага генерала Гамэлена. Падчас Зімовай вайны Гамэлен праз нейкага дробнага афіцэра французскага Генеральнага штаба перадаў Манэргейму ліст, у якім не было ніякіх канкрэтных фактаў, але канстатавалася, што становішча ў Фінляндыі безнадзейнае, і заходнія дзяржавы, відаць, неўзабаве ўвядуць на яе тэрыторыю свае войскі, але і тады краіну чакаюць вялікія страты і цяжкасці. Манэргейм тонка іранізаваў з гэтых пустых, надуманых перасцярогаў.

Каляды Манэргейм сустрэў разам з графіняй Арка ў Лугана.

Неўзабаве ён паслаў да сястры Евы ліст, у якім жартоўна пісаў, што часам з ім здараюцца смешныя сітуацыі. У яго, напрыклад, ёсць два фракі і адзін смокінг, але няма ніводных чорных штаноў. Ліст датаваны 10 студзеня 1951 года. Яму заставалася жыць 18 дзён.

19 студзеня Манэргейм зноў захварэў. Лекары ў клініцы падазравалі харчовае атручэнне. Манэргейм таксама прытрымліваўся гэтай думкі. Праз пару дзён яму палепшала, і ён пачаў думаць, які дзень прапанаваць фінскім выдаўцам для выхаду кнігі. Ён разлічваў, што рукапіс падрыхтуюць да канца лета.

22 студзеня 1951 года яму зноў пагоршала, хвароба абвастрылася. Выклікалі прафесара Ванотці, і той вырашыў перавезці хворага ў кантанальны шпіталь у Лазане. Манэргейм паведаміў прафесару, што за сваё жыццё правёў шмат бітваў, але гэтая будзе яго апошняй – і гэтую бітву ён прайграе.

Раніцай 24 студзеня 1951 года прафесар Дэкер зрабіў Манэргейму аперацыю на кішэчніку. Апрерацыя доўжылася дзве гадзі-

ны. Назаўтра сітуацыя, здаецца, стабілізавалася. Манэргейм прачнуўся і не адчуў болю. Прачытаў ліст.

Праз два дні, 27 студзеня 1951 года, а шаснаццатай гадзіне становішча раптам пагоршылася. Даведаўшыся рпа крытычны стан Манэргейма, Паасіківі асабіста патэлефанаваў прафесару Нане Шварц і папрасіў яе за дзяржаўны кошт паехаць у Лазану. Калі ўвечары яна прыйшла да хворага, яго стан быў крытычны. На думку прафесара, рабіць новую аперацыю не мела сэнсу.

Назаўтра, у суботу, у 15.30 пульс хворага не адчуваўся. Аднак а палове пятай Манэргейм прыйшоў у прытомнасць. Ён зразумеў, што яго стан безнадзейны і развітаўся з лекарамі і сёстрамі, падзякаваўшы ім за ўсё, што яны для яго зрабілі. Паміж сёмай і восьмай гадзінамі ён апрытомнеў зноў, але нікога не пазнаваў. Пасля дзесяці вечара амаль увесь час ён ужо быў у непрытомнасці. У момант смерці каля яго ложка былі яго ад’ютант, пасол Фінляндыі ў Швейцарыі, Нана Шварц і яшчэ адзін швейцарскі лекар. Дачка Соф’я з’явілася ў шпіталі праз дзве-тры хвіліны пасля смерці бацькі. Такое вось непрадказальнае жыццё.

За пахаванне адказвала Міністэрства абароны Фінляндыі.

Улетку 1949 года Манэргейм сказаў, што ў пахавальнай працэсіі павінна ўдзельнічаць ягоная кабыла Кейт. Але яна была жарэбная, і пажаданне маршала выканаць цалкам аказалася немагчымым. Аднак са Стакгольма для кабылы ўсё роўна прывезлі жалобную папону. У Хельсінкі яна была дастаўленая цягніком разам з коньмі ганаровага эскадрона. На час паніхіды ў саборы фельдфебель Сілтанен схаваў кабылу на заднім двары паліцэйскага пастарунку. А калі пахавальная працэсія ішла міма па вуліцы, вывеў яе са схові шча і рэшту шляху правёў у пахавальным картэжы на тым месцы, якое было ёй назначанае ў запавеце, – адразу за гарматным лафетам, на якім стаяла труна з целам маршала.

## Апошні мундзір

Манэргейм сканаў у кантанальным шпіталі Лазаны у 0.30 па фінскім часе ў нядзелю 28 студзеня 1951 года. У гэты ж дзень трыццацьтры гады таму ён пачаў вызвольную вайну ў Эстэрботніі, аб чым і нагадалі правыя газэты.



Цела маршала перавезлі ў Фінляндыю ў вялізнай швейцарскай труне вагой у 300 кілаграмаў. Калі восем генералаў і два палкоўнікі занеслі дамавіну ў царкву, дзверы ў храм зачынілі зсярэдзіны. Каля дзвярэй у рызніцу стаяла ганаровая варта, пачынаючы з кадэтаў ваеннай вучэльні. Варта змянялася кожную гадзіну.

Праз тры гадзіны, а шостай вечара прыйшлі ўласнік пахавальнай канторы і шэсць яго памагатых – трое мужчын і тры жанчыны. З імі быў таксама бляхар. Разам яны павінны былі закончыць падрыхтоўку да пахавання. Яны прывезлі з сабою ручнога вырабу фінскую дамавіну з чачоткі, зробленую яшчэ дзесяць гадоў таму.

Са свайго боку фінскі ўрад прызначыў сведкам палкоўніка Эрнрута, які павінен быў афіцыйна засведчыць, што нябожчык сапраўды маршал Фінляндыі Манэргейм.

Калі швейцарскую труну пачалі адчыняць, два ганаровыя вартавыя падышлі да зачыненых дзвярэй царквы, а два засталіся каля ўвахода ў рызніцу.

Бляхар адно за адным адкрыў тры вечкі швейцарскай труны. Адно з іх – сярэдняе – было свінцовае.

Валасы ў нябожчыка былі чорныя, без сівізны, бо іх падфарбавалі. Прамы прабор не збіўся ў час перавозкі. А вусы былі сівыя.

Цела пераклалі на века труны, якое ляжала на падлозе дагары ўнутраным бокам. Потым пачалі апранаць нябожчыка. Спачатку надзелі белую накрухмаленую кашулю. Потым на ногі нацягнулі шкарпэткі, доўгія штаны, абулі лакіраваныя чаравікі. Перш чым зашпіліць на кашулі каўнер, палкоўнік Эрнрут праверыў, ці на месцы залаты крыж, які маршал атрымаў у падарунак ад сваіх сясцёр і заўсёды насіў на шыі. Крыж быў незвычайнай велічыні – да пяці сантыметраў у даўжыню. Больш ніякіх каштоўнасцяў у яго не было. Шлейкі і рэмень не патрабаваліся. Апошнім надзелі ваенны мундзір.

Калі нябожчык быў перакладзены ў фінскую труну, яе паставілі на катафалк і, пакінуўшы адкрытай, запрасілі вайсковых фатографаў. Было зроблена некалькі дзесяткаў здымкаў. Гэта заняло каля дзесяці хвілінаў. Потым труну закрылі, каб болей ніколі не адкрываць. Бляхар запаяў унутраную дамавіну, зробленую з медзі. Верхняе знешняе века прыкруцілі нітамі. Труну загарнулі ў фінскі вайсковы сцяг.

Тое, што было прахам, вярталася ў зямлю. Тое, што было рухам, бачна жыве ў выніках яго ўчынкаў і дагэтуль застаецца дзеяннем.

На пытанне пра жыццё і смерць маршал некалі даў адказ, у якім быў схаваны пэўны сумнеў. На ўсякі выпадак ён не зусім зачыняў дзверы. Але ў адказе не было нічога ад вядомых догмаў:

– Цяжка ўсвядоміць, што ўсяму прыйдзе канец, але ж і цяжка нават уявіць, якім чынам усё гэта адбудзецца.

Ён сказаў, што хоча быць пахаваны ў маршальскім мундзіры. Але дзе хацеў бы ляжаць, не ўдакладніў.

# ЗМЕСТ

I. Паходжанне і юнацтва ........ 5
II. Пецярбургскія гады ........ 34
III. Падарожжа па Азіі ........ 70
IV. Першая сусветная вайна ........ 95
V. Руская рэвалюцыя ........ 111
VI. Грамадзянская вайна ........ 129
VII. Рэгенцтва ........ 164
VIII. Дзесяць год у цывільным ........ 186
IX. Насустрач другой сусветнай вайне ........ 194
X. Галоўнакамандуючы ........ 200
XI. Ад буры да зацішша ........ 237

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Вэйо Мэры

**Маршал Фінляндыі**
**Карл Густаў Манэргейм**

Адказны за выпуск *Зміцер Колас*

Падпісана да друку 01.12.2004. Фармат 84x108 $^{1}/_{32}$. Папера афсетная.
Гарнітура PetersburgCTT. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 13,86.
Наклад 500 асобнікаў. Заказ ???.

Выдавец ІП Колас
Ліцэнзія № 02330/0133412 ад 14.10.04 г. 220023, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 105–14.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка ў друкарні
УП «Смэлток», 220013, Мінск, вул. Радыяльная, 9.
Ліцэнзія ЛП № 91 ад 12.12.02 г.